Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава”

К.С. Півавар

БЕЛАРУСКАЯ МЕНТАЛЬНАСЦЬ У МОЎНАЙ ПРАСТОРЫ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ

Манаграфія

Репозиторий ВГУ

Віцебск
ВДУ імя П.М. Машэрава
2015

УДК 811.161.3’42:39(=161.3)
ББК 81.411.3-7
П32

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 6 ад 29.06.2015 г.

Адобрана навукова-тэхнічным саветам ВДУ імя П.М. Машэрава. Пратакол № 6 ад 10.06.2015 г.

Аўтар: аспірант кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, магістр філалагічных навук **К.С. Півавар**

Р э ц э н з е н т ы :
прафесар кафедры агульнага і рускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, доктар філалагічных навук *В.А. Маслава;*
прафесар кафедры беларускай мовы ГДУ імя Ф. Скарыны, доктар філалагічных навук *В.А. Ляшчынская*

Півавар, К.С.
П32 Беларуская ментальнасць у моўнай прасторы мастацкага тэксту : манаграфія / К.С. Півавар. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015. – 155 с.
ISBN 978-985-517-496-8.

Праз даследаванне вербальнага выражэння ў мастацкай літаратуры ключавых лінгваментальных адзінак (канцэптаў) *час*, *прастора*, *народ*, *Радзіма*, *мова*, *воля*, *сям’я, шчасце, каханне* дадзена характарыстыка тыповых асаблівасцей беларускай ментальнасці. Праца адрасуецца выкладчыкам, настаўнікам і студэнтам, зацікаўленым філалогіяй і этналогіяй.

Пры афармленні вокладкі выкарыстаны фрагмент карціны А. Гораўскага “Вечар у Мінскай губерні”.

УДК 811.161.3’42:39(=161.3)
ББК 81.411.3-7

ISBN 978-985-517-496-8

© Півавар К.С., 2015
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015

Рэпазіторый ВДУ

ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ……... 4

РАЗДЗЕЛ 1 ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ …… 6

1.1 Ментальнасць, менталітэт, нацыянальны характар ……... 6

1.1.2 Лінгвістычны аспект вывучэння ментальнасці 9

1.1.3 Вывучэнне беларускай ментальнасці на сучасным этапе …..... 11

1.2 Мова мастацкай літаратуры як прадмет вывучэння кагнітыўнай лінгвістыкі і лінгвакультуралогіі …… 15

1.3 Паняцце канцэпту ў лінгвістычнай літаратуры …… 18

1.3.1 Ключавыя словы і канцэпты ў моўнай карціне свету ……. 26

1.4 Паняцце канцэптасферы. Суадносіны тэрмінаў “канцэптасфера”, “канцэптуальная карціна свету”, “моўная карціна свету” …… 28

РАЗДЗЕЛ 2 КАНЦЭПТАСФЕРА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК СРОДАК СПАСЦІЖЭННЯ МЕНТАЛЬНАСЦІ НАРОДА …… 32

2.1 Канцэптуалізацыя часу ў беларускай моўнай свядомасці і тэксце …..... 32

2.2 Канцэптуалізацыя прасторы ў беларускай моўнай свядомасці і тэксце . 37

2.3 *Радзіма* як ключавы канцэпт у беларускай хрэстаматыйнай літаратуры 40

2.4 Канцэпт *народ* як увасабленне дамінантных рыс беларускай ментальнасці ……..... 56

2.5 *Мова* як фактар існавання беларускай нацыі: рэпрэзентацыя канцэпту ў мове мастацкай літаратуры …….. 71

2.6 “Найвышэйшая маральная каштоўнасць”: аб’ектывацыя канцэпту *воля* ў мове мастацкага тэксту ……. 82

2.7 Сямейны ўклад беларусаў у дыяхраніі і сінхраніі (канцэпт *сям’я* ў мове беларускай літаратуры) …… 89

2.8 Уяўленні беларусаў пра шчасце і долю (вербалізацыя канцэптаў *лёс/доля* і шчасце …….. 106

2. 9 Рэпрэзентацыя канцэпту *каханне* ў мове мастацкай літаратуры ……..... 114

2.10 Традыцыйны светапогляд беларусаў (на прыкладзе паэзіі Р. Барадуліна) ……..... 118

ЗАКЛЮЧЭННЕ …… 126

ЛІТАРАТУРА ……... 129

ДАДАТАК ……. 143

Рэпозиторий ВГУ

УВОДЗІНЫ

Праблема самапазнання народа з’яўляецца актуальнай на працягу ўсёй гісторыі яго існавання, а таму даследаванні ментальнасці нацый не страчваюць сваёй значнасці. Зыходзячы з агульнапрызнанай думкі, што пісьменнікі па-геніяльнаму проста выказваюць думкі свайго народа, у якасці матэрыялу вывучэння ментальнасці намі абраны хрэстаматыйныя тэксты, вядомыя кожнаму беларусу з дзяцінства.

Нацыянальная літаратура адлюстроўвае духоўны вопыт нацыі, асаблівасці яе культуры і ментальнасці. Мастацкі тэкст з’яўляецца каштоўным матэрыялам для даследаванняў асаблівасцей светаўспрымання, мыслення і псіхікі пэўнай нацыі. Адлюстраванне ў літаратуры ментальнасці пэўнага этнасу надае мастацкаму тэксту самабытнасць, арыгінальнасць, нацыянальную адметнасць і робіць сапраўдным выразнікам духоўнай сутнасці народа. Мастацкі тэкст, хоць і не з’яўляецца ў поўнай меры аб’ектыўнай крыніцай інфармацыі пра культуру той ці іншай краіны, валодае, тым не менш, вялікім культурным патэнцыялам, аказвае моцнае эмацыйнае і эстэтычнае ўздзеянне на чытача. Спецыфіка мастацкага нацыянальнага тэксту заключаецца ў тым, што аўтар звяртаецца ў першую чаргу да вобразнай прыроды слова, да яго сэнсавых глыбінь, якія ў кожнага народа маюць свае, адметныя ўласцівасці.

Сучасная лінгвістыка вывучае разнастайныя аспекты праблемы канцэптуальнага, ментальнага зместу ў мове. Мовы адлюстроўваюць культуру і менталітэт народаў, прадстаўляюць нацыянальныя карціны свету, у якіх рэпрэзентаваны галоўныя маральныя і каштоўнасныя арыенціры этнасаў. Намі выкарыстаны метады кагнітыўнай лінгвістыкі і лінгвакультуралогіі, у прыватнасці даследуецца ментальнасць і нацыянальная карціна свету беларусаў праз лінгваментальныя ўтварэнні – канцэпты. Комплексны падыход да дадзенай праблемы прадвызначаны антрапацэнтрычнай скіраванасцю сучаснага мовазнаўства, якое акцэнтуе ўвагу на такіх паняццях, як моўная асоба, дыскурс, масавая свядомасць, нацыянальны менталітэт, нацыянальная карціна свету.

Даследаванне прысвечана вывучэнню канцэптаў *Радзіма*, *народ*, *воля*, *мова*, *сям’я, шчасце, каханне, прастора* і *час* ў беларускай моўнай свядомасці, спосабам іх рэпрэзентацыі і заканамернасцям функцыянавання ў мастацкіх тэкстах. Крыніцамі даследавання з’явіліся падручнікі па беларускай літаратуры (V–XI кл.) [17; 18; 19; 20; 27; 115; 116; 162; 186; 187], а таксама анталогія “Беларуская літаратурная спадчына” [21; 22]. Намі прааналізвана звыш за 400 твораў, якія вывучаюцца (або вывучаліся раней) у адпаведнасці са школьнай праграмай па прадмеце “Беларуская літаратура”. Гэта агульнавядомыя вершы, аповесці, раманы, п’есы, прызнаныя хрэстаматыйнымі.

Рэпазіторый ВДУ

Актуальнасць дадзенай працы абумоўлена тым, што аналіз нацыянальна спецыфічных канцэптаў дазваляе раскрыць спецыфіку ментальнасці і культуры пэўнай супольнасці людзей. Цікавасць даследчыкаў да ўзаемадзеяння мовы і чалавека выклікана актыўнымі працэсамі міжкультурнай камунікацыі. Пры вызначэнні актуальнасці працы заўважым нарастанне ўвагі лінгвістаў да мовы мастацкай літаратуры як сродку рэпрэзентацыі ментальнасці і культуры народаў. Між тым комплекснага даследавання, прысвечанага адлюстраванню нацыянальнага характару ў мове беларускіх мастацкіх твораў на прыкладзе ключавых канцэптаў, пакуль не праводзілася. Тэарэтычная значнасць даследавання заключаецца ў тым, што вывучэнне і аналіз мастацкага канцэпту дазваляюць вырашыць шэраг пытанняў сучаснай кагнітыўнай лінгвістыкі (сэнсавая арганізацыя мастацкага тэксту, мастацкая карціна свету аўтараў); пашырыць уяўленне пра канцэпт як універсальны феномен, які адлюстроўвае змест усёй чалавечай дзейнасці, акумулюе асабісты і народны вопыт.

Практычная значнасць працы ўзрастае ў наш час, калі ва ўмовах глабалізацыі і сцірання этнічных межаў, адным з прыярытэтных накірункаў у вучэбна-выхаваўчым працэсе павінна стаць фарміраванне светапогляду маладога пакалення найперш на аснове этычных нормаў і маральных каштоўнасцей свайго народа. Думаецца, што ў многім менавіта вывучэнне роднай мовы і літаратуры ў школе і падручнікі па літаратуры фарміруюць у вучняў асноўныя маральныя і светапоглядныя арыенціры, далучаюць да нацыянальных стэрэатыпаў паводзін. Такім чынам, далучэнне маладога пакалення да маральных каштоўнасцей народа сродкамі заняткаў па літаратуры – запатрабаваная практыка нацыянальна-культурнага выхавання. Актуальнасць такога падыходу тлумачыцца неабходнасцю выхавання ў вучняў пачуцця этнічнай самасвядомасці асобы і нацыянальнага гонару.

Прааналізаваны ў манаграфіі фактычны матэрыял можа быць скарыстаны настаўнікамі на ўроках беларускай літаратуры і мовы, на факультатыўных занятках у агульнаадукацыйных установах, пры падрыхтоўцы вучняў да алімпіяд па беларускай мове і літаратуры. Матэрыялы і вынікі даследавання могуць быць скарыстаны выкладчыкамі ў вучэбным працэсе на філалагічных факультэтах ВНУ Рэспублікі Беларусь пры распрацоўцы курсаў этналінгвістыкі, лінгвакультуралогіі, кагнітыўнай лінгвістыкі, спецкурсаў па дысцыплінах мовазнаўчага цыкла, падрыхтоўцы навукова-даследчых прац студэнтаў. Вынікі даследавання могуць быць улічаны пры складанні новых праграм па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура”, а таксама пры выбары ілюстрацыйных тэкстаў у падручніках у працэсе рэалізацыі лінгвакультуралагічнага падыходу і тэкстацэнтрычнага прынцыпу навучання беларускай мове ў агульнаадукацыйных установах. Названыя напрамкі развіцця сучаснай методыкі навучання беларускай мове і літаратуры звязаны з усведамленнем мовы як сродку спасціжэння нацыянальнай і сусветнай культур, як феномена, у якім знайшлі адбітак праяўленні ментальнасці беларускага народа.

Рэпозиторий ВГУ

РАЗДЗЕЛ 1
ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

1.1 Ментальнасць, менталітэт, нацыянальны характар

Ментальнасць (ад лац. mens, mentis “розум, інтэлект”) – светаўспрыманне, настрой думак. Ментальнасць фарміруецца ў працэсе выхавання і атрымання жыццёвага вопыту людзей. З гэтага вынікае, што ментальнасць – гэта тое, чым адрозніваюцца індывіды, якія атрымалі выхаванне ў розных культурных асяроддзях.

У традыцыйным разуменні паняцце “ментальнасць” блізкае да паняцця “менталітэт” (ням. mentalität) і абазначае той ці іншы “склад розуму”, г.зн. устойлівыя інтэлектуальныя і эмацыянальныя асаблівасці, уласцівыя таму ці іншаму індывіду (звычайна як прадстаўніку пэўнай сацыяльнай групы) [113].

Менталітэт – гэта ўстойлівая сукупнасць псіхічных, інтэлектуальных, эмацыянальных і культурных асаблівасцей, уласцівых той ці іншай этнічнай групе, нацыі, народнасці. Таксама гэтае паняцце можа быць выкарыстана для характарыстыкі светапогляду канкрэтнага чалавека.

Тэрмін узнік у гістарычнай навуцы, аднак зараз актыўна выкарыстоўваецца ў іншых навуках – у псіхалогіі, сацыялогіі, у тым ліку і лінгвістыцы. Паняцце менталітэту вельмі аб’ёмнае і ўключае ў сябе погляды, ацэнкі, нормы паводзінаў і маралі, настрой думак, рэлігійную прыналежнасць, якія характарызуюць тую ці іншую групу людзей.

Менталітэт складваецца на аснове агульнага гістарычнага, культурнага, сацыяльнага і эканамічнага развіцця той ці іншай супольнасці людзей. Рысы менталітэту яскрава праяўляюцца ў паводзінах яго носьбітаў і становяцца асабліва заўважнымі, калі чалавек трапляе ў іншае культурнае асяроддзе. Першым ужыў гэты тэрмін этнолаг Ляві-Бруль. Ён выкарыстоўваў яго ў адносінах да першабытных плямёнаў, за жыццём якіх назіраў і вывучаў іх адметнасці. Ляві-Бруль супрацьпаставіў мысленне першабытнага чалавека і сучаснага, таму ён акрэсліў спецыфічнае мысленне плямёнаў тэрмінам “менталітэт”. Аднак шырокае распаўсюджанне гэты тэрмін атрымаў дзякуючы дзейнасці французскай гістарычнай школы “Анналаў”. Яны разумелі пад менталітэтам тое, што аб’ядноўвала караля Францыі і шараговага салдата, гэта значыць, што менталітэт – калектыўная рыса, а не індывідуальная. Паступова гэты тэрмін перайшоў з навуковага асяроддзя ў шырокі ўжытак.

Згодна з лексікаграфічнымі крыніцамі, “характар – гэта сукупнасць псіхічных уласцівасцей чалавека, якія выяўляюцца ў яго паводзінах” [30, с. 605]. На адметнасці характару ўплываюць як аб’ектыўныя, так і

Рэпазиторий ВГУ

суб’ектыўныя фактары. Назіранні з боку чалавека за гэтымі працэсамі знайшлі сваё адлюстраванне ў мове мастацкай літаратуры.

Нацыянальны характар (шырэй – нацыянальную псіхалогію) можна коратка вызначыць як своеасаблівую сукупнасць розных псіхалагічных рыс і якасцей, уласцівых большасці прадстаўнікоў нацыянальнай супольнасці. Асаблівасці нацыянальнага характару прама ці ўскосна адлюстроўваюцца ў найбольш распаўсюджаных рысах паводзін, пачуццяў і перажыванняў большай часткі людзей, якія адносяцца да аднаго народа.

Паняцце “нацыянальны характар” з’яўляецца блізкімда паняццяў “менталітэт” і “ментальнасць”. Па азначэнні прафесара В.А. Маславай, нацыянальны характар – катэгорыя, якая адлюстроўвае знешнюю, “энергійную” форму цэласнага праяўлення ментальнасці, стэрэатыпы паводзінаў, псіхалагічныя схільнасці, эмацыянальна-валявыя рэакцыі народа [137, с. 36]. Даследчыца размяжоўвае тэрміны “ментальнасць” і “менталітэт” і дае наступныя азначэнні гэтым паняццям: менталітэт – катэгорыя, якая адлюстроўвае ўнутраную арганізацыю і дыферэнцыяцыю ментальнасці, “склад розуму”, “склад душы” народа; менталітэт уяўляе сабой псіха-лінгва-інтэлект рознамаштабных лінгвакультурных супольнасцей. Як паказвае аналіз навуковай літаратуры, пад менталітэтам разумеюць глыбінную структуру свядомасці, якая залежыць ад сацыякультурных, моўных, геаграфічных і іншых фактараў. Па словах В.А. Маславай, ментальнасць – гэта светасузіранне ў катэгорыях і формах роднай мовы, якія аб’ядноўваюць інтэлектуальныя, духоўныя і валявыя якасці нацыянальнага характару ў тыповых яго праявах. Адзінкай ментальнасці прызнаецца канцэпт дадзенай культуры (гл. “Слоўнік канцэптаў рускай культуры” Ю.С. Сцяпанава [173]). Ментальнасць – той нябачны мінімум духоўнага яднання людзей, без якога немагчыма арганізацыя любога грамадства. Ментальнасць народа актуалізуецца ў найбольш важных культурных канцэптах мовы [135, с. 136]. На карысць думкі, што канцэпт з’яўляецца адзінкай ментальнасці (менталітэту) цытуем вытрымку з падручніка “Культура і этнас”:

Менталітэт як спецыфіка псіхічнага жыцця людзей раскрываецца праз

- сістэму поглядаў, ацэнак і нормаў, якія заснаваны на існуючых у дадзеным грамадстве ведах і вераваннях;
- мову, аналіз якой дазваляе даволі дакладна выявіць культурную спецыфіку адносін людзей да навакольнага свету і рэпрэзентуе ўнутраны свет чалавека;
- дамінуючыя ў дадзенай групе матывы, праз іерархію каштоўнасцей, якія праяўляюцца ў перакананнях, ідэалах, інтарэсах. Усё гэта дазваляе выявіць сацыяльныя ўстаноўкі, якія патрабуюць дзейнічаць пэўным чынам. Менталітэт найбольш дакладна праяўляецца ў тыповых паводзінах людзей, прадстаўнікоў дадзенай культуры, выяўляючыся перадусім у стэрэатыпах паводзін і прыняцця рашэнняў;

Рэпозиторий ВГУ

- эмацыйную сферу, перавагу якіх-небудзь пачуццяў;
- аналіз асноўных сацыяльна-палітычных і этнічных катэгорый, якімі аперыруе штодзённая свядомасць: “свабода”, “праца”, “час”, “прастора”, “сям’я” [113].

Вылучаныя складнікі менталітэту можна абазначыць як канцэпты і стэрэатыпы, хоць гэты тэрмін аўтарамі дадзенага дапаможніка не выкарыстоўваецца.

На дадзены момант назапашана вялікая колькасць літаратуры, прысвечанай аналізу тыповых рыс нацыянальнага характару і абумоўленых імі стэрэатыпаў успрыняцця разнастайных народаў. Таму нярэдка нашы меркаванні пра новага чалавека абумоўлены стэрэатыпнымі ўяўленнямі пра той ці іншы нацыянальны характар. У навуцы выдзяляюць аўтастэрэатыпы і гетэрастэрэатыпы. Аўтастэрэатыпы – гэта тое, што людзі думаюць пра свой народ, гетэрастэрэатыпы – уяўленні пра іншы народ. Пры гэтым гетэрастэрэатыпы больш крытычныя.

Інакш кажучы, ментальнасць (менталітэт) у цэлым можна вызначыць як своеасаблівы спосаб мыслення, светабачання асобнага чалавека альбо якой-небудзь супольнасці людзей. Традыцыйна лічыцца, што ментальнасць адлюстроўваецца пераважна ў спецыфічных уяўленнях людзей аб прасторы і часе, сваім прыродным і сацыяльным асяроддзі, меркаваннях аб саміх сабе (самасвядомасць) і прадстаўніках іншых груп насельніцтва, адносінах да працы, рэлігіі, права і інш. Прычым у сферу менталітэту арганічна ўваходзяць як свядомыя, рацыянальныя ўстаноўкі і арыентацыі, так і падсвядомыя, ірацыянальныя імпульсы, калектыўныя першавобразы (“архетыпы”, паводле К.Г. Юнга), што звычайна не ўсведамляюцца людзьмі, але аказваюць даволі істотнае ўздзеянне на іх асабістае светабачанне і паўсядзённыя дзеянні, паводзіны.

У нашым разуменні, як і ў большасці сучасных даследаванняў па гэтай тэме, паняцці “ментальнасць” і “нацыянальны характар” сінанімічныя. На наш погляд, галоўнае іх адрозненне заключаецца ў тым, што калі ментальнасць уяўляе сабой склад мыслення, светабачанне пэўнай этнічнай супольнасці, то нацыянальны характар выяўляецца найперш у такіх псіхалагічных феноменах, як тэмперамент, эмоцыі, пачуцці, настроі, спосабы дзейнасці і паводзін. Інакш кажучы, менталітэт “ахоплівае” ў асноўным сферу больш-менш рацыянальных думак, установак і поглядаў чалавека, тады як нацыянальны характар – галіна пераважна несвядомых, эмацыянальна-пачуццевых імпульсаў, спосабаў паводзін і непасрэдных рэакцый людзей. У асобных выпадках менталітэт і нацыянальны характар безумоўна могуць перасякацца. Такім чынам, пад паняццем нацыянальнай ментальнасці неабходна разумець спецыфічны спосаб светабачання, які ўласцівы пераважнай большасці людзей якой-небудзь нацыянальнай супольнасці. Нацыянальная ментальнасць уяўляе сабой унікальны феномен духоўнага жыцця кожнага народа. “Бадай, у найлепшай ступені

Репозиторий ВГУ

нацыянальная ментальнасць праяўляецца ў мове і народнай творчасці таго ці іншага народа," – слушна заўважае Э. Дубянецкі [16, с. 90].

Трэба адзначыць, што наша праца абмежавана аб'ектам даследавання – мовай мастацкай літаратуры, таму зыходнай базай вылучэння адметных рыс ментальнасці беларусаў служаць толькі мастацкія кантэксты, а не вынікі прац этнолагаў. Хаця з пэўнай доляй верагоднасці вылучаныя намі асаблівасці беларускай ментальнасці будуць супадаць з вынікамі даследаванняў беларусазнаўцаў, бо ў беларускай моўнай свядомасці існуюць трывалыя этнічныя аўтастэрэатыпы.

Паколькі пісьменнік з'яўляецца выразнікам той ці іншай нацыянальнай культуры, на яго накладвае адбітак нацыянальная карціна свету, якая інтэрпрэтуецца ім скрозь прызму індывідуальнага ўспрыняцця і рэалізуецца праз выразныя моўныя сродкі. З'яўляючыся кодавым арганізатарам культуры, мова рэпрэзентуе не толькі "нацыянальны дух" па В. Гумбальту, але і асаблівасці канцэптуалізацыі свету пэўнай асобай. Такім чынам, моўная карціна свету і карціна свету, якая рэканструюецца на матэрыяле мастацкіх тэкстаў, суадносныя.

1.1.2 Лінгвістычны аспект вывучэння ментальнасці

Адным з перспектыўных накірункаў вывучэння нацыянальнага характару з'яўляецца лінгвістычнае даследаванне, бо ў мове чалавек захаваў сваё фізічнае аблічча, свой унутраны стан, эмоцыі і інтэлект, учынкі і характар. У апошнія дзесяцігоддзі шэраг прац лінгвістаў па даследаванні нацыянальнага характару расце. Гэта звязана з тым, што сёння актуальнымі сталі праблемы дыялогу і ўзаемаразумення культур, г.зн. міжкультурная камунікацыя, зыходнымі паняццямі якой з'яўляюцца не толькі "культура" і "маўленчая камунікацыя", але і "моўная асоба", "нацыянальны характар" і інш. На мяжы стагоддзяў з'явіліся працы Н.Д. Аруцюнавай, Ю.Д. Апрэсяна, В.У. Колесава, І. Кажанеўскай-Бярчынскай і інш., былі створаны слоўнікі канцэптаў, у ліку якіх, напрыклад, "Чалавек. Характар і паводзіны" і інш. Так, напрыклад, Г. Вяжбіцкая паказала, якую найбагацейшую інфармацыю аб этнапсіхалогіі нясе ў сабе семантыка моўных знакаў [33; 34]. У сваіх кнігах Г. Вяжбіцкая нясе думку пра тое, што розныя мовы істотна адрозніваюцца ў адносінах сваім слоўнікавым складам і гэтыя адрозненні адлюстроўваюць адметнасць ядзерных каштоўнасцей адпаведных культурных супольнасцей. Аўтар імкнецца паказаць, што ўсякая культура можа быць даследавана, падвергнута супастаўляльнаму аналізу і апісана пры дапамозе ключавых слоў мовы, якая абслугоўвае дадзеную культуру.

Праблема ўзаемадзеяння мовы і ментальнасці разглядаецца ў працах расійскіх лінгвістаў. Напрыклад, у працы У.В. Колесава, М.У. Піменавай "Моўныя асновы рускай ментальнасці" [103] асвятляецца кола

Рэпозиторий ВГУ

даследаванняў тэорыі ментальнасці, сістэматызуецца інфармацыя, апублікаваная ў апошні час, тлумачацца асноўныя тэрміны, ілюструецца станаўленне рускай ментальнасці, адлюстраванае ў пісьмовых помніках і мове. Разам з тым, У.В. Колесаў заўважае, што “лінгвістычны аспект вывучэння ментальнасці пакуль што досыць нераспрацаваны” [103, с. 48].

Разглядаючы лінгвістычны аспект вывучэння беларускай ментальнасці, нельга абысці ўвагай працы Т.М. Мікуліч “Мова і этнічная самасвядомасць” [146], Л. Лыча “Беларуская нацыя і мова” [124]. Асаблівасць першай кнігі з навуковага пункту гледжання вызначаецца перш за ўсё тым, што ў ёй упершыню этнамоўныя працэсы сярод насельніцтва Беларусі выступаюць тэмай асобнага даследавання. Мэтай манаграфіі стала выяўленне асаблівасцей узаемадзеяння мовы і этнічнай самасвядомасці, магчымых вынікаў для этнічнай сістэмы на прыкладзе этнамоўнага развіцця насельніцтва Беларусі. Для дасягнення пастаўленай мэты былі рэалізаваны дзве асноўныя задачы – сістэматызаваны разгляд мовы і этнічнай самасвядомасці як асобных феноменаў і аналіз узаемасувязі моўных працэсаў і этнічнай самасвядомасці ў насельніцтва Беларусі ў ходзе этнагістарычнага развіцця.

Праца “Беларуская нацыя і мова”, аўтарам якой з’яўляецца доктар гістарычных навук Л. Лыч, – даследаванне таго, як у неспрыяльных умовах нашы продкі захавалі мову, культуру, побыт, чым заслужылі вялікую пашану ў сваіх нашчадкаў, далі ім добры прыклад таго, як патрэбна шанаваць, адстойваць нацыянальныя традыцыі. У працы адзначаецца: “Нацыянальная згуртаванасць беларусаў у значнай ступені была прадвызначана той свядомай працай, якая рабілася ў гэтым напрамку пісьменніцкай інтэлігенцыяй. Бадай, ніхто іншы, як яна, так добра не ўсведамляў значэння роднай мовы для лёсу свайго народа і так старанна не працаваў над умацаваннем яе пазіцый у тагачасным жыцці” [124, с. 30]. Іншымі словамі, даследчык сцвярджае выключную ролю беларускіх пісьменнікаў і іх творчасці ў захаванні і перадачы культурнага вопыту народа, мовы, асаблівасцей нацыянальнага светапогляду. “Для ўсіх народаў нацыянальная мова – найперш за ўсё гэта форма іх духоўнай культуры, што асабліва добра пацвярджаецца на прыкладзе мастацкай літаратуры” [124, с. 140].

Працягваючы асвятленне лінгвістычнага аспекту вывучэння ментальнасці, назавём артыкул вядомага беларускага мовазнаўца, доктара філалагічных навук Н.Б. Мячкоўскай “Чым беларусы адрозніваюцца ад рускіх” [145], дзе ў жанры, “больш блізкім да парэмій” [145, с. 67] сфармуляваны 10 адрозненняў беларусаў і рускіх з невялікімі каментарыямі, ілюстрацыямі, вынікамі. Даследчыца адзначае “еўрапейскасць”, падатлівасць да асіміляцыі беларусаў, іх большую прывязанасць да зямлі, гаспадарлівасць, адзначае розныя ўмовы фарміравання светапогляду “дзяржаўнага” рускага народа і “прыватнага”

Репозиторий ВГУ

беларускага. У працы выкарыстаны дадзеныя апытанняў, перапісы насельніцтва розных перыядаў, сведчанні рэспандэнтаў. Такім чынам, у артыкуле выкарыстаны разнастайныя метады даследавання: гістарычны, сацыялагічны і інш.

Даволі часта пры аналізе рыс беларускай ментальнасці вучоныя супастаўляюць беларускі і рускі нацыянальны характары. Так, віцебская даследчыца А.У. Даніч вывучала менталітэт беларусаў і рускіх, адлюстраваны ў міфалогіі, фальклоры, фразеалогіі. Дапаможнік "Менталітэт беларусаў і рускіх. Адлюстраванне ў міфалогіі, фальклоры, фразеалогіі" [67] складаецца з дзвюх частак. Праца прысвечана аналізу рускай і беларускай міфалагічных сістэм і адлюстраванню міфалагічнага светапогляду народа ў семантыцы фразеалагізмаў, якія абазначаюць паводзіны беларусаў і рускіх. Разглядаюцца асаблівасці такіх жанраў фальклору, як казкі, прыказкі, прымаўкі. Прапанаваны аналіз рускіх і беларускіх фразеалагізмаў, якія семантызуюць паводзіны чалавека, з выкарыстаннем міфалогіі і фальклору як найважнейшых крыніц фарміравання культурна-нацыянальна афарбаваных моўных адзінак.

У манаграфіі В.А. Маславай "Нацыянальны характар праз прызму мовы" (на рускай мове) [137] знаходзім апісанне беларускай ментальнасці. Так, даследчыца адзначае аседласць беларускай нацыі, моцную сувязь з "родным кутком", "працавітасць, вынослівасць, памяркоўнасць, нетаропкасць, мяккасць характару" [137, с. 40].

Такім чынам, лінгвісты актыўна звяртаюцца да вывучэння ментальнасці ў мове і тэксце, што выклікана антрапацэнтрычнай накіраванасцю ў сучасным мовазнаўстве. Аднак агульнапрынятай тэарэтычнай базы і методыкі вывучэння ментальнасці ў мове пакуль не выпрацавана.

1.1.3 Вывучэнне беларускай ментальнасці на сучасным этапе

Рост нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва Беларусі ў пачатку 90-х гадоў XX ст., звязаны з атрыманнем краінай незалежнасці, абвастрыў увагу да пытанняў мовы, культурнай і ментальнай адметнасці народа. Вывучэнне беларускай ментальнасці набывае першаступенную важнасць пры фарміраванні дзяржаўнай ідэалогіі, сацыяльнай палітыкі дзяржавы.

У сувязі з вялікай колькасцю змен, якія непазбежна адбываюцца ў розных сферах культуры, узнікае неабходнасць прааналізаваць новыя з'явы культурнага жыцця беларусаў, паглядзець больш уважліва на традыцыі, бо менавіта ў іх акумулюецца вопыт народа, яго адметнасць, непарыўная сувязь пакаленняў. Тым больш што традыцыі – не штосьці кансерватыўнае і застылае, а складаная з'ява, якая няспынна развіваецца, прыстасоўваецца для надзённых патрэб грамадства, адаптуецца да новых умоў жыцця.

Рэпозиторий ВГУ

Інстытутам мастацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору апублікавана серыя кніг пад агульнай назвай “Беларусы” (выданне ўключае 12 тамоў пад назвамі “Прамысловыя і рамесныя заняткі”, “Вытокі і этнічнае развіццё”, “Гісторыя этналагічнага вывучэння”, “Сям’я”, “Грамадскія традыцыі”, “Вусная паэтычная творчасць”, “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”, “Славянскія этнакультурныя традыцыі”, “Музыка”, “Экраннае мастацтва”, “Тэатральнае мастацтва”). Серыя не мае аналагаў на постсавецкай прасторы, у якой на багатых крыніцах даследуюцца вытокі, этнічнае развіццё, традыцыі ў матэрыяльнай і духоўнай культуры, сям’я і традыцыі ў сямейнай і грамадскай сферы, народнае і прафесійнае мастацтва.

Трэці том названай серыі “Гісторыя этналагічнага вывучэння” (1999) [24] прысвечаны аналізу асноўных тэндэнцый і навуковых плыняў у дзейнасці беларусазнаўцаў. Даследаванне ўяўляе сабой грунтоўнае апісанне, заснаванае на вялізным фактычным матэрыяле. Ахоплены перыяд з канца XVIII ст. да 90-х гадоў XX ст., таму ў нашай манаграфіі даследаванні па беларускай ментальнасці гэтага часу не аналізуюцца.

Новая праца калектыву Інстытута мастацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору “Беларусы: сучасныя этнакультурныя працэсы” [25] працягвае этналагічнае вывучэнне сучасных этнакультурных працэсаў. У працы разглядаецца шырокае кола пытанняў, сярод іх і матэрыяльная і духоўная культура, сям’я і традыцыі выхавання. Для больш грунтоўнага даследавання духоўнай культуры ўлічваецца дынаміка яе двух варыянтаў: народнага (традыцыйна-бытавога) і прафесійнага. Неабходнасць даследавання прафесійнай мастацкай культуры звязана перш за ўсё з павышэннем яе ролі ў фарміраванні, развіцці самасвядомасці народа на постіндустрыяльнай стадыі развіцця грамадства.

У раздзеле, прысвечаным этнакультурным працэсам, вылучаюцца фактары, якія вызначаюць асноўныя тэндэнцыі, заканамернасці і механізмы этнакультурных працэсаў і маюць пэўную накіраванасць, а таксама выяўляюцца асноўныя тэндэнцыі дынамікі этнічнай ідэнтыфікацыі.

Прыведзены матэрыял па беларускіх каляндарных святах і абрадах, звычаях, якія разам з іншымі аўтэнтычнымі формамі народнай культуры з’яўляюцца асновай і ядром усёй этнічнай культуры беларусаў. У сучасны перыяд традыцыйныя святы і абрады набываюць асаблівую актуальнасць, паколькі савецкая сістэма святочнай абраднасці адышла ў мінулае, а на змену ёй інтэнсіўна фарміруецца новая. Значная ўвага надаецца дзяржаўным і прафесійным, а таксама канфесійным святам як неад’емным часткам культурнай спадчыны. Даволі шырока даследаваны этнакультурныя працэсы ў прафесійнай культуры і мастацтве: літаратуры, тэатры, кіно, музыцы, выяўленчым мастацтве, архітэктуры. Аўтары

Репозиторий ВГУ

прааналізавалі значны масіў разнастайнай інфармацыі, якая ў большасці выпадкаў упершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак.

Асвятляючы напрацоўкі замежных вучоных па вывучэнні беларускай культуры і ментальнасці, варта адзначыць манаграфію “Беларусы” [26], выдадзеную ў Маскве ў 1998 г. Гэта другая кніга ў серыі “Народы і культуры”, прысвечанай апісанню этнічных супольнасцей, прадстаўнікі якіх пражываюць на тэрыторыі былога Савецкага Саюза. Аўтары імкнуліся даць поўнае і змястоўнае ўяўленне пра беларускі народ, яго традыцыйную культуру, яе спецыфіку, рэгіянальных і агульных усходнеславянскіх рысах. Значная ўвага ўдзелена развіццю сям’і, эвалюцыі сямейных абрадаў, каляндарных святаў. Чацвёртая частка раскрывае спецыфіку вусна-паэтычнай творчасці, паказвае развіццё прафесійнай культуры.

Вывучэнне беларускай ментальнасці праводзіцца і недзяржаўнымі арганізацыямі. Інстытут беларускай гісторыі і культуры – недзяржаўная, непалітычная і некамерцыйная арганізацыя – праводзіць канферэнцыі пад назвай “Трансфармацыя ментальнасці беларусаў у XXI ст.”. Асвятленне дадзенай тэмы адбывалася ў некалькіх накірунках: характарыстыкі нацыянальнага менталітэту грамадзян Беларусі ў пачатку XXI ст. (па матэрыялах пэўных даследаванняў сацыёлагаў, культуролагаў і іншых навукоўцаў); агульны вектар і характэрныя асаблівасці трансфармацыі ментальнасці грамадзян Беларусі ў сучасны перыяд; роля і магчымасці нацыянальнай інтэлігенцыі ў кіраванні працэсам трансфармацыі ментальнасці грамадзян Беларусі.

У працэсе выкладання дысцыпліны “Беларусазнаўства” для вышэйшых навучальных устаноў вывучэнню ментальнасці, нацыянальнага характару надаецца асаблівая ўвага. Так, у навучальным дапаможніку “Беларусазнаўства” пад рэдакцыяй П. Брыгадзіна [16] у раздзелах “Нацыянальны характар” і “Ментальнасць беларусаў” аўтар Э. Дубянецкі дае грунтоўнае апісанне беларускай ментальнасці на прыкладзе фальклору, гістарычных фактаў, сведчанняў вучоных. Аўтар размяжоўвае тэрміны “ментальнасць” і “нацыянальны характар”, вызначае асноўныя іх рысы, прыводзячы пераканальныя доказы з навуковых, публіцыстычных, статыстычных крыніц, з мастацтва. Пытанні вывучэння беларускай ментальнасці у большай ці меншай ступені раскрываюцца ва ўсіх навучальных дапаможніках па дысцыпліне “Беларусазнаўства” [16; 56; 171].

З апошніх прац, прысвечаных беларускай ментальнасці, адзначым манаграфію гомельскага даследчыка В.В. Кірыенкі “Беларуская ментальнасць: вытокі, сучаснасць, перспектывы” [98]. Аўтар прапануе і даволі поўна рэалізуе шматаспектны, міждысцыплінарны падыход даследавання беларускай ментальнасці як сацыякультурнага феномена, арганічна спалучаючы гісторыка-генетычны, філасофска-сацыялагічны, культуралагічны і сацыяльна псіхалагічны аналіз. Такі падыход дазваляе раскрыць прыроду беларускай ментальнасці, вызначыць магістральныя

Рэпазиторий ВГУ

тэндэнцыі развіцця дадзенага феномена. Навукоўца закранае пытанні ўплыву прыроднага ландшафту на фарміраванне беларускага этнасу, адметнасці ўспрымання часу беларусамі, разглядае родавую культуру як кампанент менталітэту. Аўтарам дадзены ідэальны ментальны партрэт і ментальны аўтапартрэт сучасных беларусаў у супастаўленні з ментальнымі партрэтамі рускіх, украінцаў, палякаў, літоўцаў, немцаў, амерыканцаў. Робіцца вывад пра тое, што, знаходзячыся ў пастаянным узаемадзеянні з культурна-цывілізацыйнымі Усходам і Захадам, беларускі этнас выпрацаваў свае спецыфічныя, уласцівыя толькі яму характарыстыкі, сфармуляваў свой унікальны геапалітычны і сацыякультурны статус.

Варта таксама адзначыць працу А.П. Мельнікава “Нацыянальны менталітэт беларусаў” [144]. Пры аналізе рыс беларускай ментальнасці аўтар прыводзіць прыклады з фразеалагічнага і парэміялагічнага фондаў беларускай мовы. Тым самым вучоны выкарыстоўвае лінгвістычны метад даследавання ментальнасці, хоць ён і не з’яўляецца асноўным у яго працы. Пра важнасць мастацкай літаратуры ва ўсведамленні рыс беларускай ментальнасці аўтар адзначае наступнае: “Творы беларускай літаратуры даюць яскравае ўяўленне пра высокамаральныя якасці і рысы аблічча беларускага народа, яго нацыянальнага характару, прыгажосці яго душы. Свабодалюбства, мужнасць, стойкасць і цярплівасць у пераадоленні цяжкасцей, смеласць, спачуванне чужой бядзе, дабрадушнасць, ветлівасць, паважлівае стаўленне да іншых народаў – такія асноўныя рысы нацыянальнага характару беларусаў у мастацкай культуры” [144, с. 49].

Грунтоўным даследаваннем ментальнасці насельніцтва Беларусі X–XVII ст. з’яўляецца манаграфія доктара гістарычных навук І.А. Марзалюка “Людзі даўняй Беларусі: Этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы [132]. Аўтар, шырока выкарыстоўваючы матэрыялы археалагічных і пісьмовых крыніц, апісвае ўяўленні даўніх беларусаў пра “сваіх” і “чужых”, дзяржаўны суверэнітэт і гістарычную самасвядомасць, ідэальнага ўласніка і яго антыпода, сямейныя традыцыі і інш. Вучоны аспрэчвае стэрэатыпныя ўяўленні пра адсутнасць антысемітызму ў нашых продкаў, апелюючы шматлікімі гістарычнымі фактамі. У раздзеле “Малюнак свету ў масавай свядомасці” аўтар выдзяляе такія рысы ментальнасці насельніцтва Беларусі, як вера ў чарадзейства і цуды, сакралізацыя дзяржаўнай улады, пачуццё ўласнага гонару, негатыўнае стаўленне да п’янства. Праца з’яўляецца важным укладам як у гістарычную навуку, так і ў этналогію.

Такім чынам, зараз вывучэнне беларускай ментальнасці ідзе даволі актыўна. Можна вылучыць тэндэнцыі ўзаемапранікнення розных навук – гісторыі, філасофіі, сацыялогіі, лінгвістыкі. Вучоныя засяродзіліся на даследаванні беларускай ментальнасці ў пэўных крыніцах, што дазваляе пазбегнуць суб’ектывізму і тэндэнцыйнасці ў атрыманых выніках. У апошні час з’явіліся этналагічныя працы, заснаваныя на сацыялагічных

Репозиторий ВГУ

[98], фальклорных і этнаграфічных звестках [120], археалагічным і гістарычным матэрыяле [132]. Пра важнасць вывучэння мовы і мастацкай літаратуры пры вызначэнні рыс нацыянальнага характару казалі Л. Лыч, А. Мельнікаў, Э. Дубянецкі. Разам з тым, грунтоўнага лінгвістычнага даследавання, прысвечанага ўзаемасувязі беларускай мовы і ментальнасці беларускага народа, пакуль у айчынным мовазнаўстве няма.

1.2 Мова мастацкай літаратуры як прадмет вывучэння кагнітыўнай лінгвістыкі і лінгвакультуралогіі

На сучасным этапе развіцця навукі пра мову ўзрастае цікавасць лінгвістаў да моўнай прасторы мастацкіх тэкстаў. Даследаванні па гэтай праблеме маюць каштоўнасць у тым сэнсе, што яны даюць магчымасць паказаць, якім чынам, з дапамогай якіх сродкаў мова мастацкіх тэкстаў скіравана на адлюстраванне пачуццяў, эмоцый, настрою, душэўнага стану канкрэтнага аўтара. Менавіта моўная прастора твораў пісьменніка дапамагае зразумець, што ён хацеў сказаць свайму чытачу, што імкнуўся да яго данесці. Сутнасць ведаў чалавека пра свет, адлюстраваных у моўнай форме, уяўляе сабой моўную карціну свету.

Мастацкі тэкст – мадэлюючае ўтварэнне: ён не адлюстроўвае, а стварае сваю рэальнасць, стварае магчымы свет [36; 37; 118]. Мы разглядаем мастацкі тэкст як культурную прастору і лічым, што літаратура надзвычай важная для існавання этнасу і нацыі.

Па словах В.У. Вінаградава, паэтычная мова – мова паэзіі і мастацкай прозы, “мова з устаноўкай на творчасць” – асобы спосаб існавання натуральнай мовы, які характарызуецца тым, што ў ім элемент любога ўзроўню арганізацыі моўнай сістэмы імкнецца стаць семантычна матываваным і можа быць ацэнены эстэтычнай, ці, па тэрміналогіі Р.В. Якабсона, паэтычнай функцыяй [36, с. 106].

Не трэба пакідаць без увагі той факт, што да 80-х гадоў XX ст. тэкст з’яўляўся толькі крыніцай матэрыялу, неабходнага для вывучэня паводзін элементарных моўных адзінак. Зараз пашыраецца традыцыйны аб’ект даследавання: узнікае лінгвістыка, арыентаваная на вывучэнне тэксту. Тэкст разумеецца “як зыходная пазіцыя ўсякай гуманітарнай навукі, а лінгвістыка становіцца служкай пры тэксце” [100, с. 85]. У цэнтры ўвагі лінгвістаў – прырода і асаблівасці мастацкага тэксту, яго мова, віды інтэрпрэтацыі.

На думку даследчыкаў, мастацкі тэкст – спецыфічны лінгвістычны аб’ект [160; 180; 192]. Слова ў мастацкім тэксце ўключае дадатковы сэнс, канатацыі, асацыяцыі. Так, мастацкі тэкст нясе ў сабе адбітак асобы аўтара, яго індывідуальныя і сацыяльна-тыповыя асаблівасці, светапогляд,

Рэпозиторий ВГУ

вопыт, пачуцці, інтэлект. Ідэйна-мастацкая задума твора і ўзровень майстэрства ў сукупнасці ствараюць “вобраз аўтара”.

Мастацкі тэкст функцыянуе ў культуры ў трох іпастасях:

- як носьбіт і крыніца інфармацыі пра свет, уяўлены праз прызму нацыянальнай культуры (тэкст – “згустак” нацыянальнай культуры);
- як носьбіт эстэтычнай інфармацыі (тэкст – твор мастацтва, г.зн. факт нацыянальнай культуры);
- як крыніца ўласна моўнай інфармацыі (тэкст – матэрыял для даследавання моўных адзінак, г.зн. форма фіксацыі нацыянальнай культуры).

Неабходна адзначыць, што ў рускім мовазнаўстве даследаванні па акрэсленай тэме ажыццяўляюцца больш актыўна. Варта назваць шэраг кандыдацкіх дысертацый па дадзенай тэматыцы: “Канцэптасфера паэзіі М.С. Гумілёва ў яе лексічным прадстаўленні” А.Я. Бяспалавай (2002) [28]; “Ключавыя канцэпты ў лірыцы А.С. Пушкіна” Т.У. Мядзведзевай (2002) [141]; “Актуалізацыя канцэпту «Радзіма» ў школьных падручніках па літаратуры і ў масавай свядомасці навучэнцаў” Я.А. Гімаева (2010) [62]; “Канцэптасфера апавяданняў О. Генры” С.В. Манджыевай (2010) [131] і інш.

Лінгвакультуралагічны аналіз літаратуры – гэта не біяграфічныя або тэксталагічныя каментарыі, якія праз факты біяграфіі дазваляюць тлумачыць тэкст, гэта, з нашага пункту погляду, культурна-эстэтычная праблема, калі да тэксту падыходзяць як да ідэйнай цэласнасці, якая валодае ўласным быццём у культуры, але найважнейшае значэнне пры гэтым надаецца мове твора.

Можна вылучыць наступныя прынцыповыя тэарэтычныя падставы для разгляду тэксту як формы інтэрпрэтацыі фрагмента свету моўнай асобы:

1. Моўная карціна свету нацыянальнай мовы ёсць вынік узаемадзеяння двух фактараў – прасторава-часавага кантынуума (аб’ектыўнага свету) і чалавечай свядомасці. Сапраўдны свет праламляецца ў свядомасці этнасу і атрымлівае сваё слоўнае ўвасабленне, унікальнае для кожнай мовы. У сваю чаргу, яно захоўваецца ў індывідуальнай свядомасці кожнага асобнага члена этнічнай супольнасці, увасабляючыся, у прыватнасці, у вербальных тэкстах.
2. Тэкст адлюстроўвае індывідуальны спосаб інтэрпрэтацыі нацыянальнага светабачання, адначасова адлюстроўвае і псіхалагічныя, суб’ектыўна-ацэначныя, эмацыянальныя характарыстыкі свядомасці моўнай асобы, і дух нацыі. Гэта аўтаномная карціна свету асобы, вынік індывідуальнай катэгарызацыі калектыўна здабытых этнасам ведаў пра свет.
3. Індывідуальна-нацыянальныя рысы менталітэту адлюстроўваюцца ў лексічных, марфалагічных, сінтаксічных і кампазіцыйных характарыстыках тэксту (яго тэматыцы, канцэптуальнай структуры).

Рэпозиторий ВГУ

4. Рэчаіснасць праламляецца ў свядомасці індывідуума – члена нацыянальна-этнічнай супольнасці – з дапамогай працэсаў канцэптуалізацыі і катэгарызацыі, зместавымі адзінкамі якіх з'яўляюцца канцэпты. Індывідуальныя канцэпты, будучы дынамічнымі кагнітыўнымі існасцямі, якія знаходзяцца ў пастаянным працэсе ўзаемаўплыву і трансфармацый, утвараюць спецыфічную семантычную прастору – канцэптасферу.

Кожная нацыянальная літаратура адлюстроўвае духоўны вопыт нацыі, асаблівасці яе культуры, тое, што М. Багдановіч назваў "нацыянальнай душой", а У. Дубоўка – "спрадвечнай існасцю". Менавіта з'яўленне нацыянальнага мастацкага тэксту выступае паказчыкам духоўнага нараджэння нацыі, яе этнакультурнага самаўсведамлення. Семантыка паняцця "нацыянальнае" надзвычай няпростая. Нацыянальнае ўвасоблена і ў сферы матэрыяльнага свету – асаблівасцях побыту, адзення і інш., і ў сферы духоўнага – нацыянальным характары, сістэме каштоўнасцей, светапоглядзе. У мастацкім тэксце нацыянальнае – гэта свет звычаяў пэўнага народа, адметнасці яго жыцця і асаблівасці духоўнай свядомасці. Нацыянальны спосаб мыслення вызначае спецыфічную форму мастацкасці і рэалізуецца праз стыль мастацкага тэксту.

Адлюстраванне ў беларускай літаратуры асаблівасцей нацыянальнага светапогляду належыць пісьменнікам-класікам – Я. Купалу, Я. Коласу, М. Гарэцкаму, К. Чорнаму. Быццёвы, матэрыяльны пачатак выражаны ў адлюстраванні мастакамі слова найперш рэчыўнага, побытавага свету, будзённых рэалій жыцця, паэтызацыі прыроды. Прырода, навакольнае асяроддзе, ва ўлонні якога народ сцвярджае сваё гістарычнае быццё, аказваюць значнае ўздзеянне на фарміраванне нацыянальнага светапогляду, самабытнай культуры, спосабу мыслення чалавека.

Беларусь спрадвеку лічылася краінай сялянскай культуры. Гэтая акалічнасць прадвызначыла своеасаблівы лад культуры і ментальнасці беларускай нацыі. Культ зямлі, апяванне чалавека на зямлі, зямлі як асновы ўсяго існага з'яўляецца вызначальнай тэмай шматлікіх твораў беларускай літаратуры ("Новая зямля" Я. Коласа, "Зямля" К. Чорнага, "Палеская хроніка" І. Мележа, творы В. Адамчыка, І. Пташнікава і інш.).

Зараз, калі пашыраюцца і нарастаюць глабалізацыйныя працэсы, адным з прыярытэтных кірункаў у вучэбна-выхаваўчым працэсе нашай нацыянальнай агульнаадукацыйнай школы павінна стаць фарміраванне ў школьнікаў маральна-этычных нормаў паводзін найперш на аснове маральных каштоўнасцей і адметнасцей светапогляду, уласцівых беларусам як пэўнай этнічнай супольнасці. Актуальнасць такога падыходу тлумачыцца неабходнасцю фарміравання ў вучняў традыцыйнага пачуцця этнічнай самасвядомасці і нацыянальнага гонару.

Рэпозиторий ВГУ

У Канцэпцыі вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” на гэтую тэму сцвярджаецца наступнае: “Беларуская літаратура далучае вучняў да духоўнага жыцця і культуры народа, выяўляе светаўспрыманне этнасу, яго ўяўленні пра рэчаіснасць, узаемаадносіны чалавека з прыродай, маральныя і эстэтычныя ідэалы, выпрацаваныя на працягу стагоддзяў. […] Пісьменнікі ствараюць мастацкі летапіс гісторыі сваёй радзімы, раскрываюць нацыянальныя характары, адлюстроўваюць асаблівасці менталітэту беларусаў, народны побыт, лад жыцця, адносіны ў сям’і” [85]. Наконт стварэння пісьменнікамі вобразаў, якія ўвасабляюць нацыянальныя характары, неабходна зрабіць наступную заўвагу. Паколькі наша даследаванне не з’яўляецца літаратуразнаўчым і павобразны метад даследавання намі не выкарыстоўваецца, для вывучэння нацыянальнага характару мы разглядаем мастацкія кантэксты, у якіх сустракаюцца этнонімы (беларус, тутэйшы, народ і г.д.). Хаця, несумненна, многія вобразы беларускай літаратуры ў масавай свядомасці з’яўляюцца носьбітамі нацыянальнага характару: Акім Загорскі (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім), Міхал (Я. Колас. Новая зямля), Васіль Дзяцел (І. Мележ. Людзі на балоце), Хведар Роўба (В. Быкаў. Аблава).

У святле кагнітыўнай парадыгмы мастацкі тэкст асэнсоўваецца як складаны знак, які выражае веды пісьменніка пра рэчаіснасць, увасобленыя ў яго творы ў выглядзе індывідуальна-аўтарскай карціны свету. У адрозненне ад папярэдніх інтэрпрэтацыйных канцэпцый, дзе прэрагатыва аўтарства мастацкага тэксту заставалася за пісьменнікам, новы, кагнітыўны погляд на семантычную прастору тэксту дазваляе асэнсаваць актуальнасць і тэарэтычную значнасць вывучэння праблемы “чалавек–мова–свет”. У тэкставую прастору ўключаецца і чытач як суаўтар. Пісьменнік і чытач узаемадзейнічаюць у кагнітыўных працэсах спараджэння, успрыняцця, разумення і інтэрпрэтавання тэксту.

Для нашага даследавання вялікую каштоўнасць уяўляе сабой мастацкі тэкст, які мы вызначылі як камунікатыўна накіраваны вербальны твор, што валодае эстэтычнай каштоўнасцю, выяўленне якой адбываецца ў працэсе яго ўспрыняцця.

1.3 Паняцце “канцэпту” ў лінгвістычнай літаратуры

Праблема ўзаемадзеяння мовы і культуры з’яўляецца аб’ектам даследавання шматлікіх навуковых дысцыплін. Так, да яе звяртаюцца прадстаўнікі сацыялінгвістыкі, лінгвакультуралогіі, псіхалінгвістыкі, этналінгвістыкі, культурнай антрапалогіі.

Думка пра існаванне своеасаблівага моўнага светабачання належыць В. Гумбальту, які актыўна займаўся пытаннямі моўнай карціны свету ў пачатку XIX ст. Вучоны пісаў, што “мова не існуе па-за межамі нас як аб’ектыўная дадзенасць, яна знаходзіцца ў нас саміх, у нашай свядомасці,

Рэпазиторий ВГУ

нашай памяці, яна змяняецца разам з кожным рухам нашай думкі, з кожнай новай сацыяльна-культурнай роляй” [65, с. 134]. Ідэі В. Гумбальта пра існаванне мовы ў цеснай сувязі з чалавекам і яго культурай атрымалі свой працяг і развіццё ў школе неагумбальтыянцаў і школе Э. Сэпіра і Б. Уорфа. Вучоныя распрацавалі так званую “гіпотэзу лінгвістычнай адноснасці”. У аснове яе ляжыць думка пра тое, што людзі бачаць свет па-рознаму – праз прызму сваёй роднай мовы. Для яе прыхільнікаў рэальны свет існуе настолькі, наколькі ён адлюстраваны ў мове [112, с. 443].

У рэчышчы антрапацэнтрычнай парадыгмы сфарміравалася лінгвакультуралогія, цесна звязаная з кагнітыўнай навукай, у межах якой асабліва выдзяляюцца два накірункі – ***філасофскі*** (лагічны) і ***лінгвакультуралагічны.*** Першы звязаны з гнасеалогіяй і псіхалінгвістыкай (Р. Лангакер, А.В. Краўчанка і інш.), другі, лінгвакультуралагічны, даследуе моўныя сродкі, якія служаць для аб’ектывацыі канцэптаў і таго нацыянальна-культурнага фону, на якім канцэпты фарміруюцца (Дж. Лакоф, А. Вяжбіцкая, Ю.С. Сцяпанаў, Ю.Д. Апрэсян, В.М. Тэлія, У.І. Карасік і інш.).

Кагнітыўная лінгвістыка ставіць сваёй галоўнай задачай мадэляванне карціны свету пры дапамозе ўніверсальных адзінак, якія маюць моўнае выражэнне і адзначаны этнакультурнай спецыфікай. Такой адзінкай з’яўляецца канцэпт. Канцэпт аб’ядноўвае ў сабе абагульнены змест мноства моўных формаў, якія аб’ядноўваюць разнастайнасць назіраемых і ўяўляемых з’яў у сферах чалавечага жыцця, абумоўленых мовай і немагчымых без яе. Нягледзячы на актыўнае вывучэнне прыроды канцэпту, метадаў яго даследавання і спосабаў выражэння, адзіны падыход да вырашэння праблемы канцэпту адсутнічае. Дыскусійнымі з’яўляюцца таксама пытанні пра структуру канцэпту і магчымасці яго мадэлявання, пра суадносіны канцэпту і яго рэпрэзентацыі, узаемасувязі канцэпту і значэння моўных адзінак, якія яго аб’ектывуюць.

Лінгвакультуралогія стала важным складнікам кагнітыўнай і канцэптуальнай лінгвістыкі. У аснове гэтых накірункаў ляжыць ідэя пра тое, што мова адлюстроўвае асобны, спецыфічны для яе спосаб канцэптуалізацыі свету.

Рознабаковыя сувязі мовы і культуры даследуе прафесар В.А. Маслава, аўтар вучэбных дапаможнікаў “Уводзіны ў лінгвакультуралогію” (1997) [134], “Лінгвакультуралогія” (2001) [135], “Кагнітыўная лінгвістыка” (2004) [136] і інш. Так, у працы “Паэт і культура: канцэптасфера Марыны Цвятаевай” (2004) [138] для аналізу выбраны не толькі ключавыя ў творчасці М. Цвятаевай канцэпты рускай нацыянальнай свядомасці (лёс, прастора, паэт), але і агульнакультурныя (каханне, прырода, час, вечнасць), а таксама ўласна аўтарскія паэтычныя канцэпты (дом, пакой, радасць, стол). Аўтар разглядае праблему ўзаемадзеяння паэта і культуры. У працы выкарыстоўваюцца метады

Рэпозиторий ВГУ

даследавання кагнітыўнай лінгвістыкі і лінгвакультуралогіі, прадэманстраваны прыклад канцэптуальнага аналізу, асветлены тэарэтычныя пытанні метадалогіі лінгвакультуралогіі.

У беларускім мовазнаўстве апошніх дзесяцігоддзяў яскрава вызначылася тэндэнцыя ўзмацнення даследчыцкай цікавасці да праблем кагнітыўнай лінгвістыкі. Гэтая цікавасць актыўна стымулюецца творчымі дасягненнямі лінгвакагнітывістаў суседніх краін (Польшчы, Расіі, Украіны і інш.). Тым не менш у сучасным беларускім мовазнаўстве вядучыя ролі пакуль адыгрываюць традыцыйныя раздзелы навукі пра мову. На карысць такога вываду сведчыць тое, што нават найноўшыя накірункі кагнітыўнай лінгвістыкі з'яўляюцца свайго роду кагнітыўнымі праекцыямі традыцыйных раздзелаў лінгвістыкі. Аднак мы можам засведчыць з'яўленне асобных, цалкам сфарміраваных накірункаў – этналінгвістыкі (М.П. Антропаў, Т.В. Валодзіна), лінгвакультуралогіі (В.А. Маслава), этнафразеалогіі (У.І. Коваль, В.А. Ляшчынская, А.Л. Садоўская, А.С. Дзядова).

Сярод беларускіх даследчыкаў пакуль адсутнічае адзіны, агульнапрыняты падыход да кагнітыўнага вывучэння мовы, што замаруджвае развіццё актуальнага на сёння накірунку. Так, па сведчанні В. Шчэрбіна, "калі на 2008 г. у працах беларускіх канцэптолагаў разглядаюцца канцэпты амаль сямі дзясяткаў розных тыпаў, то ўкраінскім канцэптолагам удалося выдзеліць і апісаць канцэпты амаль дзвюх соцень разнастайных тыпаў, а тыпалогія апісаных расійскімі даследчыкамі канцэптаў аб'ядноўвае ў сябе амаль чатыры сотні назваў... Калі ў Расіі і Украіне ўжо выдадзены манаграфіі і спецыялізаваныя зборнікі навуковых артыкулаў па канцэпталогіі, анталогіі канцэптаў і разнатыпныя слоўнікі канцэптаў, то ў Беларусі выкладу вынікаў тэарэтычных і практычных даследаванняў у галіне канцэпталогіі прысвечаны толькі разрозненыя навуковыя артыкулы мованаведаў (А. Лукашанец, Т. Паўлоўская, В. Шчэрбін), літаратуразнаўцаў (М. Мішчанчук, Н. Бахановіч) і прадстаўнікоў іншых галін навук" [191, с. 174].

Важнай асаблівасцю беларускай кагнітывістыкі з'яўляецца той факт, што амаль дзве трэція даследаваных канцэптаў, выбраных айчыннымі канцэптолагамі ў якасці аб'екта даследавання, з'яўляюцца рускамоўнымі даследаваннямі, паняццевы змест якіх апісваецца на матэрыяле твораў рускіх пісьменнікаў.

Культуралагічная парадыгма ведаў кладзе ў аснову асэнсавання моўнай карціны свету такі кампанент, як нацыянальны менталітэт. Прадстаўнікі пэўнай нацыянальнай культуры бачаць свет з пэўнага "пункту гледжання" і ўспрымаюць яго не зусім так, як прадстаўнікі іншых культур. Вывучэнне мовы – неад'емнай часткі любой нацыянальнай культуры – ёсць спроба пранікнення ў вобраз мыслення нацыі, спроба зірнуць на свет з пункту погляду яе прадстаўнікоў. Прычым пры

Репозиторий ВГУ

лінгвакультуралагічным падыходзе моўная карціна свету – гэта база дадзеных, на аснове вывучэння якіх выводзяцца ўласцівасці нацыянальнага характару, што надае моўнай карціне свету гнасеалагічную каштоўнасць. Ганна Вяжбіцкая раскрывае менавіта такі падыход да праблемы сувязі мовы і нацыянальнага характару – падыход, пры якім “прапаноўваецца выяўляць уласцівасці нацыянальнага характару, вычытваючы іх з нацыянальна-спецыфічнага ў адпаведных мовах. Тым самым звесткі пра нацыянальны характар аказваюцца вынікам лінгвістычнага аналізу, а не ягонай зыходнай перадумовай” [151, с. 21].

Лінгвістычная навука ў ходзе эвалюцыі выйшла на якасна новы ўзровень у вывучэнні моўнага знака. Ранейшыя тэрміны “значэнне” і “сэнс” аказаліся недастатковымі, саступіўшы месца “канцэпту”, які спалучае ў сабе культурныя, псіхалагічныя і мовазнаўчыя катэгорыі.

Нягледзячы на тое, што ўпершыню тэрмін “канцэпт” быў уведзены ў 1928 г. С.А. Аскольдавым, ідэя яго мае карані ў палеміцы, разгорнутай ў XIV ст. паміж наміналістамі і рэалістамі. Спрэчка ішла на тэму суадносін імён і рэчаў. Сутыкненне крайніх пунктаў погляду прывяло да ўзнікнення “ўмеранага наміналізму”, які ўвайшоў у гісторыю філасофіі пад назвай “канцэптуалізм”.

Яшчэ П’ер Абеляр у XII ст. меркаваў, што імёны па сваёй прыродзе не ўваходзяць у абазначаную імі рэч, але існуюць з прычыны “накладання” іх людзьмі на рэчы. Гэтае “накладанне” імёнаў паслана людзям самім Богам. Пры гэтым імёны (гукі і цэлыя сказы) аказваюцца ў П. Абеляра “прыладай успрыняцця рэчаў” [122, с. 280]. Вучоны разглядае канцэпт як форму “схоплівання” сэнсу, як “звязванне выказванняў у адзін пункт погляду на той ці іншы прадмет пры вызначальнай ролі розуму” [122, с. 282]. Канцэпт уводзіцца ў свядомасць слухачоў як надасобасны, цэласны сродак успрыняцця рэчаў. Канцэпт – імя рэчы, якое замацоўваецца ў свядомасці слухачоў і моўнікаў. Па сутнасці, П. Абеляр разглядаў канцэпт у кантэксце камунікацыі. Канцэпт у яго выступае нейкім даслаўесным утварэннем, сэнсам. Вучоны выдзеліў таксама такую якасць канцэпту, як яго канструяванасць індывідуальнай свядомасцю, спарадзіўшы гэтым традыцыю трактоўкі канцэпту як суб’ектыўнай формы разумення сэнсу.

У сярэдневяковай філасофіі склалася разуменне канцэптаў як імён, пэўных “псіхалагічных утварэнняў”, якія нясуць з сабой “якую-небудзь сэнсавую функцыю” [122, с. 286]. Сэнсавая функцыя імя раскрываецца ў камунікацыі.

Як і сярэдневяковыя наміналісты, С.А. Аскольдаў прымае індывідуальнае ўяўленне замяшчальнікам усяго родавага аб’ёму. Аднак у адрозненне ад іх ён не атаясамлівае канцэпт з індывідуальным уяўленнем, хоць і бачыць у іх агульнасць.

Актыўнае вывучэнне яго лінгвістыкай пачалося параўнальна нядаўна – з сярэдзіны XX ст., што было выклікана зменай навуковай парадыгмы ў

Рэпозиторий ВГУ

мовазнаўстве. У наш час мэтай лінгвістычных даследаванняў з’яўляецца ўжо не проста выяўленне і апісанне розных узроўняў моўнай сістэмы, што прадугледжвае т.зв. сістэмацэнтрычны падыход да моўных з’яў, які сфарміраваўся яшчэ ў працах І.А. Бадуэна дэ Куртэнэ і Ф. дэ Сасюра і быў даволі “папулярным” у XX ст. Згодна з гэтым падыходам, мова ёсць нейкая амаль незалежная ад нас функцыянуючая сістэма. Аднак зараз ужо ўяўляецца немагчымым вывучэнне мовы без модуса яе існавання – чалавека. Антрапацэнтрычная парадыгма прадугледжвае перанясенне ў цэнтр даследаванняў чалавечага фактару ў мове і моўнага фактару ў чалавеку.

Антрапацэнтрычны погляд на мову прывёў да пашырэння галіны лінгвістычных даследаванняў. Дзякуючы ідэям антрапацэнтрычнасці, абсяг мовазнаўчых прац значна пашырыўся. Узніклі новыя накірункі лінгвістыкі – лінгвакультуралогія, этналінгвістыка, кагнітыўная лінгвістыка, псіхалінгвістыка, лінгваканцэпталогія, гендарная лінгвістыка і інш.

Лінгвакультуралогія даследуе суадносіны мовы і культуры, якія праяўляюцца ў спосабах моўнага выражэння этнічнага менталітэту. Тым самым цікавасць лінгвакультуролагаў фіксуецца на вывучэнні спецыфічнага ў складзе ментальных адзінак і накіравана на апісанне адметных семантычных прымет канкрэтных культурных канцэптаў. Такім чынам, лінгвакультуралагічныя даследаванні хутчэй накіраваны ад імя канцэпту да сукупнасці намінуемых ім сэнсаў.

Неабходна адзначыць, што, нягледзячы на разнастайнасць трактовак канцэпту, даследчыкі адзіныя ў меркаванні: канцэпт – гэта ўмоўная ментальная структура, адзінка ў свядомасці чалавека.

З пункту гледжання тэматыкі выдзяляюцца быційныя канцэпты – звязаныя з рэаліямі бытавання народа, інтэрпрэтацыі свету. Вылучаюцца таксама эмацыйныя канцэпты. Па тыпе носьбітаў канцэпты падзяляюцца на індывідуальна-асобасныя (аўтарскія), групавыя, агульначалавечыя – *прастора*, *час*, *лік*.

Асэнсаванне тэрміна “канцэпт” адбываецца ў рэчышчы некалькіх аспектаў, напрыклад, кагнітыўным, псіхалінгвістычным і лінгвакультуралагічным. Для рознабаковай характарыстыкі канцэпту і адлюстравання разнастайнасці падыходаў да яго структуры і зместу ніжэй мы прыводзім меркаванні шматлікіх лінгвістаў.

У межах культуралагічнага падыходу, напрыклад, канцэпт трактуецца як складанае сацыяпсіхічнае ўтварэнне, якое мае паняццевы, вобразны і каштоўнасны кампаненты. Ю.С. Сцяпанаў азначае культуру праз канцэпты: “Канцэпт – гэта згустак культуры ў свядомасці чалавека, тое, у выглядзе чаго культура ўваходзіць у ментальны свет чалавека” [173, с. 14]. На думку В.А. Маславай, лінгвакультурныя канцэпты – імёны абстрактных паняццяў, паколькі культурная інфармацыя прымацоўваецца да сігніфіката, г.зн. да паняццевага ядра. Планам зместу канцэпту з’яўляецца ўся сукупнасць ведаў пра дадзены аб’ект, а планам выражэння – сукупнасць

Рэпозиторий ВГУ

моўных сродкаў (лексічных, фразеалагічных, граматычных) [138, с. 10]. Лінгвакультурны канцэпт адрозніваецца ад іншых ментальных адзінак акцэнтуалізацыяй каштоўнаснага элементу, таму што цэнтрам канцэпту з'яўляецца каштоўнасць, паколькі гэта лінгвакультурны канцэпт, а ў аснове культуры ляжыць менавіта каштоўнасны прынцып. Даследаваннем канцэптаў займаюцца В. Красных, У. Карасік і яго навуковая школа. Канцэпт з іх пункту пункту погляду – шматмерная ментальная існасць, якая мае вобразнае, апісальнае і каштоўнаснае вымярэнні [107, с. 36].

У. Карасік прапануе таксама выдзяляць канцэпты ў канкрэтным відзе дыскурсу – палітычныя, медыцынскія, публіцыстычныя, мастацкія. Па прымеце трансліруемасці выдзяляюць канцэпты актыўна- і неактыўнакантралюемыя. Па тыпе рэпрэзентацыі значэння канцэпты падзяляюцца на ўяўленні, схемы, сцэнарыі, фрэймы на аснове найбольш маркіруемага канцэптуальнага пласта можна выдзеліць канцэпт-вобраз, аксіялагічны канцэпт, канцэпт-сімвал, прэцэдэнтны канцэпт (Тамірыен), а таксама *канцэпт-ідэю*. М.У. Піменава і С.Р. Варкачоў выдзяляюць у любым канцэпце паняццевую, вобразную, этымалагічную і асацыятыўную характарыстыкі [2]. На думку І.А. Сцерніна, канцэпт не валодае дакладнай структурай, што звязана з яго актыўнай роляй у працэсе мыслення. Любы канцэпт валодае базавым слоем – гэта канкрэтны пачуццёвы вобраз, які кадзіруе канцэпт як мысленчую адзінку. Базавае кагнітыўнае слова – абавязковае ядро канцэпту [159]. На думку У.В. Колесава, у структуры канцэптаў выдзяляецца сімвалічны кампанент. Паколькі фарміраванне канцэптаў ажыццяўляецца гістарычна, то няма ні ўстойлівага паняцця канцэпту, ні яго класіфікацыі [102].

Паняцце канцэпту знаходзіцца ў цэнтры ўвагі многіх даследчыкаў і трактуецца па-рознаму. Яго разглядаюць як ідэальнае культурна-абумоўленае ўяўленне чалавека пра рэчаіснасць (Г. Вяжбіцкая), як лагічную катэгорыю (Ю.С. Сцяпанаў), як паняцце практычнай філасофіі (Н.Д. Аруцюнава), як шматмернае ўтварэнне (У.І. Карасік) і інш. Р.М. Фрумкіна вызначае канцэпт як "вербалізаванае паняцце, адрэфлексаванае ў катэгорыях культуры" [184, с. 14]. Д.С. Ліхачоў пад канцэптам разумеў "свайго роду алгебраічны выраз значэння, якім чалавек аперыруе ў сваім пісьмовым маўленні" [119, с. 30].

Часцей за ўсё прадстаўніцтва канцэпту ў мове прыпісваецца слову, а само слова атрымлівае статус імя канцэпту – моўнага знака, які перадае змест паняцця найбольш поўна і адэкватна. Аднак канцэпт, як правіла, суадносіцца больш чым з адной лексічнай адзінкай. Такім чынам, адметнасцю канцэпту з'яўляецца яго суаднесенасць з планам выражэння ўсёй сукупнасці разнародных сінанімічных (уласна лексічных, фразеалагічных і афарыстычных) сродкаў, якія прэзентуюць яго ў мове. У выніку канцэпт суадносіцца з планам выражэння лексіка-семантычнай парадыгмы.

Рэпозиторий ВГУ

Сувязь канцэпту з вербальнымі сродкамі выражэння адзначаецца ва ўсіх лінгвакультуралагічных азначэннях, аднак адзінства ў поглядах адносна канкрэтных сутнасных адзінак мовы, з якімі суадносіцца канцэпт, у вучоных пакуль няма.

Любы канцэпт убірае ў сябе абагульнены змест мноства формаў выражэння ў натуральнай мове, а таксама ў тых сферах чалавечага жыцця, якія прадвызначаны мовай і немагчымыя без яе; гэта вынік аб'яднання слоўнікавага значэння слова з асабістым вопытам чалавека.

Канцэпт таксама вызначаецца як асноўная адзінка нацыянальнага менталітэту – спецыфічнага індывідуальнага і групавога спосабу светаўспрымання і светаразумення. Канцэпт уключае ў сябе, акрамя прадметнай суаднесенасці, усю камунікатыўна значную інфармацыю. Перш за ўсё гэта ўказанне на месца, якое займае гэты знак у лексічнай сістэме мовы: яго парадыгматычныя, сінтагматычныя і словаўтваральныя сувязі.

Звярнем увагу на існаванне так званых "універсальных канцэптаў", якія выступаюць у свядомасці ў форме этычных тэрмінаў: добра–дрэнна, маральнае–амаральнае.

Такім чынам, можна вылучыць наступныя рысы канцэпту: 1) гэта мінімальная адзінка чалавечага вопыту ў яго ідэальным уяўленні; 2) гэта асноўная адзінка апрацоўкі, захавання і перадачы ведаў; 3) канцэпт мае рухомыя межы і канкрэтныя функцыі; 4) канцэпт – асноўная адзінка культуры. З гэтага вынікае, што канцэпты прадстаўляюць свет у мысленні чалавека, ствараючы канцэптуальную сістэму, а знакі чалавечай мовы кадзіруюць у слове змест гэтай сістэмы.

Мы разумеем канцэпт, услед за Ю.С. Сцяпанавым, В.М. Тэлія, Н.Д. Аруцюнавай, В.А. Маславай як "паняцце, пагружанае ў культуру", якое валодае эматыўнасцю, канатацыямі, аксіялагічнае і культурна-спецыфічнае па сваёй прыродзе ўтварэнне. На сённяшні дзень існуюць шматлікія азначэнні канцэпту. Канцэпт – гэта лінгваментальнае ўтварэнне, вербалізаваны культурны сэнс, які мае імя/імёны ў мове і ўключае ў сябе значэнне, культурныя канатацыі, паняцце і вобраз, што ляжыць у аснове найменавання.

Лічым, што менавіта гэтае азначэнне канцэпту найбольш поўна ўбірае яго сістэмаўтваральныя адзнакі, адпавядае сутнасці паняцця. З гэтай прычыны абіраем дадзенае азначэнне як вядучае, базавае ў нашай працы.

Методыка апісання канцэпту

Сярод метадаў кагнітыўнай лінгвістыкі ёсць некаторыя метады з псіхалінгвістыкі і нейралінгвістыкі.

М.У. Піменава, прадстаўнік Кемераўскай школы канцэпталогіі, прапануе наступныя этапы даследавання канцэпту: 1) праца са слоўнікамі з

Рэпозиторий ВГУ

мэтай выдзялення матывуючых прыкмет; 2) вылучэнне вобразных прыкмет канцэпту (анімалістычныя, жывой/нежывой прыроды, антарпаморфныя, стыхійныя і г.д.); 3) выяўленне паняццевых прымет (на базе разнастайных кантэкстаў, слоўнікавых артыкулаў); 4) даследаванне сімвалічных сэнсаў [157].

Заслугоўвае ўвагі методыка апісання канцэпту, прапанавая І.А. Сцерніным і З.Д. Паповай. Першы этап мадэлявання – пабудова намінатыўнага поля канцэпту, апісанне семантыкі моўных сродкаў, якія аб'ектывуюць дадзены канцэпт. Потым прапануецца выдзеліць некалькі зместавых кампанентаў: вобразны – перцэптыўны (зрокавы, тактыльны, гукавы) і кагнітыўны, у якім аўтары выдзяляюць маральныя, псіхічныя, інтэлектуальныя якасці. Таксама даследчыкі ўводзяць інфармацыйнае і інтэрпрэтацыйнае палі (апошняе складаецца з міфалагічнай, энцыклапедычнай, утылітарнай, сацыяльна-культурнай, парэміялагічнай зон). На заключным этапе мадэлявання выдзяляюцца ядро і перыферыя на падставе "яскравасці" азначаных прымет – найбольш істотныя ўваходзяць у ядро, базавы слой, менш істотныя, адзінкавыя – на перыферыю і крайнюю перыферыю [3, с. 7].

Як бачым, нягледзячы на адсутнасць адзінства трактоўкі структуры канцэпту і яго мадэлявання, мноства метадаў, прапанаваных рознымі аўтарамі, можна выдзеліць абагульненую методыку, якая ўключае комплекс неабходных прыёмаў для рэканструкцыі мастацкага канцэпту. Улічыўшы апісаныя вышэй накірункі канцэптуальных даследаванняў, у нашай працы мы прытрымліваемся наступнай методыкі апісання канцэпту:

1) вызначыць рэферэнтную сітуацыю, да якой належыць дадзены канцэпт (у нашым выпадку – гэта мова мастацкай літаратуры, або мастацкі дыскурс);

2) устанавіць месца дадзенага канцэпту ў моўнай карціне свету праз вывучэнне тэматычнага зместу мастацкай літаратуры, праз зварот да энцыклапедычных і лінгвістычных слоўнікаў. Калі для аналізу выбраны важны для культуры канцэпт, ён павінен быць шматразова паўтораны ў розных відах мастацтва (музыка, кіно, жывапіс);

3) паколькі слоўнікавае тлумачэнне дае толькі самае агульнае ўяўленне пра значэнне слова, а энцыклапедычны артыкул тлумачыць паняцце, неабходна прыцягнуць да аналізу ўсе мастацкія кантэксты, якія вербалізуюць той ці іншы канцэпт;

4) вызначыць намінатыўнае поле, каштоўнасны, вобразны, паняццевыя кампаненты, прыкметы канцэпту. На аснове паўтаральнасці іх у тэкстах змадэляваць ядро, базавы (актыўны) пласт і перыферыю канцэпту;

5) вызначыць узаемасувязь даследаваных канцэптаў.

Рэпазиторий ВГУ

1.3.1 Ключавыя словы і канцэпты ў моўнай карціне свету

Вывучэнне ключавых канцэптаў асобных лінгвакультур – сродак пранікнення ў ментальнасць народа, разумення культурных асаблівасцей, нормаў і правіл паводзін у пэўным соцыуме. У ключавых канцэптах увасоблены найважнейшыя, базавыя каштоўнасці нацыянальна-культурных супольнасцей. Абранае тэрміналагічнае абазначэнне пабудавана на вельмі ўдалай метафары (“«ключы» да культуры”) і, відавочна, таму актыўна ўжываецца многімі даследчыкамі (А. Вяжбіцкая, В. Карасік, В. Маслава, Т. Мядзведзева, М. Піменава і інш.).

Ключавы канцэпт – гэта агульнакультурныя знакавыя паняцці, асабліва важныя і паказальныя для асобна ўзятай супольнасці. Некаторыя ключавыя канцэпты могуць аналізавацца як цэнтральныя кропкі, вакол якіх арганізаваны цэлыя галіны культуры.

На думку В.А. Маславай, да ключавых канцэптаў культуры адносяцца такія абстрактныя імёны, як “Сумленне, Лёс, Воля, Доля, Грэх, Закон, Свабода, Інтэлігенцыя, Радзіма і пад.” [135, с. 137].

У сучасным расійскім мовазнаўстве вылучэнню і апісанню ключавых канцэптаў у мове мастацкай літаратуры прысвечаны шэраг прац. Так, Т.У. Мядзведзева ў дысертацыйным даследаванні “Ключавыя канцэпты лірыкі А.С. Пушкіна” [141] вызначыла і апісала канцэпты “сяброўства”, “свабода”, “каханне”. У працы С.В. Манджыевай [131] на матэрыяле апавяданняў О. Генры рэпрэзентаваны індывідуальна-аўтарскія канцэпты ў выглядзе дыяд “багацце/беднасць”, “ўдача/няўдача”, “надзея/роспач”, “адданасць/здрада”. Прадметам аналізу кандыдацкай дысертацыі Э.В. Бабарыкавай “Ключавыя канцэпты паэзіі І. Аненскага” [8] сталі ключавыя канцэпты індывідуальнай карціны свету: “я”, “сэрца” і “сум”. Аўтарам прапанавана наступная методыка аналізу ключавых слоў у мастацкім тэксце:

1. На аснове статыстычных дадзеных, з улікам крытычных прац і некаторых іншых паказчыкаў, вызначаюцца ключавыя словы і адпаведныя ім канцэпты.
2. Шляхам пабудовы дэрывацыйнага поля ключавога слова, аналізу яго лексічнай спалучальнасці, семантычнай структуры і вызначэння сістэмных тэкставых сувязей устанаўліваецца поўны склад асацыятыўна-семантычнага поля канцэпту, пад якім разумеецца шэраг лексічных вербалізатараў канцэпту з сукупнасцю набытых імі ў паэтычных творах значэнняў.
3. Вызначаюцца тыпы значэнняў ключавых слоў – канцэптуальныя, вобразна-асацыятыўныя, сімвалічныя, – і сродкі іх стварэння. Наяўнасць канцэптуальных значэнняў, якія рэгулярна актуалізуюцца, становіцца галоўным семантычным паказальнікам “ключавога” статуса выражанага словам канцэпту.

Рэпозиторий ВГУ

4. На аснове выдзеленых тыпаў значэнняў устанаўліваецца структура асацыятыўна-семантычнага поля канцэпту, мадэлюецца змест ключавых канцэптаў і робіцца вывад пра асаблівасці некаторых фрагментаў індывідуальнай паэтычнай карціны свету.

У расійскім мовазнаўстве такая методыка аб'ядноўвае шматлікія даследаванні індывідуальна-аўтарскай канцэптасферы.

Пры вызначэнні ключавых канцэптаў у мастацкай літаратуры мы кіраваліся частотнасцю прадстаўленасці тых ці іншых тэм твораў. Таксама ўлічвалася, што, напрыклад, час і прастора – быційныя канцэпты, якія дазваляюць зрабіць вывады пра своеасаблівую канцэптуалізацыю гэтых з'яў у беларускай моўнай свядомасці. Тэма народа, Радзімы ўздымаецца (у той ці іншай ступені) у мастацкай літаратуры кожнай нацыі. Адлюстраванне ў літаратуры сямейнага ўкладу дае найбагацейшую інфармацыю пра ментальнасць пэўнага народа, традыцыі выхавання. Эматыўныя канцэпты *каханне* і *шчасце* з'яўляюцца ўніверсальнымі, аднак маюць пэўнае "нацыянальнае адценне" ў кожнай культуры.

Пры вызначэнні канцэпту як ключавога намі ўлічваецца шэраг прымет:

1) высокая частотнасць ключавых слоў, якія актуалізуюць сэнсы ключавога канцэпту;

2) намінатыўна-марфалагічная дробнасць канцэптаў;

3) наяўнасць у ключавых слоў своеасаблівых канцэптуальных значэнняў, звязаных з адлюстраваннем светаўспрыняцця і светапогляду пісьменнікаў (або нацыі).

Думаецца, такія ключавыя паняцці, як *Радзіма*, *сям'я*, *родная мова*, *воля*, *шчасце* важныя для кожнай лінгвакультуры. Існуюць таксама і спецыфічныя для пэўных культур паняцці, напрыклад, Г. Вяжбіцкая вылучае для нямецкай культуры як ключавое слова пунктуальнасць, для рускай – душа, сум (рус. – тоска), лёс (рус. – судьба). Для амерыканскай культуры такім паняццем можа выступаць прыватнасць (англ. – privacy) і інш.

Для беларускай лінгвакультуры, акрамя агульнакультурных ключавых канцэптаў (Радзіма, мова, воля, сям'я), можна вылучыць такі канцэпт, як *хата*, бо ён уваходзіць у вобразны змест канцэптаў *Радзіма* і *сям'я*. Пры апісанні беларускай ментальнасці на аснове мастацкай літаратуры нацыянальна спецыфічнымі рысамі сярод іншых мы вылучылі лагоднасць, пакорлівасць, ціхмянасць, дабрадушнасць, згаворлівасць, рахманасць, чым пацвердзілі меркаванні шматлікіх этнолагаў [73; 124; 144]. На нашу думку, *хата*, *рахманасць* – нацыянальна спецыфічныя канцэпты, вартыя асобнага даследавання.

Такім чынам, ключавымі канцэптамі культуры мы называем абумоўленыя ёю ядзерныя адзінкі карціны свету, якія валодаюць экзістэнцыйнай значнасцю як для пэўнай моўнай асобы, так і для лінгвакультурнай супольнасці ў цэлым.

Рэпозиторий ВГУ

1.4 Паняцце канцэптасферы. Суадносіны тэрмінаў “канцэптасфера”, “канцэптуальная карціна свету”, “моўная карціна свету”

Сукупнасць ведаў пра свет, чалавека і яго культуру, захаваныя ў моўнай форме, уяўляюць сабой тое, што ў розных канцэпцыях называецца і як “моўны прамежкавы свет”, і як “моўная рэпрэзентацыя свету”, і як “моўная мадэль свету”, і як “моўная карціна свету”. З прычыны больш шырокага выкарыстання ў навуковай сферы мы ўжываем апошні тэрмін. Карціна свету – базіснае паняцце філасофіі, антрапалогіі, лінгвакультуралогіі, кагнітыўнай лінгвістыкі і шэрагу іншых навук.

Цікавасць да моўнай карціны свету назіраецца яшчэ ў працах В. Гумбальта, які пісаў, што “разнастайныя мовы з’яўляюцца для нацыі органамі іх арыгінальнага мыслення і ўспрымання” [65, с. 324]. У гуманітарныя навукі дадзены тэрмін прыйшоў з прац Л. Вітгенштэйна, які цалкам усведамляў яго метафарычнасць і падкрэсліваў сінанімічнасць да псіхалагічнага паняцця “вобраз свету”. Аднак А.А. Лявонцьеў, наадварот, лічыць, што паняцце “вобраз свету” нельга лічыць тоесным такім паняццям, як “моўная карціна свету” і “кагнітыўная карціна свету” [117, с. 6].

З’явілася шмат навуковых прац, прысвечаных дадзенай праблеме. Гэта працы Г.А. Бруцяна, С.А. Васільева, Г.В. Калшанскага, Н.І. Сукаленкі, М. Блэка, Д. Хаймса, калектыўная манаграфія “Роля чалавечага фактару ў мове. Мова і карціна свету” (1988) і інш. У прадмове да названай манаграфіі Б.А. Сярэбранікаў піша, што “сцверджанне многіх лінгвістаў і філосафаў, быццам бы мова адлюстроўвае рэчаіснасць, заснавана на непаразуменні. Гукавы комплекс, утвараючы слова, да адлюстравання не прыдатны. Фактычным вынікам адлюстравання з’яўляюцца канцэпты, або паняцці. Мова звязана з рэчаіснасцю праз знакавую суаднесенасць. Мова не адлюстроўвае рэчаіснасць, а адлюстроўвае яе знакавым спосабам” [167, с. 6]. Такім чынам, мова ў гэтай канцэпцыі з’яўляецца інструментам, з дапамогай якога адбываецца канцэптуалізацыя свету чалавекам. Трэба заўважыць, што ў такім выпадку і распаўсюджаны ў мовазнаўстве тэрмін *моўная карціна свету* з’яўляецца некарэктным і саступае тэрміну *канцэптуальная карціна свету*.

Адзінкамі моўнай карціны свету з’яўляецца канцэпт. Польскі вучоны Е. Бартміньскі вылучае яшчэ і стэрэатып [13]. І сапраўды, абодва яны ментальна-лінгвальныя структуры. Таму рэканструкцыя канцэптаў і выяўленне стэрэатыпаў – гэта метады вывучэння карціны свету. Неабходна не толькі пералічыць і апісаць гэтыя адзінкі, але і суаднесці іх паміж сабой, устанавіўшы ступень падабенства і адрознення.

Большасць лінгвістаў вызначае моўную карціну свету менавіта як “наіўную” (Ю.Д. Апрэсян, С.Р. Варкачоў, В.А. Маслава, М.У. Піменава,

Рэпозиторий ВГУ

Е.В. Урысон). “Наіўная” карціна свету становіцца адным з асноўных аб’ектаў вывучэння ў Маскоўскай семантычнай школе, Школе лагічнага аналізу мовы і інш. Напрыклад, у адрозненне ад навуковых ведаў пра тое, што зямля круглая, звесткі, адлюстраваныя ў мове, іншыя: зямля плоская, мае краі (на краі зямлі), унутры яна полая (праваліцца скрозь зямлю) і г.д.

Пастаноўка праблемы пра суадносіны свету, яго вобраза, існуючага ў свядомасці, і вобраза, створанага мастацкім тэкстам, садзейнічала вылучэнню трох формаў карціны свету – агульнай, канцэптуальнай (у іншай тэрміналогіі – кагнітыўнай), моўнай і паэтычнай.

Калі моўная і канцэптуальная карціны свету ў сваёй аснове ўніверсальныя, а іх стваральнікам з’яўляецца ўвесь народ, то паэтычная – індывідуальная, яна ствараецца ў тэкстах аднаго чалавека, прадстаўніка дадзенага народа. Такім чынам, моўная карціна свету і карціна свету, што рэканструюцца на матэрыяле паэтычных тэкстаў аднаго аўтара, суадносяцца, але не тоесныя.

Пазачалавечых і агульначалавечых карцін свету не бывае. В.І. Паставалава піша: “У дакладным сэнсе слова, існуе столькі карцін свету, колькі маецца назіральнікаў, якія кантактуюць са светам” [167, с. 32].

Тэрмін “моўная карціна свету”, як зазначае В.А. Маслава, гэта небольш, чым метафара, бо ў рэальнасці□спецыфічныя асаблівасці нацыянальнай мовы, у якіх зафіксаваны ўнікальны грамадска-гістарычны вопыт пэўнай нацыянальнай супольнасці людзей, ствараюць для носьбітаў гэтай мовы не якую-небудзь іншую, непаўторную карціну свету, адрозную ад аб’ектыўнай, а толькі спецыфічную □ афарбоўку□ гэтага свету, абумоўленую нацыянальнай значнасцю прадметаў, з’яў, працэсаў, выбіральнасцю адносін да іх, якая спараджаецца спецыфікай дзейнасці, ладу жыцця і нацыянальнай культуры дадзенага народа□ [136, с. 50–51].

Беларуская даследчыца А.Л. Садоўская, разглядаючы тэрмін “моўная карціна свету”, заўважае, што “моўная карціна свету – гэта зафіксаваная ў мове інтэрпрэтацыя рэчаіснасці ў выглядзе сукупнасці меркаванняў пра свет. Яна не толькі стаіць побач са спецыяльнымі карцінамі свету (хімічнай, фізічнай і інш.), яна ім папярэднічае і фарміруе іх, таму што чалавек здольны разумець свет і самога сябе, дзякуючы мове, у якой замацоўваецца грамадска-гістарычны вопыт як агульначалавечы, так і нацыянальны [165, с. 98; 100]. З гэтага вынікае, што канцэптуальная карціна свету, як і спецыяльныя карціны свету (навуковая, прафесійная і г.д.), рэпрэзентавана сродкамі мовы. Але паколькі пазнаннне свету чалавекам паступова ўдакладняецца, пазбаўляючыся ад памылак, яго канцэптуальная карціна свету мяняецца, у той час як моўная карціна свету яшчэ доўга захоўвае рэшткі гэтых недакладнасцей.

У сучаснай лінгвістыцы існуе некалькі накірункаў у вывучэнні моўнай карціны свету: 1) тыпалагічныя даследаванні: славянская моўная карціна свету, балканская мадэль свету; 2) вывучэнне моўнай карціны свету ў

Репозиторий ВГУ

аспекце рэканструкцыі духоўнай культуры народа; 3) даследаванне асобных бакоў мовы: адлюстраванне моўнай карціны свету ў лексіцы, словаўтварэнні, у люстэрку метафар і г.д. З нашага пункту погляду, вялікую цікавасць уяўляе яшчэ адзін накірунак – апісанне паэтычнай (мастацкай) карціны свету.

Адной з галоўных уласцівасцей канцэпту ў лінгвакультуралогіі і кагнітыўнай лінгвістыцы лічыцца неізаляванасць, звязанасць з іншымі канцэптамі. Такім чынам, канцэпты ўтвараюць канцэптуальныя сістэмы і структуры. Канцэптуальную сістэму часта трактуюць як “сукупнасць усіх канцэптаў, дадзеных розуму чалавека” [111, с. 94]. На нашу думку, паняцці “канцэптуальная карціна свету” і “канцэптасфера” тоесныя.

Тэрмін “канцэптасфера” ў навуковы ўжытак увёў Д.С. Ліхачоў у артыкуле “Канцэптасфера рускай мовы” на ўзор тэрмінаў В.І. Вярнадскага “наасфера”, “біясфера”; гэты тэрмін дапамагае зразумець, чаму мова “з’яўляецца не проста спосабам камунікацыі, але і нейкім канцэнтратам культуры нацыі і яе ўвасаблення ў розных слаях насельніцтва аж да адной асобы [119, с. 6]. “Канцэптасфера мовы – гэта па сутнасці канцэптасфера рускай культуры” [119, с. 8]. Д.С. Ліхачоў прапанаваў мадэль канцэптуальнай сістэмы, якая ахоплівае не ўсе віды канцэптаў, а толькі “канцэпты асобных значэнняў слоў, якія залежаць адзін ад аднаго, складаюць нейкія цэласнасці і якія мы вызначаем як канцэптасферу” [119, с. 6].

З.Д. Папова і І.А. Сцярнін пад канцэптасферай разумеюць карціну, што фарміруецца ў выніку непасрэднага пазнання свету чалавекам і ўключае як змястоўныя, канцэптуальныя веды пра навакольную рэчаіснасць, так і сукупнасць стэрэатыпных уяўленняў народа, якая абумоўлівае яго светаразуменне і вызначае яго паводзіны ў стэрэатыпных сітуацыях [159].

Тая частка канцэптасферы, якая атрымлівае выражэнне з дапамогай усёй сукупнасці значэнняў, перададзеных моўнымі знакамі дадзенай мовы, утварае семантычную прастору гэтай мовы. Семантычная прастора служыць сувязным звяном паміж канцэптасферай, якая разумеецца як канцэптуальная карціна свету, і яе моўнымі рэпрэзентацыямі, якія ствараюць моўную карціну свету.

У аснове канцэптасферы народа ляжыць спецыфічная сістэма сацыяльных, культурных і моўных стэрэатыпаў. Нацыянальная своеасаблівасць моўнай карціны свету вызначаецца спецыфікай зместу канцэптаў. Пранікненне ў канцэптасферу дазваляе лепей зразумець светаадчуванне і паводзіны людзей, раскрывае ўніверсальныя, уласцівыя канцэптасферам усіх народаў, і нацыянальна-спецыфічныя рысы.

Сукупнасць устойлівых канцэптаў утварае канцэптасферу мовы, з’яўляецца сціснутым, “алгебраічным выразнікам усёй культуры нацыі” [119, с. 3]. Раскласіфікаваныя па тэматычнай прымеце канцэпты ўтвараюць

Рэпозиторий ВГУ

псіхалагічную канцэптасферу, геаметрычную канцэптасферу, фізіялагічную канцэптасферу і г.д. Існуе нацыянальная, прафесійная, гендарная, узроставая канцэптасферы, а таксама індывідуальная канцэптасфера асобнага аўтара.

Нацыянальная канцэптасфера ўключае ў сябе наіўную карціну свету дадзенай мовы, якая фарміруе вобразны складнік канцэптаў, нацыянальную сістэму каштоўнасцей, што ўтварае ацэначны складнік канцэптаў і пэўную суму інфармацыі, неабходную для паспяховай камунікацыі ў рамках дадзенай культуры. Гэтая сума інфармацыі, як навуковай, так і бытавой, як сапраўднай, так і непраўдзівай, фарміруе паняційны складнік канцэптаў [170, с. 141].

У межах адной нацыянальнай культуры існуюць варыянты канцэптасферы (індывідуальнай і калектыўнай). “Кожны канцэпт па сутнасці можа быць па-рознаму расшыфраваны ў залежнасці ад пэўнага кантэксту і культурнага вопыту, культурнай індывідуальнасці канцэптаносьбіта” [119, с. 7]. Канцэптасфера, не валодаючы прастора-часавымі параметрамі, мае пэўныя колькасныя і якасныя характарыстыкі і змяняецца з цягам часу. Такім чынам, канцэптасфера – утварэнне дынамічнае, у большай ступені фіксаванае ў тэкстах культуры, у першую чаргу, у мастацкім тэксце [192, с. 34].

Канцэптасфера як сукупнасць канцэптаў, зафіксаваная ў культурнай памяці соцыума і/ці індывіда, складае аснову нацыянальнай кагнітыўнай базы і з’яўляецца крыніцай канцэптаў, ментальнымі праекцыямі якіх у мастацкім тэксце з’яўляюцца знакі, сімвалы, вобразы. Моўная эксплікацыя канцэптаў здзяйсняецца праз ключавыя словы і матывы, якія могуць разглядацца і ў рамках асобнага мастацкага твора пісьменніка, і ў інтэртэкстуальных сувязях [192, с. 36].

Нацыянальная канцэптасфера – гэта сукупнасць катэгарызаваных, апрацаваных, стандартызаваных канцэптаў у свядомасці народа. Канцэптасфера існуе незалежна ад мовы і ў гэтай якасці з’яўляецца прадметам даследавання кагніталогіі. Семантычная прастора мовы – частка нацыянальнай канцэптасферы, абазначаная моўнымі сродкамі, названая ў мове і прадстаўленая семемамі і семамі [159, с. 29].

На нашу думку, нягледзячы на распаўсюджанасць у сучасным мовазнаўстве тэрміна “моўная карціна свету”, ён з’яўляецца дыскусійным, адсутнічае дакладнае яго азначэнне і, што самае важнае, не акрэслены метады яе вывучэння. У сваёй працы мы выкарыстоўваем сінанімічныя тэрміны “канцэптуальная карціна свету” (метады яе рэканструкцыі – вылучэнне і апісанне канцэптаў) і “канцэптасфера”, уведзены Д.С. Ліхачовым.

Репозиторий ВГУ

РАЗДЗЕЛ 2
КАНЦЭПТАСФЕРА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК СРОДАК СПАСЦІЖЭННЯ МЕНТАЛЬНАСЦІ НАРОДА

2.1 Канцэптуалізацыя часу ў беларускай моўнай свядомасці і тэксце

На думку Ю.Д. Апрэсяна, кожная натуральная мова адлюстроўвае пэўны спосаб успрыняцця і арганізацыі (“канцэптуалізацыі”) свету. Выражаныя ў ёй значэнні складваюцца ў пэўную адзіную сістэму поглядаў, свайго роду калектыўную філасофію, якая навязваецца ў якасці абавязковай усім носьбітам мовы [6]. Пры такім падыходзе мова разглядаецца як пэўная канцэптуальная сістэма і як сродак афармлення сістэмы ведаў пра свет.

Пад канцэптуалізацыяй разумеецца “адзін з важнейшых працэсаў пазнавальнай дзейнасці чалавека, які заключаецца ў асэнсаванні паступаючай да яго інфармацыі і прыводзіць да ўтварэння канцэптаў, канцэптуальных структур і ўсёй канцэптуальнай сістэмы ў чалавечай псіхіцы” [125, с. 27]. Працэс канцэптуалізацыі адбываецца наступным чынам: чалавек атрымлівае комплекснае ўяўленне пра рэчаіснасць, якое не паддаецца ўсведамленню ва ўсёй сваёй паўнаце, аднак ён на аснове паўтаральнасці здольны выдзеліць у ім асобныя элементы, што маюць агульныя характэрныя рысы, і рабіць абстрагаванне ад нязначнай, на думку чалавека, інфармацыі. Для таго, каб сфарміраваны такім чынам канцэпт замацаваўся ў свядомасці, ён павінен атрымаць пэўнае новае знакавае ўвасабленне, фіксаваную асацыятыўнасць з пэўным азначальным (моўным знакам, малюнкам і інш).

Час і *прастора* – ключавыя быційныя канцэпты, якія існуюць у культурах усіх народаў, аднак могуць мець свае асаблівасці. Як слушна заўважыў В.В. Кірыенка, “спецыфіка адчування часу з’яўляецца адным са структураўтваральных кампанентаў нацыянальна-этнічнага менталітэту” [98, с. 99]. Так, пэўныя часавыя адрэзкі ў многіх народаў маюць суадносныя назвы – раніца, дзень, вечар, ноч. Аднак у беларусаў існуюць самабытныя моўныя адзінкі, зафіксаванаыя ў мове мастацкай літаратуры: *адвячорак, шэрая (шарая) гадзіна*.

Асобна трэба сказаць пра ўстойлівае словазлучэнне *шэрая (шарая) гадзіна*, неаднойчы вызначанае ў мове літаратуры: *І цемра / Мажнее **гадзінаю шараю*** (Р. Барадулін. Евангелле ад мамы), (К. Буйло. **Шэрая гадзіна.** Назва верша). Думаецца, *шэрая гадзіна* – паняцце, важнае для разумення часу ў канцэптуальнай карціне свету беларусаў, якое не сустракаецца ў іншых народаў. Узнікла яно для намінацыі неакрэсленага часавага прамежку паміж днём і вечарам або раніцай і днём (перадвячэрні і

Рэпазиторий ВГУ

ранішні час) пад уплывам кліматычных умоў Беларусі з яе частымі туманамі, воблачнасцю, кароткім зімовым днём. Нашы высновы пацвярджае наяўнасць безэквівалентных у дачыненні да рускай мовы слоў адвячорак – рус.‘предвечернее время’: *І **адвячорак** позніўся знарок* (Р. Барадулін. Уставала Вялічка на сяло), (У. Арлоў. Бэзавы **адвячорак** на краі стагоддзя. Назва верша), шарэннік – рус. ‘предвечернее, предутреннее время’: *Спаць не магла да святла, / На **шарэнніку** ўставала* (Р. Барадулін. Веды).

Адносіны канцэптаў *час* і *Радзіма* (ключавога канцэпту мастацкай літаратуры) можна сфармуляваць наступным чынам: Радзіма – вечная, усё астатняе – часовае, што знікне без следу. Гэтая думка знаходзіць сваё пацвярджэнне ў наступных паэтычных кантэкстах: *Ці разумееце, што мы кахалі, / Што зніклі так, як знікнеце і вы, / Што **векавечны** толькі **край** і далеч, / І жоўты ліст на зелені травы* (У. Караткевіч. У векавечнай бацькаўшчыне клёны…); *Ёсць замест прыватнай неўміручасці – / **Бессмяротнасць нацыі тваёй.** / Ты памрэш. Але ў бязмежным свеце / Будуць працвітаць твой Люд і Край…* (У. Караткевіч. Бог пайшоў). У адным з вершаў Р. Барадулін падае час з’яўлення беларусаў як этнасу: *Мы, беларусы, раз / І назаўсёды павінны / Помніць – да дамавіны – / Час нараджэння нас – / Час нараджэння Скарыны* (Р. Барадулін. Самота паломніцтва). Думка мастака слова пацвярджаецца навуковымі дадзенымі: “Працэсы кансалідацыі беларускай народнасці ў нацыю пачаліся ў XVI–XVII ст., актывізаваліся ў XIX ст.” [171, с. 23].

Любоў да Радзімы ў беларусаў вечная таксама: *Нават **мёртвым успомню** высокія зоры, / Над ракою чырвонай і цьмянай палёт кажаноў* (У. Караткевіч. Беларуская песня).

Цікавым падаецца назіранне, што ў некаторых мастакоў слова ўзнікае метафарычны вобраз часу-касца, які касой сцінае стагоддзі (ва У. Караткевіча) і дні (у Р. Барадуліна): *Час стагоддзі, як касой, сцінае* (У. Караткевіч. В. Быкаву); *Час без перадыху / Косіць траву, / Выбіраючы трапяткую самую ... / Косіць час / Хісткіх дзён траву / І стагуе стагі ў тым / Сцюдзёным зарэччы* (Р. Барадулін. Ксты). У гэтым вобразе адлюстраваўся адзін з асноўных у земляробчым календары традыцыйных заняткаў беларусаў, якія спрадвеку займаліся жывёлагадоўляй і земляробствам, – нарыхтоўка сена.

У карціне свету многіх народаў *час* уяўляецца як цыклічныя змены прыроды (нездарма у многіх мовах ёсць назвы пор года – восень, зіма, лета, вясна). Кожны этнас ствараў своеасаблівыя міфы, легенды, абрады, звязаныя са зменамі прыроды, выкліканымі кліматычнымі ўмовамі. У паслядоўных пераўтварэннях прыроды старажытныя плямёны бачылі не праяўленне натуральных законаў, а дзейнасць міфічных сіл – добрых і шкодных, іх вечную барацьбу паміж сабою. Таму поры года ўяўляліся нашым продкам не адцягненымі паняццямі, а жывымі ўвасабленнямі

Репозиторий ВГУ

стыхійных багоў і багінь, якія па чарзе спускаюцца з неба на зямлю і ўстанаўліваюць на ёй сваю ўладу.

У “Слоўніку славянскай міфалогіі” сцвярджаецца: “Больш наглядныя адухаўленні пор года сустракаем у беларусаў. Вясну яны называюць Ляля, лета – Цёця, восень – Жыцень, зіму – Зюзя” [63, с. 53]. Амаль усе названыя міфалагічныя вобразы сустракаюцца ў паэмах Р. Барадуліна “Аблачына-самабранка” і “Неба тваіх вачэй”.

Ляля ўяўляецца юнай, прыгожай і стройнай дзеваю, з гэтай прычыны існуе і прымаўка: прыгожая, як Ляля. У гонар яе адзначаюць свята перад Юр’евым днём, вядомае пад назвай Ляльніка. На чыстым лузе збіраліся сялянскія дзяўчаты; выбраўшы самую прыгожую сяброўку, яны апраналі яе ў белыя пакровы, перавязвалі ёй рукі, шыю і стан свежай зеленню, а на галаву надзявалі вянок з вясенніх кветак: гэта і ёсць Ляля. Прыгажосць Лялі падкрэслівае знаўца беларускай міфалогіі – паэт Р. Барадулін: *весялей расце трава. / Гэта ў* ***гожай Лялі*** *жаўранкі / Вылятаюць з рукава* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка).

Жыцень уяўляецца істотай маларослай, худаватай, пажылых гадоў, з суровым выглядам твару, з трыма вачыма і ўскудлачанымі, касматымі валасамі. Параўнаем характарыстыку знешнасці, дадзеную Р. Барадуліным: *а* ***Жыцень*** *– / Дзяцюк невысокі, / Паджары, падцяты* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка). Ён з’яўляецца на нівах і агародах пасля ўборкі хлеба і гародніны і аглядае, ці ўсё прыбрана як след у добрай гаспадарцы. Прыкмеціўшы шмат каласоў, не зрэзаных ці кінутых жнеямі, ён збірае іх, звязвае ў сноп і пераносіць на ўчастак таго гаспадара, дзе хлеб прыбраны чыста, з ашчаднасцю. У час асенніх пасеваў ён нябачна прысутнічае на палях і затоптвае ў зямлю раскіданае зерне, каб аніводнае зярнятка не прапала. Такім чынам, у павер’ях, звязаных з міфічнымі істотамі, выявіліся характэрныя рысы беларускай нацыі: працавітасць, дбайнасць, акуратнасць.

Зюзя – стары, невялікага росту, з белымі, як снег, валасамі і доўгай сівой барадой, хадзіць босы, з непакрытай галавой, у цёплай белай адзежы і носіць у руках жалезную булаву: *трывалы, нібы беларусы ўсе, / Бог са старога мужчынскага роду / У белым расхрышчаным кажусе, / Бог ходзіць* ***Зюзя*** *сівабароды* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка).

Як вядома, у беларускі народны каляндар традыцыйна ўключаюцца розныя святы і прысвяткі, якія адбываліся ў вызначаныя дні і тыдні на працягу ўсяго каляндарнага года. Многія з іх маюць язычніцкія карані, аднак падчас хрысціянізацыі набылі новы статус. Напрыклад, у мове твораў Р. Барадуліна сустракаюцца шматлікія назвы свят і прысвяткаў беларускага народнага календара. Напрыклад, Дзяды ‘абрад памінання нябожчыкаў, а таксама дзень, калі ён выконваецца’: *мамін голас усіх / На* ***Дзяды*** *з пашанай кліча* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка). У гэтым абрадзе, які добра захаваўся ў традыцыйнай беларускай культуры і сёння,

Рэпозиторий ВГУ

адлюстраваўся моцны культ продкаў, характэрны для нашай нацыі. Дні памяці продкаў адзначаліся некалькі разоў на год (Траецкія, Змітраўскія Дзяды). На Дзяды гатавалі рытуальныя стравы (7 і больш няцотных святочных і абрадавых страў). Абавязковымі былі куцця, клёцкі, бліны, мяса, яечня. Паводле звычаю, ад кожнай стравы ў асобны посуд адкладвалі па кавалачку для нябожчыкаў і пакідалі на ноч: лічылася, што душы памерлых продкаў, якія прыходзяць на Дзяды, трэба пачаставаць, таму пасля вячэры са стала не прыбіралі – для таго, каб памерлыя маглі за ім пасядзець у цішыні [193, с. 234–235]. З прычыны разнастайнасці страў, якія гатаваліся на Дзяды, утварыўся фразеалагізм як на дзяды ‘вельмі багата, разнастайна’: *каб ты варыў заўсягды,* ***як на дзяды*** (Р. Барадулін. Евангелле ад мамы). Адзначым ужыванне ў барадулінскім кантэксце іншых свят: Каляда ‘даўнейшы абрад хаджэння па хатах у калядныя вечары з віншаваннем, велічальнымі песнямі’: *сягодня якраз* ***Каляда*** *багатая* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка); *Не пытай / У пападзі, / Што зімой калядкі* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка); Сёмуха ‘адно са свят праваслаўнай царквы, якое святкуецца ў пяцідзясяты дзень (праз сем тыдняў) пасля Вялікадня’, Грамніцы ‘зімовае свята, якое адзначаецца 2 лютага’: *хоць бы акрэсліць час /* ***Сёмуха*** *ці* ***Грамніцы****?* (Р. Барадулін. Самота паломніцтва); Масленіца ‘старажытнае славянскае свята провадаў зімы, ад якога захаваўся звычай пячы бліны і весяліцца’: *Пост падняў кабыле хвост, / А там –* ***Масленіца*** (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка); Радаўніца ‘дзень памінання памерлых ва ўсходніх славян, на якім са старажытных часоў адбываліся трапезы на магілах бацькоў і блізкіх сваякоў’: *На* ***Радаўніцу*** *свечку запалю. / Схілюся. Змоўкну. / Ціха памалюся* (Р. Барадулін. Неба тваіх вачэй); Вялікдзень (у аўтара – Вялічка) ‘веснавое хрысціянскае свята, прысвечанае ўваскрасенню Хрыста’: *Я ...фарбаваў на* ***Вялічка*** *яйкі / шалупкамі ад цыбулі* (Р. Барадулін. Смаргонская акадэмія); Купала ‘старажытнае свята летняга сонцастаяння ва ўсходніх славян, якое святкуецца ў ноч з 23 на 24 чэрвеня старога стылю’: *Сягоння ж* ***Купала****, / Што ні зробіш – прапала...* (Р. Барадулін. Рум).

Як вядома, у структуру храналагічнага календара беларусаў уваходзяць такія святы, як Каляды, Грамніцы, Купалле, Жніво, Багач, Восеньскія Дзяды. Прымеркаванне свят да дзён гадавога цыкла сваімі каранямі ўзыходзіць яшчэ да язычніцтва – размеркаванне паміж святымі клопатаў аб надвор’і, здароўі людзей, іх працы. Поўная залежнасць ад прыроды прымусіла земляроба вывучыць навакольны свет, убачыць заканамернасці паміж прыроднымі з’явамі, што прывяло да стварэння пэўных правіл правядзення сельскагаспадарчых работ, прыкмет і тонкіх метэаралагічных назіранняў, якія ўяўляліся асабліва важнымі ў земляробчай дзейнасці. Шырокае выкарыстанне назваў гэтых свят яшчэ раз пацвярджае тое, што мастацкая літаратура цесна знітавана з народнай культурай, якая трансліруецца праз мову паэтычнага кантэксту. Некаторыя

Рэпозиторий ВГУ

назвы свят і прысвяткаў настолькі трывала ўвайшлі ў моўную свядомасць беларусаў, што набылі ў беларускай мове своеасаблівую лексічную форму, сталі безэквівалентнымі ў дачыненні да іншых моў: вербніца – рус. ‘вербное воскресенье’: *На **вербніцу** Сцепаніда з Петраком збіраліся ў царкву і яшчэ пасварыліся трохі ранкам, – надзявацца ці не* (В. Быкаў. Знак бяды); піліпаўка – рус. ‘ночь на Филиппов пост; время Филиппова поста’: *А яшчэ хацелася спаць, і на душы, і ў галаве было цёмна, як у самую глухую ноч на **піліпаўку*** (А. Жук. Паляванне на апошняга жураўля). Адлюстраваннем адмысловага “прыродна-каляндарнага” напрамку ментальнасці беларусаў можна лічыць і назвы месяцаў, звязаныя з пэўнымі асаблівасцямі прыродных і кліматычных з’яў (студзень, люты) або матываваныя назвамі асноўнага занятку беларусаў у акрэслены час (жнівень).

Такім чынам, у мове мастацкай літаратуры назіраецца цыклічнае ўспрыманне часу беларусамі. Як адзначае сацыёлаг В.В. Кірыенка, “у адрозненне ад паўночнаамерыканцаў, швейцарцаў, немцаў, якія жывуць у акрэсленым сацыяльна-псіхалагічным адчуванні лінейнага часу, усходнія славяне псіхалагічна жывуць у цыклічным часе, асноўнымі атрыбутамі якога з’яўляюцца, па-першае, рух па коле, а па-другое, узаемная сувязь мноства суб’ектаў і аб’ектаў дзейнасці” [98, с. 100]. Аўтар адзначае важную ролю ў фарміраванні канцэптуалізацыі часу беларусамі іх асноўнага занятку – земляробства і жывёлагадоўлі.

У беларускай мове нярэдка выкарыстоўваецца метафарычны выраз *час **плыве.*** Асацыятыўная сувязь з дзеясловам *плыць* назоўнікаў *човен, плыты, вада* спарадзіла ў паэзіі Р. Барадуліна наступныя паэтычныя выслоўі: *не затрымаліся **гадоў плыты; Час** – / **Човен** на быстрыні. / Намеры – / Салодкі дым. / Жыві ў сённяшнім дні, / Каб заўтрашні стаў тваім*; *Калі чакання **невады з вады / Выцягваюць сушыць твае гады,** – / Час пазнаёміцца з самім сабою* (Р. Барадулін. Ксты). Сам беларускі тэрмін “час” семантычна блізкі да слоў “часаваць”, “чакаць”, што ўскосна можа сведчыць пра нетаропкасць руху часу ў ментальнасці беларусаў. Аднак у мове мастацкай літаратуры сустракаюцца кантэксты, сэнс якіх супрацьлеглы гэтаму меркаванню. Даволі часта час паказваецца хуткаплынным, імклівым: ён таксама можа *“бегчы”, “ляцець”*: ***імчаліся наўскапыта вякі;*** *Век чалавечы і ў чаўноў і ў стрэх. / І валуны сцяны. / Ад небыцця ўратоўвае / **Няспешнага астраўнога часу бег; Гады ўцякаюць,** я ўдагон / Пускаю познюю пагоню, / Пагоню кайнасці, віны, / Што я ні за панюх табакі / Час змарнаваў; Што **дні ў нястрыманай пагоні** / Рады сваёй замене* (Р. Барадулін. Ксты). Намі выяўлены прыметнікі (*імклівы, нетаропкі*), назоўнікі (*вякі, стагоддзі, час, мінулае, сёння* [у значэнні назоўніка] і інш.), і дзеясловы, звязаныя з моўнымі адзінкамі, якія рэпрэзентуюць канцэпт *час – лятуць (гады), уцякаць, бегчы, дні прабягаюць, гады сплываюць, пралятуць гады*), і гэта дазваляе

Репозиторий ВГУ

сцвярджаць, што адназначных вывадаў з аналізу мастацкай літаратуры наконт уяўлення беларусамі часу як павольнага або імклівага зрабіць немагчыма.

Калі разглядаць ацэначны кампанент канцэпту *час* у беларускай мастацкай літаратуры, неабходна сказаць, што ў большасці выпадкаў адзначаецца нейтральнае стаўленне пісьменнікаў да гэтага паняцця. Толькі ў адным выпадку ў радках Р. Барадуліна *вякі – галодныя ваўкі, дні – перазяблыя сініцы; глядзіць час – злодзей і скнара* – даецца адмоўная характарыстыка канцэпту *час*.

У мастацкай літаратуры назіраецца пэўная скіраванасць ментальнасці беларусаў да мінулага, былых традыцый і звычаяў жыцця, а сённяшні і будучы час паўстаюць неакрэслены мі, цьмянымі. Так, тыповымі сведчаннямі своеасаблівага кансерватызму беларусаў з'яўляецца фраза "Гэтак жылі прадзеды і дзяды". Думаецца, з гэтай прычыны фантастычныя творы, прысвечаныя будучыні, не такая ўжо і частая з'ява ў беларускай літаратуры, у той час як створаны шматлікія вядомыя творы на гістарычную тэматыку (У. Караткевіч, У. Арлоў, Л. Дайнека і інш.) У адрозненне ад падобных схільнасцей беларусаў, напрыклад, для амерыканцаў больш уласціва арыентацыя на сучаснасць, сённяшні дзень і будучыню.

2.2 Канцэптуалізацыя прасторы ў беларускай моўнай свядомасці і тэксце

Аналіз мовы мастацкай літаратуры сведчыць, што ў мастакоў слова існуе падзел ***прасторы*** на "сваю" і "чужую", прычым "свая" тэрыторыя – гэта часцей родная хата, а чужая – тэрыторыя за межамі яе, роднай вёскі (горада, краіны): *Да **роднага парога** на паклон / Ідуць усе дарогі і сцяжыны, / Яны хутчэй спяшаюцца з **чужыны*** (Р. Барадулін. Самота паломніцтва). Апазіцыяй *Радзіме*, як асвоенай тэрыторыі, у прасторавых адносінах з'яўляецца *чужына* (моўныя рэалізацыі – чужына, прастора чужая). Для Р. Барадуліна, напрыклад (як і для большасці пісьменнікаў), яна асацыюецца з няўтульнасцю, холадам, самотай: *Хай будзе **чужына**, як сон, / Прачнуўся – і зноўку дома* (Р. Барадулін. Хай скруха самотных дзён…), *Пільнаваціся кожны мусіць / **Роднай зямлі**. / Не цяплее душа / Ля цяпельца чужога* (Р. Барадулін. Паэма-падарожніца); *Не мяняй свой куток на **прастору чужую**, / У **прасторы чужой** птушка гнёзды не ўе* (Р. Барадулін. Лінія перамены дат). З гэтага вынікае, што пры вызначэнні ацэначнага кампанента канцэпту *прастора* станоўчую канатацыю мае "свая", "родная" зямля, з адмоўным – "чужая". Цэнтральным вобразам "сваёй" прасторы з'яўляецца хата (пра сувязь вобразу хаты з канцэптамі *Радзіма* і *сям'я* гл. у падраздзелах 2.3 і 2.5).

Рэпозиторий ВГУ

І. Марозаў адзначае: “Феномен *прастора* прадугледжвае не закаранеласць і не статычнасць, а бязмежную свабоду руху, выбару шляху, усведамленне таго, што чалавек – вечны вандроўнік” [147, с. 171]. Відавочна, трэба прызнаць, што найчасцей прастора ў мастацкім тэксце разгортваецца не ў гарызантальнай плоскасці, вандроўніцтве, імкненні крочыць (як форме руху), а ва ўрастанні, пусканні моцных і разгалінаваных каранёў. Пісьменнікі адмаўляюць для беларусаў бязладную міграцыю, для беларусаў не характэрна бясконцае блуканне; стабільны, сталы, ураўнаважаны элемент пераважае ў складзе нацыянальнай псіхікі і мыслення: *Лепш грызці зямлю ў* ***родным кутку****, чым каб цябе ліхім ветрам кідала па чужым свеце* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Продкі ані мае, ні твае /* ***Сваёй зямлі*** *не мянялі* (Р. Барадулін. Самота паломніцтва); *От навука для тваіх дзяцей. Моцна ж накажы ты ім, дружа, каб не лёталі дарэмна па свеце, не бадзяліся: у сваім* ***родным кутку*** *работы досыць для кожнага* (Я. Колас. Хмаркі). Як адзначае В.А. Маслава, “беларусы – менш схільныя да перамяшчэнняў, гэта дастаткова аседлая нацыя, сярод іх нават зараз амаль няма эмігрантаў. А вымушаная эміграцыя цяжка перажываецца імі” [138, с. 66].

Можна заўважыць, што ў беларусаў няма паэтызацыі бязмежных прастораў. Матыў захаплення шырокімі прасторамі вельмі характэрны для рускай паэзіі, літаратуры наогул. Так, М.А. Бярдзяеў, характарызуючы менталітэт рускага народа, адзначае: “Руская душа ўшыблена абсягам (рус. – ширью), яна не бачыць межаў, і гэтая бязмежнасць не вызваляе і занявольвае яе… Вялізныя прасторы знаходзяцца ўнутры рускай душы і маюць над ёю велізарную ўладу… Рускі чалавек адчувае сябе бездапаможным авалодаць гэтымі прасторамі і арганізаваць іх” [137, с. 57]. Разам з тым, у рускай мове канцэпт *прастора* не вербалізуецца праз моўную адзінку *куток* (рус. – угол), у той час як для беларусаў характэрна апяванне роднага кутка, што знайшло адлюстраванне ў творчасці разгледжаных намі мастакоў. Для сцвярджэння гэтай думкі варта прыгадаць класічныя радкі з “Новай зямлі” Я. Коласа, вядомыя кожнаму беларусу: *“Мой родны кут, як ты мне мілы...”* (Я. Колас. Новая зямля).

У мастацкай літаратуры прысутнічае яшчэ адзін элемент канцэпту *прастора* – дарога – як абавязковы атрыбут дынамізму, руху, абнаўлення. Сімвалічны вобраз дарогі мае багатую паэтычную гісторыю ў народнай творчасці, у народных паданнях і казках. Дарога паўстае ў мове літаратуры як у канкрэтна-прадметным, так і ў абагульнена-філасофскім значэнні, мае сімвалічнае напаўненне. Дарога – сімвал бясконцасці чалавечага жыцця, сувязная ніць паміж мінуўшчынай, сучаснасцю і будучыняй, вечны спадарожнік і саўдзельнік жыццёвай хады і жыццёвых калізій чалавека. Як адзначыў А. Разанаў, *“дарога і вёска – асноўныя вобразы беларускай літаратуры. Але калі раней дарога ўпадала ў вёску, то цяпер, хутчэй, наадварот: вёска ўпадае ў дарогу”* [161, с. 219].

Рэпозиторий ВГУ

Пры апісанні канцэптуалізацыі часу ў мове літаратуры мы прыводзілі безэквівалентныя словы як адзін са сродкаў выяўлення нацыянальных адметнасцей народа. Як вядома, безэквівалентнае слова – гэта слова, якое пры перакладзе на іншую мову не мае аднаслоўнага адпаведніка. Прычыны безэквівалентнасці слоў бываюць самыя розныя. У першую чаргу, наяўнасць у беларускай мове безэквівалентнай у рускамоўным дачыненні лексікі абумоўлена фактарамі экстралінгвістычнага характару, у прыватнасці, розніцай у матэрыяльных і сацыяльных умовах жыцця беларускага і рускага народаў. Матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, як і любой іншай этнічнай супольнасці, уласцівы спецыфічныя рэаліі і паняцці, якія маюць культурна-гістарычную канатацыю і не характэрныя для жыцця і побыту суседніх народаў. Безэквівалентнасць слова можа быць звязана таксама са спецыфікай нацыянальнай свядомасці таго ці іншага народа. Носьбіты розных этнакультур па-свайму паняццева падзяляюць навакольную рэчаіснасць, у выніку чаго можна гаварыць, напрыклад, пра розную ступень дэталізацыі паняццяў у дзвюх мовах. Так, наступныя безэквівалентныя словы, выяўленыя ў даследаваным моўным матэрыяле, паказваюць своеасаблівую канцэптуалізацыю наступных аб’ектаў навакольнага асяроддзя (прасторы): ветах – рус. ‘луна в последней четверти’: *Дзе ўдзень нараджаецца* ***ветах***… (Р. Барадулін. Самота паломніцтва); знічка – рус. ‘падающая звезда’: *Прысмерклых* ***знічак*** *клінам* (Р. Барадулін. Палыновыя санеты).

Аднак найбольшай у колькасных адносінах групай з’яўляецца сінанімічны рад безэквівалентных слоў, якія аб’ектывуюць прасторавае паняцце *балота*. Чым больш шырока для таго ці іншага народа характэрны пэўныя рэаліі, паняцці (паняцце), тым больш назваў ужываецца для іх абазначэння. Напрыклад, у кітайцаў шмат найменняў для абазначэння рысу, у фінаў – снегу, у беларусаў – балота (на тэрыторыі нашай краіны больш за 11,5 тысяч балот): *алёс, багна, багніва, балота, бездань, гала, дрыгва, імшарына, мроіва, нетра, твань* і інш. Прывядзём наступныя прыклады з мастацкіх кантэкстаў: багнішча – рус. ‘огромная топь’: *…забіваюць на* ***багнішчах*** *балесную вольху* (У. Караткевіч. Вужыная каралева); балаціна – рус. ‘болотистое место, небольшое болото’: *Бондар пайшоў на ўскраек* ***балаціны*** (І. Навуменка. Сасна пры дарозе); імшара – рус. ‘моховое болото’: *каго спытаць? Журавоў на* ***імшарыне?*** (Р. Барадулін. Удакладненні); узболатак– рус. ‘край болота’: *Ужо ідучы* ***ўзболаткам****, Васіль адчуў з сяла сабачы брэх: брахалі Карчовы вартавыя* (І. Мележ. Людзі на балоце).

Як адзначае Э. Дубянецкі, “невыпадкова найчасцей у беларускім фальклоры ўзгадваюцца такія найбольш распаўсюджаныя архетыпы мясцовага краю і прыроды, як лес, балота і поле [16, с. 93]. Лес – неад’емная частка не толькі пейзажу, але і матэрыяльнай і духоўнай культуры народа: “Лес з незабыўных часоў лічыўся пасрэднікам паміж

Репозиторий ВГУ

небам і зямлёй. У лясах і гаях язычнікі хавалі мёртвых, таму што гэтыя месцы нагадвалі ім пра “блажэнныя” райскія сады, куды павінны ўзнесціся пасля смерці душы памерлых” [150, с. 235]. У празаічных творах мастацкай літаратуры выяўлены наступныя мастацкія кантэксты, якія пацвярджаюць гэтую думку: *Скарбы свае нашы людзі на золата нават / Не прамяняюць. Здаўна іх жыццё навучыла: / Нашы лясы – гэта нашых даброт і багацця / Невычарпальны калодзеж…* (М. Гусоўскі. Песня пра зубра); *А Польшча, дый твая Беларусь, да таго часу і жывуць, пакуль ёсць пушчы* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Хведар памалу ішоў цераз знаёмы да кожнага дрэўца лес, і ціхае адчуванне шчасця лілося ў ягоную душу. То быў яго **родны** лес* (В. Быкаў. Аблава).

Прыведзены матэрыял дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1. У мове мастацкай літаратуры адлюстравалася своеасаблівае ўспрыманне часу і прасторы беларускай нацыяй (наяўнасць безэквівалентных адзінак для называння прамежкаў часу, ландшафтных аб’ектаў, адлюстраванне старажытных міфалагізаваных персанажаў, звязаных з порамі года).

2. Для беларускай ментальнасці, паводле ўяўленняў беларускіх мастакоў слова, не характэрна бясконцае верацённае блуканне; стабільны, сталы, ураўнаважаны элемент пераважае ў складзе нацыянальнай псіхікі і мыслення.

3. Уяўленні беларусаў аб прасторы і часе фарміраваліся на працягу многіх стагоддзяў пад уплывам разнастайных фактараў, у тым ліку і прыродна-геаграфічнага. Нашым продкам была ўласцівая моцная прывязанасць да сваёй зямлі, родных мясцін, да лакалізацыі месца пражывання. Пры гэтым беларусы нярэдка супрацьпастаўлялі замілаванне, любоў да роднай старонкі пачуццю няўтульнасці ў іншых краінах. У беларускім менталітэце няма схільнасці да бяскрайніх прастораў, бязмежнага раздолля, што відавочна заўважаецца ў рускіх і ўкраінцаў.

2.3 *Радзіма* як ключавы канцэпт у беларускай хрэстаматыйнай літаратуры

Канцэпт *Радзіма* стаў прыцягваць увагу лінгвістаў у канцы 90-х XX ст., калі набылі актуальнасць праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці і іх адлюстраванне ў мове. Аналізу дадзенага канцэпту прысвечаны працы А. Вяжбіцкай [33; 34], В.М. Тэлія [179], а таксама кола этналінгвістаў пад кіраўніцтвам Е. Бартміньскага ў Польшчы. Е. Бартміньскі вылучае “на ўзроўні агульнай катэгарызацыі тры базавыя вымярэнні радзімы: прасторавае, грамадскае і ідэалагічнае, у якіх ёсць свае ўстойлівыя катэгарызацыі” [13, с. 124].

У рускім мовазнаўстве на матэрыяле педагагічнага дыскурсу дадзены канцэпт разглядаўся ў працах Ж.Б. Есмурзаевай [76] і Я.А. Гімаева [62].

Рэпозиторий ВГУ

У беларускім мовазнаўстве канцэпт *Радзіма* аналізавалі В. Самусевіч [166], А. Калеснікава [87]. У працах названых даследчыкаў аналізуюцца слоўнікавыя дэфініцыі лексем-вербалізатараў канцэпту, прыводзяцца звесткі з фразеалагічнага фонду мовы, фальклорных крыніц і публіцыстычных тэкстаў.

Канцэпт *Радзіма* вербалізуецца ў творах беларускай літаратуры, уключаных у школьную праграму, шматлікімі моўнымі адзінкамі: *Радзіма, Беларусь, Белая Русь, Айчына, наша краіна, родная зямля, родны куток, зямля бацькоў (продкаў), Бацькаўшчына, наша ціхая старонка, маці наша, край, родны край, мілы край наш, старонка, мілы кут маіх дзядоў, родная прадзедава мяжа, родныя куты, межы родныя, Бацькаўшчына-маці, наша родная зямля, мілы край адвечнай мукі* (Я. Колас)*, место, где людзі зародзіліся і ўскормлены* (Ф. Скарына)*, усяго Старонка Родная, Радзіма мая дарагая, родная зямелька, дзяржава, свая зямля, зямля бацькоўская, матчына зямля, Літва, бацькоўскі край, Руская зямля, Русь, родныя мясціны, Забраны край, Занёманшчына, Задзвіншчына, Бярэзінская зямля, Літва-Беларусь, твая і мая радзіма, Белая Русь, мой чароўны беларускі край, Бацькаўшчына светлая мая, куточак родны, мая зямля, мой край, мой рай бульбяна-жытны, зямля, поўная даброшчаў, Палессе, Белавежа*. Як бачым, намінатыўнае поле канцэпту ўключае шматлікія лексічныя адзінкі. Асноўнымі, ядзернымі лексемамі з'яўляюцца найбольш ужывальныя і стылістычна нейтральныя – *Радзіма, Беларусь.*

У сучаснай беларускай літаратурнай мове лексема *Радзіма* мае 2 значэнні: 1)'бацькаўшчына, родная краіна'; 2) 'месца нараджэння, узнікнення, паходжання каго-небудзь' [181, с. 533]. Згодна з дадзенымі "Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы" [197], слова *радзіма* ўтворана ад кораня – род- з дапамогай суфікса -ім-, які мае значэнне прыналежнасці да чаго-небудзь, і першапачаткова абазначала 'род пакаленняў, якія паходзяць ад аднаго продка', 'асноўная арганізацыя першабытна-абшчыннага ладу', 'родзічы, сваякі, радня, сям'я', 'паходжанне, прыналежнасць да пэўнага саслоўя'. Як паказвае семантычны аналіз мовы мастацкай літаратуры, многія старажытныя значэнні слова захаваліся ў літаратуры: сувязь з сям'ёй, радзіма як сукупнасць пакаленняў аднаго народа. "Частотны слоўнік беларускай мовы (Паэзія)" адносіць слова *радзіма* да часта цытаваных (186 словаўжыванняў на 1000 слоў) [128].

У творах розных часоў сустракаюцца шматлікія назвы Радзімы. Самая старажытная з іх – Руская зямля (*Усяслаў – князь людзям суд судзіў, гарадамі князёў надзяляў, а сам поначы ваўком гуляў.* […] *Хоць і вешча душа ў дзёрзкім целе была, але часта бяды нацярпеўся… О! стагнаці Рускай зямлі, успомніўшы быўшу часіну і быўшых князёў!* (Слова пра паход Ігаравы), а таксама Літва, Вялікае Княства Літоўскае: *Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы / Росквітам княства Літоўскага, нашага краю* (М. Гусоўскі. Песня пра зубра); *Але Жыкгімонта первого – солодкая*

Репозиторий ВГУ

память его. Той немцев, як собак, не любил и ляхов з их хитростью велли не любил, а Литву и Русь нашу любительно миловал (Прамова Мялешкі); *Літва! Бацькоўскі край, ты як здароўе тое: / Не цэнім, маючы, а страцім залатое – / Шкада, як і красы твае, мой родны краю. / Тугою па табе тут вобраз свой ствараю* (А. Міцкевіч. Пан Тадэвуш); *– Я маю на ўвазе не Літву-жмудзь, – упарта кусаючы вусны, сказаў юнак. – Я маю на ўвазе Літву-Беларусь… І потым, вы ж добра ведаеце, адкуль выросла тая памылка* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). Мастацкі тэкст – крыніца ведаў пра гісторыю назваў. Так, вядома, што з 1696 г. назва "Беларусь" была пад забаронай: *Вежа: Мы – прыдняпроўцы. А слова гэтае "Белая Русь" – канчаткова састарэлае, вельмі даўняе слова, якога ніхто не помніць. Зараз яно наогул пад забаронай, шмат год нідзе ты яго не сустрэнеш* [пра грамадска-палітычную сітуацыю ў сярэдзіне XIX ст. – *К.П.*] (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Як ужо адзначалася, польскі даследчык Е. Бартміньскі прапануе вылучаць прасторавае вымярэнне канцэпту *Радзіма*. У шматлікіх кантэкстах, дзе вербалізуецца канцэпт *Радзіма*, ідзе гаворка пра рэльеф і геаграфічныя межы Беларусі. На нашу думку, пры апісанні канцэпту Радзіма неабходна ўключыць наступныя ўрыўкі, якія семантызуюць асаблівасці ландшафту Беларусі, яе межаў і прыродных асаблівасцей: *Я аднаго не разумею, – сказаў Лабановіч, любоўна агледзеўшы краявід, – у нас столькі прыгоства, столькі багацця форм і фарбаў, і край наш вялікі і разнастайны, а мы не бачым, не хочам гэтага бачыць. Аб нашым краі злажыўся погляд як аб краі бедным, заняпалым. І нідзе ты ў падручніках геаграфіі не знойдзеш больш-менш сталага апісання Беларусі. Што такое наша Беларусь? А гэта, бачыш, заходняя акраіна Расіі. Чым яна слаўная? Нічым* […] *Выходзячы з гэтага, мы адварочваемся ад свайго роднага, не шануем яго, стыдаемся яго!..* (Я. Колас. У палескай глушы); *"Якая дзіўная краіна! – / Пісала госціца адна: – І да Бабруйска скрозь – раўніна, / І за Бабруйскам – раўніна!.." / ...Дняпро і Нёман, Сож і Прыпяць, / Дзвіна, Бяроза і Вілля – / Спляліся так, што не разблытаць / Іх у душы маёй, зямля! / ...Тваё імя яшчэ прамоўлю / Апошні раз, о краю мой! / Шчаслівы лёс – плаціць любоўю / Табе і жыць – адною ёй!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільна да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак* (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зб. "Дудка беларуская").

Аналіз беларускай літаратуры пры вызначэнні моўных сродкаў выражэння канцэпту *Радзіма* паказаў, што самай распаўсюджанай кагнітыўнай прыметай у разгледжаных намі кантэкстах стаў паняццевы кампанент 'вяртання на Радзіму, імкнення да яе, немагчымага жыцця беларуса без яе' – г.зн. нехарактэрнае беларусам блуканне па свеце, бясконцая міграцыя: *Вось так і мой даўні сябар пакінуў* ***Бацькаўшчыну,*** *і*

Репозиторий ВГУ

васямнаццаць гадоў не ведалі мы, дзе вандраваў ён па свеце. Мы часам верым, што недзе там, далёка, лепшы край і лепшыя людзі. Бог яго ведае, нашы бацькі жылі і тут спакойна, нам жа наканавана іншая доля. Аднак я, дзякуй Богу, пражыў свае маладыя гады ***там, дзе нарадзіўся.*** *Можа, дасць Бог, і косці мае тут спачнуць* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Хто ж з краёў далёкіх не сумуе па* ***сваіх ваколіцах?*** *Там нашыя жаданні і думкі жывуць; туды хацеў бы ляцець я на крылах!* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Так і цяпер вярні ты нас усіх з выгнання! / З'яві свой цуд, каб зноў сустрэцца з* ***родным краем!*** */ Дазволь душы маёй, ахопленай адчаем, / Пераляцець туды, дзе поясам блакіту / Над Нёманам лясныя ўзгоркі апавіты* (А. Міцкевіч. Пан Тадэвуш); *Я не ганю землі чужыя, / Хай іх сонца не абміне, / Толькі дзе за морам ні жыў я, /* ***Беларусь мая*** *снілася мне* (Г. Бураўкін. Я не ганю землі чужыя); *Без* ***радзімы*** *хто хочаш ашалее* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Хведар памалу ішоў цераз знаёмы да кожнага дрэўца лес, і ціхае адчуванне шчасця лілося ў ягоную душу. То быў яго* ***родны*** *лес* […] *"Божа літасцівы, чаму ж я такі нешчаслівы? – звыкла падумалася Хведару, як думалася бадай штодня ўсе пяць гадоў ягоных пакут. – Жывуць людзі, спакойна ходзяць па гэтай зямельцы, і, мусіць, ніхто не ведае, як без яе. А я…" А ён, калісьці гвалтам адарваны ад яе, здаецца, здзічэў ад самоты па ёй, спарахнеў розумам* (В. Быкаў. Аблава); *Мой* ***родны кут,*** *як ты мне мілы!.. / Забыць цябе не маю сілы! / Не раз утомлены дарогай, / Жыццём вясны мае убогай, / К табе ў думках залятаю / І там душою спачуваю* (Я. Колас. Новая зямля); *Хтосьці, начуючы ў кукавіцкай карчме, напісаў у ёй на сцяне, як бы на ўспамін тутэйшым людзям, сваё прозвішча і слова радасці, што варочаецца ў* ***родны кут*** *да блізкіх і родных* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Лепш грызці зямлю ў* ***родным кутку,*** *чым каб цябе ліхім ветрам кідала па чужым свеце* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *О* ***Беларусь! Старонка дарагая,*** */ Мне без цябе – як дрэву без вады… / Хоць непрыкметнай птушкай твайго гаю, – / Абы з табой… Навекі, назаўжды!* (Л. Якубовіч. О Беларусь! Старонка дарагая!); *Каб любіць* ***Беларусь нашу*** *мілую, / Трэба ў розных краях пабываць. / Разумею цяпер, чаму з выраю / Журавлі на Палессе ляцяць* (А. Ставер. Журавлі на Палессе ляцяць); *От навука для тваіх дзяцей. Моцна ж накажы ты ім, дружа, каб не лёталі дарэмна па свеце, не бадзяліся: у сваім* ***родным кутку*** *работы досыць для кожнага* (Я. Колас. Хмаркі); *Далёка я ад* ***межаў родных,*** */ І дзён галодных і халодных / Пражыў нямала. Я гадаю, / Я* ***родны край*** *успамінаю, / Я ім жыву, я ў ім душою / І сэрцам кожнаю парою, / Як той нявольнік прагне волі, / Так прагну я ступіць на ролі / Сваіх палеткаў, ніў благенькіх, / Дарог і сцежачак крывенькіх* (Я. Колас. Новая зямля); *Вобразы мілыя* ***роднага краю,*** */ Смутак і радасць мая! / Што* ***маё сэрца да вас парывае,*** */ Чым так* ***прыкованы я?*** (Я. Колас. Вобразы мілыя).

Репозиторий ВГУ

Неад’емнай часткай гэтага паняццевага кампанента з’яўляецца думка пра Радзіму як месца вечнага спачыну: *Калі не вярнуся на* ***Бацькаўшчыну*** *і памру недзе самотны на вяршыні гары ў чужым краі, крукі занясуць туды мае косці* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *О, памерці тут, знайсці вечны прыстанак у* ***родным кутку*** *было б найвялікшым шчасцем, пра якое ён не адважваўся і марыць* (В. Быкаў. Аблава); *То былі* ***тутэйшыя могілкі*** *з усёй ягонай раднёй, старымі, дзядамі і прадзедамі – усім ягоным родам* […] *Зайздросная ўсё ж доля, падумаў Хведар: навек разам з усімі, у* ***сваім кутку*** (В. Быкаў. Аблава); *Я* ***тут*** *нарадзіўся і тут спадзяюся памерці* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Яшчэ прапрадзедаў вадзіла / Дарожка бітая туды, / Каб разумелі, што* ***радзіма*** *– / Не толькі дом, а і клады* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *А хоць дасць мне доля ў дамавіне месца, – / Устане цень з зямлі мой, на крыж абапрэцца. / І ў той бок глядзеці будзе век нязводна, / Дзе ляжаць* ***загоны Беларусі роднай*** (Я. Купала. Я ад вас далёка); *Хоць прымае іх гэта зямля, як сыноў сваіх, шчыра, / Але просяць іх вочы хоць жменьку палескага жвіра. / Толькі дзе яго ўзяць? / Як яны* ***Беларусь*** *пакідалі, / У дарогу з сабою / Мяшэчку з зямлёю / Не бралі. / Што ім жменька зямлі той? / Ты ўся ім патрэбна, радзіма, / А ў дарожным мяшочку ўмясціць цябе ўсю немагчыма* (А. Куляшоў. Над брацкай магілай). У апошнім кантэксце знаходзім звесткі пра захоўванне ў мяшэчку роднай зямлі, які звычайна бралі з сабой, накіроўваючыся ў далёкі шлях. У гэтым бачыцца моцны культ роднай зямлі.

На падставе гэтага можна сцвярджаць, што Радзіма для беларуса – найвялікшая каштоўнасць, для нашай нацыі не характэрна бясконцая міграцыя па свеце. І разам з тым *чужына* (гэтае паняцце вербалізуецца праз моўныя адзінкі *чужына*, *чужая прастора*, *чужы свет*) як супрацьлеглае паняцце “Радзімы” часта паказваецца з негатыўнай канатацыяй: *Далёкая старонка без ветру сушыць* (В. Казько. Неруш); *На чужой зямлі без каранёў і палын не расце* (В. Казько. Неруш); *Я не ганю землі чужыя – / Хай іх сонца не абміне. / Толькі дзе б за морам ні жыў я, / Беларусь мая снілася мне* (Г. Бураўкін. Я не ганю землі чужыя); *Лепш грызці зямлю ў родным кутку, чым каб цябе ліхім ветрам кідала па чужым свеце* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

Канцэпт *Радзіма* мае такі паняццевы кампанент, як ‘фактар, што аб’ядноўвае людзей, надае самабытнасць’, якую вельмі важна захаваць беларусам: *Мы з вамі, маладыя сябры, людзі розных эпох* […]. *Але ў нас з вамі ёсць адна такая* ***рэч, якую нельга адабраць ні ад вас, ні ад мяне. Гэта наша Радзіма.*** *Беражыце яе чэсць, нясіце яе славу наперад* (І. Навуменка. Настаўнік чарчэння); *Борам стаў стогалосы за вёскай маленькі лясок. / Ён у кожнага свой, ды адна для ўсіх нас – Радзіма* (Я. Крупенька. Ёсць у кожнага з нас маленства куток); *Шалеюць скрызнякі эпох. / Я чую, як* ***Айчына кліча*** */ На раздарожжы ўсіх дарог /* ***Не разгубіць свайго аблічча*** (А. Грачанікаў. Дрымотна ціснуцца кусты); *І Мацвей*

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

упершыню за час іх сустрэчы пашкадаваў былых сваіх землякоў, шчыра паспачуваў ім, ***як лёгка страціць радзіму, тое, што завецца роднай зямлёй, родным кутам, як хутка рвецца пупавіна, якой чалавек павязаны са сваёй зямлёй,*** *і чым жа гэта яна потым падмяняецца – жменькаю п'яных слёз, слінаю старэчай бяззубай гаворкі, наборам забытых слоў, вымаўленых з французскім пранонсам* (В. Казько. Неруш). Гэтая кагнітыўная прымета разгортвае антрапалагічны накірунак раскрыцця зместу канцэпту *Радзіма*.

У кантэксце вышэйсказанага варта вызначыць тэксты-запаветы, звернутыя да нашчадкаў, у якіх гучыць думка аб захаванні памяці пра Бацькаўшчыну, пра служэнне на карысць яе: *Сваю Айчыну ўбач і зразумей, / І ў ёй сябе ты зразумееш потым. / Сваёй Айчыны яснае імя, / Нібы ўласнае – / Не дай заплямiць* (Л. Тарасюк. Імя Айчыны); *Са сваёй Радзімай ты – / Назаўжды адно і тое ж; / І малой неправаты / Ад яе ты не прытоіш. / Нібы маці, берагчы / Працаўніцу нашу – мову, / Бо яна жыцця зачын / І пачатак песні новай* (Я. Сіпакоў. Зразумець, што…).

Як заўважалася вышэй, у мове мастацкага тэксту адлюстроўваецца канцэптуальная карціна свету народа. Так, у прааналізаваных намі творах ёсць звесткі пра паходжанне назвы Беларусь, якія можна лічыць не столькі навуковай інфармацыяй, колькі адбіткам "наіўнай" карціны свету беларусаў: *Спрадвеку, як наша зямелька з Літвой злучылася, як і з Польшчай з'ядналася дабравольная, дык усе яе "Беларуссяй" звалі, і недарма ж гэта! Не вялікая, не малая, не чырвоная, не чорная яна была, а белая, чыстая: нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася* (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зб. "Дудка беларуская"). У. Караткевіч прыводзіць легенду, паводле якой Стары чалавек выратаваў палонных беларусаў, якія, прайшоўшы праз ягоны скіт, пераўтварыліся ў лебядзей і вярнуліся ў родныя мясціны: *Прызыўна трубілі лебедзі, кружлялі, падалі на ваду, і ў крыках іх гучала радасць. Кажуць, з таго часу Белая Русь і празываецца "белай". Ад лебядзінага апярэння стала белай вопратка ў яе людзей. А кажуць і другое: быццам таму яна "белая", што пад татарамі не пабыла. Можа, й так. А калі мне веры не даяце – адшукайце самі ля Галошаўскага возера мясцовасць Лебядзіны Скіт. Мо тады ўпэўніцеся, як калісьці мой сусед, са слоў якога я й апавядаю вам гэта* (У. Караткевіч. Лебядзіны скіт). У нарысе "Зямля пад белымі крыламі" пісьменнік прыводзіць легенду, якая таксама сустракаецца ў яго рамане "Каласы пад сярпом тваім". У легендзе апавядаецца, як Бог дзяліў землі між народамі і надзяліў беларусаў землямі з незлічоным багаццем, і для раўнавагі вырашыў: *"...а каб не занадта вы перад маім раем ганарыліся – дам я вам найгоршае ва ўсім свеце начальства"* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі). Па методыцы І.А. Сцерніна, дадзеныя кантэксты можна ўключыць у міфалагічную зону, што, у сваю чаргу, уваходзіць у інтэрпрэтацыйнае поле канцэпту.

Репозиторий ВГУ

Частотнымі ў мове мастацкай літаратуры з’яўляюцца кантэксты з апісаннем багацця і казачнасці прыроды Беларусі: *Мне смешна чуць пра нейчы рай: / Для ўсіх і кожнага – на свеце / **Найпрыгажэйшы** родны край! / Для нас – прыроды болей **мілай,** / Чым беларуская, няма. / Яна ж усіх нас надзяліла / Душой такою, як сама!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *А Польшча, дый твая Беларусь, да таго часу і жывуць, пакуль ёсць пушчы. Не будзе дрэў – і іх не будзе* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Перад вачыма падлеткаў, нібы невядомы, уставаў іх родны край. Бясконцыя імшары, пушчы, закінутыя старажытныя гарадкі на балотных астравах… Той змрочны, лясны, тужлівы, але самы родны свет, дзе яны нарадзіліся* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Разумею цяпер, чаму з выраю / Жураўлі на Палессе ляцяць. / Што ім тыя пагоды паўднёвыя! / Што ім пышны платанавы рай, / Калі клічуць іх далі сасновыя / І азёрны рабінавы край!* (А. Ставер. Жураўлі на Палессе ляцяць); *Вы, мшары й пушчы, знікнеце, як марны сон! / Звядзецца звычай продкавы, стары закон, / І ўсё, што слушна да мінуўшчыны належыць / Памрэ павольным сконам зубра ў Белавежы* (Я. Лучына. Паляўнічыя акварэлькі з Палесся). Такім чынам, прырода Беларусі мае вызначальнае значэнне: яе можна лічыць “візітнай карткай” краіны. Значны ўплыў на “афармленне” беларускай ментальнасці заўжды аказвала спецыфіка прыроды Беларусі з яе разнастайнасцю ландшафтаў, кліматычных зон, з даволі багатай флорай і фаўнай. Прыгажосць беларускай прыроды выпрацоўвала ў беларусаў эстэтычнае пачуццё, уменне адчуваць і бачыць харство навакольнага асяроддзя.

Між тым, у творах беларускіх пісьменнікаў супярэчліва вербалізуецца канцэпт *Радзіма*. З аднаго боку, паказваецца веліч і багацце Беларусі, прыгажосць і казачнасць: *Ці разумееце, што мы кахалі, / Што зніклі так, як знікнеце і вы, / Што векавечны толькі край, і далеч, / І жоўты ліст на зелені травы, / Што ў векавечнай Бацькаўшчыны клёны / Тысячагоддзі будуць аблятаць* (У. Караткевіч. У векавечнай Бацькаўшчыне клёны); *Абрусам сонечным, / Як радасць, / Сяброў заўсёды сустракала. / Ніколі нелюдзям спагады / У грознай бітве не давала. / Дарогі іншай не згадаю – заручана са шчаснай доляй* (В. Лукша. Дарагая мая Беларусь); *“На Беларусі Бог жыве” – / Так кажа мой просты народ … / А няма нідзе / Вярнейшых сяброў / І прыгажэйшых жанчын. / Гэта край раскрытых душ і дзвярэй...* (У. Караткевіч. На Беларусі Бог жыве); *Мой чароўны беларускі край, / Бацькаўшчына светлая мая* (У. Караткевіч. Бацькаўшчына); *“Божа, – падумаў Гораў, – нават рэкі цякуць малаком. І на гэткай зямлі, поўнай даброшчаў, паміраць?* (У. Караткевіч. Паром на бурнай рацэ); *У промнях вясновых, у барвах зялёных / Ты мне з’яўляешся казкай бясконцай* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня). Гэты паняццевы кампанент аб’ектывуецца шматлікімі моўнымі сродкамі: прыметнікамі ***(векавечная, светлая Бацькаўшчына),*** параўнальнымі зваротамі ***(як радасць),*** эпітэтамі

Репозиторий ВГУ

(заручана са шчаснай доляй), метафарамі ***(тут рэкі цякуць малаком, гэта край раскрытых душ і дзвярэй),*** і парэміямі ***(на Беларусі Бог жыве).***

З другога боку, гэты канцэпт рэпрэзентуецца ў кантэкстах, у якіх ідзе гаворка пра галечу, гора, пакуты (моўныя адзінкі, якія ствараюць дадзены паняццевы кампанент, выдзелены ў тэксце): *Цяжкі ты, хлеб наш надзённы, у промысле цяжкім – / Бачыце самі, аднак жа і* ***гора радзімы*** */ Нават цяжэйшае. Дзе нам знайсці тыя лекі, / Каб ратаваць яе ў бедах, – і самі не знаем* (М. Гусоўскі. Песня пра зубра); *Там я вырас, узгадаваўся, / Дзе спрадвеку заснаваўся / І* ***бруіць дрыготна / Жаль вялікі і пакута. / Дзе пануе гора люта / І нуда разліта…*** */ А як песню заспяваю / Аб знішчоным гэтым краі / Я не волен над сабою: Спеў мяшаецца з слязою* (Я. Колас. Роднаму краю); *О родны край! О* ***край пакуты, / Нягодай цяжкаю прыгнуты!*** */ Калі ж ты збудзеш тое гора, / Што і цяпер там, як і ўчора, / Як і даўней, цябе знішчае / І горкім смуткам авявае?* (Я. Колас. Новая зямля); *І зараслі не палынамі, / Не крапівой, не драсянамі, / Не чаратом, не лебядою, – / А* ***беларускаю бядою.*** */ Ды покі будзе сэрца біцца, / Яно не зможа пагадзіцца / Ні* ***з гэтым гвалтам, ні з бядою*** */ Над нашай роднаю зямлёю… / Эх,* ***мілы край адвечнай мукі!*** */ Праклятыя будзьце, вусны, рукі, / Што* ***на цябе ланцуг кавалі / І ў твар зняважліва плявалі*** (Я. Колас. Новая зямля); *Бачыў я цырымонію з заломам, крапіўныя святкі, гульню ў забытага нават тады "яшчура". Але найбольш бачыў я апошнюю бульбу ў месе,* ***чорны, як зямля, хлеб,*** *соннае "а-а-а" над калыскай, вялікія выплаканыя вочы жанчын. Гэта была візантыйская Беларусь!* (У. Караткевіч. Дзікае паляванне караля Стаха).

Нярэдка супярэчлівасць рэпрэзентацыі канцэпту *Радзіма* прысутнічае ў адным кантэксце: *О, край родны, край прыгожы! / Мілы кут маіх дзядоў! / Што мілей у свеце божым / Гэтых светлых берагоў, / Дзе бруяцца срэбрам рэчкі, / Дзе бары-лясы гудуць, / Дзе мядамі пахнуць грэчкі, / Нівы гутаркі вядуць* […] */ Край мой родны! Дзе ж у свеце / Край другі такі знайсці, / Дзе б магла так,* ***поруч з смеццем, / Гожасць пышная ўзрасці? / Дзе бы вобруку з галечай / Расквітнеў багацтва цуд /*** *І дзе б з долі чалавечай / Насмяяліся, як тут..?* (Я. Колас. Сымон-музыка); *Увесь стаіш перад вачыма, / Ты* ***міл і смуцен, як радзіма,*** */ Як наша ціхая старонка* (Я. Колас. Новая зямля).

Адзначым уплыў індывідуальна-аўтарскай карціны свету на мастацкую. Так, напрыклад, у свядомасці У. Караткевіча Беларусь – казачны багаты край, а ў Якуба Коласа – край бедны, занядбаны (пра што сведчыць большасць кантэкстаў у абодвух мастакоў слова). На нашу думку, гэта можна патлумачыць найперш індывідуальным светаўспрыманнем кожнага аўтара, гістарычнымі ўмовамі жыцця пісьменнікаў.

Нягледзячы на вызначаныя вышэй кантэксты пра гора і галечу Радзімы, ацэначны кампанент дадзенага канцэпту ў канцэптуальнай

Репозиторий ВГУ

карціне свету беларускіх пісьменнікаў вызначаецца як станоўчы. Радзіма заўсёды ацэньваецца як каштоўнасць для чалавека. Расійскі даследчык С.Р. Варкачоў называе канцэпты *Радзіма* і *народ* тэлеаномнымі, г.зн. такімі, якія адлюстроўваюць каштоўнасці, для абароны якіх чалавек гатовы ахвяраваць уласным жыццём [59, с. 4]. Вытрымкі з мастацкіх тэкстаў яскрава пацвярджаюць гэтую думку: *Маліся ж, бабулька, да Бога… / Каб* ***за край быў умёрці гатоў,*** */ Каб не прагнуў айчызны чужых* (Ф. Багушэвіч. Ахвяра); ***За лепшу долю роднага краю,*** */ За сваіх брацціяў у святой барацьбе – / Гэтакай толькі* ***смерці жадаю,*** */ Памяткі гэткай чакаю сабе* (Я. Купала. З кутка жаданняў); *Маці родная, Маці-Краіна! / Не ўсцішыцца гэтакі боль… / Ты прабач, Ты прымі свайго сына, /* ***За цябе яму ўмерці дазволь!...*** (М. Багдановіч. Пагоня); *Быў. Ёсць. Буду.* […] */ За ўсіх, хто крывёю піша / Ў нязгодзе / З рабства подлай дарогай, / Хто за Край Свой Родны, за ўсе Народы /* ***Паўстане нават на Бога*** (У. Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду); *Калі хоць адзін чалавек астаўся на роднай зямлі – яна не загіне.* (У. Караткевіч. Лебядзіны скіт); *Радзіму нашу любім і абараняць яе павінны – значылі ўрачыстыя лацінскія словы* (І. Навуменка. Настаўнік чарчэння); *А жыццё яе цяпер патрэбна не толькі ёй і маленькай Светцы. Усведамленне сваёй патрэбнасці людзям – ды якім людзям! – Радзіме (некалі туманнае для яе разуменне Радзімы цяпер пашырылася і разам з тым зрабілася вельмі канкрэтным, як самае блізкае дарагое, увайшло ў розум, у сэрца…* (І. Шамякін. Гандлярка і паэт); *О край родны! Я прашу: / Ратуючыся ад пустазелля, / Я сам расцераблю душу, / А ты мне дай свайго насення, / Каб мог я так сумленна жыць, / Каб і мяне ў ліхую невідзь, / Ніхто не мог закабаліць, / Ніхто не мог ачужаземіць* (А. Грачанікаў. Дрымотна ціснуцца кусты).

Даволі часта беларускія мастакі слова ў сваіх творах выказваюць пажаданне росквіту сваёй Радзіме. Нярэдка, пад уплывам моцнай хрысціянскай традыцыі, яно мае форму малітвы: *Радзіма мая дарагая, / Ты ў шчасці жаданым жыві / Я сэрцам табе прысягаю / У шчырай сыноўняй любві* (А. Бачыла. Радзіма мая дарагая); *Божа, / Адвядзі ад Беларусі / Здраду, / Вераломства / І вайну. / Смутнаю парою нелюдзімай, / Калі ўсё наўкол ідзе на злом, / Божа, / Захіні маю Радзіму / Мудрасцю, / Спакоем, / І цяплом!* (Г. Бураўкін. Малітва); *Я буду маліцца і сэрцам, і думамі, / Распятаю буду маліцца душой, / Каб чорныя долі з мяцеліцай шумамі / Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй* (Я. Купала. Мая малітва); *Ды зверне на ікону найсвятую, / Спашлі святло ты зямлі беларускай* (С. Полацкі. Зварот да найпадобнай маці Еўфрасінні).

Залежнае становішча нашых зямель, шматлікія войны выклікалі ў беларусаў імкненне да вызвалення Бацькаўшчыны ад прыгнёту, ад чужынцаў, што адлюстравалася ў наступных кантэкстах: *Ты чым жа ёсць, Палессе, ціхі, грушны край, / З адменаю тваёй, куды ні завітай, / Дзе дзікая краса прыроды ад зачаткаў, / Дзе памяткі князёў, тых Рурыка нашчадкаў, /*

Репозиторий ВГУ

Што ў стэп на полаўцаў збіралі вояў раць, / На дзіду тураў колісь мелі браць? / Ты ёсць аблога, нечапаная ніколі (Я. Лучына. Паляўнічыя акварэлькі з Палесся); *Фінляндыя гэтаксама ляжала паміж двума дужымі гасударствамі, як і наша Беларусь.* […] *Фінаў, як і нас, то адзін сільны сусед браў у свае жалезныя рукі, то другі* (Цётка. Успаміны з паездкі ў Фінляндыю); *М у л ь ц і к. Святым хлебам святую зямлю сваю баранілі ад чужынцаў* (А. Дудараў. Вечар); *Мы здалёку ўбачылі свабоду / І яшчэ не вырваліся з пут… / Божа, не дабаў майму народу / Пошасці, / Няпраўды / І пакут* (Г. Бураўкін. Малітва); *Бо што зробіш, калі воля і радзіма жывуць толькі крывёю, талентам, мозгам, барацьбою, смерцю сыноў?* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Гэты край – / Твой дом і сабор… / У нас дваццаць з лішнім тысяч рэк, / Адзінаццаць тысяч азёр. / Нам ёсць што піць, / З падмосткаў ліць, / Чым палі свае акрапіць, / А як давядзе, то ёсць нам дзе / І ворага ўтапіць* (У. Караткевіч. На Беларусі Бог жыве). З прыведзеных кантэкстаў можна вылучыць паняццевы кампанент ‘вызваленне Бацькаўшчыны ад прыгнёту, чужынцаў’ які выяўляецца праз наступныя вобразна-выяўленчыя сродкі: ***воля і радзіма жывуць толькі… барацьбою сыноў; мы яшчэ не вырваліся з пут; мы здалёку ўбачылі свабоду; як і нас, то адзін сільны сусед браў у свае жалезныя рукі, то другі.***

Іншыя гістарычныя факты адлюстраваліся ў мове хрэстаматыйнай літаратуры. Так, К. Чорны пра апісанні дарогі ўскосна згадвае падзел Беларусі на Усходнюю і Заходнюю ў 1920–1939: *Гэтая дарога, няроўная, выкручастая і больш ціхая, чым людная, канчаецца недзе паміж Нясвіжам і Клецкам, праходзіць праз Цапру і Балвань і такім парадкам злучае і дзве разлегласці нашай Бацькаўшчыны, у кожнай з якіх наша гісторыя запісана па-свойму і своеасабліва* (К. Чорны. Пошукі будучыні). Шматлікія творы пра будаўніцтва камунізму пасля рэвалюцыі 1917 г. не атрымалі шырокага прадстаўлення ў сучаснай хрэстаматыйнай літаратуры, бо страцілі сваю надзённасць. Прыклад такога верша – “О Беларусь, лясная ружа” У. Дубоўкі: *О Беларусь, лясная ружа, / зялёны ліст, чырвоны цвет! / Да камунізма крокам мужным / Ты пракладаеш вечна след.*

Разглядаючы канцэпт *Радзіма* ў дыяхранічным аспекце, важна адзначыць, што нацыянальнае адраджэнне ў пачатку XX ст. акцэнтуалізуе гэты канцэпт ў беларускай літаратуры. У шматлікіх творах гучаць заклікі да аднаўлення Беларусі, незалежнага шляху ў будучыню: *Устань ты, старонка, родная маці! / Годзе зімовага рабскага сну, / Годзе табе ўжо слёзна ўздыхаці, – / Выйдзі на поле, на сенажаці, / Выйдзі спаткаці вясну! / Скінь лахманы, што доўгія векі / Ты валачыла з кастры, з палыну; / Выйдзі з-пад дзікай зімняй апекі, / Што над табою строіла здзекі, – / Выйдзі спаткаці вясну! / …Сплецену з церняў маеш карону, / Хорам твой – неба і нівы краса, / Царства ў чатыры дрэмле староны, / Слугі – мазольных рук мільёны* (Я. Купала. Выйдзі); *Развёўся злосці змей паганы, / На брата брата падбівае; / Расой чырвонаю паляны / Блішчаць, як тая кроў жывая*

Репозиторий ВГУ

[…] */ Ані канца таму праклянцю, / Ані яснотаў тых пачатку… / Калі ж ты, Бацькаўшчына-маці, / Устанеш к новаму парадку* (Я. Купала. Крыўда); *Жыві ж, наш край! Няхай надзея / Гарыць у сэрцы і мацнее, / Што хоць не мы, дык нашы дзеці / Убачаць цэльным цябе ў свеце* (Я. Колас. Новая зямля); *Годзе ў поле, ў лясах ты, старонка, і так / Сіратой начавала забытаю, / Годзе выпіў крыві з сэрца крыўды чарвяк, / Косці вецер тачыў непакрытыя. / Падымайся з нізін, сакаліна сям'я, / Над крыжамі бацькоў, над нягодамі; / Занімай, Беларусь маладая мая, / Свой пачэсны пасад між народамі!..* (Я. Купала. Маладая Беларусь). Заклік да адраджэння вербалізуецца дзеясловамі загаднага ладу (***устань, выйдзі*** *спаткаці вясну,* ***жыві, занімай*** *свой пачэсны пасад між народамі*), а таксама лексічнай адзінкай ***годзе*** са значэннем 'хопіць, даволі' [182, с. 153].

Варта адзначыць названыя аўтарамі сімвалы Радзімы, або прэцэдэнтныя імёны. Прэцэдэнтныя імёны – гэта шырока вядомыя ўласныя імёны, якія выкарыстоўваюцца ў тэксце не толькі для абазначэння канкрэтнага чалавека (горада, аб'екта прыроды, сітуацыі), колькі ў якасці культурнага знаку, сімвала. Да іх адносяцца культавыя збудаванні, найбуйнейшыя прыродныя аб'екты, знакамітыя асобы, жывёлы або птушкі, расліны і інш.: *Да пэўнай ступені* ***бусел*** *– сімвал Беларусі* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі); *Рабіў ён* [продак. – *К.П.*] *зрубы залатыя, / Нарогі, гонкія чаўны / І сцены белыя* ***Сафіі*** */ Над плынню быстраю* ***Дзвіны*** (Е. Лось. Продкі); *Зямля Беларусі! Вачамі азёраў / Глядзіш ты ў празрыстыя высі нябёс… / Былога быліны, старога паданні / Плывуць, як аблітыя сонцам чаўны, / Па краю зялёным, прасторах бяскрайніх / Ад* ***Нёмна*** *да* ***Сожа,*** *ад* ***Буга*** *да* ***Гайны,*** */ Па хвалях* ***Дняпра*** *і шырокай* ***Дзвіны****. / Бацькоў нашых слава на іх узбярэжжах, / Гамоняць пра гэта* ***бары****-байкары, / Гамоняць пра гэта і* ***Полацка*** *вежы, / І* ***Турава*** *сцены, і шум* ***Белавежы,*** */ І роднага* ***Мінска*** *сівыя муры* (П. Броўка. Зямля Беларусі); *Дзе мой край? Там дзе вечную песню пяе* ***Белавежа,*** */ Там, дзе* ***Нёман*** *на захадзе помніць варожую кроў, / Дзе на ўзвышшах* ***Навагрудскіх*** *дрэмлюць суровыя вежы / І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі* ***Дняпро.*** */ Ты ляжыш там, дзе* ***Прыпяць*** *ласкава віецца, / Дзе* ***Сафія*** *плыве над* ***Дзвіною****, нібы карабель* (У. Караткевіч. Беларуская песня); *Так карцела – сляза закіпала, – / Каб да сэрца хаця б здалёк / Праплывалі* ***жалейка Купалы, / Багдановічаў васілёк****… / Гэта ўсё, безумоўна, не нова. / А ці трэба, каб новым было /* ***Поле бацькава, матчына мова*** */ І над хатай* ***буслова жытло?*** (Г. Бураўкін. Я не ганю землі чужыя); *Без Волечкі і без* ***шыпшыны*** *няма для мяне і роднай бацькаўшчыны* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Ён* [Гервасій Выліваха. – *К.П.*] *пашукаў чагосьці вачыма і знайшоў гэта: першую кветку шыпшыны. Адламаў яе і прышпіліў да грудзей* […] *– Нашто ты яе зламаў? / – Гэта – мая зямля. І яна застанецца са мною, пакуль ты не адсячэш у апраметнай маёй галавы* (У. Караткевіч. Ладдзя роспачы); *Зорка Радзімы і зорка маёй адзіноты /*

Репозиторий ВГУ

ззяе ***палярная зорка*** *на ўскрайку нябёс* (Д. Бічэль-Загнетава. Вусцішна раптам…); *У вёсцы, якой яны зараз ехалі, некалі настаўнічаў не то* ***Купала,*** *не то* ***Колас,*** *Мацвей блытаў іх яшчэ са школы, яны зліліся яму як бы ў адзін твар, твар чалавека, які стаў увасабленнем яго роднай зямлі* (В. Казько. Неруш); *Ад родных ніў, ад роднай хаты / У панскі двор дзеля красы / Яны, бяздольныя, ўзяты / Ткаць залатыя паясы* […] */ І тчэ, забыўшыся, рука, / Заміж персідскага узору /* ***Цвяток радзімы васілька*** (М. Багдановіч. Слуцкія ткачыхі).

Тэрмін “прэцэдэнтныя імёны” ўзнік у мовазнаўстве пасля выхаду манаграфіі Ю.М. Каравулава “Руская мова і моўная асоба” [97], які ўвёў у навуковы ўжытак тэрмін “прэцэдэнтнасць”. Прэцэдэнтныя тэксты вызначаны ім як тэксты, “значныя для той іншай асобы ў пазнавальных і эмацыянальных адносінах, добра вядомыя шырокаму асяроддзю дадзенай асобы, уключаючы яе папярэднікаў і сучаснікаў, і такія, зварот да якіх узнаўляецца неаднаразова ў дыскурсе дадзенай моўнай асобы” [97, с. 216]. Прэцэдэнтныя тэксты Ю.М. Каравулаў характарызаваў праз тэрмін “хрэстаматыйнасць”, які распаўсюджваецца на мастацкія тэксты вядомых класікаў літаратуры, уключаныя ў агульнаадукацыйны курс літаратуры, а таксама на анекдоты, цытаты знакамітых людзей і г.д. Вынікам хрэстаматыйнасці і агульнавядомасці прэцэдэнтных тэкстаў з’яўляецца іх рэінтэрпрэтуемасць. Так, намі выяўлены тэксты-рэпрэзентанты канцэпту *Радзіма*, якія прыводзяцца ў тэкстах пісьменнікаў пазнейшага часу (XX ст.): *– Каго любіш? – Люблю Беларусь. – То ўзаемна!* (Пароль паўстанцаў 1863 г.) эпіграф да балады (Я. Сіпакоў. Шыбеніца); *Скарына (прыхінае да сябе Маргарыту) “Понеже от прирождения звери, ходящие в пустыни, знаютъ ямы свая; птицы, летающие по возъдуху, ведаютъ гнезда свая, рибы, плавающие по морю и в реках, чуютъ виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, – тако ж и люди, и где зародилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають”* (А. Петрашкевіч. Напісанае застаецца).

Нягледзячы на існаванне моўнай адзінкі *Бацькаўшчына* (радзіма – значыць зямля бацькоў (продкаў) або бацькі), у мастацкіх тэкстах Радзіма найчасцей параўноўваецца менавіта з маці (хоць у беларускай мове і няма лексічнай адзінкі кшталту motherland (англ.) – ‘зямля маці’): *Чаму ж чалавек заўсёды сумуе па сваёй роднай зямлі, як дзіця па маці?* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Мой край, мой рай бульбяны-жытны! / Зеленадолы, залаты! / Як спеў матулі – старажытны, / Як песня любай – малады!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *Беларусь, я твой воін адданы і сын, / Мае думкі і сэрца заўсёды з табою. / Ты мяне гадавала, ты мяне калыхала, / Ты мне песні, як родная маці, спявала, / Клапатліва збірала ў шлях* (П. Панчанка. Беларусі); *Я шчаслівы ад думкі: і ў мяне гэтаксама ёсць радзіма свая, свой народ, свая мама* (Я. Сіпакоў. У гасцях); *Зямля! Маці наша! Чуецца заўсёды і ўсюды тваё цёплае, жыватворнае дыханне,*

Репозиторий ВГУ

каторае мёдам па жылах разліваецца …І хто каранямі сваімі глыбей у зямлю стараецца ўлезці, у таго галава чуць не да самага сонейка даходзіць, у таго шчасце ракой-морам расшыраецца (З. Бядуля. Зямля). Параўнанні ***(сумуе па роднай зямлі, як дзіця па маці; мой край, як спеў матулі; ты*** [Радзіма. – *К.П.*] ***мне песні, як родная маці спявала),*** звароткі ***(Беларусь, я твой адданы сын; Зямля! Маці наша!)*** і інш. моўныя сродкі выразнасці вербалізуюць паняццевы кампанент ‘сувязь Радзімы і маці’.

Трэба адзначыць, што “сямейная” метафара вельмі актыўна выкарыстоўваецца пры вербалізацыі канцэпту ‘*Радзіма’*: *Цяжкі, як стопудовы камень, смутак наваліўся на яго. Родныя мясціны на Вілейшчыне, куды яму прарочыў вярнуцца стары фельчар, звязваліся ў яго ўяўленнях з бацькам. Як жа ён вернецца туды, калі ўжо бацькі няма? А калі і вернецца, то цяпер гэта ўжо не тое будзе* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Божа мой, я ж, пакутуючы душой у той праклятай Нямеччыне, толькі і думаў, што пра Волечку* [дачку. – *К.П.*] *і пра тую шыпшыну. Без Волечкі і без шыпшыны няма для мяне і роднай бацькаўшчыны* (К. Чорны. Пошукі будучыні).

У некаторых кантэкстах канцэпт *Радзіма* выступае сувязным звяном у ланцужку паняццяў “сям’я – народ – Радзіма – чалавецтва”: *Няма Радзімы ў злыдняў хіжых / І Маці ў нелюдзяў – няма. / Мы – тройчы дзеці ў вечным крузе: / Мы – дзеці роднае сям’і, / І – дзеці Маці-Беларусі, / І – дзеці Матухны-Зямлі. / Трайны ён круг, ды недзялімы: Бо сёння – як ні паглядзім – / А лёс Дзяцей, і лёс Радзімы, / І лёс Планеты – лёс адзін* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *Каліноўскі: А так. Звычайна ў людзей так. Першае – гэта я, другое – сям’я, родны дом, трэцяе – родны горад, чацвёртае – родная краіна, пятае – родная зямля, роднае Чалавецтва. І кожны любіць сам сябе, амаль усе – сям’ю, большасць – родны горад, частка – радзіму. І толькі адзінкі любяць чалавецтва* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Варта назваць і іншыя сродкі рэпрэзентацыі канцэпту ‘*Радзіма’*. Акрамя прыроды, знакамітых землякоў, гэта, безумоўна, родная хата, дом: *У сталіцы раскашаюць. Знаць, і ім вядома, / Што дому лепшага няма нідзе, як* ***дома*** (А. Міцкевіч. Пан Тадэвуш); *Трэба* ***дома*** *бываць часцей, / Трэба дома бываць не госцем, / Каб душою не ачарсцвець, / Каб не страціць святое штосьці* (Р. Барадулін. Трэба дома бываць часцей); *Добры вечар,* ***цёплая хатка – / Родная матка!*** */ Не пытаецца, ці злянілася, / Ці многа нажала. / Ды пытаецца, ці змарылася, / Што спазнілася* (Добра жаць – шырокая ніўка); ***Хату матчыну*** *помню – заўсёды стаіць прад вачыма. / Чую клёкат буслiны, пад акном – ціхі шэпат бяроз, / Ты такой перад мной паўстаеш, дарагая* ***Радзіма*** (Я. Крупенька. Ёсць у кожнага з нас незабыўны маленства куток). Такім чынам, хата, дом – важны прасторавы складнік канцэпту ‘*Радзіма’*.

Даволі часта Радзіма звязана з парой дзяцінства, застаецца ва ўспамінах на ўсё жыццё: *Што да мяне, то сваё паляванне і ловы /*

Репозиторий ВГУ

*Адпаляваў я. Адзіная ўцеха ў самоце – / **Жыць успамінамі. Думкай ляціш** быстракрылай / Ноччу і днём **на радзіму,** у памяці сеці, / Вабіш той час незабыўны, што некалі ў нетрах / Родных лясоў разгубіўся, і кліч – не даклічаш* (М. Гусоўскі. Песня пра зубра); *Безліч выпадкаў, прыгод і жывых успамінаў / Хваляй нахлынуць, палоняць душу – здаецца: / Зноў ты **вярнуўся ў той край, дзе пачатак пачаткаў / Сэнсу жыцця і пачуцця святога – радзіма*** (М. Гусоўскі. Песня пра зубра); *А чым яшчэ, акрамя гэтага дзяцінства і памяці, павязала яго з сабою родная зямля і што такое – родная зямля? **Няўжо толькі ў дзяцінстве ёсць родная зямля,** калі ты на ёй, як каля грудзей маці, і калі табе яшчэ нічога не трэба, акрамя гэтага малака маці, дыхання і святла, і ты ўпэўнены, што маці ў цябе вечная і неба над галавою таксама вечнае і непарушнае* (В. Казько. Неруш); *Што добра чалавеку, калі ў **яго куточак родны на зямлі ёсць, дзе некалі босым па расе бегаў*** (А. Дудараў. Вечар); *Кожны з нас **прыпасае Радзімы куток, / Каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны** / Дым над хатай, снапамі прыціснуты ток, / Матчын спеў і гароды, прапахлыя кмінам* (П. Панчанка. Кожны з нас…).

У кантэксце вышэйсказанага зазначым, што ў мастацкіх тэкстах Радзіма часцей паўстае як родная хата, сям'я, прырода, а не дзяржаўнае ўтварэнне. Намі вызначана толькі два кантэксты, дзе ідзе гаворка пра Айчыну як дзяржаву і якія адносяцца да XVI ст.: *Я ж вашым княскім мосцям, як прыгадвалася, гэты першародны плод на гэтай мове ахвяраваў для таго, каб Айчына і Рэч Паспалітая ад вашых мосцяў блаславённай надзеі чакаць магла* (С. Будны. Прадмова да асвечаных князёў і паноў іхняй мосці паноў Мікалаяў Радзівілаў); *Разбяромся / Мне так здаецца, што гэтай шаноўнаю назвай / Век той названы па простай прычыне: дзяржаўца / Перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна / Ставіў багацце духоўнае – злата дзяржавы* (М. Гусоўскі. Песня пра зубра). На нашу думку, гэта звязана з канчатковай стратай беларускай дзяржаўнасці ў XVIII ст. і з моцнай традыцыяй сям'і і роднага кута. У сувязі з гэтым працытуем Н.Б. Мячкоўскую, якая сцвярджае: "У адрозненне ад «дзяржаўнага» рускага народа, беларусы заўсёды былі і ёсць больш «прыватныя» людзі, адасобленыя ад любой дзяржавы" [145, с. 73].

Яшчэ адзін паняццевы кампанент – 'Радзіма важная для творцы' – фарміруецца наступнымі тэкставымі вербалізатарамі: *Ніякі довад, што для творцы / Навек пакінуць родны край – / Усё адно што і памерці, – / Не пераконваў – хоць канай! / ...Каб песню, вартую народа, / На поўны голас шчыра спець – / Што трэба творцу? Вельмі многа! / Радзіму ў сэрцы трэба мець!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *Песня мая не шукае чырвонцаў – / Будучнасць гэткіх не знойдзе ў ёй плям, – / Жыць толькі хоча ў радзімай староны, / Пеці па сэрцы ўсім добрым людзям* (Я. Купала. Песня мая); *С к а р ы н а. Позна… Позна, ваша святая Каралеўская Вялікасць. Спалены не толькі кнігі і друкарня, спалены і масты. Нарадзіўся я, відаць, зарана на*

Репозиторий ВГУ

сваёй шматпакутнай зямлі. Паспяшаўся стаць прарокам у сваёй Айчыне (А. Петрашкевіч. Прарок для Айчыны). Як бачым, Радзіма – неабходны элемент жыцця творцы, сэнс творчасці.

Наступныя паняццевыя кампаненты складаюць інфармацыйнае поле канцэпту *Радзіма:* (прыгажосць прыроды Радзімы), ‘Радзіма – гэта родная хата, родны куток’ (прасторавае вымярэнне); ‘праца на карысць Радзімы’, ‘ахвяра дзеля Радзімы’, ‘гераічнае мінулае Радзімы’, ‘славутыя імёны Радзімы’, ‘запавет нашчадкам аберагаць Радзіму’, ‘пажаданне шчасця, росквіту Радзіме’ (ідэалагічнае вымярэнне); ‘немагчымасць жыцця без Радзімы’, ‘любоў да Радзімы’, ‘удзячнасць Радзіме’, ‘Радзіма аб’ядноўвае людзей, надае самабытнасць’ (грамадскае вымярэнне). У дысертацыйным даследаванні Я.А. Гімаева [62] на матэрыяле рускага педагагічнага дыскурсу вылучаны наступныя паняццевыя кампаненты канцэпту *Радзіма:* ‘любоў да Радзімы’, ‘прыгажосць Радзімы’, ‘адданасць Бацькаўшчыне’, ‘абарона айчыны’, ‘дзейнасць на карысць Радзіме’, ‘удзячнасць Радзіме’, ‘гонар за краіну’. Як бачым, напаўненне канцэптаў ў рускай і беларускай карцінах свету маюць як свае адметныя, так і падобныя рысы.

Прыведзены аналіз вобразнага зместу і паняццевых кампанентаў дазваляе нам змадэляваць дадзены канцэпт, вылучыўшы асноўныя яго прыметы (якія ў навуковай літаратуры называюцца бліжняй перыферыяй, актыўным пластам, каляядзерным полем) і дадатковыя прыметы. Чляненне зместу канцэпту адбываецца па “крытэрыі яркасці кагнітыўных прымет” (тэрмін І.А. Сцерніна). Паняццевыя кампаненты ‘любоў да Радзімы’, ‘прыгажосць Радзімы’, ‘удзячнасць Радзіме’, ‘абарона Радзімы’, ‘пашана да Радзімы’ – складаюць ядро канцэпту *Радзіма*. Ацэначны кампанент канцэпту вызначаецца як пазітыўны.

Такім чынам, канцэпт *Радзіма* знайшоў шырокую рэпрэзентацыю праз семантыку шматлікіх моўных адзінак у беларускай мастацкай літаратуры. Гэта абумоўлена тым, што Радзіма – ключавы вобраз беларускай літаратуры. Беларусам з даўніх часоў была ўласціва такая рыса, як пачуццё ўласнай годнасці, патрыятызму і гонару за сваю краіну. Аседласць нашага народа на сваёй этнічнай тэрыторыі абумовіла спрадвечнае пачуццё павагі да сваёй Радзімы, таго месца, дзе нарадзіўся.

Разгортванне канцэпту *Радзіма* ў мастацкіх тэкстах адбываецца ў некалькіх накірунках: культурна-гістарычным, эстэтычным, антрапалагічным, міфалагічным.

У кантэкстах-рэпрэзентантах канцэпту *Радзіма* знаходзіцца шмат гістарычнай інфармацыі: барацьба за незалежнасць, нацыянальнае адраджэнне, падзел Беларусі на Усходнюю і Заходнюю, шматлікія войны (асабліва жудасная Вялікая Айчынная вайна), Чарнобыльская катастрофа. Усе гэтыя звесткі ствараюць вялікую панараму існавання Беларусі ў стагоддзях, а значыць, на мастацкіх прыкладах дазваляюць лепш усвядоміць пэўныя гістарычныя факты, узбагачаюць мастацкі канцэпт

Репозиторий ВГУ

Радзіма, дазваляюць сканструяваць дадзены канцэпт у дыяхранічным аспекце.

Уявіць Радзіму-Беларусь цяжка без яе сімвалаў. У беларускай літаратуры вербалізаваліся шматлікія "імёны" Радзімы – знакамітыя асобы, архітэктурныя збудаванні, геаграфічныя аб'екты, жывёлы і птушкі. Безумоўна, гэтая інфармацыя не прэтэндуе на абсалютную паўнату, бо матэрыялам даследавання паслужылі толькі мастацкія творы, уключаныя ў школьную праграму. Дапоўніць гэтыя звесткі магчыма інфармацыяй краязнаўчай, публіцыстычнай і інш.

Для беларуса Радзіма – гэта хутчэй родная хата, сям'я, дзяцінства, чым дзяржава як палітычнае ўтварэнне. Магчыма, гэта звязана са стратай самастойнай дзяржаўнасці ў канца XVIII ст., а таксама беларускія моцныя сямейныя традыцыі, сям'я і Радзіма – аднолькава дарагія каштоўнасці.

Вобразны змест канцэпту прадстаўлены шматлікімі перцэптыўнымі прыметамі, сярод якіх пераважаюць зрокавыя: *Зямля Беларусі!* ***Вачамі азёраў*** */ Глядзіш ты ў* ***празрыстыя*** *высі нябёс* (А. Грачанікаў); *мая Радзіма – / Дзе з-за бору / Ўзыходзіць месяц уначы*; *Край мой, дзе горы паўсталі ўзнёсла, / Край* ***сініх вод,*** *чаратамі зарослых, / Пушчаў, дзе ў голлі хаваецца сонца* (Я. Баршчэўскі); *Мой край, мой рай бульбяна-жытны! /* ***Зеленадолы, залаты!*** (Н. Гілевіч). Адзначым таксама гукавыя вобразы (*Дзе мой край? / Там, дзе вечную* ***песню пяе*** *Белавежа* (У. Караткевіч); *Мой край* […] *Як* ***спеў*** *матулі, старажытны, як* ***песня*** *любай – малады!* (Н. Гілевіч); *Прыедзь у край мой* ***ціхі,*** */ Тут продкаў* ***галасы*** (Я. Янішчыц) і тактыльны (*Беларусь – /* ***Поціск цёплых*** *матуліных* ***рук*****).**

Неабходна адзначыць супярэчлівасць кантэкстаў, з якіх рэканструюецца канцэпт *Радзіма*. Паказ велічы і багацця перамяжоўваецца з адлюстраваннем гора і галечы. Гэта выклікана тым, што аб'ектам даследавання выступае не індывідуальна-аўтарская карціна свету аднаго пісьменніка, а тэксты шматлікіх аўтараў, светаўспрыманне якіх можа адрозніваца. Таму такую супярэчлівасць агульнай мастацкай карціны свету беларусаў можна лічыць праявай разнастайнасці выяўлення канцэпту.

Канцэпт *Радзіма* ў сучаснай айчыннай лінгвістыцы з'яўляецца актуальным аб'ектам даследавання з прычыны яго этнічнай маркіраванасці і запатрабаванасці для фарміравання грамадзянскай пазіцыі і нацыянальнай ідэі. Канцэпт *Радзіма* з'яўляецца ключавым у беларускай нацыянальнай свядомасці і стаіць у адным шэрагу з такімі маральнымі катэгорыямі, як народ, мова, воля, сям'я.

Даследуючы змест канцэпту *Радзіма* ў мастацкіх тэкстах, прадстаўленых у школьных падручніках, мы пацвердзілі меркаванне аб тым, што дадзены канцэпт займае найважнейшае месца ў мастацкай літаратуры, а значыць і ў масавай свядомасці беларускага народа. Пра гэта сведчаць развітая структура канцэпту, наяўнасць у ёй некалькіх

Рэпозиторий ВГУ

паняццевых складнікаў, якія актуалізуюць у свядомасці школьнікаў трывалыя маральна-патрыятычныя ідэалы. Устойлівасць канцэпту *Радзіма* ў моўнай карціне свету беларусаў абапіраецца на тое, што яго ядро мае старажытнае паходжанне. Словы з корнем *род-* сустракаюцца ў многіх славянскіх мовах. У беларускай мове слова *Радзіма* мае некалькі значэнняў, адно з якіх "месца нараджэння" найбольш блізкае да яго архаічнага кораня, у якім замацавалася архетыпічнае ўяўленне аб радзіме як маці, сям'і, уласным доме.

2.4 Канцэпт *народ* як увасабленне дамінантных рыс беларускай ментальнасці

Канцэпт *народ* у мове хрэстаматыйнай літаратуры рэпрэзентуецца праз наступныя моўныя адзінкі: *беларусы, браты, братцы, народ, мой народ, наш народ, беларускі народ, мы, нашчадкі Каліноўскага, сыны Радзімы, дочкі, сыны, землякі, сцішаны і грозны народ, народ твой маленькі, народ, які ніколі не крыўдзіў другіх, грамадзяне беларускія, нашы людзі, мужны і адвечны народ, беларускі сярмяжны народ, сын герояў і багоў, унукі Скарыны, ліцвіны, тутэйшыя, русіны, люд, беларускія людзі, грамада, мазольных рук мільёны, дзеці Беларусі, люд паспаліты, палешукі.* Найбольш частотнымі з'яўляюцца лексемы *народ*, *беларускі народ*, *беларусы*, якія складаюць ядро канцэпту.

Паводле "Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы", лексема *народ* мае значэнне 'народ, людзі, нацыя'. Існуе ў польскай, украінскай, рускай, славенскай, чэшскай, славацкай мовах. Праславянскі назоўнік *narodъ – аддзеяслоўны, першапачаткова з шырокім спектрам значэнняў: 'нараджэнне, паходжанне', 'народжаныя, нашчадкі, род', што магло адносіцца і да іншых жывых істот; пазней значэнне звузілася – 'людзі, пэўная супольнасць людзей'. Значэнне 'нацыя' ўзнікла на базе 'мноства, тлум', 'насельніцтва краіны' ва ўсходніх славян толькі ў XVIII–XIX ст. [196, с. 242]. У сучаснай беларускай мове выдзяляюцца наступныя лексічныя значэнні: народ 1) 'усё насельніцтва пэўнай дзяржавы, жыхары краіны'; 2) 'працоўная маса насельніцтва той ці іншай краіны'; 3) 'розныя формы гістарычных супольнасцей (племя, народнасць, нацыя)'; 4) 'вялікая група людзей' [182, с. 374]. У "Частотным слоўніку беларускай мовы (Мастацкая проза)" адзначаецца, што лексема ўваходзіць у лік часта цытаваных лексем (73 словаўжыванні на 1000 слоў) [127]. Цытуемасць лексемы *народ* у паэзіі яшчэ большая: 253 выпадкі ўжывання [128]. Гэта пацвярджае меркаванне, што канцэпт *народ* з'яўляецца актуальным у беларускай хрэстаматыйнай літаратуры.

Народ (нацыя, этнас) адрозніваецца перадусім тым, што гэта супольнасць, якая склалася гістарычна і вызначаецца ўсведамленнем свайго адзінства і адрознення ад іншых народаў: *бо я не італьянец, не*

Репозиторий ВГУ

немец, не доктар або які-небудзь з асяроддзя паноў (В. Цяпінскі. Прадмова да Евангелля); *Нас жа не жменька, а з шэсць мільёнаў – больш і шмат больш, не раўнуючы, як жыдоў, напрыклад, або татар ці армян* (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зборніка “Дудка беларуская”). У. Караткевіч закранае і пытанне крытэрыяў веравызнання і вызначэння народа: *Як жа не паляк, – сказаў ён. – Хрысцілі цябе ў касцёле. Веравызнання ты рымскага. / – Ну і што, – цяжка рухаючы сківіцамі, сказаў Кастусь. – Прашу прабачэння, заўтра я ахрышчу вас у касцёле – і вы не станеце з гэтай прычыны палякам. А я перайду ў магаметанства і не стану туркам. Будзе беларус магаметанскага веравызнання і беларус веравызнання каталіцкага* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Як адзначыла даследчыца Т.М. Мікуліч, “нацыяй можа называцца народ, прасякнуты сістэмай нацыянальных поглядаў і імкненняў, які ўсвядоміў сябе роўным з іншымі народамі і ўнёс значны ўклад у развіццё агульначалавечай культуры, цывілізацыі” [146, с. 46]. Этнічная самасвядомасць можа разглядацца як разнавіднасць самасвядомасці наогул і фактычна ўяўляе сабой сістэму поглядаў, на падставе якіх адбываецца вылучэнне этнасам сябе з этнічнага свету (сукупнасці этнічных супольнасцей рознага парадку), усведамленне асноўных рыс і асаблівасцей свайго і іншых этнасаў.

Рост самасвядомасці народа ва ўсе часы з’яўляецца адной з ключавых тэм усёй беларускай літаратуры, што абумоўлена гістарычна. На пачатку XX ст. ў літаратуры гучалі заклікі да абуджэння нацыі, якая некалькі стагоддзяў была пад уладай Расійскай імперыі: *Кожны народ мае свой гонар. Англічанін перад усім светам вызначае: я англічанін! Тое самае скажа француз, немец, аўстрыец, рускі і іншыя прадстаўнікі другіх нацый. А мы, беларусы, не адважваемся прызнацца ў тым, што мы – беларусы. Бо на голаву беларускага народа, як вядома, многа выліта памыяў, годнасць яго прыніжана і мова асмеяна, у яго няма імя, няма твару* (Я. Колас. У палескай глушы); *Я н к а. Якімі б раскошамі матэрыяльнымі нас ні надзялялі, ніколі яшчэ не будзем шчаслівы, пакуль чужая воля будзе гаспадаром над нашай воляй. Каб гэтага не было, мы павінны растаптаць, зніштожыць даўгавечнуюману, якая вучыць, што мы не ёсць мы, што мы нейкае нешта, якое абы накарміў, дык і сыта будзе. Мы павінны душу нашу народную выявіць у сваім “я”, у сваёй самабытнасці і смела сягнуць па сваё неаддымнае права самім распараджацца гэтым сваім “я”* (Я. Купала. Тутэйшыя).

Напачатку XX ст. канцэпт *беларускі народ* акцэнтуалізуецца. У літаратуры XIX ст. сустракаюцца адзінкавыя кантэксты, у якіх вербалізуецца дадзены канцэпт: *Плач, як мае вочы, / Над народу доляй… / Іграй слёзным тонам / Над народу сконам* (Ф. Багушэвіч. Мая дудка). Аднак напярэдадні і пасля рэвалюцыі 1917 г. беларусы павінны былі выбраць шлях самавызначэння. Многія паэты ў эмацыйных вершах

Рэпозиторий ВГУ

выказалі свой запавет – не пакарыцца суседзям, пазбавіцца ад прыгнёту, займець свой голас сярод народаў, захаваць родную мову: ***Паўстань, народ!*** *Для будучыні шчасце / Ты строй, каб пут не строіў больш сусед; / Не дайся ў гэты грозны час прапасці, / Прапашчых не пацешыць шчасцем свет. / Сваю магутнасць пакажы ты свету, – / Свой край, сябе ў пашане мець прымусь! / Паўстань народ!.. З крыві і слёз кліч /* ***Цябе чакае Маці-Беларусь!*** (Я. Купала. Паўстань, народ); *Табе, народ мой, згібнуты ў аковах, /* […] *Упаў народ. Змарнеў народ, забыўся, / Як Бацькаўшчыну, як яго завуць; / Як падарожны без пуцця знябыўся, / Як сірата, якой нідзе заснуць…* (Я. Купала. Свайму народу); *Народ,* ***Беларускі Народ! / Ты цёмны сляпы, быццам крот.*** */ Табою ўсягды пагарджалі, / Цябе не пушчалі з ярма / І душу тваю абакралі, – / У ёй нават мовы няма. / Збудзіўшысь ад грознай бяды, / Ўвесь поўны смяротнай жуды, / Ты крыкнуць не вольны: "Ратуйце!" / І мусіш ты "Дзякуй!" крычаць. / Пачуйце жа гэта, пачуйце, / Хто ўмее з вас сэрцам чуваць!* (М. Багдановіч. Народ, Беларускі народ!); *Веру, братцы:* ***людзьмі станем, / Хутка скончым мы свой сон;*** *На свет божы шырэй глянем, / Век напіша нам закон.* […] *Бачу, братцы, мы не з карт, / Мы не з гіпсу, мы – з каменя, / Мы – з жалеза, мы – са сталі, / Нас кавалі ў пламенні / Каб мацнейшымі мы сталі* (Цётка. Вера беларуса); *А хто там ідзе, а хто там ідзе / У агромністай такой грамадзе? / – Беларусы / А што яны нясуць на худых плячах, / На руках у крыві, на нагах у лапцях? / – Сваю крыўду. / А куды ж нясуць гэту крыўду ўсю, / А куды ж нясуць напаказ сваю? / – На свет цэлы. / А гэта ж іх не адзін мільён, / Крыўду несць наўчыў, разбудзіў іх сон? / – Бяда, гора. / А чаго ж ім, / Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім? / –* ***Людзьмі звацца*** (Я. Купала. А хто там ідзе); ***Дык хіба ж мы праў не маем,*** */ Сілы шлях свой адзначаць / І сваім уласным краем / Край свой родны называць* (Я. Колас. Сымон-музыка).

Тэма прыгнёту суседніх народаў гучыць даволі часта: *Родны край! У божа імя, / У чэсць косцелаў, царквоў / Паміж дзеткамі тваімі / Многа легла камянёў; / Многа выйшла трасяніны – / Меч, агонь знішчалі край: /* ***З двух бакоў "айцы" з дубінай / Заганялі нас у рай*** (Я. Колас. Сымон-музыка); *М і к і т а. А што вы, новаспечаныя рэспубліканцы, хэ-хэ-хэ! беларусы ці як там… што вы маніцёся бараніць, бо дагэтуль, межджу протчым, вы яшчэ нічога не ўбаранілі! Я н к а. Мы баронім саміх сябе ад* ***вашай навалы*** [расійскага самаўладства. – *К.П.*] (Я. Купала. Тутэйшыя); *Я н к а. Але сцеражэцеся, пане рэгістратар. Ідзе народ, беларускі сярмяжны народ ідзе, а ён вашаму руска-ісціннаму рэгістратарству саб'е рогі* (Я. Купала. Тутэйшыя). Ігнараванне суседнімі народамі беларускай ідэнтычнасці па-мастацку прадэманстраваў Янка Купала ў п'есе "Тутэйшыя" ў вобразах Усходняга і Заходняга вучоных (якія, на жаль, самі былі выхадцамі з беларускіх зямель): *Я н к а. Янка Здольнік, пане вучоны. / Заходні вучоны. Я н у ш З д о л ь н і ц к і (запісваючы ў нататкі, голасна).*

Рэпозиторий ВГУ

Незаводне тып Всходнё-Крэсовэго поляка з немалон дозон крві познаньско-гуральскей. Людносць розкшэва сень на две галэнзі родовэ: племен бялорусінов і племен тэж-бялорусінов з походзэня рэнегатов і дэгенератув. Мова ойчыста – огульно-польска незвычайне ўдосконалёна, ен з велькон домешкон незразумялых слув. / У с х о д н і в у ч о н ы (таксама запісваючы ўперамежку з Заходнім вучоным). Іоан Здольніков. Ісціноруссклй ціп Северо-Западной Обласці і безусловно з прымесью монгольско-фінской крові. Народность ныне распадаецца на две родовыя ветві: племя – белорусы і племя – тожэ-белоусы, ісходзяшчае от рэнегатов і дзегенератов. Родной язык – обшчэрусскій, веліколепно усовершенствованный, но с большой прымесью непонятных слов (Я. Купала. Тутэйшыя).

Актуалізуецца тэма самавызначэння і ў кантэкстах мастацкіх твораў канца XX – пачатку XXI ст., калі ва ўмовах глабалізацыі, міграцыі і сцірання этнічных межаў беларусам важна захаваць сваю самабытнасць: *Народ сябе пазнаць павінен! / Народ – не зборышча, не гурт, / Ён мусіць мець – інакш загіне! – / Усведамлення цвёрды грунт. / Калі ён сам сябе ўсвядоміў, / Сваю гісторыю, свой лёс, / Свае правы ва ўласным доме, – / Тады – народ, тады – ён ёсць* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *Ёсць тое, чаго не здольныя зразумець гэтыя былыя беларусы і нават палешукі сярод іх, бо на чужой зямлі без каранёў і палын не расце. Яны адсюль з'ехалі, так і не адчуўшы сябе беларусамі, саромеючыся таго, што яны беларусы, не пазбавіўшыся гэтага сораму, і пражылі жыццё за акіянам, імкнучыся як мага хутчэй збыць, знішчыць у сабе беларуса. А калі знішчылі, звярнуліся да радзімы, усцешваючы, абнадзейваючы сябе, што ў іх знішчальным вопыце ёсць нешта карыснае, прыдатнае іх землякам* (В. Казько. Неруш); *Ты столькі вынес і пакут, і гора, / Што заслужыў навечна, назаўсёды / Мець лёс не нарыхтоўчае канторы, / А роўнага між роўнымі народа*. (С. Законнікаў. Чорная быль).

Несумненна, для захавання самабытнасці нацыі неабходна валодаць добрай гістарычнай памяццю: *Даўно было – мо тысячу год назад, а мо яшчэ болей, – як сталі жыць, размнажацца і ў славу расці ўдалыя прашчуры нашыя – дрыгавічы, крывічы, і палачане… Вера ў нашых продкаў была трохі іншая як цяпер, бо не аднаго бога мелі, а некалькі, і прозвішчы былі не такія, як цяпер, называліся яны і Сонца, Пярун, Каляда ды іншыя яшчэ* […] *Просты быў народ, і крывадушнічаць не ўмеў ён у веры сваёй* […] *А чыстае, відаць, сумленне мелі прадзеды нашы… а пасля з дабраты сваёй і рупнасці гасціннай прынялі, падумаўшы, да сваіх старых багоў і новага Бога…* (Я. Купала. Як у казцы…); ***Нам продкаў кемкасць захавала / Шмат весцяў дзіўных з быўшых год,*** */ Хоць гэтых весцяў ўжо нямала / Ў няпамяць кінуў сам народ* (Я. Купала. Магіла льва); *Чаму ўсё-ткі народ так часта звяртаецца па сутнасці да адной і той жа думкі?* ***Людскі маральны вопыт марна не прападае.*** *Ён, канечне, у генах не*

Репозиторий ВГУ

перадаецца ў спадчыну, а жыве ў традыцыях, у звычаях, у расказах бывалых людзей пра былі і небыліцы. (А. Макаёнак. Пагарэльцы); *Вазьмі ў звычай, сын герояў і багоў, /* ***Не пагарджаць святым сваім мінулым, / А заслужыць яшчэ, і вартым быць яго*** (У. Караткевіч. Беларускае мінулае); *Абыякавы да мінулага не мае аніякай інтэлектуальнай перавагі над жывёлай, і таму ёсць першы кандыдат на маральную, а затым фізічную смерць. Усё адно хто гэта – чалавек ці народ* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Кожны народ памятае заснавальнікаў княжацкіх і царскіх дынастый. У нас гэта* ***Рагвалод*** *і яго дачка* ***Рагнеда,*** *дзеці і ўнукі якой прадоўжылі дынастыю полацкіх князёў* (У. Бутрамееў. Славутая дачка Полацкай зямлі). Так, у вершы "Мы ўзышлі" Н. Гілевіча сцвярджаецца існаванне багатай беларускай спадчыны: *Мы ўзышлі не з насення, што ветрам занесена, – / Мы не з дзікай травы самаслыя парасткі / У глыбінях зямлі гераічнай і песеннай, / Нашых дум карані з вузялкамі ўпартасці* […] */ Мы на золку далёкім ардзе не скарыліся, / Славай* ***Грунвальда*** *выйшлі ў вялікія ратнікі, / Нас будзіў да святла стук друкарань скарынінскіх. / Да братоў мы гарнуліся сэрцамі братнімі. /* ***Каліноўскі*** *дарэшты пазбавіў нас кволасці – / Веру мужнасць сваю завяшчаў нам з-пад вісельні, / З гнеўнай лірай* ***Купалы*** *і з эпасам* ***Коласа*** */ Мы пазналі сябе і свой голас узвысілі* (Н. Гілевіч. Мы ўзышлі).

Як бачна з папярэдняга кантэксту, гаворачы пра захаванне памяці пра мінулае, мастакі слова часта звяртаюцца да знакамітых асоб беларускага народа, яго яркіх прадстаўнікоў. Гэта пісьменнікі, першадрукары, змагары за незалежнасць: *Сыноў, што з вераю жыццё вянчалі, / Ці ж мала Беларусь узгадавала? / Стаяць, як знак ахоўны, за плячамі /* ***Скарына, Каліноўскі*** *і* ***Купала.*** */ Народ мой, слухай голас іх прарочы, / Ён недарма трывожыць гаркатою. / Прачніся, адкрывай шырока вочы, / Не разміній з праўдаю крутою* (С. Законнікаў. Чорная быль); *Мае ж дзяды тады пісаць умелі / Калі фарсілі ў воўчых скурах вы! / Палілі на агні жанчын старых – / У нас тварылі* ***Будны*** *і* ***Цяпінскі*** */ Паэты, дойліды і разьбяры* (У. Караткевіч. Зямля дзядоў); *Гравюры* ***Скарыны!*** */ Ён выразаў іх / На спаконвечным / Дрэве гісторыі / Свайго народа, / Хоць мог бы падабраць / І больш падатлівы, / І больш удзячны / Матэрыял. / І выразаў ён іх* […] */ Промнем сваёй веры і любові да народа* (М. Танк. Гравюры Скарыны). У. Караткевіч, напрыклад, звяртаецца да асобы М. Багдановіча*: Ты* [М. Багдановіч. – *К.П.*] *сказаў нам: / "Унукі Скарыны, / Дзе ваш гонар, моц і краса? / Ёсць і ў вас, як у іншых, святыня, / Не давайце святыні псам! / Не давайце з яе гluміцца, / Бо праспіць яна ясну зару, / Бо святы ізумруд заімгліцца / У пярсцёнку тваім, Беларусь* У. Караткевіч. Багдановічу). У. Караткевіч паказвае вызначальнасць Асобы ў лёсе цэлага народа: *А толькі гіне народ, калі на пачатку ягонай дарогі не з'явіцца такі, як вы, без кампрамісаў* [Каліноўскі пра Шаўчэнку. – *К.П.*] *справа ваша – высакародная, таму што такой любові, як ваша, яшчэ*

Репозиторий ВГУ

пашукаць на зямлі. Такой любові, калі адзін чалавек ратуе цэлы народ (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Канцэпт *народ* уяўляе сабой спараджэнне сваёй Радзімы як геаграфічнага, гістарычнага, сацыяльнага і духоўнага асяроддзя. Выяўлена шмат кантэкстаў мастацкай літаратуры, з якіх вынікае, што беларускі народ мае вялікае прыроднае багацце і аберагае яго, бо ўсведамляе гэты скарб як частку самога сябе: *Скарбы свае нашы людзі на золата нават / Не прамяняюць. Здаўна іх жыццё навучыла: / Нашы лясы – гэта нашых даброт і багацця / Невычарпальны калодзеж…* (М. Гусоўскі. Песня пра зубра); *І дарма, што ў свой час / (Хоць хацеў) не прабіўся да мора – / Мора лёну ў яго, / І разлівы лугоў, / І Бязмежжа лясоў* (Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву). Гаворачы пра ўплыў прыроды на характар беларусаў, адзначым, што ў нейкай ступені ён абумоўлены прыроднымі асаблівасцямі краіны: *у многіх з паданняў згадваюцца гістарычныя выпадкі, іншыя ж – болей плён фантазіі ды меланхалічнага духу, што вызначае* ***жыхара гэтых дзікіх і лясістых ваколіц;*** *ад прыроды ён здольны да жвавае думкі, уяўленне яго стварае дзіўныя карціны* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Дык жа народ просты, народ, каторага лаюць “цёмным”, чаго ён, гэты шэры, аднатонны* ***народ, па глухіх кутках, у лясах сваіх, сярод балот і пнёў,*** *чаму ён мучыўся* (М. Гарэцкі. Роднае карэнне); *І калі бачыш на водмелі напаўзанесенае пяском мокрае бервяно – адразу становіцца зразумела, адкуль узяў народ паданне аб волатах, што спяць, засыпаныя жвірам і заплеценыя травой, спяць, пакуль не прыйдзе час вялікай бяды і пакуль іх не пакліча народ* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). Такім чынам, таямнічасць неабсяжных лясоў і бароў, балотаў з цягам часу сфарміравала ў беларусаў надзвычай багатую і дзіўную фантазію, развітую ўражлівасць, некаторую містычнасць светаўспрымання.

Пра знітаванасць народа і Радзімы ўказвае сама мова – гэтыя словы паходзяць з аднаго старажытнага кораня *-род-*, а таксама кантэксты беларускай мастацкай літаратуры: *Зямля бацькоўская, святая, / Так, гэта мы. Увесь народ… / Мне ў сэрца бусел залятае / З трывожных прыпяцкіх балот* (П. Панчанка. Зямля бацькоў).

У мастацкай літаратуры канцэпт *народ* рэканструюецца як калектыўная асоба, што валодае ўласным нацыянальным характарам, у якім выдзяляюцца як станоўчыя, так і адмоўныя рысы. Акрамя агульнаацэначных велічы, славы і доблесці (*які гэта быў высакародны, слаўны, востры, дасціпны іх народ у навуках і як шмат разоў іншыя адукаваныя народы іх мудрасць мусілі хваліць і, вядома ж, вучыцца ў іх* (В. Цяпінскі. Прадмова да Евангелля) са станоўчых рыс характару ў мастацкіх тэкстах у парадку змяншэння частотнасці назавём наступныя.

Самая яскравая рыса беларусаў – мірны характар, добрыя адносіны да іншых народаў, што вербалізуецца ў мастацкіх тэкстах выразамі *верацярпімасць і прыязнасць майго народа; адданы крэўнаму брацтву; мы*

Рэпозиторий ВГУ

дружбы народам жадаем і інш.: *Па агульным назіранні, беларусам прыродна ўласцівая* ***павага да іншых народаў і памяркоўнасць да таго, хто думае іначай*** (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі); *С к а р ы н а. Я пра адвечную* ***верацярпімасць і прыязнасць майго народа*** *да іншых народаў і іх рэлігій, пра тое, чым мы можам ганарыцца* (А. Петрашкевіч. Напісанае застаецца); *Быў* ***адданы*** *спрадвеку / Славянскаму* ***крэўнаму брацтву,*** */ З ім дзяліўся ўсім / Што ў стагоддзях займеў* (Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву); *С к а р ы н а (устае з крэсла). Вы недаацэньваеце мой народ, яго патрыятычных перакананняў і высокага пачуцця ўласнай годнасці. Вы не ўлічваеце, што* ***ён не сірата сярод чужынцаў, што ў яго, як ва ўсіх добрых людзей, ёсць браты*** (А. Петрашкевіч. Напісанае застаецца); *Чужое зямлі нам не трэба, / Пачуцці ва ўсіх нас адны: / Мы хочам, каб мірнае неба / Не знала пажараў вайны. /* ***Мы дружбы народам жадаем*** */ І шчырай* ***братэрскай любві*** (А. Бачыла. Радзіма мая дарагая); *Народ мой, дзякую табе, / Што і на міг мне не дазволіў, / Каб я кагосьці абязволіў, / Жыў у кагосьці на гарбе, / Што ў радаслоўную ўпісаў / Не гандляроў і прайдзісветаў, / А плытагонаў і паэтаў, / І штукароў ганчарных спраў. / Народ мой, дзякую, што ты / Велікадушна даў мне ў рукі / Не алебарды і шчыты, / А лемяхі і першадрукі* (Г. Бураўкін. Народ мой…); *Ёсць за што, ёсць за што / І народу майму ганарыцца: /* ***Не хадзіў і не лез ён / На землі чужыя вайной*** (Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву). Гісторыя пацвярджае, што беларусы ніколі не вызначаліся грубай агрэсіўнасцю ў стасунках нават з тымі людзьмі, якія да іх адносіліся часам нядобразычліва. У характары беларусаў – схільнасць да бесканфліктнага вырашэння праблем. Як слушна заўважае А. Цвікевіч, “нацыянальная рыса беларусаў – агіда да гвалту – з’яўляецца слабасцю беларускага народа ў мінулым, у перыяд працяглай дэнацыяналізацыі і прыгнечання, але гэтая якасць яго будзе складаць яго сілу і гордасць у будучым” [16, с. 105].

Гасціннасць – гэта тое, што са станоўчага боку характарызуе беларусаў: *Усе, хто прыязджае да нас, адзначаюць як адну з галоўных рыс – гасціннасць, почасту досыць цяжкую для госця. “Госць у хаце – Бог у хаце” – і ганьба таму дому, дзе не зробяць усяго, нават немагчымага, каб госць быў задаволены* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі); *Ведаючы шчырую беларускую гасціннасць, зварочваю туды на адпачынак* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Важны быў гэта народ, і паміж суседзямі меў ён добрую песню і праўдзівае паважанне* […] *госці ведалі, што народ, да якога ім дарога належыла, быў сэрца мяккага, рупны гасцінаю і багаццем асаблівым адзначаўся* (Янка Купала. Як у казцы…); *Вайшоў Кандрат і павітаўся / І пра здароўе распытаўся / Дарота, Пальчыха старая, / Таксама хлебам дом вітае – / Такі ўжо звычай беларускі, – / У клумку выпіўка, закускі* (Я. Колас. Новая зямля); *Зямлю, дзе сцяжыначка кожная / У прыветлівы двор прывядзе* (А. Ставер. Жураўлі на

Рэпозиторий ВГУ

Палессе ляцяць); *Мы ўсім сваёй гасціннасцю вядомы / Надзейныя сябры і дружбакі. / І госць, і падарожны ў нас, / Як дома, / А злым і травы колюцца ў бакі* (Р. Барадулін. Мы – беларусы). Беларуская гасціннасць (як адзначаў У. Караткевіч, нярэдка вельмі цяжкая для госця) адлюстравалася ў мове праз сталыя звароты моўнага этыкету *піць-есці было, толькі прымусаў не было* або *на стале ўсяго было, толькі прынукі не было: А л ь ж б е т а. Што ж, выбачайце, госцікі. Не хацелі піць і есці, пасля самі будзеце жалець. С ц я п а н. Выбачайце, выбачайце, каханенькія, родненькія, адно не скажыце, што ўсяго было ўдаволь, толькі прынукі не было* (Я. Купала. Паўлінка). Магчыма, гэтая шчырасць, душэўная адкрытасць да госця аб'ядноўвае і некаторыя іншыя якасці беларускага народа – талерантнасць, памяркоўнасць, лагоднасць, павагу да іншаземцаў.

Даволі шырока прадстаўлены кантэксты, якія рэпрэзентуюць такую рысу характару, як вальналюбства: *Учора, калі мылі падлогу, адна дзеўка так на мяне паглядзела, што я пакінула верыць майму сыну, які кажа, што над тутэйшым народам трэба павесіць меч, і ён уверуе, што гэта тая праўда, да якой ён сам павінен імкнуцца* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Дзе мой край? Там, дзе людзі* ***ніколі не будуць рабамі,*** *што за поліўку носяць ярмо ў безнадзейнай турме* (У. Караткевіч. Беларуская песня). *Добры, верны сябрам і страшны ворагам,* ***вольналюбівы, чысты і горды*** (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). *Не, не стопчуць красы тваёй брудныя боты, / Не,* ***народа майго аніхто не сагне*** (П. Панчанка. Беларусі); *Скупая зямля маёй Беларусі /* ***Не раджала рабоў і не мела рабоў*** (У. Караткевіч. Буслы вучаць дзяцей); *Народ… Жывы, разумны і* ***вольналюбівы.*** *Так ён глядзеў на сябе сам, так павінны глядзець на ягоны тагачасны воблік і мы. Ён давёў гэтае вольналюбства і, хай сабе не заўсёды спалучаную з зухаватасцю, спакойную смеласць і ў бясконцых паўстаннях супраць прыгнятальнікаў, і ў пераможных войнах з татарамі і крыжаносцамі, і ў вялікай мужыцкай вайне XVII ст. і, урэшце рэшт, у апошняй вайне з фашызмам. …****Галоўнай яго*** [беларускага народа. – *К.П.*] ***рысай з'яўлялася свабодалюбства*** (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі).

Сярод яскравых асаблівасцей беларускага народа вылучаецца цярплівасць: *Шмат цярпець народ умее, / Умее і памсціцца, / Як дадзене вельмі крыўда, / Як зло разгасціцца* (Я. Купала. Бандароўна); *Што ведала яна* [Смерць. – *К.П.*] *аб яго народзе, які жыў насупор і не так і ўзрошчваў шыпы на сваіх карэннях, а не на сцяблінах?* (У. Караткевіч. Ладдзя роспачы); *Гэта яны баяцца, што ад іхніх люлек абурэнне выбухне, – сказаў Раткевіч. – Не бойцеся. Не такі ўжо ён вогненебяспечны народ* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *І маўчанню яго, і цярплівасці / Можна здзівіцца. / Кажуць, доля такая: / Пазначана войнамі скрозь* (Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву). Блізкай да гэтай рысы назавём вынослівасць, цягавітасць: *Праявы знешняй сілы, якая ўразіць на хвіліну*

Репозиторий ВГУ

дый звяне, замяняе тут вынослівасць, жылавітасць, цягавітасць. Там, дзе другі апусціць рукі, беларус будзе цягнуць… Нездарма яшчэ ў даўніну беларусы лічыліся незаменнымі на такіх цяжкіх работах, як земляныя і лесасплаўныя (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі).

Гаспадарлівасць беларусаў аб'ектывуецца ў наступных фрагментах мастацкіх тэкстаў: *У старыну Беларус, не падданы, / Гаспадарыў, быў сам над сабою / І далёка ў свеце быў знаны / За літоўскай і ляшскай зямлёю. / Але час прамінуў, і нядоля / на народ, як бы камень, звалілась, / Беларуская слава і воля / Адышла, адцвіла, закацілась. / Не змяняючы шэрай апраткі / Працаваў ты, як вол, гаратліва, / А ў хаце тваёй недастаткі, / А на ніве тваёй неўрадліва. / А чаму? Ты не здольны, ці хворы, / Ці благі гаспадар, ці п'яніца? / Мусіць, не! Бо і іншым у пору / У цябе гаспадарыць наўчыцца* (А. Гарун. Ты, мой брат); *Мая радзіма – / Дзе з-за бору / Ўзыходзіць месяц уначы, / Дзе ў братнім ладзе, ў дружным зборы / Жылі калісьці крывічы… / Дзяцей бацькі вучылі строга / Любіць саху, пчалу, зямлю / І аднаму маліцца богу – / Нялёгкай працы мазалю. / Таму і праўнуку, і ўнуку / Было няміла нішчыць, біць* […] *Умеў мой продак човен ладзіць, / Паліць ікластыя карчы, / таму, хто ў роспачы, – дарадзіць, / Таму, хто ў горы, – памагчы…* (Е. Лось. Продкі); *На рэках, азёрах і нівах, / Заводах, будоўлях – наўсцяж / Народ наш працуе руплівы, / І край узвышаецца наш* (А. Бачыла. Радзіма мая дарагая).

Меншую прадстаўленасць кантэкстаў з хрэстаматыйнай літаратуры ў колькасных адносінах маюць наступныя рысы нацыянальнага характару:

Аптымізм: *Не загіне край твой родны / У тэй цемені начэй!.. / …Вер, брат, жыцце залатое / Будзе ў нашай старане* (Я. Колас. Не бядуй); *Вось сімвал твой, забыты краю родны: / Зварушаны нарэшце дух народны, / Я верую, бясплодна не засне, / А ўперад рынецца, маўляў крыніца, / Каторая магутна, гучна мкне, / Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца* (М. Багдановіч. Санет); *Яшчэ адна рыса характару. Самасуцяшэнне, спалучанае з гумарам і стойкасцю. Знаходзіць выхад, хай маральны, з самага, здавалася б, безнадзейнага становішча* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі).

Таленавітасць: *Наш народ спявучы, таленавіты, горды. І вось яго ўвесь час дзякуюць за дабрыню седзячы на ягонай спіне* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Эх, чаго нам ні прышлося, / Брацце мілыя, ужыць! Колькі талентаў звялося, / Колькі іх і дзе ляжыць. / Невядомых, непрызнаных, / Не аплаканых нікім* (Я. Колас. Сымон-музыка).

Негаварлівасць, маўклівасць: *лічу, што чужаземнае не будзе пасаваць негаваркому жыхару Беларусі* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *І маўчанню яго, і цярплівасці / Можна здзівіцца. / Кажуць, доля такая: / Пазначана войнамі скрозь* (Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву).

Сціпласць: *Мы сціпласцю сваёй здаўна вядомы, / Саміх сябе хваліць нам не з рукі* (Р. Барадулін. Мы – беларусы); *І сябе не лічыў ён ніколі*

Рэпозиторий ВГУ

выключным. / “Болей дбай пра сябе!” – / Спачувалі народы яму (Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву).

Мужнасць: *Быў просты рахманы і вельмі мужны народ.* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Гордасць: *Добры, верны сябрам і страшны ворагам, вольналюбівы, чысты і горды* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). *Наш народ спявучы, таленавіты,* ***горды*** (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Ахвярнасць: *Мы больш сваёй ахвярнасцю вядомы, / Мы, беларусы, / Мы – народ такі* (Р. Барадулін. Мы – беларусы).

Адказнасць за сям’ю: *Усе прыезджыя ва ўсіх кнігах хвалілі тутэйшых людзей за тое, што добрыя бацькі і мужы. Але тыя кніг не чыталі, дый здзівіліся б, прачытаўшы: “А як іначай? Малады – дурэй колькі хочаш, а ажаніўся – тут ужо не-е!”* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Дабрыня: *О, шмат прыгожанькіх дзяўчатаў / Старонцы нашай Бог прыдбаў! / Царэвіч ехаць мог бы ў сваты / К ёй не адной, каб толькі знаў. / Душы і сэрцайка такога, / І той бязмернай дабраты / Шукаці толькі хіба ў Бога, – / Ў другіх людзей не знойдзеш ты. / На беларускую дзяўчыну, / Калі тут праўду ёй аддаць, / Ніхто йшчэ каменем не кінуў / І не наважыцца кідаць* (Я. Купала. Магіла льва).

Схільнасць да гумару: *Над сваім апетытам беларус заўсёды пасмейваўся (уменне іранізаваць не толькі над кімсьці, але і над сабою – адна з самых, па-мойму, вартых рыс беларускага нацыянальнага характару* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі).

Розум: *Народ… Жывы, разумны і вольналюбівы.* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі).

Сярод адмоўных рыс беларускага народа ў мастацкай літаратуры вербалізуюцца нацыянальнае беспамяцтва, прыстасавальніцтва, панурасць.

Тэма нацыянальнага бяспамяцтва закранаецца ў творчасці шматлікіх беларускіх пісьменнікаў: *Мо яны, Беларусь, панясліся / За тваімі дзяцьмі ўздагон, /* ***Што забылі цябе, адракліся, / Прадалі і аддалі ў палон?*** */ Біце ў сэрцы іх – біце мячамі, /* ***Не давайце чужынцамі быць!*** */ Хай пачуюць, як сэрца начамі / Аб радзімай старонцы баліць* (М. Багдановіч. Пагоня); *А з гэтага вынікае тое, што* ***беларус – інтэлігент адмяжоўваецца не толькі ад свайго народа, але і ад бацькоў сваіх.*** *Мы ведаем такое здарэнне з адным нашым знаёмым настаўнікам, да якога прыехала з дому матка. У яго былі госці. Ён пры гасцях не пасмеў пазнаць свае мацеры: “Ідзі, кажа, кабетка, на кухню: там цябе накормяць”* (Я. Колас. У палескай глушы); *Мы, беларусы, / Мы – народ такі. /* ***Ахвотна забываем, што мы, / Хто мы.*** */ Згадаюць / Нашай памяці вякі!* (Р. Барадулін. Мы – беларусы).

Прыстасавальніцтва як адмоўная рыса характару аб’ектывуецца ў наступных кантэкстах: *Пакуль у капішчах іхніх будзеш паўзці, нібы крот, / Пакуль ты слухаць іх будзеш і пакуль ты верыць ім будзеш, / і пакуль будзеш скарацца ім,* ***мой беларускі народ,*** */ вашага бога не ведаю,* ***з раем***

Рэпозиторий ВГУ

рабоў і гаротных (У. Караткевіч. Бекеш); *І ўсё ж* ***непрытульны мы народ… І гэты ганебны гандаль радзімай на працягу сямі стагоддзяў.*** *Спачатку Літве, пасля, ледзь народ паспеў асіміляваць яе, палякам, усім, каму не ляната* (У. Караткевіч. Дзікае паляванне караля Стаха); *Звыклы працэс прывядзення ў выкананне прысуду яўна парушаўся, і прычынаю таму – гэты маскоўскі бандыт.* ***Са сваімі беларускімі ворагамі*** *Косцікаў не меў вялікага клопату,* ***тыя былі паслухмяныя і перад ямай паводзілі сябе як авечкі*** (В. Быкаў. Жоўты пясочак).

Спецыяльныя даследаванні сведчаць, што менавіта для меланхоліка характэрна своеасаблівая ўлада мінулага над уласным “Я”, імкненне пастаянна асэнсоўваць свае былыя дзеянні, увесь час як бы азірацца назад. Таму невыпадкова, “што ў пачатку XX ст. асобныя даследчыкі лічылі тыповай рысай беларускай душы “лагодную меланхолію”, абумоўленую найперш “сумным” каларытам усёй прыроды Беларусі” [16, с. 104]. Меланхалічнасць, панурасць беларусаў аб’ектывуецца ў мове мастацкай літаратуры наступным чынам: *У большасці песень гэтага простага люду, як у думках, так і ў мелодыі, ёсць нешта меланхалічнае, і нават вясельныя песні, дзе маладым зычаць шчаслівага супольнага жыцця, маюць у сабе нейкае пачуццё смутку, як быццам яны не давяраюць будучаму лёсу* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *жыхары гэтага краю – Полацкага, Невельскага і Себежскага паветаў, – спрадвеку пакутуючы, зусім змяніліся характарам; на іх тварах заўсёды адбіты нейкі смутак і змрочная задумлівасць. У іх фантазіях увесь час блукаюць нядобрыя духі, якія, аднак, служаць злым панам, чараўнікам і ўсім непрыяцелям простага люду* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня).

Варта адзначыць, што кантэксты з адмоўнай канатацыяй канцэпту *народ* з’яўляюцца адзінкавымі. Так, напрыклад, адзінкавым кантэкстам вербалізуецца такая непрымальная для беларусаў рыса характару, як балбатлівасць: *Ды пры іхняй язык атасці яны туды з сапраўднага раю ўсіх перацягнуць* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі).

У мастацкай літаратуры знаходзім звесткі і пра знешнасць беларусаў. Сярод хрэстаматыйных твораў выдзелім нарысы “Зямля пад белымі крыламі” У. Караткевіча, якія можна назваць мастацкай этнаграфічнай энцыклапедыяй, дзе апісваецца лад жыцця беларусаў, гарады, вёскі, геаграфічныя ўмовы, гісторыя і г.д. Антрапалагічныя рысы беларусаў апісваюцца наступным чынам: *Чарнявых сярод беларусаў няшмат.* […] *Пераважаюць на Беларусі валасы светла-русыя ці нават бялявыя. Цёмна-русых і шатэнаў менш. Адпаведна і колер вачэй часцей за ўсё блакітны, шэры ці сіні. Рысы аблічча мяккія, склад здаецца, на першы позірк, крыху далікатным, але гэтая далікатнасць падманвае* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі).

Вобразны змест канцэпту мадэлюецца такой кагнітыўнай прыметай, як ‘народ валодае душой, сэрцам, памяццю і іншымі чалавечымі якасцямі’:

Рэпозиторий ВГУ

Так, жыццё гэтых людзей цяжкое, беднае і прыгнечанае, […] *жывая яшчэ* ***душа*** *ў народзе гэтым* (М. Багдановіч. Апокрыф); *З цэлым народам гутарку весці, /* ***Сэрца*** *мільёнаў паслухаць біцця* […] */ Што не загубяць крыўду жывую /* ***Душу народа,*** *што ўстане са сну* (Я. Купала. З кутка жаданняў); *Сама гісторыя вучыла: / Шануй, народзе, і цані – / Усё, што поіць-жывіць шчыра / Тваёй свабоды карані! Шануй* ***душу*** *сваю, народзе, / І ўласнай* ***памяці*** *не траць, / Каб у нязведанай дарозе / Ахвярай хуткасці не стаць!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *Цяпер, братцы, мы з граніту, /* ***Душа*** *наша з дынаміту, /* ***Рука*** *цвёрда,* ***грудзь*** *акута, / Пара, братцы, парваць пута!* (Цётка. Вера беларуса).

У мастацкай літаратуры сустракаецца размежаванне значэнняў лексемы *народ*. Так, у многіх кантэкстах ідзе гаворка пра народ як усю нацыю, а ў шэрагу выпадкаў народ – гэта сялянства, працоўны клас, у які не ўключаецца т.зв. эліта (прадстаўнікі вышэйшага саслоўя): *Але хто ж вінен у тым, што гэтыя людзі дзікуны? Дзяржава, якой ёсць да іх справа толькі ў часы мяцяжу? Уладары над душамі, якім ёсць да іх справа толькі пасля жніва? Адкуль ім ведаць асновы свету, што вакол іх? Царква крычыць ім аб апраметнай, паданні пагражаюць д'яблам і ведзьмакамі* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). *І яшчэ, панове… Народ не з вамі.* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Панства свайго табе шкода, а ці падумаў ты, што топчуць волю народа твайго, мову і веру яго, душу яго?* (У. Караткевіч. Дзікае паляванне караля Стаха).

Пры выяўленні кантэкстаў, дзе вербалізуецца канцэпт *беларусы*, вылучаюцца тэксты пра палешукоў. Яны, як і ўвесь беларускі народ, паказваюцца разважлівымі, сціплымі, маўклівымі, не схільнымі да крайнасцей: *Ён не быў бы Роўдам, не быў бы палешуком, Дзям'янам з самага сэрца Палесся, калі б безразважна паверыў Шахраю.* ***Быць памяркоўным*** *– гэтага патрабавала само Палессе, яно таксама было ў роздуме. Нястомна і безупынна думалі і нашэптвалі сваё рэкі, што беглі між травы і пад зямлёю…* (В. Казько. Неруш); *Шмат чаго ў палешукоў ад гэтых буслоў, шмат чаго і ў гэтых птахаў у белых світках ад людзей, што жывуць у палескім краі. Аднолькава* ***сціплыя*** *яны і* ***маўклівыя*** (В. Казько. Неруш); *Малады настаўнік шмат перажыў, перадумаў. Цэлыя вечары праседжваў ён у сялянскіх хатах, прыглядаючыся да жыцця палешукоў. Яго тут прымалі і* ***спатыкалі прыветна,*** *з ахвотаю падтрымлівалі гутарку аб розных справах. Але гэтыя гутаркі не выходзілі за межы тых пытанняў, якія закранаў сам настаўнік, бо палешукі – людзі* ***паважныя, сталыя, асцярожныя, не адразу і не кожнаму расчыняюць сваю душу,*** *бо ўжо, мусіць, сама прырода Палесся палажыла на іх сваю адзнаку. Бясконцыя балоты вучылі іх мудраму разважанню, мора лясоў выхоўвала ў іх засцярогу, бо так лёгка тут напаткаць небяспеку* (Я. Колас. У палескай глушы). Як сведчаць прыклады, на сувязь прыроды і паляшуцкага характару ўказваецца ва ўсіх прыведзеных кантэкстах.

Рэпозиторий ВГУ

У рэпрэзентацыі канцэпту *народ* у мастацкіх тэкстах важнае месца займае апісанне жахаў шматлікіх войнаў і іх наступстваў, якія давялося перажыць беларусам: *Б'юцца князі-ваяводы, а стогнуць народы: / Воіны ж гінуць у тых і другіх сутычках, / Што ім твой смерд – наша гора і нашы пакуты* (М. Гусоўскі. Песня пра зубра); *Брацце мае, беларусы! / У той кнізе людскіх спраў / Сам лёс, мусіць, для спакусы. / Гэты край нам адзначаў. / Тут схадзіліся плямёны / Спрэчкі сілаю канчаць, / Каб багата адароны / Мілы край наш звяваць* (Я. Колас. Сымон-музыка); *О бедны наш народ! / Чым толькі правініўся ты прад Богам, / Каб жыць у акружэнні чорных сіл / Быць занядбаным, ссечаным, пабітым / Тэўтонцам, туркам і рукой сваіх сыноў* (А. Дудараў. Князь Вітаўт); *Ёсць чаму, ёсць чаму / І ў народа майго павучыцца: / Як змагацца з чужынцам / Суровай парой. / Ёсць за што / І народу майму ганарыцца: / Не хадзіў і не лез ён / На землі чужыя вайной* (Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву); *Вы бачылі лес, / дзе прагал скразны? / Скажыце, вы бачылі бор той, / дзе кожнай другой няма сасны / ці сама меней – чацвёртай? / Тое ж было і з народам маім. / Сякера ваеннай навалы / прайшлася бязлітасна па ім, і – прагалы, прагалы* (А. Вярцінскі. Рэквіем па кожным чацвёртым). Сярод трагедый, якія давялося перажыць беларусам, назавём і Чарнобыльскую катастрофу: *Чорна на душы, як на тых чорных плакатах, што чарнелі на мітынгу: "А хто там ідзе / У агромністай такой чарадзе? / – Беларусы. / А што яны нясуць на сваіх плячах? / – Радыяцыю"* (Я. Сіпакоў. Одзіум).

Канцэпт *народ* цесна звязаны з вобразам песняра, паэта, "прарока": *Бо як ёсць у народа такія* [М. Багдановіч. – *К.П.*] *– / Не загіне давеку народ* (У. Караткевіч. Багдановічу); *Няма народаў малых – / Бываюць малыя паэты* (Р. Барадулін. Няма народаў малых…); *Народ без будучыні – гэта шлак планеты, / Паэты без народа – не паэты!* (В. Коўтун. Суд Алаізы). Мастак слова бачыць сваё прызначэнне ў служэнні на карысць свайму народу: *...я, Францішак, Скарынін сын з Полацка, у лекарскіх навуках доктар, загадаў "Псалтыр" ціснуці рускімі словамі славянскае мовы. Найперш – для ўшанавання і хвалы Бога ў Тройцы адзінага і Прачыстай маці яго Марыі, і ўсіх нябесных сыноў, і святых божых. А таксама – для карысці* ***паспалітага люду*** (Ф. Скарына. Прадмовы да Псалтыра); *як прыясны, просты і шчыры, праўдзіва, верна і адкрыта, з любоўю да маёй Айчыны, паколькі мітрапаліты, уладыкі і ніхто з вучоных, каму гэта ўласна і патрэбна было зрабіць, такі доўгі час не хацелі гэтага, народу майму раблю паслугу з убогае сваёй маёмасці, на якой і пры якой жыву ў маёнтку* (В. Цяпінскі. Прадмова да Евангелля); *Не я пяю – народ Божы / Даў мне ў песні лад прыгожы, / Бо на сэрцы маю путы / І з народам імі скуты* (Я. Лучына. Не я пяю – народ божы…). Асабліва яскрава думка пра народ як найвышэйшую каштоўнасць праявілася ў творчасці У. Караткевіча: *Ёсць замест прыватнай неўміручасці – / Бессмяротнасць нацыі тваёй. / Ты памрэш. Але ў бязмежным свеце / Будуць працвітаць*

Рэпозиторий ВГУ

твой Люд і Край… / Вер, што ў гэтым, вер, што толькі ў гэтым / Шчасце пасмяротнае і рай (У. Караткевіч. Бог пайшоў); *Хан, хіба ты забыў старую прыказку: “Дзіця нараджаецца ад мацеры, а памірае за народ”. Калі адно толькі калена застанецца ад народа – дык і ад яго пойдзе ён жыць* (У. Караткевіч. Лебядзіны скіт). *Я не буду страляцца, хлопцы, – сказаў Ямант. – Мне нельга без гэтай справы, але я не застрэлюся. Гэта нізка для сына радзімы* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Недзе поруч ляжалі дарогі, / Кліч кахання ляцеў ад ніў, / Але ён не кахаў нікога, / Бо занадта радзіму любіў* (У. Караткевіч. Нявесце Каліноўскага).

Некаторыя аўтары выказваюць свой запавет нашчадкам – захаваць багатую спадчыну народа – гісторыю і мову: *Унукі Скарыны, / Дзе ваш гонар, моц і краса? / Ёсць і ў вас, як у іншых, святыня, / Не давайце святыні псам!* (У. Караткевіч. Багдановічу); *Зразумець, што ты – народ, / І ад радасці ўзвінуцца, / На любы яго зварот, / Як на імя адгукнуцца. / Са сваёй Радзімай ты – / Назаўжды адно і тое ж; / І малой неправаты / Ад яе ты не прытоіш. / Нібы маці, берагчы / Працаўніцу нашу – мову, / Бо яна жыцця зачын / І пачатак песні новай* (Я. Сіпакоў. Зразумець, што…).

Такім чынам, у мове беларускай мастацкай літаратуры выяўляюцца шматлікія моўныя адзінкі-рэпрэзентанты канцэпту *народ*. Многія з іх ужо выйшлі з ужытку (русіны, ліцвіны, люд паспаліты, тутэйшыя), але служаць важным матэрыялам для рэканструкцыі канцэпту *беларускі народ*. Названыя лексічныя адзінкі шырока выкарыстоўваюцца ў “Прадмове да Статута Вялікага Княства Літоўскага, п’есе “Тутэйшыя” Я. Купалы, а таксама ў гістарычных раманах і аповесцях “Дзень, калі ўпала страла” У. Арлова, “Меч князя Вячкі” Л. Дайнекі, “Каласы пад сярпом тваім” У. Караткевіча.

Самавызначэнне народа, абуджэнне нацыянальнай свядомасці, барацьба з прыгнятальнікамі – ключавыя тэмы разгледжаных намі тэкстаў, дзе рэпрэзентуецца канцэпт *народ.* Гэтая тэма, набыўшы асаблівую актуальнасць у пачатку XX ст., не страціла сваёй надзённасці і ў канца XX – пачатку XXI ст., у час глабалізацыі, сцірання этнічных межаў.

“Для захавання нацыянальнай ідэнтычнасці неабходна захоўваць гістарычную памяць,” – сцвярджаюць мастакі слова і звяртаюцца да яркіх прадстаўнікоў беларускай нацыі як захавальнікаў народнай спадчыны (Ф. Скарыны, К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча).

У мастацкай літаратуры канцэпт *народ* мае наступны вобразны змест: гэта калектыўная асоба, якая валодае ўласным характарам. Канцэпт *народ* рэканструюецца спараджэннем сваёй Радзімы як геаграфічнага, гістарычнага, сацыяльнага і духоўнага асяроддзя. Так, з прыведзеных намі кантэкстаў вынікае сувязь народа і прыродных багаццяў нашай краіны, якое беларусы аберагаюць і ўсведамляюць як частку сябе і якія таксама паўплывалі на характар нашых землякоў: ціхае цячэнне рэк надало

Репозиторий ВГУ

памяркоўнасці, лясы навучылі асцярожнасці і мудраму разважанню. Кагнітыўны вобраз складаецца з маральных, псіхічных, інтэлектуальных якасцей. Так, у напрамку ад найбольш частотных да найменш прадстаўленых назавём наступныя: міралюбівы характар, гасціннасць, вальналюбства, цярплівасць, гаспадарлівасць, аптымізм, таленавітасць, маўклівасць, сціпласць, мужнасць, гордасць, ахвярнасць, выносліваць, любоў да сям'і, дабрыня, гумар. Сярод адмоўных рыс беларускага народа ў беларускай літаратуры вызначаюцца наступныя: бяспамяцтва, прыстасавальніцтва, панурасць, балбатлівасць.

Як бачым, некаторыя названыя рысы характару з'яўляюцца супрацьлеглымі – маўклівасць і балбатлівасць, вальналюбства і прыстасавальніцтва. Як ужо было адзначана, намі даследуецца творчасць шэрагу аўтараў, погляды якіх могуць не супадаць. Гаворачы пра гэта, нельга не звярнуць увагу на творчасць асобных пісьменнікаў, у творах якіх канцэпт *народ* раскрыўся найбольш поўна і глыбока. На нашу думку, У. Караткевіч стварыў канцэптуальна новае разуменне характару і сутнасці беларускага народа. У літаратуры XIX – пачатку XX ст. вобраз беларуса – вобраз забітага цёмнага мужыка (творы Э. Ажэшкі, Ф. Багушэвіча, некаторыя вершы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча). Для У. Караткевіча беларус – горды нашчадак слаўных продкаў, якія перадалі яму багатую спадчыну – непаўторную мову і гераічнае мінулае. Пісьменнік неаднаразова сцвярджае, што беларускі народ – багаты талентамі, годны, вольналюбівы, велічны народ са слаўнай гісторыяй і шчаслівай будучыняй. Нарысы У. Караткевіча можна назваць энцыклапедыяй жыцця беларусаў, дзе пісьменнік з яўным замілаваннем апісвае суайчыннікаў, аднак дае ім цалкам справядлівую ацэнку: *Як і паўсюль, ёсць сярод беларусаў мяшчане і падзвіжнікі, лайдакі і працаўнікі, "малюскі" і героі… дурні і мудрацы. І кожны паступае адпаведна свайму характару, і мудрыя разважаюць мудра і па-свойму, а дурні – як паўсюль* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі).

Канцэпт *народ* у творах беларускай мастацкай літаратуры, якія вывучаюцца ў сярэдняй школе, рэканструюецца не толькі як калектыўная асоба, але і як жывая істота, якая валодае сэрцам, душой, памяццю і іншымі чалавечымі якасцямі.

Базавы пласт канцэпту *народ* у беларускай літаратуры рэканструецца як 'супольнасць, што склалася гістарычна і вызначаецца ўсведамленнем свайго адзінства і адрознення ад іншых падобных утварэнняў'. Самавызначэнне народа, абуджэнне нацыянальнай свядомасці, барацьба з прыгнятальнікамі, захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці, сувязь з роднай прыродай – паняццевыя кампаненты канцэпту *народ*, якія фарміруюць яго ядро.

Такім чынам, разгледжаны намі матэрыял дазваляе сцвярджаць, што моўныя сродкі выражэння канцэпту *беларусы* ў беларускай літаратуры

Репозиторий ВГУ

шматлікія і разнастайныя. Гэта дапамагае змадэляваць і ўявіць названае семантычнае ўтварэнне ў мастацкай канцэптасферы, дзе яно знітавана з канцэптамі *Радзіма, воля, мова*.

Па сутнасці, у кантэкстах твораў беларускіх пісьменнікаў пра беларусаў фрагментарна і разам з тым даволі падрабязна апісаны меркаванні пра беларускі народ, або нацыянальныя аўтастэрэатыпы. Безумоўна, што ва ўсіх падобных меркаваннях, стэрэатыпах ёсць пэўная доля ўмоўнасці, суб'ектыўнасці, аднак у цэлым яны ўсё ж адлюстроўваюць найбольш тыповыя рысы псіхалогіі нашай этнічнай супольнасці.

2.5 *Мова* як фактар існавання беларускай нацыі: рэпрэзентацыя канцэпту ў мове мастацкай літаратуры

Агульнапрызнана, што родная мова любой нацыі – не толькі сродак зносін паміж людзьмі, але і сродак захавання культурнай інфармацыі пра этнас. Пра сувязь мовы і духоўнага жыцця народа неаднаразова сцвярджалі не толькі вучоныя-этнолагі, але і беларускія пісьменнікі, бо "ніхто іншы, як яна [пісьменніцкая інтэлігенцыя. – *К.П.*], так добра не ўсведамляў значэння роднай мовы для лёсу свайго народа і так старанна не працаваў над умацаваннем яе пазіцый" [124, с. 31].

Вялікая роля роднай мовы ў жыцці беларускага грамадства адзначалася ў працах шматлікіх даследчыкаў [1; 16; 24; 25; 124; 146]. Як вядома, мова выступае сувязным звяном у зносінах людзей, сродкам пазнання свету, фарміруе самасвядомасць індывіда, вызначае яго спецыфіку. Чалавек, які ідэнтыфікуе сябе з пэўнай культурай, засвойвае яе стэрэатыпы, нормы паводзін, у тым ліку моўныя. У гэтым плане вельмі важным паняццем з'яўляецца родная мова, якая ў значнай ступені спалучана з этнічнай самасвядомасцю і выступае як адзін з бакоў яе, як сімвал этнічнай супольнасці. Як слушна адзначаў на гэтую тэму А.А. Лукашанец: "У сучаснай моўнай сітуацыі ўзрастае роля беларускай мовы як фактару нацыянальнай свядомасці, сімвала і сродку нацыянальнай ідэнтэфікацыі і самаідэнтыфікацыі, прычым гэта роля беларускай мовы набывае ўсё больш самастойнае значэнне" [25, с. 75].

Аналіз моўных адзінак у творчасці разгледжаных намі аўтараў паказвае, што ўжыванне лексічнай адзінкі *мова* амаль заўсёды суправаджаецца прыметнікамі-канкрэтызатарамі *родная, беларуская, матчына*. Назавём лексічныя адзінкі і словазлучэнні, якія рэпрэзентуюць канцэпт *мова* і складаюць яго намінатыўнае поле: *мова, родная мова, наша мова, наская мова, свая мова, мая беларуская мова, найсвятлейшая спадчына, скарб, зямлі маёй перлы, праменнае, звонкае слова матчына, слова наша роднае, мужыцкая гаворка, гэта мова, гэтая, здаўна славянская, любімая мова, матчына мова, маці-родна мова, скарб душы, адзежа душы, вешчая мова Баяна, айчыннае слова*.

Репозиторий ВГУ

Паходжанне ядзернай лексемы канцэпту *мова* праславянскае, слова вядомае ў многіх славянскіх мовах – ва ўкраінскай, польскай, чэшскай, старажытнарускай, славенскай, славацкай, стараславянскай. Слова мае значэнні ‘размоўная літаратурная мова’, ‘спосаб вымаўлення слоў, манера гаварэння’ [189, с. 60]. У “Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы” падаюцца наступныя дэфініцыі: 1) ‘сродак чалавечых зносін і выказвання думак з уласцівымі яму фанетыка-граматычным ладам і лексічным фондам’; 2) ‘сукупнасць унармаваных сродкаў выражэння славеснай творчасці, уласцівых індывідуальнай манеры пісьменніка’; ‘стыль’; 3) ‘здольнасць гаварыць’; 4) ‘сістэма знакаў, гукаў, сігналаў, якія перадаюць інфармацыю’; 5) ‘асаблівасць маўлення, манера гаварыць’; 6) ‘тое, што тлумачыць сабой што-н., паясняе’ [196, с. 349]. У “Частотным слоўніку беларускай мовы (Паэзія)” адзначаецца, што слова *мова* ўваходзіць у лік тысячы найбольш частотных слоў [128, с. 87].

Аналіз тэкстаў-рэпрэзентантаў канцэпту *мова* сведчыць пра тое, што найчасцей у мове твораў беларускай літаратуры семантызуецца веліч і прыгажосць беларускай мовы, а таксама гаворыцца пра любоў да яе, г.зн., асноўнымі паняццевымі кампанентамі мастацкага канцэпту *мова* з’яўляюцца ‘любоў да роднай мовы’, ‘прыгажосць роднай мовы’. Гэта выяўляецца праз ужыванне назоўнікаў са станоўчай канатацыяй (*крыніца, сонца, святыня*), прыметнікаў (*жывая, непаўторная, пяшчотнае, шчырасці поўнае, ласкавае цёплае, чыстае*), параўнанняў (*як ручаіна, як сонца, як голас птушкі, як паратунак, бы казка*) і г.д.: ***Чую*** *тваю* ***жаўруковую музыку*** */ У скошаных травах мурожных. / Мова!* ***Як сонца*** *маё беларускае, / Ты* ***свецішся*** *словам кожным. / Цябе і заворвалі, і закопвалі, / І ўсё ж нашы продкі праз гора / Данеслі да нас цябе,* ***родную, цёплую, / Жывую і непаўторную.*** */ І калі ты мяне толькі паклікаеш, / Памру за цябе без енку. / Нашу я любоў да цябе вялікую / У сэрцы сваім маленькім* (Я. Янішчыц. Мова); *Калі я засмягну ад спёкі, / дазволь мне табе пакланіцца, /* ***крыніца*** *– / роднае слова* […] */ Калі анямею раптоўна – / дык не навекі! – / голас мне вернуць не лекі, а* ***крэўнае слова.*** */ Калі растваруся ў натоўпе, / дзе твару твар не знаходзіць, / аблічча маё адродзіць /* ***айчыннае слова.*** */ Лёсу майго кірунак, / долі маёй выснова, / як паратунак, – / матчына слова, бацькава слова, /* ***роднае вечнае слова*** (П. Макаль. Роднае слова); *Я чула* ***пяшчотнае, шчырасці поўнае,*** */ маё, беларускае,* ***роднае, кроўнае****… / толькі сваё і такое* ***чароўнае****… / такое* ***ласкавае, цёплае, чыстае, / як сонца, агністае, як Нёман, празрыстае, / бы казка,*** *быліна,* ***бы песня,*** *жаданае, / дагэтуль яшчэ ў жыцці не спазнанае, /* ***вясновае слова*** *ад шчырага сэрца… / Яно* ***празвінела*** *над хвалямі ў рэчцы…* (Д. Бічэль. Роднае слова); *З легендаў і казак былых пакаленняў, / З калосся цяжкога жытоў і пшаніц, / З сузор’яў і сонечных цёплых праменняў, / З грымучага ззяння бурлівых крыніц, / З птушынага шчэбету, шуму дубровы, / І з гора, і з радасці, і з усяго / Таго, што лягло*

Репозиторий ВГУ

назаўсёды ў аснову / ***Святыня народа, бяссмерце яго,*** *–* / *Ты* ***выткана, дзіўная родная мова*** (М. Танк. З легендаў і казак былых пакаленняў…); *Гучанне гэтых слоў было незвычайнае для ўступнай прамовы. Гэта не былі французскія, польскія ці якія іншыя словы. Гэта была тая мова, на якой усе гэтыя людзі гаварылі са слугамі ў доме, з дробнай шляхтай – пры сустрэчы, з сялянамі – на полі і якую, аднак, ніхто, акрамя адзінак, якіх лічылі дзівакамі, не ўжываў пры спічах. Пад столлю вялізнай залы гучала* ***мяккая, як ручаіна, пявучая, як голас птушкі, гнуткая і цвёрдая адначасова, лаканічная мова.*** *Гучала ўпершыню за шмат год* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Канцэпт *мова* ўзнаўляецца з мастацкіх тэкстаў як ‘звяно, якое звязвае людзей у адзіны народ’: *Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее, гэта любоў да Бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы… Хто любіць свой народ, хто ў кожным бачыць брата-чалавека, той не сагнецца перад крыўдай, перад здзекам. “Але поруч з любоўю да сваіх братоў патрэбна яшчэ нешта, што* ***злучае людзей у суцэльны народ, – гэта родная мова*** (Цётка. Шануйце роднае слова). Родная мова злучае пакаленні народа – продкаў і нашчадкаў, што пацвярджаюць радкі *Адкажы – сам сабе адкажы: / Чым зрабіўся табе непрыгодны /* ***Скарб бясцэнны тваёй жа душы?*** */ Жыў ты ў горы, змагаўся ў няволі, / І канаў, і сыходзіў крывёй, / І жывым ты гарэў, а ніколі / Не саромеўся мовы сваёй. / Схамяніся ж, ачніся, агледзься! / Ды разваж, ды раздумай як след: / Што пакінеш ты з поля ў налецце? /* ***З чым нашчадкі пакажуцца ў свет?*** (Н. Гілевіч. Адкажы); *Зямлі маёй перлы, дзе іх адшукалі? / Спытай у магіл: / Удзень і ўначы / Іх, з бурамі дужаючыся, здабывалі / Людзі простыя – крывічы … / Але ўратаваў люд мой слова ад згубы / І гонячы катаў ад родных бяроз, / Праз далеч стагоддзяў сівых – з губ у губы – / Да нас, незамутнёнае, данёс. / Як скарб дарагі,* ***перададзены ў спадчыну,*** */ У сэрцы* ***хавае народ*** *мой ад здрад, / Праменнае, звонкае слова матчына / Для песень сонечных і балад!* (К. Цвірка. Перлы роднай зямлі). Як бачым, мова вобразна называецца *скарбам, спадчынай*.

З гэтага вынікае, што захаванне мовы – умова існавання нацыі: *Пакуль гучыць вакол святая наша мова, / Пакуль ёсць беларусы на Зямлі…* (час існавання мовы і беларусаў супадае) (У. Караткевіч. Дом сябра); *Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок, / Тая гордая мова, якую й тады не забудзем, / Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок* (У. Караткевіч. Беларуская песня). Паэты даволі катэгарычна выказваюцца пра народ, які забудзе сваю мову, а значыць, стане здраднікам Радзімы: *Хай не будзе світання ў народа майго, / Калі досвіткам здрадзіць табе* (У. Караткевіч. Мова); *Слову нашаму Бог дапамог. / Хто не любіць яго, ад тога / Назаўсёды адвернецца Бог!* (Р. Барадулін. Беларускае слова). Увогуле, нярэдка мова і Радзіма атаясамліваюцца: *Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад*

Репозиторий ВГУ

Вільна да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зб. “Дудка беларуская”); *“Тут, – сказаў арап. – Мне ўжо там усё было б чужое. Я і мовы сваёй не помню. Некалькі слоў, можа. Тут мая* ***і мова і зямля*** (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Наш край, мая зямля. Багатая, прыгожая, мяккая душамі людзей – яна чужая нам… Спытаюць: чым? Я скажу: мовай. Мова ў нас якая хочаце, толькі не свая. Свая яна – у сярэдняй часткі шляхты ды яшчэ ў нешматлікіх прадстаўнікоў буйной, перад якімі я нізка схіляю галаву. Бо нельга есці хлеб народа і грэбаваць ягонай мовай* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Для рэканструкцыі канцэпту *мова* ў беларускай літаратуры вельмі важна прааналізаваць гістарычныя ўмовы існавання беларускай мовы, што дапаможа вызначыць варыянты назваў мовы ў розныя часы, акрэсліць перыяды росквіту і заняпаду, статус мовы ў дзяржаве.

Адзін з першых пісьмовых кантэкстаў, у якім вербалізуецца канцэпт *мова*, – урывак са Статута Вялікага Княства Літоўскага, у якім ідзе гаворка пра старабеларускую мову як мову дзяржавы і закона: *Любому народу сорам не ведаць сваіх законаў, а нам жа асабліва, бо законы нашы выкладзены* ***не на нейкай чужаземнай мове, а на сваёй роднай,*** *і мы маем магчымасць звярнуцца да іх у любы час, даведацца, якім менавіта законам бараніцца супраць усялякай крыўды* (Зварот Льва Сапегі да ўсіх саслоўяў Вялікага Княства Літоўскага (з нагоды выдання Статута 1588 г.).

Пра мову як прыкмету дзяржаўнасці кажа герой п’есы А. Петрашкевіча “Прарок для Айчыны” Ф. Скарына (у творы нашага сучасніка падзеі развіваюцца ў XVI ст.): *С к а р ы н а. Законы, якія мы з вамі зрабілі на мове народа, гэта якраз тое багацце дзяржавы і народа, якое сцвярджае іх годнасць перад народамі-суседзямі. Г а ш т о л ь д. Вы былі б несправядлівы, доктар, калі б западозрылі мяне ў абыякавасці да роднай мовы…* ***пакуль жыве наша дзяржава, будзе жыць і яе мова.*** *С к а р ы н а. Але ж вы не будзеце пярэчыць, што, пакуль жыве мова, будзе жыць і дзяржава. Будзе жыць дзяржаўнасць* […] *С к а р ы н а. Надрукаваны Статут стаў бы першым сапраўдным сімвалам беларускасці. Ён засведчыў бы арыгінальнасць і еўрапейскую годнасць беларускай мовы і пісьмовай культуры. Мова, што б мы ні гаварылі, жыве пад пагрозай паланізацыі* (А. Петрашкевіч. Прарок для Айчыны).

У цэлым, старажытны перыяд з X па XVI ст. у мастацкіх тэкстах XX ст. характарызуецца часам росквіту беларускай культуры, мовы, літаратуры: *А Кірыла Тураўскі, а паданні? А тое, што наша друкаваная “Біблія” з’явілася раней, чым у многіх у Еўропе? А тое, што законы Статута літоўскага склалі мы? А тое, што Польшча сто гадоў судзілася законамі, напісанымі на нашай мове, а калі перакладала іх, то пакінула ўсе нашы тэрміны і адсылала тых, хто не разумее, да арыгінала? А тое, што рукапіс меж паміж Польшчай і Літвой, які даследчык лічыць польскім,*

Репозиторий ВГУ

напісаны беларускай гаворкай? А тое, што трыста год мовай княства была беларуская мова?... (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Росквіт старабеларускай мовы ў Вялікім Княстве змяніўся паланізацыяй у Рэчы Паспалітай (з канца XVI ст.). Гэта адлюстравалася ў Прадмове да Евангелля В. Цяпінскага, які палымяна і вельмі эмацыянальна гаворыць пра заняпад старабеларускай мовы і занепакоены адсутнасцю ўмоў для яе развіцця ў часы паланізацыі: *Бо хто ж з набожных не задрыжыць, на такое знішчэнне Божае гледзячы, хто б не мусіў плакаць, бачачы… у такім высакародным і асабліва раней дасціпным, адукаваным рускім народзе занядбанне сваёй слаўнай роднай мовы і папросту пагарджэнне ёю; з-за якога праз пакаранне Божае гэтая ясная ў Божым слове іхняя мудрасць як толькі пакінула іх, дык на месца адразу такое вартае жалю невуцтва прыйшло, што некаторыя ўжо і пісьма свайго, і асабліва ў слове Божым, саромеюцца?! І, нарэшце, што можа быць больш вартым жалю, больш агідным, што тыя, якія між імі завуцца духоўнымі асобамі і настаўнікамі, смела скажу, не толькі найменш ёю валодаюць, найгорш яе разумеюць і не навучаюцца на ёй, але ж нават і школы для яе вывучэння нідзе не маюць, з-за чаго польскаму або іншаму якому пісьму з такой вялікай неахвотай і са свайго боку і з боку дзяцей, не без сораму свайго, нібы разам адчулі адно і тое ж* (В. Цяпінскі. Прадмова да Евангелля). Сам жа першадрукар выдаў Евангелле на дзвюх мовах: паралельна ў двух слупках тэкст падаваўся на царкоўнаславянскай і старабеларускай (славянскай і рускай, як іх называў аўтар): *каб яно таксама і для іх (людзей) на іх уласнай рускай мове (у перакладзе) са славянскай з друку выйшла* […]. *Сам жа Гэтым Госпад зробіць іх* [дзяцей. – *К.П.*] *схільнымі і абудзіць ахвоту да вывучэння самых важных навук на сваёй мове, да сур'ёзных разважанняў і ўмельства* (В. Цяпінскі. Прадмова да Евангелля). Варта адзначыць, што Ф. Скарына таксама называў мову сваіх выданняў рускай, што можна патлумачыць пераносам сэнсаў назваў у пазнейшы час (руская мова не атаясамлівалася з тагачаснай маскоўскай).

Прэцэдэнтным тэкстам, які аб'ектывуе канцэпт *мова*, з'яўляецца Прадмова да зборніка "Дудка беларуская" Ф. Багушэвіча (1891) пад псеўданімам Мацей Бурачок. У гэтым тэксце можна вызначыць некалькі накірункаў раскрыцця зместу гэтага канцэпту: 1) сцвярджэнне годнасці роднай мовы і роўнасці яе з іншымі еўрапейскімі: *і пераканаўся, што мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо іншая якая. Чытаў я ці мала старых папераў, па дзвесце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі* (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зборніка "Дудка беларуская"); 2) важнасць захавання мовы народам, бо яна "святая", яна "адзежа душы" народа: *Ой, не! Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людцам, і гаворым жа мы ёю шмат і добрага, але так ужо самі пусцілі яе на здзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахвотней гавораць па-французску, як па-*

Репозиторий ВГУ

свойму […]; *Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы* (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зборніка “Дудка беларуская”); 3) немагчымасць існавання беларусаў як этнасу без роднай мовы на прыкладзе іншых народаў: *Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову зойме, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!* (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зборніка “Дудка беларуская”); прычыны занядбання роднай мовы беларусамі: *а ў нас як бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык можа б, і ў сваёй вёсцы сказалі, што “піша па-мужыцку”, і як дурня абсмяялі б* (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зборніка “Дудка беларуская”). Гэты зборнік мы невыпадкова назвалі прэцэдэнтным, бо ён часта цытуецца ў творах іншых пісьменнікаў (А. Гурыновіч, Цётка): *Дзякуй табе, браце, і за тыя словы, / Што ўспомніў звукі нашай роднай мовы* (А. Гурыновіч. Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею).

Сярод літаратурных дзеячаў XIX ст., якія сцвярджалі годнасць беларускай мовы, варта назваць не толькі Ф. Багушэвіча, але і А. Міцкевіча. Як вядома, паэт чытаў лекцыі па гісторыі літаратуры славянскіх народаў у Францыі, у якіх сцвярджаў, што *на беларускай мове … гаворыць каля 10 мільёнаў чалавек, гэта самая багатая і самая чыстая гаворка, яна ўзнікла даўно і выдатна распрацавана. Адам Міцкевіч. 1842* (эпіграф да верша) (К. Цвірка. Перлы роднай зямлі).

Выяўлена шмат кантэкстаў, дзе семантызуюцца пэўныя звесткі з гісторыі развіцця мовы. Так, становішча беларускай мовы напярэдадні і ў час паўстання 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага апісваецца ў творах У. Караткевіча і Я. Сіпакова: *З’явіўся ўжо беларус, ды яшчэ і князь. Глядзіце, каб хутка не з’явілася яшчэ, замест мужыцкай гаворкі, нейкая беларуская мова. – Я не чытаў пана Марцінкевіча, – сказаў Алесь. – Але існаванне беларускай мовы не залежыць ад нашых з вамі жаданняў, пане Ходзька. Як ні называй, яна проста – існуе* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Кнігі беларускія канфіскоўвалі і палілі, друкаванне іх, нават ужыванне слова “Беларусь” было забаронена пад страхам кары… Між тым, паролем Кастуся і яго сяброў былі словы: “Каго любіш? – Люблю Беларусь! – То ўзаемна!”. Але нават каб не было гэтага, заставаўся б яшчэ адзін, непарушаны нічым, факт: мова чалавека. На ёй напісаны перадсмяротныя вершы Каліноўскага. “Мужыцкую праўду” Кастусь выдаваў таксама па-беларуску* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Вось так цэлы край узялі і забілі / І вырвалі мову з глыніцы жывой, / І памяць забралі, каб казкі і былі / Навек зараслі бадылём, крапівой. / Са школаў павыгналі роднае слова, / У світцы мужыцкай не ўлезці туды. / На шчырых, сумленных наладзілі ловы, / Як воўчыя ямы – царовы суды* (Я. Сіпакоў. Шыбеніца).

Репозиторий ВГУ

Адраджэнне беларускай мовы ў XX ст. знайшло адлюстраванне ў наступных мастацкіх кантэкстах: *М і к і т а. Не маючы што рабіць, інтэрнацыянальная інтэлігенцыя выдумала гэты нейкі беларускі язык, а вы хацелі б заставіць нас, руска-ісцінную тутэйшую, межджу протчым, інтэлігенцыю, сушыць над ім свае апошнія мазгі* […] *Я н к а. О так, так! Для вашага гонару падавай вам мацярынскі язык цароў, Мураўёвых-вешальнікаў, Распуцінаў, Азэфаў і ўсея кампанія падобных ім, а на свой папраўдзе для вас родны, як вы кажаце, язык вам напляваць* (Я. Купала. Тутэйшыя); *Мейце сілу і адвагу дзяржацца роднага слова. Мейце смеласць усюды голасна казаць па-свойму. І, гледзячы на вас, асмеляцца і іншыя* (Цётка. Шануйце роднае слова). Як бачым, пасля забароны і забыцця беларускай мовы шлях да яе адраджэння не быў лёгкім, што ўскладняла стаўленне насельніцтва да "мужыцкай" мовы.

Як паказвае даследаваны матэрыял, вельмі часта мастакі слова заклікаюць шанаваць і берагчы мову: *Ты, мой брат, каго зваць Беларусам, / **Роднай мовы** сваёй не цурайся; / Як не зрокся яе пад прымусам / Так і вольны цяпер не зракайся. / Ад дзядоў і ад прадзедаў, браце, / Гэты **скарб** нам адзін захаваўся, / У сялянскай аграбленай хаце / Толькі ён незабраны астаўся* […] */ Можа б, ты і памёр і загінуў, / Каб не вешчая **мова Баяна.** / Хто ж быў добры, яе хоць пакінуў? / Як жа так, што яшчэ не забрана? / Бо што бачылі госцікі-герцы – / І зямлю, і лясы, і кілімы, – / Усё забралі. А **мову ў сэрцы,** / Ў сваім сэрцы хавалі-няслі мы. / Дык **шануй,** Беларус, сваю мову – / Гэты **скарб** нам на вечныя годы; / За пашану **радзімаму слову** / Ушануюць нас брацця-народы* (А. Гарун. Ты мой брат).

Пры рэканструкцыі канцэптаў *Радзіма* і *народ* у мове твораў беларускай літаратуры ўжо адзначалася, што гэтыя паняцці пісьменнікі звязваюць са знакамітымі асобамі Беларусі. Канцэпт *мова* таксама не стаў выключэннем: *Слова наша роднае, хапала / На стагоддзі доўгія цябе. / **Багдановіч, Колас** і **Купала** / Прыпадалі да цябе ў журбе, / Адкідалі кпіну і абразу, / З дзён былых цягнулі ў заўтра ніць / І хаця не ўсіх і не адразу, – / Навучылі ўсё ж цябе цаніць* […] */ Мова продкаў нашых і нашчадкаў – / Шэпт дубровы і пчаліны звон – / Нам цябе ласкава і ашчадна / Спазнаваць ажно да скону дзён, / Па чужых краях не пабірацца, / Не аддаць цябе на забыццё, / Наша невычэрпнае багацце, / Наша несмяротнае жыццё* (Г. Бураўкін. Слова наша роднае…); *Я з той краіны, што ў век беспрасветны / Ясны прамень нарадзіла – **Скарыну** / І песню для славы дала сусветнай / **Адаму Міцкевічу** – роднаму сыну. / З краіны, дзе **Каліноўскага** слова / Лес гнеўных кос на цара ўзнімала, / Дзе голасам чыстым у час суровы / Зваў з цемры люд свой **Янка Купала.** / ...Дзе песню новую да небакраю / Нясе маладосць на шляхах вясновых / І плешча мора – вечна жывая, / Мая беларуская звонкая мова!* (К. Цвірка. Я з той краіны).

Пры рэпрэзентацыі канцэпту *мова* варта вылучыць паняццевы кампанент 'навучанне на роднай мове ў розныя перыяды': *Дзеля таго*

Репозиторий ВГУ

таксама, каб вашыя княскія мосці не толькі на чужаземных мовах зналіся, але і гэтую, здаўна слаўную славянскую мову таксама палюбілі і на ёй вучыцца пажадалі. Бо слушная рэч, каб вашыя мосці таго народу мову ўзлюбілі, у якім даўнія продкі і іхнія міласці панове бацькі вашых мосцяў галоўныя пасады займалі і займаюць (С. Будны. Прадмова да асвечаных князёў і паноў, іхняй мосці паноў Мікалаяў Радзівілаў. XVI ст.). Можна знайсці звесткі пра барацьбу беларусаў за права навучання на роднай мове ў 1921–1939 у Заходняй Беларусі (калі гэтыя землі належалі Польшчы): *Каб далі вучыцца нам на мове роднай / Ўсе мы дамагаліся грудзьмі!..* (М. Танк. Песня кулікоў); *Мы, сяляне вёскі Галынка, – чытаў Мікола, – заяўляем пратэст супроць таго, каб нашы дзеці вучыліся не на роднай мове, і патрабуем адкрыць у нас беларускую школу* (Я. Брыль. Сірочы хлеб). Занядбанне ці росквіт роднай мовы ў будучыні ў многім залежыць ад навучання на ёй новых пакаленняў: *Магутныя бюракраты / Уласным сцверджанням рады: / "Гаворыш па-руску – / Інтэрнацыяналіст; / Гаворыш па-беларуску – / Нацыяналіст. / Вучы дзяцей французскай, / Ангельскай, эсперанта, / Але не беларускай…" / Палохаюць піраты. / І адвучылі / Дзяцей і бацькоў, / І адлучылі / Ад родных народных слоў* (П. Панчанка. Развітанне); *А мову ледзь не затапталі / І асмяялі, як раней. / А вы ў народа запыталі, / Якая мова нам радней? / Бацькі (яшчэ не ўсе), / І дурні, / І хамы (хамам не пярэч!) / Сцвярджаюць: "Руская – культурней / І прагрэсіўней. / Нашу – прэч! / …А мову родную заўсёды / І ўсюды вучыць першы клас. / А ў нас стыдаюцца: "Не модна…", / Як і калісьці ў царскі час* (П. Панчанка. А мову ледзь не затапталі). Пра важнасць навучання на роднай мове казалі многія беларускія вучоныя-гісторыкі, этнолагі, сацыёлагі [1; 124; 144]. Так, Л. Лыч сцвярджае: "Нацыянальна-культурнае адраджэнне любога этнасу немагчыма без стварэння і функцыявання нацыянальнай школы" [124, с. 148].

Даволі супярэчліва падаецца ў кантэкстах, дзе вербалізуецца канцэпт *мова*, пытанне пра мову як вечную або як знікаючую існасць. Сустракаюцца мастацкія тэксты, дзе сцвярджаецца, што мова вечная: *Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі, / Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок.* ***/ Тая гордая мова, якую й тады не забудзем, / Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок*** (У. Караткевіч. Беларуская песня); *Іншы бохан ляжыць пад абрусам, / На сцяне цікавейшы абраз, / толькі роднае мовы на вуснах / Не крануў усё мяняючы час* […] */ Мова з крыўдай, са скарбамі ўласнымі, / Што пранесла праз жудасны век, / і сівая, і разам сучасная, / як харошы, жывы чалавек. / Новы час непатрэбнае крышыць. / Наша ж* ***мова, як вечнасці ніць,*** *з праславянскіх крыніц і узвышшаў / красаваць будзе з намі і жыць* (М. Танк. Іншы бохан…); *Магутнае слова, ты, роднае слова! / Са мной ты наяве і ў сне; / Душу мне затрэсла пагудкаю новай, / Ты песень наўчыла мяне. /* ***Бяссмертнае слова,*** *ты, роднае слова! / Ты крыўды, няпраўды змагло; /*

Репозиторий ВГУ

Хоць гналі цябе, накладалі аковы, / Дый дарма: жывеш, жыло! / Свабоднае слова, ты, роднае слова! / Зайграй ты смялей, весялей! / Хоць гадзіны сыкаюць, кружацца совы, / Жывеш ты на хвалу людзей. / Загнанае слова, ты, роднае слова! / Грымні ж над радзімай зямлёй: / Што роднае мова, хоць бедная мова, / Мілей найбагатшай чужой! (Я. Купала. Роднае слова); *Суджана, стаўлена пад перакладзіны. / Сечана, палена, а не аддадзена, / Не парастрачана і не раскрадзена, / Рупна ў падмуркі на золку пакладзена / Роднае слова. / Хоць яго з поля, як зелле высмыквалі, / Не забывалася ў песні музыкавай, / Не знебывалася ў долі нясытае, –* ***Намі навечна ў насевак усыпана*** (М. Лужанін. Роднае слова); *У любімай мове, роднай, наскай, / Ах, якія словы: "Калі ласка!.." / Як звіняць яны сардэчнай струною, / Праз усё жыццё ідуць са мною* (П. Броўка. Калі ласка).

Сустракаюцца кантэксты, дзе сцвярджаецца адваротнае: *Мы спазніліся / На сотні, напэўна, гадоў, / А можа, / На цэлае тысячагоддзе. / Мы забылі пра вольнасць / Старажытнах сваіх гарадоў. / Наш цягнік адышоў. /* ***Знікла родная мова / Ў народзе*** […] */ Родны Янка Купала, / Вы пісалі: / – Я веру – настане…! / Дарагі мой Іван Дамінікавіч, / Не, не настане! / Гэта ўжо світанне, / Гэта наша настала змярканне, /* ***Гэта з мовай маёй, / Гэта з песняй маёй / Развітанне*** (П. Панчанка. Развітанне); *Апошні Журавель ляцеў са сцэны, / Каб раскалыхваць скурчаныя душы* […] */ На цэлы свет крычаў адчайна, смела / Пра ўсё, аб чым сказаць баяцца людзі. / Пра тое, што падсечана карэнне / І рушацца адвечныя асновы, / Што ўзнікла недарэчнае стварэнне – /* ***Народ, які жыве без роднай мовы*** (С. Законнікаў. Чорная быль).

Акрамя канцэптаў *Радзіма* і *народ*, канцэпт *мова* сваім паняційным зместам блізкі да канцэпту *сям'я* (маці): ***Дала мне маці гэту мову,*** */ Каб не нямым прыйшоў у свет, / Дала мне маці гэту мову, / Як спадчыну і запавет / Была яна не беларучкай / І на жніве і на сяўбе; / На глебе добрай беларускай / Здабыты словы ўсе яе…* (А. Пысін. Дала мне маці гэту мову…); ***Гук слова роднага, з якім ад першых дзён / Мяне ў калысцы маці калыхала*** […] */ Гук слова роднага… Дык гэта ж ты і ёсць. / Пах хлеба жытняга… / То ж Беларусь – Айчына, / А я твой сын, ад косці тваёй косць, / Кроў ад крыві тваёй, мая Айчына* (С. Дзяргай. Родная мова); *А ў матуліным сэрцы найвялікшае сонца жыве, / Найвялікшае сонца – мая беларуская мова. /* ***Слова маці!*** *Цябе перадам я сынам. / Ты – мой скарб дарагі, найсвятлейшая спадчына. / За цябе, калі трэба, жыццё я аддам, / Толькі б песня не моўкнула б матчына* (Я. Крупенька. Ёсць у кожнага з нас незабыўны маленства куток); *Гэй* ***ты, маці, родна мова,*** */ Гэй ты, звон вялікі, слова, / Звон магучы, / Звон бліскучы, / З срэбра літы, / З злота збіты, / Загрымі ты, / Загрымі!* (А. Гарун. Песня-звон). Як бачым, мова або параўноўваецца з маці, альбо перададзена ад маці як самая дарагая спадчына.

Рэпозиторий ВГУ

Частотнасць кантэкстаў з моўнымі адзінкамі *беларуская/родная мова* паказвае, што гэты канцэпт надзвычай актуальны для беларускай мастацкай літаратуры. На важнасць мовы ў фарміраванні і існаванні беларускай нацыі ўказвалі многія вучоныя-беларусазнаўцы [56; 16; 171]. Пра мову як чалавечае маўленне ідзе гаворка толькі ў некалькіх выяўленых намі кантэкстах: *Каб расказаць пра ўсе цуды – мала слоў у чалавечай мове* (Я. Баршчэўскі. Шляціц Завальня); *Сэрцам мяне і, скажам, іспанца можа яднаць толькі пісьменства… Значыць, мова, прыгожае пісьменства, паэзія, музыка, усё такое, гэта не дрындушкі, а сродак сувязі між душамі людзей* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова* (А. Разанаў. Паляванне ў райскай даліне).

Канцэпт *мова* рэпрэзентуецца ў мастацкай літаратуры як існасць, што аб'ядноўвае людзей у нацыю, і перадаецца ад продкаў да нашчадкаў як каштоўная спадчына. Менавіта адсюль вынікае неабходнасць захавання роднай мовы беларусамі. У шматлікіх кантэкстах *мова* рэканструюецца як прыгожая, багатая, лаканічная. Мастакі слова кажуць пра любоў да яе, немагчымае жыццё без роднай мовы.

Намі выяўлена даволі шмат тэкстаў беларускай літаратуры, з якіх рэпрэзентуецца гісторыя роднай мовы. Так, час Вялікага Княства Літоўскага, калі старабеларуская мова была дзяржаўнай мовай, мовай Статута, лічыцца часам яе росквіту, што пацвярджаюць тэксты як тагачасных аўтараў (Л. Сапега, В. Цяпінскі), так і нашых сучаснікаў (У. Караткевіч, Ю. Свірка і інш.): *Яго* [народа. – *К.П.*] *роднаю мовай / Гаварыла Вялікае Княства, / А пасля без яе, незаменнай, / Марнеў і нямеў* (Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву). У часы Рэчы Паспалітай існавалі неспрыяльныя ўмовы для развіцця мовы праз палітыку паланізацыі, яшчэ больш неспрыяльнымі яны былі ў часы Расійскай імперыі (XVIII ст. – пач. XX ст.). Аднак у гэты час былі створаны найважнейшыя тэксты, прысвечаныя мове і напісаныя на ёй (Прадмова да зборніка "Дудка беларуская" Ф. Багушэвіча, "Мужыцкая праўда" К. Каліноўскага). Адраджэнне мовы ў пачатку XX ст. адбывалася на хвалі беларусізацыі. Канцэпт *мова* актуалізуецца ў гэты час у творах Цёткі, Я. Коласа, Я. Купалы, А. Гаруна і інш.

Пісьменнікі XX ст. заклікаюць берагчы родную мову, каб не страціць сваёй нацыянальнай адметнасці. Умова ж захавання мовы – навучанне на ёй маладога пакалення, пашырэння ўжывання мовы, пашана да яе. Калі казаць пра пагрозу знікнення мовы, то ў беларускай літаратуры, як ужо адзначалася, сустракаюцца тэксты, дзе мова паўстае як вечная (у большасці выпадкаў) і як знікаючая.

Ядро канцэпту *мова* складаецца з паняццевых кампанентаў: 'прыгажосць беларускай мовы', 'любоў да роднай мовы', 'мова з'ядноўвае продкаў і нашчадкаў, людзей у адзіны народ', 'мова – умова існавання

Репозиторий ВГУ

народа’. Змест канцэпту *мова* блізкі сэнсаваму напаўненню канцэптаў *воля*, *народ*, *Радзіма*.

Вобразны змест канцэпту можна змадэляваць наступнымі перцэптыўнымі прыметамі: слыхавыя (пераважаюць над астатнімі, што можна патлумачыць асацыятыўнай сувяззю *мова – слухаць*): *шэпт дубровы і пчаліны звон, звукі нашай роднай мовы*; *пявучая, як голас птушкі*; *Як звіняць яны* [родныя словы. – *К.П.*] *сардэчнаю струною*; *жаўруковая музыка*; *звон вялікі*; *звон бліскучы*; *з срэбра літы*; *гук слова роднага, з якім ад першых дзён / Мяне ў калысцы мама калыхала*; *і плешча мора – вечна жывая, / Мая беларуская звонкая мова!*; *Праменнае, звонкае слова матчына / Для песень сонечных і балад!* Прадстаўлены таксама зрокавыя *(трапяткая і сіняя, як васілёк; Мова, як сонца маё беларускае, / Ты свецішся словам кожным; чыстае; як сонца, агністае; як Нёман, празрыстае; найвялікшае сонца – мая беларуская мова)*, тактыльныя (*гарачая, як прамень; мяккая, як ручаіна; цёплая, там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок)*, смакавыя (*Гук слова роднага… / Пах хлеба жытняга*) вобразныя прыметы. Параўнанне мовы з сонцам можна патлумачыць станоўчай канатацыяй лексічнай адзінкі *сонца* ў моўнай свядомасці беларусаў, у той час калі для многіх паўднёвых народаў такое параўнанне не мае пазітыўнай ацэнкі, бо сонца ўспрымаецца імі як бязлітасная, злая стыхія і акружана адмоўным сэнсавым арэалам. Кагнітыўны вобраз канцэпту мадэлюецца наступнымі прыметамі: *не беларучка; і сівая, і разам сучасная, як харошы, жывы чалавек; пяшчотная, шчырасці поўная, ласкавая*.

Інфармацыйнае поле мастацкага канцэпту *мова* складаецца з наступных паняццевых кампанентаў: ‘прыгажосць беларускай мовы’, ‘любоў да роднай мовы’, ‘мова з’ядноўвае продкаў і нашчадкаў, людзей у адзіны народ’, ‘мова як спадчына і запавет’, ‘дзе родная мова, там і родная зямля’, ‘родная мова – мова навучання’, ‘мова яднае душы людзей’, ‘мова – умова існавання народа’, ‘мова – святыня народа, бяссмерце яго’, ‘мова дзяржавы, законаў’, ‘мова ад маці’, ‘мова – вечная/знікаючая існасць’, ‘гатоўнасць ахвяраваць жыццём дзеля мовы’, ‘занядбанне мовы’.

Ацэначная зона дадзенага канцэпту можа быць прадстаўлена наступнымі кантэкстамі: *родная мова, хоць бедная мова, / Мілей найбагатшай чужой* (Я. Купала); *Як скарб дарагі, перададзены ў спадчыну, / У сэрцы хавае народ мой ад здрад* (К. Цвірка); *ты мой скарб дарагі – найсвятлейшая спадчына* (Я. Крупенька); *Тая гордая мова, якую й тады не забудзем, / Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок* (У. Караткевіч); *Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова* (А. Разанаў); *Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная* (Ф. Багушэвіч); *А мову ледзь не затапталі / І асмяялі, як раней* (П. Панчанка). Такім чынам, канцэпт *мова* мае станоўчае ацэначнае

Репозиторий ВГУ

значэнне як у кантэкстах, дзе ідзе гаворка пра любоў і пашану да роднай мовы, так і ў кантэкстах, дзе выказваецца думка пра забыццё роднай мовы.

Калі казаць пра вобразны змест канцэптаў (тэрмін І.А. Сцерніна), трэба адзначыць, што сярод перцэптыўных прымет у канцэпце *мова* часцей сустракаюцца гукавыя характарыстыкі, а для канцэпту *Радзіма* больш частотнымі з'яўляюцца зрокавыя прыметы.

2.6 "Найвышэйшая маральная каштоўнасць": аб'ектывацыя канцэпту *воля* ў мове мастацкага тэксту

Згодна з дадзенымі этымалагічных слоўнікаў, словы *воля і свабода* адносяцца да старажытнага пласта спрадвечнай лексікі, прычым слова *воля* – індаеўрапейскае, а слова *свабода* – славянскае з коранем індаеўрапейскага паходжання. Слова *воля* характарызуецца працэсуальнай семантыкай, у структуры якой вылучаюцца семы 'жаданне', 'хаценне', 'улада', 'магчымасць выбраць'[194, с. 191; 176].

Заўважым, што ў рускім мовазнаўстве канцэпты *воля* і *свабода* разглядаюцца як самастойныя канцэпты, якія ўтвараюць сэнсавую пару. Н.М. Катаева адзначае: "Даследаванні канцэптуальнай пары *воля* і *свабода* дазваляюць сцвярджаць, што ў рускай моўнай свядомасці воля, будучы звязанай са свабодай, амаль заўсёды ёй супрацьпастаўляецца, у адрозненне ад свабоды яна з'яўляецца асобай адзінкай ментальнасці рускага чалавека" [2, с. 42].

На нашу думку, у беларускай моўнай свядомасці няма выразнага падзелу паміж дадзенымі лексічнымі адзінкамі. Лексемы *воля* і *свабода* сінанімічныя, што пацвярджаюць дадзеныя "Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы": воля – 'свабода ў праяўленні чаго-н.', 'свабода, незалежнасць' (процілеглае – няволя) [182, с. 116]; свабода – 'незалежнасць, адсутнасць абмежаванняў, якія звязваюць грамадска-палітычнае жыццё і дзейнасць якога-н. класа, усяго грамадства або яго членаў' [182, с. 589]. На прыкладзе аналізу мовы мастацкай літаратуры можна сцвярджаць, што лексема *воля* больш распаўсюджаная.

У беларускай мастацкай літаратуры вылучаецца канцэпт *воля*, які рэпрэзентуецца з дапамогай ключавой лексемы *воля* і семантычна блізкіх актуалізатараў *свабода, незалежнасць, нашай волі сцяг, вольнасць, годнай волі дар, воля светлая, не знацца з прымусам*. Таксама можна вылучыць канцэптуальную апазіцыю *воля – няволя* (жыццё пад'ярэмнае ў чорнай няволі, рабства, путы).

Колькасны аналіз кантэкстаў паказаў, што найчасцей у беларускай мастацкай літаратуры ідзе гаворка пра волю народа (Радзімы), а не асобы, чалавека (45 кантэкстаў і 32 адпаведна). Такім чынам, можна сцвярджаць, што гэты канцэпт актуальны для беларускай нацыі і стаіць у адным шэрагу з такімі каштоўнасцямі, як Радзіма, народ, мова.

Рэпазіторый ВГУ

Так, даволі частотнымі з’яўляюцца кантэксты, у якіх сцвярджаецца, што беларусы – свабодны, вольналюбівы народ: *Народ… Жывы, разумны і* ***вольналюбівы.*** *Так ён глядзеў на сябе сам, так павінны глядзець на ягоны тагачасны воблік і мы. Ён давёў гэтае* ***вальналюбства*** *і, хай сабе не заўсёды спалучаную з зухаватасцю, спакойную смеласць і ў бясконцых паўстаннях супраць прыгнятальнікаў, і ў пераможных войнах з татарамі і крыжаносцамі, і ў вялікай мужыцкай вайне XVII ст. і, урэшце рэшт, у апошняй вайне з фашызмам. ...Галоўнай яго* [беларускага народа. – *К.П.*] *рысай з’яўлялася* ***свабодалюбства*** (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі); *Дзе мой край? Там, дзе людзі* ***ніколі не будуць рабамі,*** */ Што за поліўку носяць ярмо ў безнадзейнай турме* (У. Караткевіч. Беларуская песня); *Навучыла жыццё* ***волю светлую піць*** */ І ніколі* ***не знацца з прымусам.*** */ Навучыла зямля, як радзіму любіць, / Як любіць крывічан-беларусаў* (Л. Случанін. Рагнеда). Або воля народа чакаецца: *З новай думкай, з новай песняй / Выйдзеш ты на нівы, / Беларусе, на прадвесні, / Браце мой цярплівы* […] */ Ў Добрай долі і прыгодзе, / Радасны, шчаслівы, /* ***Жыць ты будзеш у свабодзе,*** */ Браце мой цярплівы* (Я. Купала. З новай думкай!); *Асаблівым поспехам карыстаўся святы Юры, які забівае дракона, і святы Мікола за сваё сялянскае паходжанне і за тое, што (па беларускай легендзе) аднойчы ўратаваў адзіную кабылку беднага мужыка, якая заблукала ў лесе. Не даў раздзерці ваўкам і памог ажарабіцца, а пасля прывёў гаспадару. Згодна павер’ю, калі жарабятка падрасце, то на ім паедзе той, хто дасць волю народу* (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі).

Нярэдка лексемы *мова* і *воля* знаходзяцца ў адным сінанімічным радзе ў мастацкім тэксце. У гэтым бачыцца глыбокая сувязь аднайменных канцэптаў: мова народа – прыкмета суверэнітэту, незалежнасці краіны. Народ, які не можа гаварыць на роднай мове, не можа лічыцца вольным: *Беларусь мая, сонца, / Дарагая і родная маці! На якіх раздарожжах / Згубіла ты шчасце сваё?* […] */ ...Край сагнуўся ў спіне, / Край баіцца размовы* ***пра волю, / Край згубіў сваю мову*** */ І матчынай песні напеў…* […] */ І няўжо не ўваскрэсне / Забытая родная мова / Не на тое, каб енчыць, / А каб крыкнуць да ўсіх на зямлі: “Устаньце, хлопы, да зброі! / Ліце кроў для вялікай любові…!* (У. Караткевіч. Паўлюк Багрым); *Забяры ў чалавека ў адзін дзень сваякоў, хлеб,* ***волю, мову.*** *Ён жа ўзбунтуецца. Ён зброю возьме. А тут ціснуць патроху, па каліву, па слоўцу, па чалавеку, па песні – непрыкметна адбіраюць* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *І растопча, як праўду людзей, / Нашу* ***волю і родную мову.*** */ Свежы вецер у голлях гудзе, / Стогне край пад арлом двухгаловым* (В. Коўтун. Суд Алаізы).

Блізкім да паняццевага кампанента ‘воля–мова’ з’яўляецца складнік ‘воля – свабода слова, пясняр (лірнік) як носьбіт праўды’: *Каліноўскі: Кніг пазбавілі – хочуць і ліры пазбавіць. Ведаюць:* ***пакуль слухаюць людзі хаця***

Репозиторий ВГУ

б аднаго лірніка, не памерла воля (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *І прыйдзе новых пакаленняў / На наша месца грамада / Судзіце суд, ці мы сумленна / Жыццё прайшлі, ці чарада / Зняваг мінулых нас не з'ела, (...) / І ці пакінулі на памяць /* ***Мы песень гэтакіх змаглі, / З якіх бы можна было ўцяміць, / Што мы свабоднымі былі?..*** (Я. Купала. І прыйдзе…); *Так гаварыў і* ***з рабства клікаў / Людзей на волю той прарок,*** */ Ждучы з трывогаю вялікай / Ад іх адказу неўнарок* (Я. Купала. Прарок); *Скажы, як у няволі жывецца, / Як нам шыі здушыла ярмо, / Як душа наша томіцца, рвецца, / Як жыццё прападае дармо* (Я. Колас. Песняру); *Прайшло шмат гадоў з таго часу. Скрыпка разбілася. Але памяць аб музыку не загінула з ім разам. І з-паміж таго народа, катораму ён калісь іграў, выйдуць* ***дзясяткі новых музыкаў*** *і граннем сваім* ***будуць будзіць людзей к свету, к праўдзе, брацтву і свабодзе*** (М. Багдановіч. Музыка).

Працягваючы тэму незалежнасці народа, варта падкрэсліць, што гэтае паняццевае напаўненне канцэпту *воля* звязана з асобай К. Каліноўскага, што пацвярджаюць шматлікія тэксты з мастацкай літаратуры: *І, гледзячы на яго* [Кастуся Каліноўскага. – *К.П.*]*, Алесь думаў: "Бунт ідзе… Ідзе паўстанне… Ідзе рэвалюцыя, выбух шалёнага гневу і ярасці. Няўмольны пажар ад Гродні да Дняпра. Яго не можа не быць, такое зрабілі з людзьмі… Ідзе воля да майго народа і ўсіх народаў* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Калі памяраць, то памяраць за сваю волю і веліч. Не паўставаць, калі белае панства наплюе на інтарэсы Беларусі* (словы К. Каліноўскага) (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *А ты не чакай дабрадзеяў, народзе, / Ніхто табе волі не дасць самахоць. / Пасейся ў свабодзе, радзіся ў свабодзе, / І здзейсні сваю векапомную хоць! / І нашых з табой намаганняў не сцерці. / Сказаць я хачу пасля столькіх нягод, / Што большага шчасця няма як памерці / За вольную волю і вольны народ* (маналог К. Каліноўскага) (Я. Сіпакоў. Шыбеніца). Канцэпт *воля* ў моўнай карціне свету беларусаў, на нашу думку, звязаны з постаццю К. Каліноўскага ў многім дзякуючы гістарычным звесткам пра паўстанне 1863–1864 гг., а таксама ўрыўкам з "Мужыцкай праўды", асноўным пытаннем якой было пытанне пра зямлю і волю.

Сучасныя аўтары афармляюць тэксты, у якіх семантызуецца *воля*, як выказванні знакамітых асоб Беларусі (К. Каліноўскі, П. Багрым, М. Багдановіч у У. Караткевіча, Скарына у А. Петрашкевіча, Цётка ў В. Коўтун: *С к а р ы н а. Так, летуценнік. І мой дэвіз – роўная свабода ўсім, агульнае багацце для ўсіх* (А. Петрашкевіч. Прарок для Айчыны); *О, як хочацца волі! / Жаданае волі, ты чуеш? / Асвяці мне ўсмешкай / Апошнія дні ў жыцці. / Ты маўчыш? / Ты не чуеш?* […] / *Паміраю і веру: Калісьці над светлымі водамі, / Над свабоднай зямлёю / І над Белаю Руссю маёй / Шчасце сонцам заззяе, / І Слова нашчадка свабоднага / Мае раны загоіць / Гаючай жывою вадой* (У. Караткевіч. Паўлюк Багрым); *А л а і з а. Ніколі б*

Рэпозиторий ВГУ

не падумала, прызнацца, / Што й на радзіме можна нажывацца, / На барацьбе, на шчасці для народа, / На тым святым, што мы завем "Свабода!" (В. Коўтун. Суд Алаізы).

У самай вялікай групе кантэкстаў-вербалізатараў канцэпту *воля* гаворыцца, што свабода – найвышэйшая маральная каштоўнасць, а таму лексічная апазіцыя свабоды – няволя – уяўляецца бядой, цяжкім выпрабаваннем: *Мудрацы розных часоў лічылі, што ў кожнай дзяржаве прыстойнаму чалавеку* ***даражэй за*** *ўсё на свеце яго* ***свабода. Няволя*** *ж настолькі* ***агідная,*** *што ад яе трэба пазбаўляцца ўсімі сродкамі. Таму людзі, якія паважаюць сябе, не павінны шкадаваць ні маёмасці, ні нават свайго жыцця, каб не трапіць пад* ***жорсткую ўладу няволі.*** *А тыя, хто зрабіўся* ***паднявольным,*** *але мае* ***свабодалюбівы*** *характар, таксама не павінны цярпець над сабой непрыяцеля. І не толькі нейкага чужаземца, да якога трапілі ў палон, але і свайго тутэйшага* (Леў Сапега. Прадмова да Статута 1588 г.); *Бог барані, калі нас перамогуць прышэльцы, / Лепш ужо смерць нам усім без пары, чым такая / Доля –* ***жыццё пад'ярэмнае ў чорнай няволі*** (М. Гусоўскі. Песня пра зубра); *У гэтым раскаце чуецца воля, / Чуецца радасць зямлі. / Ў грукаце гэтым многа ёсць сілы, / Чуецца моц і прастор / ...Гром ты магутны, гром адзінокі! / ...Моцна мяне ты клічаш на волю /* ***Цяжка без волі*** *мне тут. / Кланяйся, громе, роднаму полю, / Родны вітай ты мой кут!* (Я. Колас. Першы гром); ***Лепш змагацца вольным,*** *браце, / Чым цярпець ды гнуцца!* (Я. Колас. Будзь цвёрды); *Сорак гадоў б'юся, / Ніяк не звярнуся, / Ніяк не натраплю / Вадзіцы хоць каплю, / Ды такой вадзіцы, / Ды з такой крыніцы, / Што як хто нап'ецца, / Дык* ***вольным стаецца*** (Ф. Багушэвіч. Мая дудка); *От, здаецца б,* ***і не еўшы / Быў бы сыты на свабодзе,*** */ Як той кролік у гародзе. / Тут, здаецца, і сканаў бы, / За свабоду жыццё б даў бы!* (Ф. Багушэвіч. Кепска будзе); *Куды вядзеш, скажы? Што хочаш дам, Ды толькі* ***волю не аддам ніколі!*** (В. Шніп. Паэзія); *І не ўстаў ніхто, і не сказаў людзям, што няможна рэзаць адзін аднаго, што свет вялікі і на кожнага хопіць ніў, што хлеб аднолькава смачны, на якой мове яго ні называй. Не мог сказаць…* ***Справа ішла больш чым пра хлеб. Справа ішла пра свабоду*** (У. Караткевіч. Паром на бурнай рацэ); *Вы не разумееце нават, што ён не за сябе, што ён за народ, за вас, за гэтых бедных людзей. Ён не дзеля грошай, не дзеля ўлады… Каб народ быў вольны. Гэта і ваш народ, пан капітан.* ***Воля патрэбна ўсім.*** *А нам, беларусам, рускім, палякам, – больш за ўсіх. Бо мы штодня без яе паміраем у пакутах* (У. Караткевіч. Паром на бурнай рацэ).

Адсюль вынікае, што 'воля асацыюецца з паняццямі лепшай долі, лёсу': *Не чакай долю, здабудзь волю* (Прыказка); *Але голас праўды, згоды / Не памрэ ў душы ніколі: / Будзе клікаць ён на волі, / Будзе ў сэрцы жыць заўсёды, / Як той вобраз лепшай долі* (Я. Колас. Сымон-музыка); *Ты мне гаворыш, што долю і волю / бачыць не суджана нашай айчыне? / Вецер*

Репозиторий ВГУ

ганяе тут попел над полем, / попел у спадчыну вораг пакінуў? / ...Шчасце здабудуць мазольныя рукі, / Шчасце мы створым сваімі рукамі. / Ведаць не будуць пра гора ўнукі, / што панавала ад веку над намі (У. Дубоўка. Ты мне гаворыш). Воля ўяўляецца важнай умовай дабрабыту людзей: *М у л ь ц і к: Яны ж на зямлі выраслі, яна ж іх маці, яны ж павінны былі заместа нас на яе прыйсці, каб хлебам людзей карміць… Не пайшлі… Таму што ведалі: такія гастрыты, як ты, не дадуць ім ні спакою ні волі* (А. Дудараў. Вечар); *Васіль здагадаўся, што іх павядуць працаваць, і ў ім на момант паявілася спакуслівае жаданне папрасіцца з імі і самому, але ён прамаўчаў. Адчуў, што прасіцца дарэмна: не тое месца, каб выбіраць, што лепей, не воля* (І. Мележ. Людзі на балоце).

Для найбольш поўнага апісання канцэпту *воля* ў творах школьнай праграмы па беларускай літаратуры варта прааналізаваць дадзенае семантычнае ўтварэнне ў дыяхранічным аспекце. Так, яшчэ ў XVI ст. Леў Сапега ў Прадмове да Статута Вялікага Княства Літоўскага даволі поўна раскрыў сутнасць паняцця воля: *Галоўнай мэтай законаў ва ўсім свеце з'яўляецца падтрыманне ў грамадстве такога становішча, каб кожны мог захоўваць у непарушнасці добрае імя, здароўе і маёмасць… у гэтым заключаецца наша свабода, якой мы ганарымся перад іншымі хрысціянскімі народамі* (Л. Сапега. Прадмова да Статута 1588 г.); *...Дзеля гэтага і створаны законы – Тыя аброць і цуглі, якія будуць стрымліваць кожнага нахабніка ад усякага гвалту і свавольства і не даваць яму магчымасці здзекавацца над слабейшымі… Цыцэрон вучыў, што карыстацца свабодай можа той, хто стане нявольнікам закону. А для прыстойнага чалавека няма большай асалоды, як жыць у сваёй Айчыне ў поўнай бяспецы, ні з кім не біцца і не сварыцца* (Л. Сапега. Прадмова да Статута 1588 г.). У кантэксце вышэйсказанага варта суаднесці паняцці *воля* і *закон*. Трэба адзначыць, што значная ўстойлівасць прававых нормаў у пэўным сэнсе яшчэ больш узмацняла схільнасць беларусаў жыць па "законах продкаў". Вядомая кансерватыўнасць беларускай ментальнасці знайшла адлюстраванне ў працытаванай вышэй частцы Статута Вялікага Княства Літоўскага. У мінулым беларусы ставіліся да законаў і прававых нормаў з павагай, былі законапаслухмянымі грамадзянамі. Іншаземныя падарожнікі па Беларусі адзначалі, што сярод беларусаў былі адноснай рэдкасцю цяжкія злачынствы супраць асобы і грамадства [16, с. 98]. Такім чынам, можна сказаць, што воля ў свядомасці беларусаў абмяжоўваецца законам.

У літаратуры XIX ст. галоўным рэпрэзентантам канцэпту *воля* была лексема *вольнасць* – адмена прыгоннага права, воля былых прыгонных: *…але і цяпер не надта нам лепей: далі нам вольнасць, далі – праўды! Але гэта* ***вольнасць*** *мала нам лепей выходзіць, як тая даўнейшая прыгонная няволя! А пакажыце вы мне, хто з гэтай вольнасці так дужа разбагацеў?* (Дзядзька Антон. Ананімны твор); *Дай нам толькі, Божа, скоранька прыждаці* [волі. – *К.П.*], */ Каб маглі спакойна пасядзеці ў хаце, / Пана не*

Репозиторий ВГУ

баяцца і войта загаду, / Было б у нас болей дабра і ладу (Гутарка Данілы са Сцяпанам); *А мы, бедны, Браце, церпім скрозь няволю, / Жыццё праклінаем, сваю горку долю / ...Ім гэта не смашна костка ў горле стане, / Як мужык без пана* ***вольнасці*** *дастане* (Гутарка Данілы са Сцяпанам); *Эй, у* ***свабодзе*** *зажывем шчасліва / Мы будзем дзеткі, а нам бацька – Бог!..* (У. Сыракомля. Добрыя весці). У "Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы" дадзены наступныя дэфініцыі лексемы *вольнасць*: 1) свабода, незалежнасць, 2) бесцырымоннасць, фамільярнасць у паводзінах, развязаннасць, 3) адступленне ад агульных правіл, ад нормы ў чым-небудзь [182, с. 116]. Як бачым, толькі першае значэнне супадае са значэннем лексемы, з якім яна рэалізавана ў мастацкім кантэксце.

Канцэпт *воля* набыў асаблівую актуалізацыю ў творчасці пісьменнікаў пачатку XX ст.: *Будуць для ўсіх там палацы, / Стане ўсім там цяпла, / Ў панстве братэрства і працы, /* ***Вольнасці,*** *хлеба й святла* (А. Гарун. Брацця, к агульнаму шчасцю); *Нязмерны* ***вольныя прасторы /*** *Святой зямлі, – а чалавек / Мяжы, ірвы, тыны рабіў за векам век, / Хаваўся ў іх, як ліс у норы* (М. Багдановіч. Мяжы), а таксама ў грамадзянскай лірыцы Я. Коласа, Я. Купалы, Цёткі.

Беларуская мастацкая літаратура – крыніца цікавых гістарычных фактаў, звязаных з канцэптам *воля*: *З кулінарных кніг выкрэсліваліся словы аб смажаных парасятах, якіх трэба, "не таміўшы, ставіць на* ***вольны дух"*** (пра час улады Паўла I) (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Н а с т а. А па-мойму, што-небудзь ды ёсць. Ёсць, напрыклад,* ***свабода:*** *што хачу, тое раблю. Узяць хоць бы тое: хто калі да рэвалюцыі ў Менску лузаў семечкі? – Ніхто! А цяпер усе і ўсюды – дома, і на вуліцы, і нават у тэатры лузай сабе ды лузай, шапку на вушы нацягнуўшы* (Я. Купала. Тутэйшыя). Нярэдка ў мастацкім творы разуменне героем волі адлюстроўвае і гістарычную эпоху. Так, для героя "Новай зямлі" Міхала асновай волі выступала ўласная зямля, што было характэрна для сялянства аж да пачатку XX ст.: *А дзе ж той выхад? дзе збавенне / З* ***няволі цяжкай,*** *з паланення? Адзін ён ёсць:* ***зямля,*** *зямля, / Свой пэўны кут, свая ралля* (Я. Колас. Новая зямля). Адносіны героя твора да волі служаць дакладнай характарыстыкай персанажа: *Д а ч к а. Чаму ты так радуешся? Падумаеш – свабода! Што ты яе – на хлеб намажаш? С ы н. "Смяюся з чалавечай дурнаты і яе ж аплакваю", – сказаў філосаф. Эх ты, эмбрыён! Ды ці ведаеш ты, колькі людзей загінула, самі на смерць пайшлі, за свабоду? На катаргу! На вісельню! На эшафот! На штыкі! На кулі! Ды ты ведаеш, што такое свабода? Воля? За свабоду, за волю і я магу пайсці на эшафот. Нават на касцёр! / Д а ч к а. Ну і дурань! Вось скажаш мне: "Ты свабодная". І я не ведаю, што рабіць. А так лягчэй* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал).

Метафарычным складнікам канцэпту *воля* можна лічыць частае параўнанне свабоды з ветрам, паветрам, атаясамліванне са сцягам:

Рэпозиторий ВГУ

Н е з н а ё м ы. Я ліст, адарваны з таго самага дзерава, што і вы, што і многія мільёны падобных. ***Вецер свабоды*** *прынёс мяне сюды, на вашую руіну* (Я. Купала. Раскіданае гняздо); *– Ты ведаеш, як ён "лекаваўся" ў Італіі? Далучыўся да гарыбальдзійцаў… / – Што ж, пэўна, яму якраз было патрэбна* ***паветра свабоды.*** *Можа, таму ён і задыхаўся* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); ***Вольны вецер*** *напеў вольных песень табе, / Бор зялёны ўзняў дружным гоманам* (Я. Купала. Маладая Беларусь); *Анюта ўвесь вечар была невясёлая і, чытаючы, рабіла памылкі, Сцепаніда нават падказала ёй двойчы: "Да працы ўсе, хто чуе сілу, пад сцяг чырвоны,* ***вольны сцяг!"*** (В. Быкаў. Знак бяды); *Вось гэткі быў ён – наш салодкі / Надзённы хлеб у грозны час. / І з ім мы выстаялі ўсё-ткі – / Каб нашай* ***волі сцяг*** *не згас!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

Некалькі кантэкстаў пра ўзаемасувязь паняццяў *волі* і *кахання* пацвярджаюць думку, што воля – важны складнік жыцця чалавека, як і каханне. І нярэдка чалавекам стаіць перад цяжкім выбарам аднаго з іх: *Я сама сябе гэтак караю, / Бо я ж Яна больш волі люблю!* (Я. Сіпакоў. Вяселле); *Я знала: шчасце наша немагчыма, / Пакуль лютуе самаўладства гнусь. / Тваёй любоўю, верай і айчынай / Адна была жанчына – Беларусь. / …Так прадзірацца праз такія церні, / Ускласці столькі жыццяў на алтар / свабоды – і няўжо з такога зерня / Не ўскаласуе годнай волі дар?!* (Н. Мацяш. Маналог каханай Кастуся Каліноўскага).

Паняццевы кампанент канцэпту *воля* фарміруецца некалькімі кантэкстамі. Так, сцвярджаецца, што воля даецца Богам: *Бог не судзіў мне бачыць волі / І кідаць зерне ў свае ролі* (Я. Колас. Новая зямля); а таксама падаецца думка, што воля даецца чалавеку ў залежнасці ад асабістых якасцей: *С ы н. Зноў абмежаванне свабоды асобы. Т а т а. Гэта ты асоба? Асобай трэба стаць, тады і свабода будзе…* (А. Макаёнак. Зацюканы апостал), або волю трэба здабыць самому: *К а л і н о ў с к і. Усё забралі: зямлю, ваду, неба, свабоду, гісторыю, сілу… А я ўсё гэта люблю … А л е с ь. Зброяй трэба нарадзіць павагу да сябе і мужыка. І волю нарадзіць таксама – зброяй* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). Кантэкстаў з семантыкай 'самастойна здабыць волю' ў мове мастацкай літаратуры намі выяўлена больш.

Такім чынам, канцэпт *воля* займае важнае месца ў канцэптасферы беларускіх пісьменнікаў і ў нацыянальнай карціне свету. Дадзены канцэпт узаемазвязаны з канцэптамі *мова*, *народ*, *Радзіма*. Ядро канцэпту складаецца з наступных паняццевых кампанентаў: 'воля – лепшая доля ("свабода – найвышэйшая маральная каштоўнасць" В. Быкаў)', 'воля – свабода слова', 'няволя – цяжкія пакуты'. Метафарычны кампанент канцэпту можна вызначыць як 'вецер (паветра) свабоды, волі'.

Інтэрпрэтацыйнае поле канцэпту прадстаўлена ацэначнай і міфалагічнай зонамі. Ацэначная зона мастацкага канцэпту *воля* аб'ектывуецца наступнымі кантэкстамі: *Лепш ужо смерць нам усім без*

Рэпозиторий ВГУ

пары, чым такая / Доля – жыццё пад'ярэмнае ў чорнай няволі; *прыстойнаму чалавеку даражэй за ўсё на свеце яго свабода*; *на тым святым, што мы завем "Свабода!"*; *за свабоду жыццё б даў бы*.

Міфалагічную зону канцэпту можна праілюстраваць на прыкладзе легенды пра святога Міколу ў творах У. Караткевіча "Зямля пад белымі крыламі" і "Каласы пад сярпом тваім": *Асаблівым поспехам карыстаўся святы Мікола за сваё сялянскае паходжанне і за тое, што (па беларускай легендзе) аднойчы ўратаваў адзіную кабылку беднага мужыка, якая заблукала ў лесе. Не даў раздзерці ваўкам і памог ажарабіцца, а пасля прывёў гаспадару. Згодна павер'ю, калі жарабятка падрасце, то на ім паедзе той, хто дасць волю народу*. (У. Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі).

Дыяхранічны метад даследавання канцэпту *воля* пацвердзіў наша меркаванне пра актуальнасць дадзенага канцэпту ў хрэстаматыйнай беларускай літаратуры. Пацвярджаюць нашу думку і матэматычныя дадзеныя: згодна з дадзенымі Частотных слоўнікаў [127; 128], слова *воля* распаўсюджанае як у мове мастацкай прозы (39 словаўжыванняў на 1000 слоў) і ў мове паэзіі (150 выпадкаў ужывання ў 91 фрагменце).

2.7 Сямейны ўклад беларусаў у дыяхраніі і сінхраніі (канцэпт *сям'я* ў мове беларускай літаратуры)

Даследаванне сям'і і выхавання дзяцей з'яўляецца актуальным у гуманітарных навуках, паколькі ў складаны перыяд станаўлення беларускай дзяржаўнасці адбыліся карэнныя змены ў каштоўнасных арыентацыях сям'і, яе базавых функцыях, тыпах, захаванні пераемнасці сувязей паміж сем'ямі. Разам з тым духоўнае і культурнае жыццё сям'і вызначаецца нацыянальнымі адметнасцямі, захаваннем традыцый, якія бытавалі як на ўзроўні грамадскага жыцця, так і на сямейным побытавым узроўні.

Значны ўклад у навуковае даследаванне шматаспектных праблем сям'і ўносяць айчынныя даследчыкі – этнолагі, філосафы, сацыёлагі, педагогі, псіхолагі і інш. Іх дзейнасць і вынікі працы спрыяюць распрацоўцы прагнозных напрамкаў працы з сям'ёй, з'яўляюцца асновай фарміравання сямейнай палітыкі краіны. У апошняй трэці XX – пачатку XXI ст. беларускімі этнолагамі, як і ў ранейшыя часы, даследуюцца грамадскі і сямейны быт беларусаў, традыцыі матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры. Значныя дасягненні былі зроблены ў даследаванні матэрыяльнай і духоўнай культуры В.К. Бандарчыкам, М.Ф. Піліпенкам, А.І Лакоткам, В.С. Цітовым і інш. [24; 25]. Вучоныя адзначаюць, што адбыліся карэнныя змены ў каштоўнасных арыентацыях сям'і, яе базавых структурах, функцыях, захаванасці пераемных сувязей паміж сем'ямі, родамі, пакаленнямі. Для шырокай грамадскасці сталі вядомыя праявы негатыўных з'яў у сям'і: сіроцтва дзяцей пры жывых бацьках, адзінота,

Рэпозиторий ВГУ

маладзетнасць. Гэтыя з'явы адлюстраваліся таксама і ў тэматыцы беларускай мастацкай літаратуры.

Аналіз мовы беларускай мастацкай літаратуры паказаў, што, нягледзячы на шырокую рэпрэзентацыю канцэпту *сям'я* ў хрэстаматыйных тэкстах, моўныя сродкі яго аб'ектывацыі даволі нешматлікія: *сям'я, радзіна, айчына, бацькаўская буслянка, бацькі, гняздо, роднае кубло*. Гэта можна патлумачыць найбольшым пашырэннем лексемы *сям'я*, якую і назавём ядром канцэпту. У межах дадзенага канцэпту намі апісаны кантэксты з моўнымі адзінкамі *маці* і *сірата*, якія, на нашу думку, уваходзяць у канцэпт *сям'я* і нясуць важную інфармацыю аб гэтым семантычным утварэнні.

Спынімся на паходжанні і дэфініцыях ядзернай лексемы канцэпту *сям'я*. У "Этымалагічным слоўніку беларускай мовы" адзначаецца, што слова мае праславянскі корань. Магчымы перанос значэння 'стаянка, паселішча' і ўзыходзіць да абазначэння тэрыятарыяльнай супольнасці [197, с. 151]. Унутраная сувязь *сям'я – месца паходжання, паселішча* існуе і ў лексеме радзіма, на што ўказвалася ў падраздзеле 2.2. Гэта яшчэ раз падкрэслівае сувязь канцэптаў *сям'я* і *Радзіма*. Дадзены факт, аднак, не адлюстраваўся ў сучасных лексікаграфічных працах [181; 182]: сям'я 1) 'група людзей, якая складаецца з мужа, жонкі, дзяцей і іншых блізкіх сваякоў, што жывуць разам', 2) у пераносным значэнні – 'група людзей, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі', 3) 'група жывёл, птушак, якая складаецца з самца, самкі і дзіцянят, што жывуць разам, а таксама група некаторых жывёлін або раслін аднаго віду' [182, с. 647]. Такім чынам, для атрымання першасных, фундаментальных семантычных прымет канцэпту неабходна звяртацца да этымалогіі ядзерных адзінак.

У апошняй трэці XX – пачатку XXI ст. беларускімі вучонымі, як і ў ранейшыя часы, даследуецца сямейны быт беларусаў, традыцыі матэрыяльнай, духоўнай культуры [24; 25].

Вартым увагі падаецца даследаванне канцэпту *сям'я* ў дыяхранічным аспекце. Патрыярхальныя асновы сям'і адлюстраваліся ў традыцыі, калі бацькі жанілі сваіх дзяцей, выбіраючы ім пару: *Антону ж наказаў, каб не забараняў Васілю жаніцца з Алютаю, але дапамагаў ім, бо яны абое сіроты* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Мы з Грышкай паклонімся яму ў ногі ды будзем прасіць ды маліць, каб ён пагодзіў нашых бацькоў, ды каб яны дазволілі нам пажаніцца* (В. Дунін-Марцінкевіч. Пінская шляхта); *П а ў л і н к а. Але ж калі я яго люблю, цётачка. / А г а т а. Мала што, дзеткі, тудэма-сюдэма, любіш яго, але калі бацька не хоча, дык падумай, што людзі скажуць, як супроць волі старых пойдзеш* (Я. Купала. Паўлінка); *Зелянеюць, зелянеюць / Лугі, сенажаці, / Пытаецца сын у мацеры, / Ды каторую ўзяці* (Зелянеюць, зелянеюць лугі, сенажаці); *Трэба будзе ў хату ісці, паказвацца, стаяць перад імі… Перад сватамі, перад старым Карчом, перад Яўхімам!.. Стаяць, чакаць, што надумаюць*

Репозиторий ВГУ

бацька, мачыха, якую долю вызначаць ёй!.. (І. Мележ. Людзі на балоце); *Як няўхільны закон жыцця, ведала – спрадвеку так заведзена ў людзей: воля бацькоў для дзяцей – божая воля. Так было са ўсімі, так будзе і з ёй. І няма чаго рвацца, трэба слухацца іх, бацькоў, і бога* (І. Мележ. Людзі на балоце). Прычым гэтая традыцыя сустракаецца ў мастацкіх тэкстах XVIII–XIX ст. і нават XX ст. (І. Мележ. Людзі на балоце), што адлюстроўвае трываласць сямейнага ўкладу беларусаў (асабліва палешукоў).

Нялёгкае жыццё селяніна, цяжкая фізічная праца з'явіліся перадумовай уяўленню пра дзяцей як пра дадатковы клопат, "лішні рот": *Цяжка жыць у цемнаце, / У знявазе чорнай, здзеку, / Дзе адбітак свой з-за хлеба / Накладае талака, / Дзе так пільна праца трэба, / Плечы моцныя, рука, / **Дзе рот лішні на прымеце,** / І так топчацца сям'ёй, – / Лепш бы там не жыць на свеце / Дзеткам з чуткаю душой!* (Я. Колас. Сымон-музыка); *А вам, сынкі мае любыя, / **Не век сядзець на маёй шыі!** / Пара падумаць, небажаткі, / Як жыць без бацькі і без маткі, / Бо іх жыццё – не вечна ў свеце* (Я. Колас. Новая зямля). Паняццевы кампанент 'дзеці – гэта клопат' аб'ектывуецца ў дадзеных кантэкстах устойлівымі выразамі *сядзець на шыі*, *рот лішні на прыкмеце*.

У мове мастацкай літаратуры адлюстравалася дзяленне сям'і на часткі, адасабленне, распад: *Новая лазня з часам стала раскошнай для Кагутовай радзіны. Сыны **па дурным новым звычаі аддзяліліся*** (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *С т а р а ц. Але, але, ведаю! **Гняздо раскідалася, і птушкі разбегліся якая дзе-куды.** Ведаю, ведаю. Сам я з такога гнязда* (Я. Купала. Раскіданае гняздо). Аднак час найвялікшых змен сям'і – гэта паслярэвалюцыйныя 20–30-я гады XX ст. Гвалтоўная калектывізацыя, грамадзянская вайна, рэпрэсіі, новая савецкая палітыка ў дачыненні да сям'і – усё гэта прывяло да "вялікага пералому" ў векавых сямейных традыцыях. Асабліва яскрава гэта адлюстравалася ў творах М. Зарэцкага: *Да мяне прыйшоў брат. Ён працаваў у адной патаемнай контррэвалюцыйнай арганізацыі і ў той час быў прыціснуты да сцяны* […] *Мо каб хто чужы так прасіў, я б не ўстрывала, дала яму ратунак. Але гэта быў мой брат, а ў той час нікога **я не лічыла такімі ворагамі, як сваю радню…*** (М. Зарэцкі. Кветка пажоўклая); *Адчуваўся нейкі ледзь прыкметны фальш у гэтых цвёрдых, энергічных словах аб вызваленні жанчыны, **аб змаганні з іржавымі путамі сям'і, аб рэвалюцыі быту** і г.д.* (М. Зарэцкі. Дзіўная); *Усё правільна Шумава выказала, толькі ў адным перабавіла, у нутро жаночае балюча ўрэзалася. Выступіла супраць ядынай уцехі, шчасця жаночага: сказала, што **не трэба матцы дзяцей сваіх гадаваць,** што зло ў гэтым нейкае ёсць. Прапанавала: адбіраць ад матак іхніх дзяцей і дамы выхавання наладжваць. Каб матка не знала сына свайго, а сын маткі, каб агульныя, усіхныя дзеці былі. Проці гэтага жанчыны-маткі агнём урэзаліся. Казалі: жорстка гэта і крыўдна* (М. Зарэцкі. Дзіўная); *Вось падумаем так: вам прыйшлося б выбіраць з*

Репозиторий ВГУ

двух адно: або страціць бацьку, або адмовіцца ад вашае справы… Што б вы выбралі? / Гуторскі злёгку ўсміхнуўся. / – Вы, Ніна Васільеўна, дрэнны прыклад узялі. Я ўжо больш пяцёх год не бачыўся з бацькамі і калі й было ***ва мне раней якое сыновае пачуццё, дык цяпер яго няма й звання…*** *Я б, вядома, не задумаўся… / Яна здзіўлена паглядзела ная яго* (М. Зарэцкі. Ворагі); *Я не магу і не хачу судзіць цябе. Ты ведаеш, што я* ***прывыкла бачыць у табе не толькі свайго бацьку, а і старшага таварыша.*** *Ты – стары партыец, а я камсамолка* (М. Зарэцкі. Вязьмо). Знакамітая сталінская фраза "Сын за отца не отвечает" часта гучыць у мастацкіх творах, у якіх рэпрэзентуецца канцэпт *сям'я*. За выслоўем, якое стала крылатым, – трагедыя беларускай сям'і, разрыў адносінаў бацькоў і дзяцей, братоў: *Пасля Хведар шмат начэй думаў пра тое, пра сына і ягоную начальніцкую пасаду, непакоіўся і перажываў. І ўсё стаяла ў думках, што сказаў Сталін:* ***сын за бацьку не адказвае.*** *Гэтыя словы ён чытаў у газеце, шмат разоў чуў ад людзей. Мусіць, і сапраўды так, калі Міколку паставілі ў раёне начальнікам, дык, мусіць жа, ведалі, дзе бацька і маці, з якой сям'і ён паходзіць* (В. Быкаў. Аблава); *Ужо каму – каму, а яму – то ўбівалася ў галаву формула,* ***што сын ці дачка не адказваюць за бацьку*** (І. Шамякін. Сэрца на далоні); *Мусіць, нельга тут стала жыць брату высланага кулака і Міцька рашыўся на высылку па сваёй волі. Як ён цяпер там, на шахтах? Ні разу не напісаў яму пад Котлас, зрэшты як не напісаў яму і Хведар таксама. Ды ён не ведаў і адраса.* ***Распадаліся сем'і, нішчылася людская роднасць, спрадвечная вясковая крэўнасць. Сталі браты як чужыя*** (В. Быкаў. Аблава); *Ну, Роўба. Цяпер жа ён парцейны сакратар. Малады, а нібы той цівун! Ад бацькі адмовіўся. Бацька ж яго раскулачаны ў Нядолішчы, дык адмовіўся. Казалі, і прозвішча меўся мяняць, каб анізвання* […]. *Тое, што ён чуў пра сына Міколку, напачатку бянтэжыла, збівала з тропу* (В. Быкаў. Аблава).

На жаль, да разбурэння сям'і ў часы сталінізму дадаліся страшныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. У хрэстаматыйных творах беларускай літаратуры адлюстраваліся рэальныя факты пра знішчэнне сямей партызан і падпольшчыкаў. Напрыклад, забойства фашыстамі дзяцей кіраўніка партызанскага атрада М.П. Шмырова: *Пагражаюць Мінаю загадам: / Ён павінен скарыцца, / З'явіцца, / Здацца ў рукі фашысцкім уладам* […] */ А не з'явіцца – расстраляны / Будуць заўтра заложнікі – / Дзеці… / Спі, наш татка не прыйдзе, / На гэта / Ён не мае бацькоўскага права* […] / *Вось і ўсё. Перад бацькам Мінаем / Станьце, усе бацькі, на калені!* (А. Куляшоў. Балада аб чатырох заложніках). Аднак і створаныя ва ўяўленні аўтараў гісторыі выклікаюць эмоцыі ў чытача: *Цяпер не можа быць ніякага сумнення: гэта яны, гэта тыя, што замучылі яго маці, яго сястрычку, адабралі ад яго светлае сонца* (М. Лынькоў. Васількі); *Да самага канца вайны заходзіўся ў горы стары ляснік. Колькі ні шукаў ён сваю ўнучку – знайсці не мог. Пасля вярнулася дачка. Пачуўшы страшную вестку, яна*

Рэпазиторий ВГУ

павалілася на лаўку і праплакала ўсю ноч (І. Чыгрынаў. Дзівак з Ганчарнай вуліцы). Цяжкі лёс сірот і бацькоў, што так і не пабачылі сваіх дзяцей, асабліва яскрава паказаны ў паэзіі: *Не плакаў я – усім на злосць, / Бо ў хаце быў адзін – мужчына. / Не йшоў ты… / Маці маладосць / Глыбей заворвалі маршчыны* (Р. Барадулін. Бацьку); *Да кургана пясчанага, што нас / Разлучыць назаўжды, – / Прыйдзі, мой сын. / Павер хвіліну нейкую, што я / Жывы стаю між трапяткіх бяроз / І слухаю: у праведных баях / Што ты здабыў? / Што ў сэрцы ты прынёс?.. / … Прыйдзі, як песня, што табе збярог. / Бацькоўскі край і дбайна перадаў… / Прыйдзі, мая надзея і мой лёс, – / І лёгкай будзе для мяне зямля* (В. Зуёнак. Прыйдзі аднойчы). Агульнавядома, што ментальнасць нацыі складваецца гістарычна, і трагічныя падзеі, якія адбываліся з цэлымі пакаленнямі беларусаў на працягу стагоддзяў, сфарміравалі ў сучаснікаў усведамленне сям'і як адзінай вялікай каштоўнасці.

Адлюстраваны ў беларускай мастацкай літаратуры і цяжкі маральны выбар бацькоў падчас акупацыі: дзеля дзяцей супрацоўнічаць з акупантамі ці рызыкаваць іх і сваім ўласным жыццём: *Але злавіўшы гаспадыніну насцярожанасць, зразумела, які страх яна перажывае за будучае дзіця, таму сказала не зусім шчырую праўду, якую ва ўсе часы паўтараюць усе маці: –* ***Цяпер адзіная мая радасць – дачка. Дзеля яе жыву*** (І. Шамякін. Гандлярка і паэт); *Ну во, ты для дзяцей так стараешся. А калі яны вырастуць, паразумнеюць, думаеш, яны падзякуюць табе? / – Хто знае? Як каторы, – трохі нават сумеўся Недасека і паклаў лыжку. / – Яны ж будуць цябе ўсё жыццё праклінаць! / – Як праклінаць? – недаўменна зірнуў на яе Недасека. –* ***Я ж для іх гэта… Праз іх пакутую, раблю ўсё гэта.*** */ – Антоська! – нечакана для сябе сказала яна амаль спагадна, кранутая гэтай яго няўцямнасцю. – Лепей бы ты памёр для іх* (В. Быкаў. Знак бяды).

Сямейныя традыцыі, што адлюстроўваліся ў хрэстаматыйнай літаратуры, рэпрэзентуюцца шматлікімі моўнымі адзінкамі – назоўнікамі, якія абазначаюць святы, уласнымі назоўнікамі, парэміямі). Напрыклад, знаходзім звесткі, што ўласныя імёны – важны кампанент сямейных традыцый, умова захавання памяці аб продках: ***Але імёны – тое нешматлікае, што засталося з сямейнай традыцыі.*** *Ды яшчэ некалькі назваў хатніх прадметаў* (У. Караткевіч. Чазенія); ***І яшчэ мяняць прозвішча? Што ж тады застанецца ад мінулага?*** *Як тады жыць у будучым? Што скажа ён сваім дзецям, калі тыя будуць у яго?* (В. Быкаў. Аблава).

Багатая сямейная абраднасць, што адлюстравалася ў беларускім фальклоры (радзінныя, вясельныя песні, галашэнні і інш.), атрымала моўную аб'ектывацыю ў мастацкіх тэкстах. Напрыклад, вясельныя і радзінныя абрады: *Жыў адзін бедны чалавек з жонкаю. Нарадзілася ў іх дачка. Прыйшлося спраўляць* ***радзіны*** (Разумная дачка); *З тым і жыў* [беларус. – *К.П.*] *Гаўрыла (пад Полацкам). Ад* ***вяселля*** *да* ***наваселля,*** *ад*

Репозиторий ВГУ

радзін *да* ***хрэсьбін****, ад свята сонца да свята марозу: з дня ў дзень, з года ў год працай славіў свой род* (П. Сіняўскі. Зачараваная гаспадарка); *Бабуля на куце сядзіць, / Харошую песню пяе. / Першую – нараджоную, / Другую – сужоную, / Трэцюю – хрэсьбінную. / Дай, Божа, нашаму дзіцяці / **Хрэсьбінкі** згуляці, / **Хрэсьбінкі** згуляці / І **вяселля** даждаці* (Каля месяца, каля яснага); *Першае **вяселле** ў Княжборы спраўлялася без **каравая.** І, здаецца, было яно ўжо не сапраўдным* (В. Казько. Неруш); *“Ёсць тут Бог дый матка, / Радзоныя і суседзі блізкія… / Блаславіце краснай панне / **Каравай учыніць*** (В. Дунін-Марцінкевіч. Гапон); *Больш таго, Барздыкі настаялі, каб не хто-небудзь іншы, а менавіта ён, Мацвей, і **выкупляў нявесту** ў Махахеяў* (В. Казько. Неруш); *Ведае бусел, здольны ён прадказаць, напрарочыць дзеўцы яе лёс. Убачыла яна яго адразу, як толькі вярнуўся ён з цёплых краін, на буслянцы – і ёй яшчэ ў бацькаўскай буслянцы год сядзець, а калі прыглядзела, што ляціць антон – паляцела неўзабаве і яна з роднага кубла: згуляюць ёй вяселле сёлета* (В. Казько. Неруш). У дадзеных кантэкстах вызначаюцца назоўнікі-назвы сямейных святаў (*вяселле, радзіны, хрэсьбіны*), устойлівыя адзінкі, якія семантызуюць пэўныя звычаі і прыкметы, звязаныя з гэтымі святамі (*учыніць каравай, выкупляць нявесту*).

Пахавальная абраднасць таксама прадстаўлена ў тэкстах-рэпрэзентантах канцэпту *сям’я*: *Там на могілках можна бачыць сцэны, якія наводзяць на душу смутак. Вось удава з малымі дзецьмі ля драўлянага крыжа, які стаіць над магілаю яе мужа, а там сірата над магілаю бацькоў выказваюць сваю журбу голасам, які раздзірае сэрца; калі хто наблізіцца да іх і падслухае іхнія словы, – яны зайздросцяць мёртвым, і гэтыя слёзныя скаргі, здаецца, працялі б і каменныя грудзі* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *А журботныя плакальшчыцы, якія нядаўна залівaліся над магілаю мужа і бацькі, скачуць пад мелодыю дуды: Слава табе, Хрысце цару, / Што мой муж на цмантару, / І бяды пазбылася, / І гарэлкі напілася* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Вой, як павалюся я на тваю магілачку, / Як закуваю я цяпер па табе кукулечкай. / Дружыначка ж ты мая, нашто ж ты мяне пакідаеш? / А ці дабра ты ад дзетак, ад жонкі – не маеш? / Як жа ж нам цяпер… пражыць? / Як нам жыццё без цябе… прабыць? / Як мы цябе забываць… будзем? / Адкуль мы цябе дажыдаць… будзем?* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). Як бачым, вельмі распаўсюджаным быў абрад галашэння па нябожчыку.

Мова мастацкай літаратуры – крыніца звестак пра ўнікальныя беларускія сямейныя абрады, сярод якіх – дзядзькаванне. Гэты звычай апісаны ў рамане “Каласы пад сярпом тваім” і патрабуе дадатковага тлумачэння для сучаснікаў: *Каб ведалі, як даецца зямля, – сказаў дзед, – каб не збэсціліся на сабаку. Аддавалі, бывала, як толькі чатыры гады дзіцяці. Хто на тры, а хто і на пяць год. І зусім не дапамагалі хлопскай сям’і. А потым, калі возьмуць хлопца зноў у двор – даюць мужыку*

Рэпозиторий ВГУ

пакормнае, за тое, што хлопец з'еў, і дзядзьковае, бо ўсе мы як быццам дзядзькі малому, выхоўвалі яго, розуму вучылі. Або: *Па старому, часоў уніі, звычаю, які амаль знік у XIX ст., беларускія паны аддавалі сыноў на "дзядзькаванне" (выхаванне) у сялянскія сем'і* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Аўтэнтычныя беларускія сямейныя абрады найчасцей мелі на мэце захаванне ў сям'і трывалых сувязей паміж сваякамі, дастатак у хаце: *Як закладвалі зруб хаты, пад чырвоны вугол паклалі царскі рубель і повязь – яе і яго матузы. На багацце і каб жылі добра, не сварыліся і не разлучаліся. Яны і не разлучыліся да самай смерці* (В. Быкаў. Аблава). Увогуле, хата мае важнае сімвалічнае значэнне ў моўнай карціне свету беларусаў (гл. падраздзел 2.3). Хата – гэта і абаронца сям'і: *Хатка ж ты мая, хатка, свет ты мой, зара, ты ж мяне ўсю вайну бараніла, дачку ў мяне прыняла, ты ж майго бацьку і мяне гадавала, ты ж майго чалавека бласлаўіла пайсці на вайну, адсюль ён пайшоў, сюды калекаю, але з перамогаю вярнуўся, адсюль уперад нагамі яго і панеслі* (В. Казько. Неруш), і разам з тым у некаторых кантэкстах назоўнік *хата* мае значэнне *'сям'я'*: *Доля, шчасце зачне жыць, / Дзе цвяроза хата* [дзе цвярозая сям'я. – *К.П.*] (Я. Чачот. Да мілых мужычкоў). Матыў вяртання да роднай хаты вельмі распаўсюджаны ў сучаснай беларускай літаратуры: *Кожны помніць бярозу, рабіну ці клён пад акном, / Што садзіў яшчэ бацька ў гады маладыя, / Каб сыны пазнавалі здалёку бацькоўскі свой дом, / Каб канчаліся дома вандроўкі даўгія* (Ю. Свірка. Вяртанне ў пачатак); *Трэба дома бываць часцей, / Трэба дома бываць не госцем, / Каб душою не ачарсцвець, / Каб не страціць святое штосьці* (Р. Барадулін. Трэба дома бываць часцей).

Адзін з найважнейшых паняццевых кампанентаў канцэпту *сям'я* можна сфармуляваць як 'абавязкі перад продкамі, адказнасць за ўчынкі продкаў': *Ах, пан Беларэцкі, гэта жахліва. Чым я вінаватая, што* ***павінна адказваць за грахі дзядоў?*** *У нашых жылах не блакітная, а брудная кроў. Няўжо вы думаеце, мы,* ***усе мы, да дваццатага калена, не павінны адказваць за гэта?*** *Мы былі такія абыякавыя да народа, які пакутаваў з намі поруч і ад нас, мы лічылі яго быдлам, мы пілі віно, а яны лілі кроў* (У. Караткевіч. Дзікае паляванне караля Стаха); *Калі марнею ад нягод / І сэрцу цесна, /* ***Я ўспамінаю радавод*** */ І продкаў песні. / Яны ідуць за годам год / З мячом і плугам. / О, мой нязводны род, / Ён моцны духам! / Імёны памяць берагла, / Вяла праз церні, / Каб я не сеяў зла, / А толькі – зерне. / Да іх іду я зноў і зноў, / Ім веру свята. / Таму й вяду сваіх сыноў / Да іх на раду* (А. Пісьмянкоў. Продкі); *У мяне няма нічога, акрамя магіл, бо я ваш сын.* […] *Я* ***клянуся абараняць вашы магілы*** *мячом і зубамі, нават калі мая магіла будзе далёка ад вас* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Нягледзячы на існаванне ў беларусаў трывалага культу продкаў, бацькоў, сустракаюцца кантэксты, дзе паказана адзінота старых, якія

Рэпозиторий ВГУ

чакаюць сваіх дзяцей: *Звычайная беларуская хата пад каравай у цвеце грушай і старыя, вельмі старыя дзядок і баба ў белым, якія сядзяць на прызбе і з чаканнем глядзяць на дарогу* […] *Старыя чакалі. Як тысячы такіх на зямлі* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *М у л ь ц і к. Гэтымі грашыма сына ад мяне адбілі… Пяты год немаведама дзе бадзяецца, бацьку роднага забыў… / Г а с т р ы т. Ты што?! Што ты вярзеш? Пры чым тут пенсія? / М у л ь ц і к. А пры тым: ведае ён, што мне яе даюць… А раз даюць, значыць з голаду не здохну! А не здохну з голаду – навошта ж пра мяне клапаціцца, пісьмы пісаць… А я б здаецца, крапіву з лебядой еў, каб толькі ўнука ці ўнучку за руку павадзіць* (А. Дудараў. Вечар).

Пры рэканструкцыі канцэпту *сям'я* небходна таксама разгледзець такія паняццевыя кампаненты, як ‘бацькі, адносіны да бацькоў’, ‘выхаванне дзяцей, адносіны да іх’.

Бацькі ўяўляюцца ў кантэкстах мастацкай літаратуры як самае дарагое, святое для чалавека: *Атрымліваем арбіту з дзвюх раўнацэнных палавін: бацька і маці. Яны далі жыццё нам. Мы ў вечным і неаплатным даўгу перад імі. На іх молімся. Яны сняцца нам, не пакідаюць нас, нават калі адыходзяць у вечнасць* (У. Ліпскі. Ад роду – да народу); *Клапоцячыся пра бацьку, яна зусім не пашкадавала, што страціла вянок, знак сваёй дзявочай волі* (І. Мележ. Людзі на балоце); *Як бы яму тыя "начаткі" / Мілей і бацькі, мілей маткі* (Я. Колас. Новая зямля); *Бацькоў заўсёды шкода бывае* (М. Зарэцкі. Вязьмо). Дзяцей, якія зробяць шкоду бацькам, чакае страшнае пакаранне: *Згоды між бацькоў няма, / Гневаюцца задарма. / Дзеці з бацькіна прыкладу / Між сабой не маюць ладу: / Нападае брат на брата… / Сястра сястры кляцьбы дорыць; / Дзеці часта бацьку лаюць, / Клянуць матку, зневажаюць… / Ёсць жа сын такі праклятый, / Хто на бацьку альбо матку / Здуру ляпне мову гадку; І за то быць у пекле грэцца, / Калі словам к ім парвецца. / А якія ж будуць мукі, / Хто ўзнясе на бацьку рукі?* (Вось цяпер які люд стаў. Гутарка XIX ст.).

Такім чынам, сярод важных традыцый сямейнага выхавання беларусаў трэба адзначыць павагу дзяцей да бацькоў і дарослых увогуле. Аднак адносіны да дзяцей у сям'і паказваюцца амбівалентна. З аднаго боку, стаўленне да дзяцей станоўчае: *"Чаму, за што вы нас, спытаюць, / Такіх пазбавілі даброт?.." /* ***Бацькі дзяцей не абкрадаюць*** *– / Спакон было так, з роду ў род!* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці); *Нявада прыдумляў словы, ён не ведаў, што Паліводскі* ***пражыў жыццё адзін, без сям'і і дзяцей, і тое, што яму, Нявады, магло быць мэтай, Паліводскаму было нічым*** (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Бацькі спачатку пазлуюць, пазлуюць трохі і адпусцяцца, – ведама,* ***бацькоўскае сэрца*** (Я. Купала. Паўлінка); *Кажуць, белакроўе ў яго, – адказаў бацька. / – Божа мой, божа! – забедавала спагадлівая маці. – Такі ж маладзенькі, ветлівы і, як кажуць, разумны, сталы, а гэтакі нешчаслівы… Вот* ***гора дык гора для бацькоў***

Репозиторий ВГУ

(Г. Далідовіч. Страта). З другога боку, да дзіцяці можа быць іншае стаўленне з боку бацькоў: *Бедны хлопчык быў загнаны, / У бацькоў нялюбы сын, / Бо відочныя заганы / І меў толькі ён адзін. / Не такі, як усе дзеці, / Нейкі вырадак, дзіўны, / Нёс віну за ўсё на свеце, / Вінаваты без віны* (Я. Колас. Сымон-музыка).

Выхаванне дзяцей – няпросты працэс, у якім галоўную ролю адыгрываюць бацькі, што пацвярджаюць творы мастацкай літаратуры: *Т а т а. У нас жа дзеці!* ***Іх выхоўваць трэба!*** (А. Макаёнак. Зацюканы апостал); *Скажы мне, Сазоненка, хто вінаваты, што растуць вось такія?..* […] *– Усе патроху… Школа, камсамол. Мы. / – А бацькі? – Гукан узняў галаву. / –* ***Бацькі – гэта само сабой… У першую чаргу, безумоўна, бацькі*** (І. Шамякін. Сэрца на далоні); *А вось гэта Тарасаву не падабалася.* ***Безумоўна, бацька адказвае.*** *Але калі з асобных фактаў пачыналі выводзіць тэорыю, што, маўляў, усе пачварныя з'явы толькі ў асяроддзі дзяцей забяспечаных бацькоў, што ва ўсім вінаваты дабрабыт, – гэта абурала Сяргея Сяргеевіча. Выходзіць, толькі ў беднасці і жабрацтве можна правільна выхоўваць. Глупства!* (І. Шамякін. Сэрца на далоні); *Ш ы к о в і ч. Як я выхоўваю сваіх дзяцей? Было б недарэчнасцю сказаць – абсалютна правільна, бо абсалютна правільнае выхаванне, у маім разуменні, само па сабе – абсалютнае глупства. Але я адно магу сказаць: у галоўным* ***мы – я і жонка – ніколі не давалі дрэнных прыкладаў*** (І. Шамякін. Сэрца на далоні). Прыведзеныя прыклады дазваляюць выдзеліць паняццевы кампанент канцэпту *сям'я* – 'бацькі як узор для паводзін дзяцей'.

Знаходзім звесткі і пра фізічнае пакаранне пры выхаванні дзяцей: *Міхал звярнуўся к "дарактору": / – А не паслухае каторы – / Цягні за вуха на калені: / Знайду лякарства я ад лені! / А будзе йсці навука туга, /* ***Падгоніць бацькава папруга!*** (Я. Колас. Новая зямля); ***Бабуля адсцябала*** *матузамі малога* ***ўнука*** *за тое, што паабшчыпаў, не дачакаўшыся вячэры, акрайчык ацеслівага, спечанага з бульбы і ячменных шароек хлеба… І яна* [маці. – *К.П.*] *падумала, што і сама часам гэтак жа сцябала малога, і цяпер пашкадавала, што рабіла гэтак* (М. Стральцоў. На чацвёртым годзе вайны). Аднак прыярытэтным у сямейным выхаванні беларусаў спрадвеку лічылася не фізічнае ўздзеянне ці пакаранне, а павучальнае бацькоўскае слова, якое накіроўвае чалавека на правільны жыццёвы шлях.

Адметнай рысай паводзін беларусаў у традыцыйнай сямейнай культуры выступае павага да старэйшых, у тым ліку і да бацькоў, што сцвярджала сямейнае і грамадскае добраўпарадкаванне. Паводле народнай традыцыі беларусаў, спрадвеку лічылася, што дзеці павінны паважаць, слухаць бацькоў, не абмяркоўваючы іх патрабаванняў.

У завяршэнне апісання паняццевага кампаненту 'бацькі–дзеці' важна падкрэсліць, што ў моўнай свядомасці беларусаў існуе думка, што бацькі і дзеці падобныя. Доказ гэтаму – шматлікія беларускія ўстойлівыя выразы,

Рэпозиторий ВГУ

народныя афарызмы, якія адлюстраваліся ў мове мастацкіх тэкстаў: *Бо як добры плод сведчыць аб добрым дрэве, так і* ***добрыя паводзіны дзяцей аб добрым жыцці бацькоў апавядаюць*** (М. Сматрыцкі. Трэнас); *Дзякую табе, сынок… Ускарміў, успаіў, выпеставаў сабе дапамогу на сівую галаву. Аддзячыў. / – Злыдзень ты, бацька. / –* ***Яблыка ад яблыні недалёка падае****, а ты вун куды адкаціўся,* ***і ў каго толькі пайшоў, сын… / – У цябе, бацька, і трохі ў чалавека,*** *разумею, трохі толькі* (В. Казько. Неруш); *Учора вярнулася са школы, залітая слязьмі, як дажджом… Мой тата – паэт, а ў мяне тройка па літаратуры!* (А. Дудараў. Кім); *Маці стала непрыемна. Адкуль гэта ўзялося ў Іры? І наогул, чаму так усё атрымліваецца? Здавалася б, простыя бацькі, простыя і шчырыя адносіны ў сям'і – і раптам такія дзеці, зусім розныя і абое з нейкім дзіўным адхіленнем ад той нормы, што выпрацавала педагогіка* (І. Шамякін. Сэрца на далоні).

Як ужо адзначалася, канцэпты *Радзіма*, *мова* і, безумоўна, *сям'я* звязаны з вобразам маці, які мае шырокую рэпрэзентацыю ў хрэстаматыйных тэкстах. Маці паўстае як самі дарагі, блізкі чалавек, які клапоціцца пра сваіх дзяцей усё жыццё, яна ласкавая і пяшчотная з імі: *На тое яна матка, штоб за дзіця баяцца!* (І. Мележ. Людзі на балоце); *І песціць шчыра ўсіх, як матка… / Хіба забудзеш міг той, братка?* (Я. Колас. Новая зямля); *Падобна было на тое, што небарака часцяком быў галодны. Ведама, жыў не ў роднай маці, а ў дальняй радні* (В. Быкаў. Знак бяды); *Яны* [Зоська і Сымон. – *К.П.*] *самі даўно ўжо аддзяліліся ад нас, але толькі я – матка – ад іх не магу аддзяліцца і пакінуць іх тут без ніякага нагляду* (Я. Купала. Раскіданае гняздо); *Яны ўсе такія, маці: што б ні казалі, на языку, як і ў галаве, вечна дзеткі. Часам смешна з іх клопатаў. А часам і горка* (В. Карамазаў. Дзяльба кабанчыка). З гэтага вынікае, што страта дзяцей, асабліва на вайне, – гэта незагойны боль, страшная бяда для маці: *Былі ў маці тры сыны на раду, / Загадалі ўсім тром на вайну. / Ой, старэйшаму не хочацца, / Малодшаму не прыходзіцца, / А сярэдні меч бярэ, збіраецца, / З бацькам, з матухнай прашчаецца, / "Не кусай вусы, мой татка, пры мне, / Не плач, мая родная матка, пры мне, / …Наплачашся, мая мамка, без мяне. / Нагалосішся, наплачашся, / З сіротамі накугачашся"* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Доўга яшчэ ляцела на ветры тое яе запытанне, і нема крычала матчына сэрца ад нясцерпнае раны вайны* (В. Быкаў. Незагойная рана); *Ды толькі сын для маці не загінуў. / Знаходзіць маці тысячы прычын, / Чаму так доўга сын яе ў дарозе, / Чаму не йдзе разгладзіць ёй маршчын / і высушыць на родным твары слёзы /… Ідуць гады, / І кожны дзень чакае маці сына* (В. Зуёнак. З вайны сустрэлі мацяркі сыноў).

Яшчэ з часоў глыбокай старажытнасці маці ў сям'і выконвала ролю першай апякункі і выхавальніцы. Ад яе дзіця навучаецца словам, першым крокам, узаемаадносінам з навакольным светам. Пад апекай маці дочкі

Рэпозиторий ВГУ

заставаліся да паўналецця, да моманту ўступлення ў шлюб: *Мамулька з дачкой / Усю ноч гаварыла: / – Мамулька ж мая родная! / Як жа мы расстанемся? / – Сваты прыйдуць / І цябе вазьмуць, / А я застунуся. / – Мая матулька, / Мая родная! / Я ж цябе не пакіну: / Хоць замуж пайду, / Я ў госці прыйду / З табой гукаць буду* (Бяроза з лістом гаварыла).

Бязмежная любоў маці да дзяцей надзяляе яе звышнатуральнымі сіламі: *Голас незнаёмага можа здзівіць, / Голас друга – на хвіліну спыніць, / Голас любай – сагрэць сонцам лета, / Голас маці – вярнуць з таго свету* (М. Танк. Голас); *Не першая ты / Каля камня заходзішся з жалю. / Не раз на ім сеялі, але ні разу не жалі. / На нашыя нівы / Яго закацілі чужынцы* […] */ Каб сына свайго / Не даждалася маці ніколі* […] */ І тройчы такою / Кляцьбою / Той камень пракляла. / Стаў камень зямлёю, / Сама ж яна каменем стала. / На камні былым пры дарозе / Узыходзяць зярняты. / Вяртаецца сын па дарозе / З паходу дахаты* (А. Куляшоў. Маці).

Роля маці ў выхаванні дзіцяці вельмі вялікая (*З павагай да суседзяў мы раслі: / Пабудзь адзін: бягу на дапамогу" / І* ***маці,*** *як матулі ўсёй зямлі, /* ***Была маім найлепшым педагогам.*** */ Нам завяшчала сумленныя сцежкі, / Бо справядлівых шануе зямля; / І не саромецца простай адзежкі, / І не саромецца мазаля* (П. Панчанка. Паслядоўнік). Тым не менш, сустракаюцца кантэксты, дзе ўлада маці над сынам перабольшана, што можа негатыўна адлюстравацца на станаўленні асобы дзіцяці: *І хто ён зараз дзякуючы маме? – / Ні богу свечка і ні чорту качарга. / А ў нас яшчэ бывае так часамі, / Я дам параду мамам усім чыста: / Не трэба перашкод малым рабіць. / Куды шаноўней слесарам выдатным быць, / Чым дрэнным піяністам* (У. Корбан. Музыкальная камедыя); *І аднойчы, на нейкае свята, у час яго кароткага гасцявання дома, адчула маці, што ўжо скончылася дзяцінства яе белагаловага хлапчука і з ім – яе, матчына, улада над сынам* (В. Быкаў. Незагойнай рана).

Нягледзячы на адлюстраванае ў моўнай карціне свету беларусаў паважлівага стаўлення да маці, у школьным курсе літаратуры сустракаюцца творы, дзе адлюстроўваецца няўдзячнае стаўленне дзяцей да бацькоў ("На каляды к сыну" З. Бядулі, "Дзяльба кабанчыка" В. Карамазава, а таксама некаторыя кантэксты з іншых твораў: *Ну вядома. Як гадавала Тэкля, то добрая была. Тады* ***мамка міла, як ззаду мыла*** (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім)).

Няўдзячнасць, няўважлівасць да маці, якая асэнсоўваецца дзецьмі, як правіла, занадта позна, таксама займае важнае месца ў мастацкай літаратуры: *І хілюся да сэрца… / А трэба б упасці / Перад ёй – нядужнай, сівой – / На калені… / Сэрца маці! / Наш боль быў тваім, / Не іначай, / Сорам наш / Ты насіла вялізарным горам… / Жаль, і горыч, і боль / Мне душу працінае: Як жа позна, / Як позна – любімыя дзеці – / Мы няўдзячнасць сваю / Разумець пачынаем* (Н. Гілевіч. Маці); *Маці, адзіная мая, дарагая матуля, – шаптаў у бяздонную цемру Глечык, – ці даруеш ты*

Репозиторий ВГУ

мне маё непаслушэнства, мае дураслівыя выбрыкі? Чаму я такі быў дурны, не разумеў твайго сэрца, якое хацела свайго чалавечага шчасця, навошта пакінуў цябе – родную, адзіную маю? (В. Быкаў. Жураўліны крык); *Калі пушок прабіўся над губою / І ў сны прыйшло дзявочае імя, / Я ні аб чым не раіўся з табою, / Матуля адзінокая мая. / Мне сорамна здавалася часамі / Сярод хлапцоў – цыбатых забіяк – / Назваць цябе, як у маленстве, "мама", / Таму часцей не называў ніяк. / ...Прайшлі гады. Мы пасівелі самі, / І, мабыць, крыўдна мне не аднаму, / Што гэтае святое слова "мама" / Цяпер сказаць ужо няма каму* (С. Грахоўскі. Мама). На нашу думку, такія творы выклікаюць вялікае эмацыйнае суперажыванне вучняў і валодаюць вялікім выхаваўчым патэнцыялам.

Беларускія пісьменнікі апяваюць вобраз маці: *Ёсць матчына любоў. / Яе не зблытай / З ніякай, бо няма нідзе такой – / Пяшчотнай, бескарыслівай, адкрытай. / Шчаслівы ты, пакуль яна з табой* (Ю. Свірка. Ёсць матчына любоў); *Ад маці / Ўся мая навука, / А ўсё астатняе – / Пасля. / Ад маці – / Радасці і мука, / А маці / – Родная зямля* (С. Грахоўскі. Усё ад маці); *Я хаце абавязаны прапіскаю – / Калыскаю, падвешанай пад столь. / Я маці абавязан кожнай рыскаю, / Драўлянай лыжкаю, гліняной міскаю – / Усім, чым працы абавязан стол. / Я – матчын спеў, я – матчыны трывогі, / Я – матчын гнеў, які ўставаў на ногі* (А. Куляшоў. Я хаце абавязаны прапіскаю); *Пакуль яшчэ зялёная зямля / Трымае нас па міласці закона, / Сынок і маці – зерне і ралля, / Сынок і маці – мудрая ікона* (Я. Янішчыц. Сынок і маці).

Такім чынам, значная роля ў працэсе сацыялізацыі дзіцяці, развіцця яго здольнасцей адводзіцца маці. У мастацкай літаратуры маці малюецца як першая выхавальніца сваіх дзяцей, настаўніца, самы дарагі і блізкі чалавек. Беларуская народная педагогіка назапасіла прыгожыя, змястоўныя і вельмі трапныя выразы, у якіх вобразна падаецца роля маці ў жыцці дзіцяці: "Якая матка, такое і дзіцятка", "Ад злой маткі – злыя і дзеткі", "Дзеўка маткай красна" [82]. Беларуская літаратура данесла да нас ветліва-паважлівыя звароты да маці: "матуля", "мамачка-галубачка", "мамачка".

Народная мудрасць мінулых часоў выпрацавала сістэму запаветаў, вербалізаваных у мастацкай літаратуры, якія з'яўляюцца правіламі для дзяцей: паважай маці, шкадуй і беражы яе; выказвай словы ўдзячнасці за яе клопат; дзяліся з ёю сваімі перажываннямі, сумненнямі, трывогамі; прыслухоўвайся да яе парад і павучанняў; са шчырасцю выконвай яе даручэнні, дапамагай, чым можаш; бяры прыклад з матулі ва ўсім.

У адрозненне ад вобразу маці, вобраз жонкі аб'ектывуецца супярэчліва. Жонка паказваецца як "скарб найдаражэйшы": *Другі лягчэй знаходзіць жонку – / Свой вечны лёс, сваю красу, / Чым дзядзька добрую касу* (Я. Колас. Новая зямля); *А добрая жонка – скарб найдаражэйшы, бо дзе ў хаце каханне і згода, там і бласлаўенне Божае* (Я. Баршчэўскі.

Репозиторий ВГУ

Шляхціц Завальня). І разам з тым жонка можа прыносіць пакуты мужу або, наадварот, быць у залежным ад яго становішчы: *І, часам гаворачы пра Сакратавы пакуты, нагадваць учынкі свае жонкі, бо яго жонка Яўхімія была падобная да Ксантыпы* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Як была быдлам у свайго мужыка, так і будзеш давеку* (М. Зарэцкі. Вязьмо).

Кантэкстаў, дзе вербалізуецца вобраз бацькі, у творах школьнай праграмы выяўлена менш. Бацька паўстае, як і маці, дарагім, любімым членам сям'і, а таксама як аўтарытэт для дзяцей: *І заплакаў, аж заліўся, / Так, як бацьку пахаваўшы* (Ф. Багушэвіч. Кепска будзе); *Акім Загорскі за галаву схапіўся. Чаго ж тады чакаць ад чалавека, калі ён на забойства бацькі ідзе? Што ж гэта робіцца? Ці біблейскія часы вяртаюцца, ці апошнія надыходзяць?* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Мае дзетачкі, мае дробныя, / Вы наплачацесь, нагалосіцесь, / Бо не стане ў вас татачкі! / Хто вас будзе гадаваць адзяваці? / Ад цёмнай ночы ўкрываці? / Станеце вы, дзеткі, жабракамі, / Пойдзеце барамі-лугамі / Ды гасцінцамі дарогамі* (М. Багдановіч. Максім і Магдалена); *Яна бачыла: прыйшла часіна такая, што нават такі аўтарытэт, як родны бацька, перайначыўся, і рукі яго дрыжэлі, калі ён трымаў яе плечы* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Зірнуў на яго спадылба Міколка, моўчкі адышоў ад бацькі. Кепскія жартачкі з ім, з гэтым старым партызанам. А харошы ж усё ж бацька… Трошкі пабойваўся яго Міколка, а любіў яшчэ болей* (М. Лынькоў. Васількі). Аднак сустракаюцца кантэксты, у якіх адлюстравалася аддаленасць бацькі ад дзяцей, абыякавасць да іх лёсу: *І яму раптам стала крыўдна, што яго сын нічога не ведае аб сваім бацьку і што ён сам мала цікавіўся сваім сынам. Яму нават стала страшна ад таго, што паміж ім і яго малым няма дружбы. А без гэтай дружбы чагосьці вялікага і патрэбнага не хапае ў жыцці. Дружба павінна быць вялікая, моцная і вечная* (К. Чорны. Насцечка); *Вольга з маленства не надта любіла бацьку, можа, праз тое, што пасля работы ад яго непрыемна пахла, хоць баялася яна бацькі менш, чым маці, бо ён ніколі не біў і рэдка лаяў нават* (І. Шамякін. Гандлярка і паэт).

Мужчына ў сям'і – яе абаронца, заступнік дзяцей: *Ведамо, адна, без чалавека* [мужа. – *К.П.*]. *Няма каму пастаяць… Нічога, ето апошні раз* (І. Мележ. Людзі на балоце); *А як жа Іван-нябожчык* [муж. – *К.П.*]? – *успамінае Зося, сумеўшыся. – Няхай бы ён, Божачка мілы, лепш сам быў жывы, чым усе гэтыя грошы. Але што ты парадзіш?* (Я. Брыль. Сірочы хлеб); *А можа, і добра, што сын не помніць бацьку: так будзе лепш яму, але ж затое колькі ёй трэба трывання, жорсткасці да сябе і да людзей, каб паставіць сябе ў жыцці, каб не даць у крыўду сябе і сына* (М. Стральцоў. На чацвёртым годзе вайны).

Сямейнае жыццё адлюстравалася ў змесце шматлікіх моўных адзінак, у якіх увасобілася шматвекавая народная мудрасць беларусаў: *Але цікава, – сказаў пан Завальня, – ці перавыхавала яго Алюта, бо ёсць*

Рэпозиторий ВГУ

прыказка: хто ажэніцца, той пераменіцца (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *На гэта адны суседзі са смехам казалі: – Пазнаў роўны роўнага, будзе добрая пара* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Ох, недарэмна гавораць: у багатага сам чорт дзяцей калыша, а беднаму…* (В. Казько. Неруш). Сям'я ўяўляецца ў мастацкай літаратуры як неад'емная частка жыцця, шчасця: *Каб дапісаць партрэт Антося, / Скажу: на свеце не знайшлося / Ні ўдоўкі-любкі, ні дзяўчыны, / Каб палучыць дзве палавіны, / Каб разам шчасце здабываць / І поруч долю падзяляць* (Я. Колас. Новая зямля); *І планы яе сур'ёзныя і простыя: выйсці замуж, нараджаць дзяцей… Некаторыя фыркаюць: мяшчанства. Ёлупы! Схіліце галовы! Гэта жыццё ў яго натуральным выглядзе. Самі вы мяшчане!* (І. Шамякін. Сэрца на далоні).

Сярод паняццевых кампанентаў канцэпту *сям'я* можна назваць 'брацкія адносіны'. У мове твораў мастацкай літаратуры вербалізуецца моцная брацкая еднасць: *Пажыццёвая высылка. Згадзіцца на гэта было немагчыма. Больш, чым брат. Брат па крыві – па выхаванню і думках. Брат, кінуты ў няволю за тое, што спяваў на кірмашы песню, якую напісала твая рука…* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *В і т а ў т. Брат супраць брата – страшны грэх прад Богам!* (А. Дудараў. Князь Вітаўт); *І смела крычыць, што пан яму, як брат родны, ні ў чым не адмовіць, і ён усё зробіць, што яму толькі захочацца* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня). Аднак у народных казках часта паказваецца разлад у сваяцкіх адносінах, выкліканы зайздрасцю, стараннім уплывам: *Было ў бацькі дванаццаць сыноў, усе рослыя ды ўдалыя хлопцы* […]. *Стары бацька, сівы, як голуб, сядзеў сабе ў кажушку і ўлетку ды толькі камандаваў. І былі ў сям'і лад ды згода. Пажаніліся сыны, пайшлі ў іх свае дзеці. Вырасла вялікая сям'я. Ды ўсе слухалі старога бацьку, і кожны рабіў сваю работу. Але вось па некаторым часе памёр бацька. І пачаліся ў сям'і нелады. Жонкі братоў сварацца, адна адну заядаюць, – рады няма. Такая пайшла між імі калатнеча, што і мужыкі нічога зрабіць не могуць* (Палешукі і палевікі); *Іван і расказаў пра тое, як ён залатога птаха дастаў, як братоў у караля выкупіў і як яны яго забілі, а добрая ваўчыха ажывіла* […]. *Выгнаў бацька старэйшых сыноў з дому, а з Іванам і цяпер жыве* (Залаты птах).

Як ужо адзначалася, намі разгледжана ўжыванне кантэкстаў з лексемай *сірата* з мэтай выяўлення месца дадзенага паняцця ў моўнай карціне свету беларусаў. Так, здаўна сірата ўяўлялася няшчасным, бедным чалавекам, што адлюстравалася ў змесце вобразна-выяўленчых адзінак, напрыклад, параўнанняў: *Затое ж хвоечкі малыя / Стаяць,* ***як сіраты якія,*** */ Ад снегу выгнуўшысь дугою, / На дол прыпаўшы галавою* (Я. Колас. Новая зямля); *Што ж ты сядзіш такая* ***самотная, нібы сірата якая?*** (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Броўкі –* ***долі сіроцкай чарней*** (М. Багдановіч. Максім і Магдалена). Жыццё сіраты паказваецца цяжкім,

Рэпозиторий ВГУ

поўным турбот, доля – няпростай: *Сірата штодзённа наракае на сваю нядолю, апавядае пра розныя пакуты, якія мусіць ён трываць на гэтым свеце, і яго скаргі на працягу ўсяго жыцця зліваюцца ў адну аповесць, хоць ён і не думаў сёння пра тое, што будзе апавядаць заўтра* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *У Даніка, хоць ён таксама сірата, слёз было менш, чым радасці. Хлеб сірочы, вядома, нялёгкі, аднак пра яго пакуль больш думала мама* (Я. Брыль. Сірочы хлеб). Таму ранняе сіроцтва – канец дзяцінства: *У той вечар скончылася Васількава шчаслівае дзяцінства, і ён зазнаў пачатак вялікага гора. Бацьку пахавалі, маці счарнела ад пакутаў і слёз* (В. Быкаў. Жураўліны крык).

Сіратой традыцыйна лічыцца чалавек, што застаўся без бацькоў, якія памерлі або пакінулі дзіця, альбо без аднаго з бацькоў: *Г а н н а: / Мне так шкода цябе, шкода! / Ёсць бацькі, ты ж сірата!.. / Твая долечка люта, / І пагана, ох, прыгода!* (Я. Колас. Сымон-музыка); *Ён Зосін, а прозвішча іхняе Малец. У яго толькі маці, ён сірата* (Я. Брыль. Сірочы хлеб). Сустракаецца кантэкст, з якога вынікае, што сірата – гэта стары бацька, які застаўся без дзяцей: *Яго ў суровы час нядоля / Навек зрабіла сіратой. / Сыноў абодвух, лейтэнантаў, / Не дачакаўся дзед з вайны* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

У мове мастацкай літаратуры заўважаецца асаблівае стаўленне беларускага народа да сірот, што выявілася ў моўных зваротах: *Бог мой бацька, зямля матка* [так казалі сіроты. – *К.П.*] (Ф. Багушэвіч. Кепска будзе); *Сіроцкія слёзы дарма не мінаюць. Пападуць на белы камень – камень прабіваюць* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); або тэксты песень на вяселлі сіраты: *Вясельная песня сіраціне / Ах, знаць, знаць, па вяселіку, / Што не бацюшка аддаець, / Двор вялікі, а збор не вялікі: / Нет у мяне радзінушкі, / Ой, зашлю, пашлю серу зязюльку / Па радзінушку / ...Ды за родненькім бацькам / Серая зязюлька не прылятаець / А татулька адмаўляець: / “Рад бы я ўстаці / К свайму дзіцяці / І парадушку даці; / Грабовыя дошкі / Сціснулі ножкі, / Ды не магу я ўстаці.” / Сырая зямля / Дзверцы залягла / І акошачка засланіла; / Майго бацюшку / На вяселіка не пусціла* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня). Адсюль вынікае, што сірот шкадавалі, дапамагалі ім або бралі ў іншыя сем’і на выхаванне: *Антону ж наказаў, каб не забараняў Васілю жаніцца з Алютаю, але дапамагаў ім, бо яны абое сіроты* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Меў Антон добрую гаспадарку, беднасці не ведаў, а што быў бяздзетны, дык узяў дзіця невядома ад якіх бацькоў. Яго ахрысцілі і далі імя Васіль* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня).

У творы сучаснага аўтара А. Дударава “Кім” знаходзім новае разуменне паняцця сіраты, якое не стасуецца з ранейшымі ўяўленнямі. Так, “спадчынны” сірата Кім, прадпрымальны і актыўны падлетак, зусім не выглядае няшчасным, як і яго бацька. У тэксце раскрываюцца сучасныя сацыяльныя прычыны сіроцтва: *Толькі няўвязка з прозвішчам па бацьку.*

Рэпозиторий ВГУ

Справа ў тым, што мяне на вакзале некалі знайшоў сяржант міліцыі… Мая мамачка пакінула мяне на падаконніку… Прозвішча ў сяржанта было Міхайлаў… Так я стаў Міхайлавічам… (А. Дудараў. Кім) і ўмовы жыцця сірот: *Канечне, яна не родная мне. Калі здарылася Зона і дзетдом рассялілі, яна ўзяла мяне, Піню і Баранесу на выхаванне. Мэрыя выдзеліла трохпакаёвую кватэру. Гэта называецца сямейны дзіцячы дом. Яна нас усынавіла і ўдачарыла* (А. Дудараў. Кім).

Калі да сіраты ў свядомасці беларусаў існуюць спагадлівыя адносіны, то да дзяцей, народжаных па-за шлюбам, стаўленне было ўжо зусім іншым. У беларускай мове ёсць лексічная адзінка *байструк*, якая абазначае ‘пазашлюбнае дзіця’ і мае слоўнікавую памету *разм. Груб* [182, с. 79]. У мастацкіх кантэкстах відавочнае стаўленне да такіх дзяцей: *Бацькі ў Галі не было. На пашы дзеці лаялі яе брыдкім бязлітасным словам – байстручка* (Я. Брыль. Галя).

Напрыканцы апісання зместу канцэпту *сям’я* неабходна акрэсліць месца дадзенага лінгваментальнага ўтварэння сярод канцэптаў *Радзіма*, *народ*. Як ужо адзначалася ў падраздзеле 2.3 Радзіма і сям’я – узаемазвязаныя паняцці. Гэта можна пацвердзіць наступнымі кантэкстамі: *Мацвею ўсё гэта было родным: Свілёва, Балонь, Махахеева дуброва – самі назвы гучалі яму зусім так, як гучаць словы маці, бацька* (В. Казько. Неруш); *І ён тыя заработкі / Панясе аддасць бацькам, / Хоць на момант на кароткі / Завітае ў родны дом. / Эх ты, родненькі куточак! / Ці ж не думаў ён аб ім?* […] */ Сніўся родны дом хлапчыне, / Вабіў моцна, бы святло. / Млела сэрца па айчыне, – / Хоць і цяжка ў ёй было* [у дадзеным кантэксце цяжка акрэсліць лексічнае значэнне слова **айчына** – ‘сям’я’ або ‘радзіма’] (Я. Колас. Сымон-музыка); *Нёмне, рэчка мая радаводная, дзе / Тыя воды, што браў я ў маленстве ў далоні / Сэрца ахаладзіць, што зайшлося ў нудзе* (А. Міцкевіч. Да Нёмна (пераклад Р. Барадуліна). Канцэпт *сям’я* рэканструюецца як частка канцэпту *народ*: *Я плюс Я – сям’я. / Сям’я плюс сям’я – род. / Род плюс род – народ. / Народ плюс народ – людзі Зямлі… / Хай гэтая жывая карусель будзе вечнай, / Каб народ не згубіў повязь часоў, каб мацнелі сем’і, на якіх трымаецца род і народ, іх слава і моц* (У. Ліпскі. Ад роду – да народу). Таксама раскрываецца тэма цяжкага маральнага выбару паміж сям’ёй і народам як дзвюма найдаражэйшымі каштоўнасцямі для чалавека: *“Даруй мне, – развітаўся з дачкою Вячка. – Я твой бацька, але я князь полацкага роду. Зямлю, што прадзеды перадалі ў спадчыну, трэба ад ворагаў бараніць, веру нашу адстойваць. Даруй, што выбраў зямлю і веру, а не цябе”* (Л. Дайнека. Меч князя Вячкі).

Такім чынам, намі рэканструяваны канцэпт *сям’я* ў мове твораў, уключаных у школьную праграму па беларускай літаратуры. Выяўлена ядро і асноўныя паняццевыя складнікі. У выніку апісання канцэпту ў дыяхранічным аспекце можна зрабіць наступныя высновы:

Рэпозиторий ВГУ

1) беларуская сям’я мела патрыярхальны ўклад, што адлюстравалася ў практыцы жаніцьбы дзяцей бацькамі, у поўным паслушэнстве дзяцей;

2) сем’і складаліся з вялікай колькасці сямейнікаў, засведчаны паступовы распад сямей на больш дробныя;

3) у сям’і зберагаюцца найважнейшыя каштоўнасці: павага да бацькоў і старэйшых увогуле, строгасць і патрабавальнасць да дзяцей, асабістая адказнасць кожнага члена сям’і за даручаную яму справу, узаемадапамога і ўзаемавыручка, сумленнасць, добразычлівасць, сціпласць, павага да працы і працоўнага чалавека;

4) адлюстравалася пэўная кадыфікацыя сямейнага ўстою: негатыўнае стаўленне да пазашлюбных дзяцей, шлюбаў без дазволу бацькоў, няроўных шлюбаў;

5) падзеі рэвалюцыі, войнаў XX ст. карэнным чынам паўплывалі на сямейныя традыцыі, паспрыялі раз’яднанню моцных сямейных сувязей.

У мове мастацкай літаратуры адлюстравалася багатая сямейная абраднасць беларусаў: радзіны, вяселле, пахаванне, а таксама шматлікія рытуалы, накіраваныя на захаванне моцнай сям’і і выхаванне дзяцей. У сферы сямейных стасункаў беларусы заўсёды лічылі, што стварэнне сям’і – гэта вельмі адказная справа.

Відавочна, што беларусы шчаслівымі лічаць тыя сем’і, дзе муж і жонка жывуць у каханні, ціха і спакойна, а паміж сямейнікамі пануе згода і ўзаемаразуменне. Гэта тлумачыць наступная акалічнасць: у характары беларусаў спрадвеку адзначаецца схільнасць да бесканфліктнага вырашэння жыццёвых праблем, да кампрамісаў, да таго, каб заўсёды была “згода”.

У межах рэканструкцыі канцэпту *сям’я* з твораў мастацкай літаратуры намі выяўлены і прааналізаваны такія паняццевыя складнікі, як ‘адказнасць за продкаў і перад імі’, ‘хата як частка сям’і’, ‘павага да бацькоў’, ‘маці – найдаражэйшая на свеце’, ‘асаблівасці выхавання дзяцей’, ‘падобнасць, пераемнасць бацькоў і дзяцей’, ‘брацкія адносіны’, ‘эвалюцыя вобразу сіраты’, ‘негатыўнае стаўленне да пазашлюбных дзяцей’. Зыходзячы з яскравасці кагнітыўных прымет і паняццевых кампанентаў, мы мадэлюем ядро канцэпту з наступных кампанентаў: ‘павага да бацькоў’, ‘падобнасць, пераемнасць бацькоў і дзяцей’, ‘адказнасць за продкаў і перад імі’. Вобразнае ўяўленне канцэпту – хата, гняздо, што семантызуецца ўстойлівымі зваротамі *бацькоўская хата, бацькоўскае гняздо*.

Прааналізаваны шматлікія моўныя адзінкі – параўнанні, фразеалагізмы, парэміі, якія нясуць важную інфармацыю пра народнае ўяўленне аб канцэпце *сям’я.* Выяўлена месца дадзенага канцэпту ў сістэме ключавых канцэптаў – *Радзіма, народ*. Як і гэтыя канцэпты, дадзенае лінгваментальнае ўтварэнне ўяўляецца дарагой каштоўнасцю ў моўнай свядомасці беларусаў.

Репозиторий ВГУ

2.8 Уяўленні беларусаў пра шчасце і долю (вербалізацыя канцэптаў *лёс/доля* і *шчасце*

У “Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы” адзначаецца наступнае азначэнне лексем *лёс* і *доля*: 1) ‘частка чаго-н.’, 2)‘лёс’ [182, с. 317]. Паходжанне гэтага слова звязана са словам *дзяліць*. Лёс – ‘ход жыццёвых падзей, якія складваюцца незалежна ад волі чалавека’; ‘збег акалічнасцей’; ‘доля’; ‘развіццё чаго-небудзь’; ‘далейшае існаванне, будучыня’ [182, с. 181]. На думку этымолагаў, гэтае слова праз польскую мову запазычана з нямецкай са значэннем ‘доля, прызначэнне, жэрабя’. Як бачым, такое тлумачэнне лексічнага значэння не зусім поўнае.

Народнае разуменне названых паняццяў выяўляецца у беларускіх парэміях. Так, парэміі *“Будзе тое, што будзе, а будзе, што суджана”*, *“Ніхто наперад не знае, што каго чакае”* ўказваюць на прадвызначанасць лёсу чалавека, паўплываць на які няма магчымасці. У прыказках і прымаўках тыпу *“Як няма шчасця — няма і долі”*, *“Шчасце за гарамі, а бяда за плячамі”* бачна яскравае атаясамліванне канцэптаў *доля*, *лёс* з канцэптам *шчасце (шанцаванне)*. У беларускіх праклёнах чалавеку маглі зычыць благой долі: *“Каб табе ліхая доля!”*, *“Хай яму горкая доля, як ён мяне напалохаў!”*. Такім чынам, доля ўяўляецца беларусамі амбівалентна: яна можа быць як добрай, так і благой.

У сістэме традыцыйных поглядаў *доля* – гэта пэўная частка дабрабыту, выдзеленая з агульнага, належнага ўсяму соцыуму шчасця. Да таго ж, кожны чалавек мае сваю долю, толькі яму належную, вылучаную Богам ці замоўленую ў яго сваякамі. Між тым, з цягам часу доля можа пэўным чынам змяняцца – нараджэнне або смерць кагосьці ў сям’і можа выклікаць перараз мяркаванне агульнай калектыўнай долі. Канкрэтна гэта можна назіраць на сімвалічным атаясамліванні долі і хлеба, ежы. Магчыма, гэтаму ёсць аб’ектыўныя прычыны, бо калісьці доля кожнага і сапраўды вымяралася неабходнай яму колькасцю харчавання.

Звернемся да індывідуальна-аўтарскага разумення канцэпту *лёс, доля* на прыкладзе паэзіі Р. Барадуліна і У. Караткевіча. Лёс – тое, чаго сам чалавек змяніць не можа, бо атрымлівае яго звыш. Аднак У. Караткевіч пярэчыць гэтай агульнавядомай думцы: *На вялікія справы – і сэрца вялікае, / На вялікае сэрца – і лёс надзвычайны* (У. Караткевіч. Энтузіясту); *У людзях на гэтай зямлі, людзях, што* ***робяць свой лёс,*** */ Ў праве на праўду і слова, на светлы агонь непакорны* (У. Караткевіч. Бекеш).

Канатацыя лексемы *лёс* неадназначная. У розных кантэкстах лёс чалавека выступае і як добрая доля, і як благая: *Усім дарую. Усім дарую я / ...Нават каменю. Нават лёсу, / Аб якім клапоцімся мы* (У. Караткевіч. Балада аб асуджаных і аб чалавечым “даруй”); *І сарамлівасць мілая, дзявочая, / І светлая была, як* ***светлы лёс*** (У. Караткевіч. Зімовая элегія); *Ён бачыць будучае ўсёй Радзімы, / Яе* ***няпросты і вялікі лёс***

Репозиторий ВГУ

(У. Караткевіч. Вячэрнія ветразі); *Бачыць слёзы, бачыць гора, / Бачыць* ***лёс*** *народа* ***чорны*** (У. Караткевіч. Перакаці-поле).

Для Р. Барадуліна характэрная персаніфікацыя вобразаў долі і лёсу (нездарма ён ахрышчаны літаратуразнаўцамі "каралём метафары"): *Лёс прынёс мяне на базар / І, як пеўня, / Трымае пад пахай. / Хоча збыць свой тавар / Гандляр / Просіць: / – Ты языком не лахай, / Каб не спудзіліся купцы. / Толькі ўбыткі адны з табою. / Не прадам цябе – / І капцы, / У капцы зарасцеш травою. / – Лёсе мой, / Пацярпі, прашу: / Не збаўляй цану, / Патаргуйся. / Не мяне, / Дык маю душу, / Можа, у вырай паклічуць гусі. / І мяне ў халадах нябёс / Пад крыло сваё / Возьмуць хмары. / Ні купцоў, ні цаны, / Мой лёс, / Нам не мець / На зямным базары…* (Р. Барадулін. Лёс); *Лёс да кожнага прыходзіць босы, / Як Хрыстос, / Каб бядзілі кожнага турботы, / Як абуць свой лёс у лапці, ў боты. / А яму не занасіць калёсы: / Боссю – каб нячутна / Ходзіць лёс* (Р. Барадулін. Лёс да кожнага прыходзіць босы). У вершы Р. Барадуліна "Цераз капрызлівую раку" паўстае неадназначны вобраз долі, якую аўтар параўноўвае як з маці, так і з мачыхай і нават спагадлівай цёткай: *Цераз капрызлівую раку / Кладкай трывалай самаю / Доля вяла мяне за руку / Зажуранай мамаю. / Я назалеўся на скрызняку. / Неба мне сны растлумачыла. / Доля дала мне кій у руку / Нязлою мачахай. / Я награбеўся на цаліку / Над кожнаю соткаю. / Доля мне падала руку / Спагадлівай цёткаю* (Р. Барадулін. Цераз капрызлівую раку).

Р. Барадулін – глыбокі знаўца міфалогіі беларусаў – уводзіць у свой паэтычны радок духа з іменем Кон: *А можа, мне вяртаюць рысы нейчыя, / А ці ў мяне пазычылі мае? / Ці* ***кон*** *нябачнай свечкаю падсвечвае / І мне чужое нешта аддае?* (Р. Барадулін. Паспець). Дух Кон быў магутнай істотай, якая нагадвала фатаў у рымлян. Ён прадказваў будучыню ўсіх, нават багоў, а таму займаў ганаровае месца сярод міфічных істот.

У творчасці разгледжаных намі майстроў слова трывалы матыў ўзаемаадносін чалавека і лёсу, спробы чалавека дагаварыцца з лёсам, атрымаць ад яго лепшага: *Што ж ты помсціш мне, чалавечнасць, / Што ж ты, лёс, мне нічога не даў?* (У. Караткевіч. Папярэдні); *Доля – / Вогнехвостая лісіца – / Замятае, палячы, сляды. / Да яе ў сябры не напрасіцца, / За лясамі пазычае сітца, / На якое сеюцца гады* (Р. Барадулін. Сум). *Кожны лёсу дагадзіць стараецца, / Хто душой, хто праўдай, хто маной, / Ну а лёс штовечара, шторaніцы / Надзяляе кожнага віной* (Р. Барадулін. Трыкірый).

Канцэпт *лёс, доля* блізкі па значэнні да канцэпту Бог, бо ў хрысціянстве Бог – адзіны справядлівы суддзя, ад якога залежыць жыццё і шчасце чалавека. У радках Р. Барадуліна *Як назваць яго, Лёсам ці Богам, / Дзякуй, што ашчаслівіў астрогам, / Дзе ў няволі нам вольна нарэшце* (Р. Барадулін. Самота паломніцтва) гэтая думка знаходзіць яскравае пацверджанне. Як і іншыя народы, беларусы чакалі долю найперш ад Бога.

Рэпозиторий ВГУ

Але важна і адметна тое, што ў індаеўрапейцаў *доля* і *Бог* першапачаткова азначалі адно і тое ж. Корань bog- абазначае не толькі таго, хто надзяляе (Бог даў, дай Бог, не дай, Божа), але і тое, чым нехта надзяляецца, а гэта значыць – самой доляй. Давайце параўнаем: багаты – гэта надзелены, а слова таго ж кораня з адмоўнай прыстаўкай – нябога, нябожчык – значыць, абсалютна пазбаўлены жыццёвай сілы, долі. Таму Бог выступае як надзельнік, давальнік.

Славянскія ўяўленні пра долю дапускаюць адносную вольнасць. З аднаго боку, доля кожнага вызначаная найвышэйшым судом, з другога – гэтая прадвызначанасць не ёсць абсалютнай. Доля не толькі даецца, але й бярэцца, у асобных выпадках чалавек сам выбірае сваю долю ці змагаецца з папярэдняй. Такая неадназначнасць індывідуальнай долі выяўляецца таксама ў тым, што ў ролі яе давальніка бачыліся не толькі міфалагічныя персанажы, але і маці: *Творца Ўсёісны / У бяссонныя рукі маме / Перадаў і маю душу. / Мама, калі сваё адкунежыла / і маю душу даверыла мне, / Пажадала, / Каб зносу ёй не было* (Р. Барадулін. Евангелле ад мамы); *Матулі / Вязалі долі нашае снапы, / А кожны сноп на зерне не скупы* (Р. Барадулін. Ксты).

Р. Барадулін стварыў паданне, якое не сустракаецца ў фальклоры, тэматыка яго звязана з канцэптам *лёс/доля*. У “Крывіцкім паданні” распавядаецца пра тое, як Бог у выглядзе жабрака вандраваў па зямлі і папрасіў у жняі, каб тая напаіла яго вадой. Жанчына спаслалася на цяжкую працу, на недахоп часу і працавала далей. Тады жабрак звярнуўся да мужчыны-касца, і той адразу падаў яму вады і падзяліўся абедам. Менавіта таму “*Бог і падзяліў ашчадна долі: мужыку на ўсё хапае часу, бабе – аніколі*” (Р. Барадулін. Крывіцкае паданне).

Яшчэ адна лексема, якая вербалізуе канцэпт *лёс*/*доля*, – гэта *нядоля*. Калі *доля* часцей атаясамліваецца са шчасцем, то нядоля – з горам, няўдачамі*: І плачаць на горкую* ***нядолю*** */ За мокрым шклом раздзеты чорны сад* (У. Караткевіч. На пачатку дарог).

У. Караткевіч сцвярджае сваё разуменне шчасця і няшчасця (“ліха”): *І, можа, шчасце менавіта ў гэтым, / Каб любаму аддаць усе гады, / Каб адкрываць нязнаныя планеты, / Сівець, чакаць, кахаць, расціць сады, / Не быць ніколі вербным херувімам, / І для адвечнай мары дарагой / Ў касмічным пыле, у агні і дыме / Спаліць жыццё над цёплаю зямлёй* (У. Караткевіч. Трагедыі не знікнуць пры Камуне…); *Дай мне вечнае шчасце: над вымытай зліваў травой / Зліцца ў крыку любові з пакутнымі тымі палямі, / Што чакаюць цябе* [дождж. *– К.П.*]*, што загінуць без ласкі тваёй* (У. Караткевіч. Засуш); *Я павінен, павінен табе сказаць, / Што няма на свеце горшага ліха, / Як самотным жыць і самотным сканаць* (У. Караткевіч. Слова пра чалавечнасць); *Нас нарадзілі ў свет / Не для выбухаў, не для мукі / … / А на тое, каб песню і шчасце / Мы нагбом на зямлі пілі … / Шчасце для ўсіх адно* (У. Караткевіч. Матчына душа).

Рэпозиторий ВГУ

Р. Барадулін пакінуў у паэзіі шмат афарыстычных выслоўяў на тэму долі і шчасця: *быць беларусам – гэта значыць вясёла з сумнай долі кпіць*; *доля на долькі не дзеліцца*; *шчасце нязмушана няньчыць бяду*; *ад наканаванкі ўсё жыццё ўцякаем* (Р. Барадулін. Навошта); *У шчасці розныя, роўныя ўсе ў бядзе, / Хоць кожны жыве на сваёй планетцы. / Век шчасця зямнога кароткі, як летні сон, / Ды ён хоць аднойчы павінен сасніцца* (Р. Барадулін. Псалмы Давідавы).

Такім чынам, рэпрэзентацыя Р. Барадуліным і У. Караткевічам канцэпту *лёс/доля* ўзбагачае моўную карціну беларусаў. Ацэначныя адносіны чалавека да свайго лёсу рэалізуюцца ў выглядзе паняцця шчасця, якое ўключае канцэпты *шчасце* і *няшчасце/нядоля*. Апошнія ўяўляюць сабой этнамаркіраваныя семантычныя ўтварэнні. У творчасці абодвух разгледжаных намі пісьменнікаў трывалы матыў узаемаадносін чалавека і лёсу, спробы чалавека дагаварыцца з лёсам, атрымаць ад яго лепшага.

Варта адзначыць, што У. Караткевіч часта звяртаецца да тэмы шчасця ў паэтычнай творчасці. У яго паэтычнай карціне свету шчасце ўяўляецца існасцю, якая ўзыходіць над зямлёй, нібы сонца: *Маўчы дзеля бедных дзетак, дзеля любай жонкі сваёй, / Дзеля вечнага, добрага шчасця, / што будзе над нашай зямлёй* (У. Караткевіч. Партызанская балада); *Паміраю і веру: Калісьці над светлымі водамі, / Над свабоднай зямлёю / І над Белай Руссю маёй / **Шчасце сонцам заззяе,** / І слова нашчадка свабоднага / Мае раны загоіць / Гаючай жывой вадой* (У. Караткевіч. Паўлюк Багрым). Нярэдка паўстаюць вобразы шчасця як нечага матэрыяльнага: *Калі ёсць на зямлі дзве унцыі шчасця, – / Ўсё яно, без астачы, ў сэрцы маім* (У. Караткевіч. Крокі ўначы); *Адзін удар трызубнай снасці, / І ў ходзе казачных падзей / **Жывое, трапяткое шчасце** / Само ў далоні ўпадзе* (У. Караткевіч. Мая Іліяда); *Прачнешся, і ў гэтым садзе / **Шчасце будзе блукаць** між траў. / Так мне радасна, / Радасна, / Радасна, / Што падскочыў і сонца б сарваў* (У. Караткевіч. Праменьчык); *Беларусь мая, сонца, / Дарагая і родная маці! / На якіх раздарожжах / Згубіла ты шчасце сваё?*(У. Караткевіч. Паўлюк Багрым). Шчасце бачыцца паэту ў служэнні Радзіме і народу, узаемным каханні. У караткевічаўскіх кантэкстах часцей ідзе гаворка пра шчасце краіны, у той час як у паэзіі Р. Барадуліна ідзе гаворка пра лёс/шчасце асобнага чалавека. Асацыятыўнае ўяўленне мастакоў стварае наступныя “вобразы” долі, звязаныя з шыццём: *суровая нітка жыцця не лезе ў шаршатку долі, тчэцца лёс людскі, колькі б доля пражы ні напрала, у шлях апошні йдзём*.

Як было сказана вышэй, у моўнай карціне свету беларусаў блізкім да канцэпту *лёс, доля* з’яўляецца канцэпт *шчасце*, і таму ў нашым даследаванні яны разглядаюцца разам. Дзеля таго каб звесці ў адзінае паняцце ўсе наяўныя ўяўленні пра **шчасце**, звернемся да лексікаграфічных прац. Для аналізу канцэпту *шчасце* трэба прывесці ўсе значэнні гэтага слова ў розных слоўніках.

Рэпозиторий ВГУ

З пункту гледжання этымалогіі шчасце – агульнаславянскае слова, якое суадносіцца з чалавекам, што застаўся “з часткай”, гэта значыць са здабычай [183].

Шчасце, згодна з “Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы ў 5-ці тамах”, мае 3 асноўныя значэнні: 1) ‘стан поўнай задаволенасці жыццём, пачуцце найвялікшай радасці і задавальнення’; 2) ‘удача, поспех у чым-небудзь. Шчаслівы выпадак, шчаслівае спалучэнне акалічнасцей’; 3) ‘лёс, доля’ [181, с. 743].

Н. Гаўрош падае наступнае азначэнне паняцця “радасць”: ‘пачуццё вялікай асалоды, задаволенасці’ і наступны рад магчымых азначэнняў да гэтага слова: бязмежная, бясконцая, неабсяжная, вялікая, высокая, святочная, бурлівая, гордая, звонкая, чыстая, светлая, ясная, шчымлівая, вясновая [60, с. 21]. Аналіз прыведзеных значэнняў дадзенага слова дае магчымасць зрабіць вывад пра тое, што шчасце ўспрымаецца як пачуццё найвялікшай радасці і задавальнення, пры якім удала складваюцца жыццёвыя абставіны. Шчасцем варта таксама называць задаволенасць чалавека сваім уласным жыццём, гармонія з прыродай, соцыумам.

Сэнсавымі рэпрэзентантам шчасця выступаюць таксама моўныя адзінкі *ўдача, поспех, лёс, доля, дабро, шанцаванне.*

Найчасцей шчасце ўяўляецца беларускімі мастакамі слова ў дзейнасці, працы на карысць людзям, а значыць у простых рэчах: *М у л ь ц і к. Не ў сытасці шчасце… / Г а с т р ы т. А ў чым жа яно? / Мульцік. У працы… У радаснай працы* (А. Дудараў. Шчасце); *Спакойнага шчасця / не зычу нікому: / Навошта грымотам / маланка без грому, / Навошта ручай / без пякучае смагі, / Халодная ўвага, / не вартая ўвагі, / Жаданні, што прагныя / крылы згарнулі, / Зязюля без лесу / і лес без зязюлі* (А. Куляшоў. Спакойнага шчасця не зычу нікому); *Простае шчасце людское, / Так, як і наша з табою, / Пэўна, складаецца з солі, / З хлеба, сабранага ў полі, / З поту, з дарожнага пылу, / З роднага небасхілу, / З дружбы, мацнейшай ад смерці, / З песні… І так мне здаецца: / Каб з чаго іншага скласці, / Дык ці было б яно шчасцем* (М. Танк. Простае шчасце людское); *Шчаслівы той, хто не сядзіць, а старанна працуе, / Дык яму ва ўсім вечна шанцуе* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Арыце, сейце, людзі, хто што можа, / Старым ці новым абычаем! / А вашу працу доля ўпрыгожа / Шчаслівым, буйным ураджаем* (Я. Купала. Яна і я). Такім чынам, базавым паняццевым кампанентам мастацкага канцэпту шчасце з’яўляецца ‘шчасце ў дзейнасці, працы’.

Як і паходжанне лёсу/долі, у мове беларускай мастацкай літаратуры паходжанне шчасця таксама падаецца амбівалентна. Згодна з адным пунктам погляду, шчасце дае Бог: *Шчаслівейшую долечку пашлі вам, Божа!* (Я. Купала. Раскіданае гняздо); *Чым я магу аддзякаваць за ўсё? Толькі словам. Дай вам Бог шчасце* (У. Караткевіч. Паром на бурной рацэ). Па іншай версіі, шчасце неабходна здабыць, заслужыць, знайсці самому:

Рэпозиторий ВГУ

І надумаўся ён сыноў выправіць з дому – свет вялікі, можа, там сабе шчасце-долю знойдуць (П. Сіняўскі. Зачараваная гаспадарка).

На думку многіх беларускіх пісьменнікаў, шлях да шчасця заключаецца ва ўнутранай чысціні людзей, г.зн. залежыць ад іх маральных якасцей: *Хай кожнае чалавечае Я стане вобразам Дабрыні, Розуму і Любові. Тады і Зямля наша ператворыцца ў планету шчасця. Тады і мы станем Людзьмі. І захочацца нам адзін аднаго называць родзічам* (У. Ліпскі. Ад роду – да народу). Цесна звязаны з гэтай думкай паняццевы кампанент канцэпту *шчасце* ‘шчасце нельга пабудаваць на чужым няшчасці, падманным спосабам’. Ён шырока прадстаўлены ў мове мастацкай літаратуры: *Цёнгле быў грэх квапіцца на чужое. На чужым і дармовым шчэнсця не бэндзе. Мне шкада вас* (В. Быкаў. Знак бяды); *У яго ж рукі ад зямлі чыстыя, душа ад неба светлая – а такім чужое шчасце вачэй не мазоліць* (П. Сіняўскі. Зачараваная гаспадарка); *Бо ты, – абазваўся Сымон Ракуцька, – па сабачы спадзяваўся на сваё шчасце. Няхай бы ты зерне сеяў і хлеб жаў, а то ты бачыў сваю радасць у тым, што нехта пойдзе, як ты кажаш, на ўсход, чалавечыя косці трушчыць і кроў ліць. Як свет стаіць, то яшчэ не было вядома, каб на нянавісці выросла шчасце, а радасць на чужой бядзе* (К. Чорны. Пошукі будучыні); *Нядоўга Ілля мецьме панскую ласку, а грошы, сабраныя ашуканствам і крадзяжом, шчасця не дадуць, і Алена была б шчаслівейшая, каб выйшла за чалавека хоць беднага, але пачцівага* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня). Як вынікае з папярэдняга кантэксту і некаторых іншых (накрыклад, “*Шчасце не ў золаце”* З. Бядуля), можна выдзеліць паняццевы кампанент ‘шчасце не ў матэрыяльным багацці’.

Моцны культ роднай зямлі ў беларускай моўнай свядомасці, апісаны ў раздзелах 2.2 і 2.3, праявіўся і ў рэпрэзентацыі канцэпту *шчасце*. Так, з мовы твораў мастацкай літаратуры вынікае, што шчасця для беларусаў няма на чужыне: *Не шукай ты шчасця, долі на чужым, далёкім полі* (Я. Купала. Не шукай). Жыць на роднай зямлі і прыносіць ёй карысць – аснова асабістага шчасця чалавека: *О, салодкія ўспаміны забаў і звычаяў роднае зямлі! Як кароткае шчасце, як прыемны сон, як вера бацькоў! Навек застануцца яны ў памяці* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Хацела б быць я рэчкай быстрай / Абегчы родны край /* […] */ Каплю шчасця, долі ўліць, / Думаць усюды аб народзе / Родны край усюды сніць* (Цётка. Мае думкі).

Такія тыповыя рысы беларускай ментальнасці, як узаемадапамога і імкненне да мірнага ладу жыцця, увасобіліся ў наступных уяўленнях пра шчасце: *Каб сяброў сустракаў клапатлівых / На дарогах, далёкіх ад дому, / І каб сам быў заўсёды шчаслівы, / Калі шчасце прыносіш другому* (С. Грахоўскі. Чалавеку патрэбна не шчасце); *Шчаслівы той, хто ад спрэчкі далёкі* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня).

Канцэпт *шчасце* цесна звязаны з канцэптам *каханне*. Шчасце ўяўляецца ва ўзаемным каханні: *Васіль адчувае, што Ганна ад гэтых яго*

Рэпозиторий ВГУ

слоў мякчэе. Ён, праўда, яшчэ з асцярогай, бярэ ў сваю яе цёплую руку – Ганна не адбірае. І Васілю становіцца радасна, да яго зноў вяртаецца шчасце, вялікае, неабсяжнае, – здаецца, шчасцем гэтым напоўнены не толькі Васілёвы грудзі, а і ўся ноч, уся цёмная духмяная цішыня, што дрэмле над Куранямі (І. Мележ. Людзі на балоце); *Каб убачыць праменьчыкі / У зрэнках тваіх, / Нарадзіцца ізноў / І паверыць, што прыйдзе / І збавенне, і шчасце / Адно на дваіх* (С. Грахоўскі. Як я жыў без цябе); *І з вострым пранікненнем у праўду ён зразумеў, што няма шчасця ў тым, калі толькі цябе кахаюць. Кахаць – вось што было шчасце* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Скажыце мне, а што павінна / Лічыцца шчасцем у жыцці? / – Па мне – з найлепшаю жанчынай / Вось гэтак поручкі ісці. / І знаць: Яна цябе кахае, / Як ты яе – ўсёй душой, / І што за лёс вас ні чакае – / Табе не зробіцца чужой* (Н. Гілевіч. Родныя дзеці).

У мове мастацкай літаратуры рэпрэзентуецца стан шчаслівага чалавека. Так, яму ўласціва лічыць усіх вакол сябе шчаслівымі (*Хто сам шчаслівы, таму здаецца, што і ўсе шчаслівы, – сказаў Арол на гутарку Хмаркі* (Я. Колас. Хмарка), а таксама сцвярджаецца, што шчаслівы той, хто ўсведамляе сваё пачуццё радасці: *С к а р ы н а. Бо толькі тады чалавек шчаслівы, калі лічыць сябе шчаслівым* (А. Петрашкевіч. Напісанае застаецца). Прычыны шчасця чалавека могуць мець вытокі ў няведанні, або, наадварот, веданні пэўнай інфармацыі пра свет: *Можа, затым яна і была такая шчаслівая, што нічога не ведала аб белым свеце* (Я. Колас. Хмарка); *Я князь, але я і мужык. Магчыма, мяне тым дзядзькаваннем няшчасным зрабілі. Але я таго няшчасця не аддам. У ім маё шчасце. Яно мяне відушчым зрабіла. Вярнула да майго народа* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). Увогуле, адукаванасць, “навука” ўяўлялася “ключом” да шчасця: *Сонца навукі скрозь хмары цёмныя / Прагляне ясна над нашай ніваю, / І будуць жыць дзеткі патомныя / Добрай доляю – доляй шчасліваю* (Я. Лучына. Роднай старонцы).

У мове мастацкай літаратуры адлюстравалася ўяўленне беларусаў пра шчасце як недасяжнае, а то і ўвогуле яго адсутнасць на зямлі: *Але нядоўга астаецца шчасце на адным месцы. Пакінула яно і той слаўны куточак* (Я. Колас. Жывая вада); *Хоць жыхары гэтых ваколіцаў забяспечаны ўсім, што толькі трэба дзеля іхніх выгадаў, аднак і сярод іх слёзы, трывога, пакуты сустракаюцца як і ўсюды; няма праўдзівага шчасця, няма раю на гэтай зямлі* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Многа казак розных / нам складалі продкі. / Шлях да шчасця доўгі, / да бяды – кароткі* (У. Дубоўка. Многа казак розных). Адсюль існаванне шматлікіх прымет “на шчасце”, асабліва на вяселлі, якое ўспрымалася вельмі важнай, а часам нават вырашальнай падзеяй у лёсе новай сям’і: *Вясёлай гаманой / Вяселлейка запіта… / А чаркі ні адной / На шчасце не разбіта* (Я. Янішчыц. Сянцо каля гумна); *І казалі, што свечкі ў маладых*

Репозиторий ВГУ

гарэлі так цьмяна, што сёй-той са страхам паглядаў на гэта, шэпчучы суседу: “Не будзе тут шчасця. Жыццё іх зацьміцца смуткам” (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня).

Важным нацыянальна-культурным фактам, на нашу думку, з’яўляюцца адлюстраваныя ў мове беларускай літаратуры легенды пра папараць-кветку і пералёт-траву як рэпрэзентацыю ўяўленняў беларусаў пра шчасце: яно недасягальнае і даецца толькі выбраным людзям: *Як заўсёды, шукалі смелыя / **Кветку-папараць, кветку шчасця.** / Як жадалі мець гэтую кветку / Цёмных пушчаў глухія шаты, / Каласы на бедных палетках, / Людзі ў цёмных, закураных хатах* (У. Караткевіч. У тую ноч). Нагадаем, што легенда распавядае пра цвіценне папараці ў купальскую ноч. Паданне пра пералёт-траву засведчыў Я. Баршчэўскі ў зборніку апавяданняў “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”: *Пералёт-трава, або лятучае зелле, расказваюць пра яе, што яна мае здольнасць пераносіцца з месца на месца, яе вясёлкавая кветка надзвычай жывая і прыгожая, а ў сваім палёце часам блішчыць, быццам зорачка. Шчаслівы, хто яе сарве, бо не зазнае перашкодаў у сваім жыцці, усе жаданні неадкладна здзейсняцца, і гэтая трава – трава шчасця. Людзі, марачы пра шчасце на гэтай зямлі, малююць яго ў розных вобразах: і грэкі, і рымляне верылі ў сляпую Фартуну, што, круцячы вечнае кола, уздымае людзей пад аблокі і зноў апускае ў бяздонне* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Беларускі народ уявіў сабе нейкую лятучую траву, гонячыся за якой не адзін збіўся з дарогі і не вярнуўся да роднае хаты* (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня).

Такім чынам, аналіз мовы мастацкай літаратуры пры рэпрэзентацыі канцэпту *лёс/доля, шчасце* дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1. Намінатыўнае поле мастацкага канцэпту складаюць наступныя лексічныя адзінкі: *лёс, доля, шчасце, шчаслівы, радасць, шанцаванне, кон, наканаванка*. Антанімічную пару складаюць лексічныя адзінкі *нядоля, няшчасце, бяда, гора, ліха*.

2. У ядзернай зоне канцэпту *лёс/доля, шчасце* можна выдзеліць два кагнітыўныя параметры: тэалагічны (лёс – найвышэшая сіла) і экзістэнцыяльны (лёс – жыццёвы шлях чалавека).

3. Паняцевыя кампаненты, што складаюць зместавае напаўненне канцэпту *лёс/ доля, шчасце*, наступныя: ‘лёс, шчасце залежаць ад добрых спраў чалавека’, ‘чалавек узаемадзейнічае са свім лёсам’, ‘шчасце, доля даюцца Богам’, шчасце заключаецца ў працы на карысць людзям, узаемадапамозе, мірным ладзе жыцця’.

4. Канцэпт *лёс/доля, шчасце* звязаны ў моўнай карціне свету беларусаў з канцэптамі *Радзіма*, *каханне*, *сям’я*. У гэтым лінгваментальнам ўтварэнні адлюстраваліся такія рысы беларускай ментальнасці, як узаемадапамога, мірны лад жыцця, любоў да Радзімы.

Рэпозиторий ВГУ

5. Каштоўнасны кампанент канцэпту вызначаецца ва ўяўленні беларускіх пісьменнікаў пра шчасце як галоўны складнік жыцця чалавека (з некаторых прыкладаў вынікае, што чалавечае жыццё – шчасце: *Бомбы падалі на дамы Севастопаля, магілы тысяч простых шчасцяў* [людскіх жыццяў. – *К.П.*] (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). Канатацыя канцэпту *шчасце* пазітыўная, а *лёс/ доля* – неадназначная (бо могуць выступаць як добрым, так і благім).

6. З прычыны таго, што *лёс/доля, шчасце* – абстрактныя паняцці, даволі цяжка апісаць вобразны кампанент дадзенага канцэпту. З мастацкіх твораў вынікае, што шчасце можа запоўніць сабой усю прастору, перамяшчацца, яго можна падлічыць (*капля шчасця, унцыя шчасця*), яно можа ўвасабляцца ў расліны (*папараць-кветка, пералёт-трава*). Лёс/доля ў творах некаторых паэтаў (найперш Р. Барадуліна) персаніфікуецца.

2.9 Рэпрэзентацыя канцэпту *каханне* ў мове мастацкай літаратуры

У розныя перыяды развіцця грамадства каханне як з'ява духоўнага, культурнага і сацыяльнага жыцця інтэрпрэтавалася па-рознаму. Сучасная псіхалогія дае азначэнне каханню як інтымнаму пачуццю, якое накіравана на іншага чалавека. Каханне ўяўляе сабой павышаны пачуццёва-эмацыйны стан чалавечай псіхікі, які накіраваны на прадмет сваёй сімпатыі – асобу процілеглага полу.

У "Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы" даецца наступнае значэнне лексемы *каханне*: 'вялікае сардэчнае пачуццё да пэўнай асобы другога полу' [182, с. 286]. Старабеларускае *кохати* (вядомае ў помніках ужо на пачатку XVI ст.) лічыцца запазычаным з польскай. Слова запазычана з польскай і ва ўкраінскай мове. Магчыма, прамым паланізмам трэба лічыць і *каханне*. Прасл. *koxati было ў праславянскія часы дыялектным словам: яго не зналі беларуская і ўкраінская мовы. Адносна рус. *кохать* Трубачоў мяркуе, што яно шырока прадстаўлена ў гаворках і, магчыма, з'яўляецца спаконвечнай лексемай [188, с. 314]. Семантычна блізкім да гэтай лексемы з'яўляецца любоў 1) 'пачуццё сардэчнай прыхільнасці, адданасці каму-, чаму-н.', 2) 'схільнасць, цяга да чаго-н.' [195, с. 324].

Праведзены аналіз мастацкіх кантэкстаў – вербалізатараў канцэпту *каханне* – дазваляе канстатаваць, што каханне як эмацыйнае пачуццё чалавека вызначаецца станоўчай канатацыяй. У свядомасці беларусаў каханне – свайго роду "падмурак", на якім павінна трымацца сям'я: *Убачыла, што ён не кахае мяне. А як жыць без кахання, ды чакаць, пакуль ён набярэ розуму, каб прагнаць цябе, дык лепш жа самой пайсці загадзя* (М. Зарэцкі. Вязьмо). Аднак любоў да бацькоў паказваецца мацнейшай за каханне: *Я кахаю цябе, але не магу згадзіцца і пайсці з табою, бо бацькі*

Репозиторий ВГУ

мае будуць пакутаваць. Няхай лепш я сама буду ахвяраю свайго няшчасцю, каб толькі яны былі спакойныя (Я. Баршчэўскі. Шляхціц Завальня); *Значыць, надумала, адважылася аддаць свайго любага ў ахвяру, каб ратаваць бацьку* (М. Зарэцкі. Ворагі).

Каханне ў мове мастацкай літаратры рэпрэзентуецца як моцнае пачуццё, якое не падуладнае ні багаццю, ні ўладзе: *Ой, не пайду замуж за цябе: не трэба мне золата, не трэба багатага молайца. Я* ***кахала аднаго – кахаць буду;*** *цалавала аднаго – цалаваць буду* (З. Бядуля. Шчасце не ў золаце); ***Каханне не карона,*** *храбры віцязь, / Яно зніжае ўладара да смерда, / А ўздыме і жабрачку да багоў* (А. Дудараў. Князь Вітаўт). Сіла кахання выяўляецца ў тым, што яно ўсведамляецца як аснова чалавечага жыцця, як пачатак усяго на зямлі: *Пачынаецца ўсё з любві, / Нават самая простая ява. / І тады душой не крыві / На дарозе жыцця шырокай. / Пачынаецца ўсё з любві – / Першы поспех і першыя крокі* (Я. Янішчыц. Ты пакліч мяне. Пазаві); *Святі, каханая чыстая зара! / Святі – пачуццяў сэрцаў не азмрочвай – / Над доляй плугара і песняра / І над высокай доляю жаночай. / Усіх людзей пара табе, пара, / З'яднаць чароўнай сілаю прарочай. / Бо, сапраўды, на свеце без кахання / Жыцця няма – ёсць толькі існаванне* (А. Грачанікаў. Святі, каханая…).

У мастацкіх кантэкстах, дзе вербалізуецца канцэпт *каханне*, апісваецца стан закаханага чалавека. Так, па-рознаму могуць кахаць старыя і маладыя: *Апошняе каханне бывае моцнае, дужа моцнае… І дурное.* ***Стары дурней за маладога кахае*** (М. Зарэцкі. Вязьмо); *Каханне – лёгкая прынада /* ***Для сэрцаў*** *чуткіх,* ***маладых*** */ Хоць бы гняздзілася ў ім здрада, / Хоць гэта б яду быў кяліх* (Я. Купала. Магіла льва). Гэта азначае, што каханню падуладныя ўсе ўзросты: *А зрэшты, што ў гадах?* ***Каб закахацца / Не станеш перш у метрыкі звяртацца*** (А. Міцкевіч. Пан Тадэвуш). Завяршаючы гаворку пра псіхічныя якасці закаханых людзей, адзначым, як любіць слабы: *За сваю ўласную слабасць таксама любіць… Гэта праўда: бывае і так. Нездарма бабы казалі:* ***слабы любіць больш верна.*** *Ды балюча яму, што слабы ён, нядужы* (І. Шамякін. Гандлярка і паэт).

Неабходна заўважыць, што ў рэпрэзентацыі канцэпту *каханне* адзначаецца пэўная супярэчлівасць. Так, каханне можа прыводзіць да з'яўлення супрацьлеглых пачуццяў: *Пачынаецца ўсё з любві – / Нават ненавісць і агіда* (Я. Янішчыц. Ты пакліч мяне. Пазаві); чалавек можа кахаць па-рознаму: *Не пасаромелася прызнацца, што кахае яго і нікому не аддасць. І каханне яе цяперашняе зусім не падобнае на тое, якое яна мела да Адася і да замужжа, і пасля, калі жылі разам. Яно, гэтае новае каханне, як у таго Блока, якога яны чыталі разам* (І. Шамякін. Гандлярка і паэт).

Канцэпт *каханне* рэканструюецца як супярэчлівае, так і пэўнае пачуццё: *– Ну, як жа так – не ведаю… Каханне – гэта пачуццё такое… такое яснае… Заўсёды адчуваеш, ці кахаеш ты чалавека, ці не… Нават і калі дрэнна з ім… ну, калі паспрачаліся, калі разышліся нават… а ўсё*

Рэпозиторий ВГУ

роўна нешта ёсць да яго не такое, як да іншых людзей… (М. Зарэцкі. Вязьмо); *Мо закахаўся? Смешна рабілася самому з гэтае думкі. Закахаўся… Ды не, гэта не тое, гэта бывае не так. Ён жа добра ведае, што значыць – кахаць: было калісь гэта. Тады – летуценні, парыванні, кроў агнём бушуе, бурліць неспакойна. А тут – не. Тут проста – цікавасць нейкая* (М. Зарэцкі. Кветка пажоўклая).

Да таго ж каханне паказваецца як вечнае і мімалётнае (што характэрна, у творчасці аднаго пісьменніка): *Але кожны дзень на зямлі памірае каханне, і людзі абыякава праходзяць паўз дарагія калісь магілы* (У. Караткевіч. Чазенія); *Дзяржавы праходзяць, і царствы праходзяць, вечнае толькі каханне, і чалавек не можа памерці, не пакінуўшы следу на твары зямным* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім). Аднак у творах іншых мастакоў слова часцей ідзе размова пра пастаянства кахання, вернасць: *Трудна мне без Грышкі жыці. / Ніяка земска прэпона / Не ў сілах нас разлучыці!* […] */ Без яго мне смерць – спасенне, / Без яго мне свет – магіла. / Няхай бацькі лаюць, мучаць, / Ні з кім другім не злучуся. / Калі з ім мяне разлучаць, / Я ў Прыпяці ўтаплюся* (В. Дунін-Марцінкевіч. Пінская шляхта); *Між табою і дзяўчынай / Хтось мілейшы ёй стаіць, / І цябе па той прычыне / Ёй ніяк не палюбіць. / Смерць іх толькі і разлучыць – / Так злюбіліся яны… / Не паможа, не навучыць / Знахар самы ўвіхны* (Я. Колас. Сымон-музыка).

Шматграннасць кахання (любові), немагчымасць апісаць гэтае пачуццё словам па-мастацку ўдала заўважыў М. Зарэцкі: *Якая бедная наша мова людская! Колькі розных разуменняў прыходзіцца пакрываць адным словам. Любоў… І пяшчотная ласка маткі да дзіцяці свайго, і адважная, шчырая адданасць барацьбіта сваёй справе, свайму калектыву, і гэтае агнёвае, бурнае, што кроў растапляе ў жылах, што грудзі віхурыць прагавітым жаданнем… Усё – любоў…* (М. Зарэцкі. Кветка пажоўклая).

Напэўна, у кожнай лінгвакультуры існуюць агульнавядомыя тэксты-рэпрэзентанты канцэпту *каханне*. Найчасцей гэта песні, балады, вершы знакамітых аўтараў (“Я помню чудное мгновенье”, “Я Вас любил” А.С. Пушкіна ў рускай літаратуры, “Рамэа і Джульета” У. Шэкспіра, агульнавядомы твор ва ўсім свеце). На нашу думку, такімі тэкстамі ў беларускай лінгвакультурывыступае верш М. Багдановіча “Зорка Венера” (*Зорка Венера ўзышла над зямлёю, / Светлыя згадкі з сабой прывяла… / Помніш, калі я спаткаўся з табою, / Зока Венера ўзышла. / З гэтай пары я пачаў углядацца / У неба начное і зорку шукаў. / Ціхім каханнем к табе разгарацца / З гэтай пары я пачаў* (М. Багдановіч. Зорка Венера), а таксама верш А. Куляшова “Бывай” (*Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся, / Бывай, смуглявая, каханая, бывай. / Стаю на ростанях былых, а з паднябесся / Самотным жаўранкам звініць і плача май* (А. Куляшоў. Бывай…). Агульную вядомасць творы атрымалі, калі былі пакладзены на музыку. Таксама дадзеныя вершы вучаць на памяць у школе.

Репозиторий ВГУ

Як адзначалася вышэй, мастацкія тэксты – у пэўнай ступені крыніца інфармацыі пра гістарычныя змены ў грамадстве. І нават такое вечнае пачуццё, як каханне, мела сваю “сацыяльна-гістарычную” афарбоўку ў пэўныя перыяды: *Ды і наогул, хто можа прасачыць за гэтым дзівачым* ***камсамольскім каханнем,*** *якое ўплятае чаромху ў тэзісы аб сацспаборніцтве, а ў слодыч першых пацалункаў улівае гаркавы прысмак тэорыі дадатковае вартасці!* (М. Зарэцкі. Вязьмо). У рэпрэзентацыі канцэпту *каханне* адлюстараваўся і побыт беларусаў, асноўны земляробчы занятак, калі цяжкая праца селяніна не пакідала часу на праяўленне пачуццяў: *Час быў* ***не для кахання – гарачы жніveньскі час.*** *Людзі ўставалі раней за сонца, вярталіся ўпоцемку* (І. Мележ. Людзі на балоце).

У падраздзеле 2.7 мы звярталі ўвагу на тое, што канцэпт *шчасце* накладваецца сваім зместам на змест канцэпту *каханне*. Так, узаемнае чыстае каханне ўяўляецца ў моўнай тканіне мастацкіх твораў як сапраўднае шчасце: *Лета было летам шчасця. Не разумеючы яшчэ да канца, што такое каханне, Алесь ведаў, што яго кахаюць і ён сам кахае* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім); *Але ўсё ж такі не было гэта шчасце, бо Сымон Карызна навучыўся нарэшце разумець, што жаль – гэта яшчэ не зусім каханне* (М. Зарэцкі. Вязьмо).

У інфармацыйным змесце канцэпту *каханне* можна вылучыць такі паняццевы кампанент, як ‘жыццёвыя перашкоды і цяжкасці загартоўваюць каханне’: *А ты што – зручнасці хацеў? Яна ж зненавідная сапраўднаму каханню, лёгкасць гэтая, зручнасць… тое каханне, што лёгка дораць, не цягнецца доўга* (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім).

Непадкантрольнасць розуму, немагчымасць схаваць свае пачуцці – універсальная “якасць” кахання. Гэта і знайшло адлюстраванне ў наступным кантэксце: *– Я ведаю, як ты любіш мяне. Але пара ўжо, каб твая любоў рабілася разумная. / – Любоў ніколі не бывае разумнай, – адказала яна старой кніжнай ісцінай. А яму гэтая сцёртая ісціна чамусьці здалася амаль адкрыццём. Ён падумаў: / – А праўда, ёсць яна ў каго, разумная любоў?* (І. Шамякін. Сэрца на далоні).

У свядомасці нашага народа бытуе думка, што кахаць можна і трэба толькі падобнага ці роўнага сабе па фізічных ці псіхалагічных адзнаках, узросце, сацыяльным статусе: *Гэй, было б табе, Максім, не кахацца, / На вяльможную дачку не заляцацца* (М. Багдановіч. Максім і Магдалена).

Такім чынам, аналіз кантэкстаў вербалізатараў кацэпту *каханне* дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1. Ядзернымі лексічнымі адзінкамі разгледжанага канцэпту з’яўляюцца лексічныя адзінкі *каханне*, *любоў*.

2. Вобразны змест канцэпту *каханне* цяжка ўзнавіць з тэкстаў мастацкай літаратуры, што абумоўлена абстрактнасцю дадзенага паняцця ў свядомасці людзей.

Рэпозиторий ВГУ

3. Інфармацыйны змест канцэпту каханне складаецца з наступных паняццевых кампанентаў: ‘каханне – моцнае пачуццё, не падуладнае багаццю, уладзе, узросту’, ‘каханне – падмурак сям’і’, ‘каханне – аснова жыцця’, ‘каханне – шматграннае, супярэчлівае пачуццё’,‘каханне мацнее ў перашкодах’.

4. Канцэпт *каханне* накладваецца сваім зместам на змест канцэптаў *сям’я* і *шчасце*.

5. У мастацкай літаратуры існуюць знакавыя тэксты-рэпрэзентанты канцэпту *каханне*, шырока вядомыя носьбітам беларускай мовы (“Зорка Венера” М. Багдановіча, “Бывай” А. Куляшова). Змест гэтых тэкстаў – прызнанне ў цнатлівым каханні, моцнае перажыванне горычы расстання, у якім адчуваецца вялікае пачуццё, хоць і сціпла выказанае. У сюжэце гэтых вершаў няма “страсцей”, што, магчыма, і характарызуе ўмераны тэмперамент, пэўную меланхалічнасць і стрыманасць беларусаў.

2.10 Традыцыйны светапогляд беларусаў (на прыкладзе паэзіі Р. Барадуліна)

Мэтазгоднасць звароту да твораў Р. Барадуліна з мэтай выяўлення тыповых рыс светапогляду беларусаў прадыктавана наступнымі акалічнасцямі: Р. Барадулін – агульнапрызнаны майстар беларускага слова. Удумлівае выкарыстанне слова, разнастайных выяўленчых сродкаў робяць мову яго паэзіі скарбніцай мудрасці не толькі паэта, але і народа, да якога ён належыць. В. Быкаў пісаў пра свайго земляка і сябра Р. Барадуліна так: “Рыгор Барадулін – паэт рэдкай унутранай нацыянальна-паэтычнай сілы, яго глыбіннае валоданне паэтычнай мовай, па-мойму, не мае сабе роўных у нашай літаратуры... Беларуская мова, тая ж наша пагрэбаваная “трасянка”, пад рукой Барадуліна можа запець салаўінай песняй [9, с. 570]. У 2006 г. польскім і рускім ПЭН-цэнтрамі, украінскім і беларускім Саюзамі пісьменнікаў Р. Барадулін быў вылучаны кандыдатам на суіскальніцтва Нобелеўскай прэміі. Прычынай, па якой паэт не атрымаў узнагароду, крытыкі адзінагалосна называюць тое, што ў перакладах на англійскую мову не захавалася “душа” паэзіі, не адлюстраваўся талент паэта і мілагучнасць мовы.

Сам народны паэт Беларусі Р. Барадулін у адным са сваіх вершаў сцвярджае важнасць спасціжэння культурнай прасторы, у якой жыве пісьменнік: *“Каб ведаць паэта, / Трэба пабыць на ягонай зямлі / І паэтаву маці пабачыць”* (Р. Барадулін. Каб ведаць паэта). Паэт, мову творчасці якога мы разглядаем, знітаваны з народнай культурай і беларускай прыродай. Яго паэзія нясе ў сабе вялікі лінгвакультуралагічны патэнцыял, што пацвярджаюць словы М. Скоблы ва ўступным артыкуле да кнігі “Выбраныя творы” Р. Барадуліна: “Увогуле, я перакананы: Барадулін рана ці позна стане культурным брэндам Беларусі” [9, с. 8].

Рэпозиторий ВГУ

Як вядома, хрысціянскай рэлігіі на Русі папярэднічала язычніцтва. Язычніцтва (ад царк.-сл. *языцы* – народы, чужаземцы) – прыняты ў багаслоўі і ўмоўна ў гістарычнай літаратуры тэрмін, які абазначае старадаўнія вераванні і культы, што існавалі да пашырэння так званых “вышэйшых” рэлігій – хрысціянства, ісламу і інш. Язычніцтва, у асноўным, з’яўлялася бытавой рэлігіяй сялянства з яго натуральнай гаспадаркай, патрыярхальным ладам жыцця, поўным залежнасці ад сіл прыроды. У старажытнасці многія сяляне патаемна выконвалі язычніцкія абрады. Такім чынам, ствараласа тое двухвер’е, якое існавала на тэрыторыі Беларусі з даўніх часоў, сустракаецца сёння і дазваляе славянскаму язычніцтву мірна суіснаваць з усходнім і заходнім хрысціянствам. Сінтэз язычніцкага і хрысціянскага светапогляду заўважаецца і ў паэзіі Р. Барадуліна. Праз усю яго паэтычную творчасць прасочваецца народны погляд на стасункі чалавека і прыроды, якія абапіраюцца на міфалагічныя ўяўленні людзей пра навакольны свет. На ранніх этапах асваення навакольнага свету вялікую ролю ў жыцці чалавека адыгрывалі міфы, у аснове паходжання якіх ляжалі пэўныя веды пра рэчаіснасць. У наш час міф у большасці выпадкаў пераасэнсоўваецца. На першы план выступае сімволіка, якая скіравана на акрэсленне пэўнай ідэі і служыць для абагульнена-абстрагаванага разумення з’яў рэчаіснасці.

Р. Барадулін – паэт-хрысціянін, але, як выразніку нацыянальнай свядомасці беларусаў, не чужыя яму і міфалагічныя вобразы. На думку В. Максімовіча, “нацыянальная славянская сімволіка ўваходзіць у вершы Р. Барадуліна не як антураж, не як этнаграфія, а як арганічнае праяўленне яго складу розуму, складу яго таленту” [130, с. 25]. Паганскія багі і міфічныя істоты – спадарожнікі беларускага селяніна на жыццёвым шляху, свайго роду памочнікі ў яго нялёгкай працы на зямлі, у штодзённых клопатах пра гаспадарку. У сваіх творах аўтар даволі часта звяртаецца да беларускай міфалогіі. Яго паэмы “Аблачына-самабранка” і “Неба тваіх вачэй” з поўным на тое правам можна лічыць энцыклапедыяй насельнікаў беларускага язычніцкага пантэону: Зюзя ‘міфічная істота, увасабленне холаду, бог зімы’: *трывалы, нібы беларусы ўсе, / Бог са старога мужчынскага роду / У белым расхрышчаным кажусе, / Бог ходзіць* ***Зюзя*** *сівабароды* (Р. Барадулін. Неба тваіх вачэй); Ярыла ‘старажытнае язычніцкае бажаство, якое сімвалізуе вясновую абуджаную прыроду і пачуццёвае каханне’: ***Ярыла,*** *вусы распрамень, / Расчодрыся на святы* (Р. Барадулін. Неба тваіх вачэй); Пярун ‘вярхоўны бог у старажытных славян-язычнікаў, бог грому і маланкі’: *спі, пакуль* ***пярун*** *не падыме* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка); Дамавік ‘ва ўсходнеславянскай міфалогіі – дух-ахоўнік дамашняга ачага’: ***Дамавік*** */ Ці з печы злез / Ці выйшаў з запечка* (Р. Барадулін. Неба тваіх вачэй); Чур ‘міфічная істота, добры дух, які засцерагае межы гаспадаркі’: *праверыў межы нябачны* ***Чур,*** */ Надземную ўсю гасподу* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка); Жыцень

Репозиторий ВГУ

‘антрапаморфная істота ў міфалагічных павер’ях беларусаў, якая ўплывае на выспяванне ўраджаю’: *а* ***Жыцень*** *– / Дзяцюк невысокі, / Паджары, падцяты* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка); Ляля ‘багіня вясны, кахання, прыгажосці’: *весялей расце трава. / Гэта ў гожай* ***Лялі*** *жаўранкі / Вылятаюць з рукава* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка); Лясун ‘дух-ахоўнік лесу’: *А ў лесуна сваты / Абутыя ў боты з моху* (Р. Барадулін. Неба тваіх вачэй).

Узгадваюцца паэтам і міфічныя істоты тыпу ваўкалак ‘у славянскай міфалогіі – чалавек-пярэварацень, які валодае звышнатуральнай здольнасю ператварацца ў ваўка, а потым – зноў станавіцца чалавекам’: *...дзе плачуць шчырыя* ***ваўкалакі*** (Р. Барадулін. Неба тваіх вачэй); Цмок (прыцмок) ‘фантастычная змеепадобная істота’: ***Цмок*** *і сынок яго* ***Прыцмок*** */ Сасмягла локчуць бражку, / Ажно ў* ***Прыцмока*** *лоб узмок, / Аж скінуў* ***Цмок*** *сярмяжку* (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка); русалка ‘жанчына падобная істота, увасабленне воднай і лясной стыхій’: ***русалачка-латгалачка,*** */ Хмялей смялей* (Р. Барадулін. Неба тваіх вачэй). Паэт нават сам стварае міф (верш “Маё паданне”) пра тое, як Пярун паслаў бога Вададыха разліць пароўну ваду па ўсёй краіне, але, зачараваны прыгажосцю Ушаччыны, Вададых загледзеўся, заслухаўся, спатыкнуўся і праліў тут усю ваду, ад чаго на Ушаччыне і з’явілася такое мноства рэк і азёр: *Загледзеўся на ўзлескі, на паляны, / На ўзгоркі, на спакойныя лугі, ... Тут, кеміў, / Маюць спачываць багі. / Ці захмялеў ад гукаў ды ад пахаў, / Ды спатыкнуўся ён на ўсім хаду, / Разліў ашчадны Вададых з размаху / Ў мясціне нашай як не ўсю ваду* (Р. Барадулін. Маё паданне).

Апрача таго, у паэзіі Р. Барадуліна знаходзім рэшткі вераванняў людзей пра перасяленне душ памерлых продкаў у птушак: *У фортку* ***птушка*** *заляцела. / Ці гэта нейчая душа / Мяне наведаць захацела?* (Р. Барадулін. Вестка); пераўтварэнне людзей у птушак: *У зязюлю перакінула дзеўку / Благое вока чараўніка. / Княгіня стала ў сям’і птушынай / Зязюляй шэрай* (Р. Барадулін. Самота паломніцтва). А ў паэме “Буслова нарачонка” жанчына ляціць разам з буслом у вырай і нараджае ад яго дзяцей. Як бачым, птушкі і людзі кантактуюць паміж сабой, нібы роўныя. Пацверджаннем гэтаму могуць быць і наступныя радкі: *Песня жаліцца часцей: / Ах ты, шэрая зязюля, / Забаўляй маіх дзяцей* (Р. Барадулін. Евангелле ад мамы); *Клін журавоў журлівы, / У выраі летучы, / Гукае: – Лівы-лівы! / Пытаецца: – Калі вы / Ў нас возьмеце ключы? / Каб адамкнуць астрогі / Без ценяў, без вады* (Р. Барадулін. Евангелле ад мамы). У павер’ях беларусаў сустракаюцца рэшткі анімалістычных вераванняў, сувязей чалавека з дзікімі жывёламі, што семантызуюць наступныя барадулінскія радкі: *Мяне здрыганула, / А гэта воўк / Ступіў на след мой у лесе недзе* (Р. Барадулін. Смаргонская акадэмія).

Між тым, аўтар у сваёй паэзіі трывала і натуральна выяўляе сваё хрысціянскае светаадчуванне. Ён звяртаецца да паглыбленага паэтычнага

Репозиторий БГУ

асэнсавання біблейскіх сюжэтаў, матываў і сімвалаў. Напаўняючы біблейскія матывы сучасным “паэтычным дыханнем”, Р. Барадулін фактычна будуе і сцвярджае новыя этычныя прынцыпы ўзнаўлення дыялога душы чалавека з Богам. Гэта найбольш відавочна ў яго вершаваных цыклах “Трыкірый”, “Ружанец”, “Псалмы Давідавы”.

Даследаваны намі моўны матэрыял дазваляе зрабіць пэўныя вывады пра рэлігійны светапогляд аўтара, які вельмі часта ў сваіх вершах у якасці аб’екта параўнання выбірае лексемы з канфесійнай семантыкай тыпу *крыж*, *ікона*, *абразы*, *Ісус Хрыстос*, *Іаан Хрысціцель*, *душа*, *грэх*, *анёл*, *пекла, рай, божая мілата* і інш. На Беларусі спрадвеку існавалі дзве асноўныя канфесіі – праваслаўная і каталіцкая. Прычым праваслаўная па колькасці вернікаў лічыцца больш распаўсюджанай. Аднак частотнасць ужыванняў Р. Барадуліным лексем *касцёл* і *царква* паказалі, што першая лексема ўжываецца ў паэта 4 разы, у той час як другая – толькі 1 раз. Магчыма, гэта звязана з тым, што ў свой час ахрышчаны паэт быў у Кубліцкім касцёле. Заслугоўваюць увагі параўнанні, створаныя на аснове назіранняў паэта за рэлігійнымі святамі, уласцівасцямі бостваў: *Урачыста-засмучоная, / Як* ***Радаўніца, / Велікодна****-захмялелая, / Як раніца, / Нагарбелая над лехамі, над кроснамі / Кшчоная няхітрай песняй / Матка хросная* (Р. Барадулін. Феліцыя); *Сусед капялюх на вуха ссунуў, / Спіць,* ***як святы Ілля*** (Р. Барадулін. Бацьку); *І* ***зоркаю каляднаю*** */ Пад столлю загарэлася лямпачка* (Р. Барадулін. Міласэрнасць плахі).

Барадулінскі паэтычны тэкст у пэўнай ступені адлюстроўвае таксама і гісторыю хрысціянства на беларускіх землях. Так, у творчасці паэта выяўляецца рэальны факт знішчэння Кубліцкага касцёла, што на Вушаччыне, калі ў 30-я гады XX ст. гэтае культавае збудаванне было “расцягнута” жыхарамі на будаўнічыя матэрыялы: *Калі разбіралі царкву, / бацька, ад пылу шэры, / навазіў паўцагелкаў, / а потым з іх склалі печку. / Відаць, Усявышні злосць затаіў, / бо нашу хату спалілі першую, а гліне святой абгарэць / давялося яшчэ раз* (Р. Барадулін. Матчына хата). У прыведзеных радках выразна рэпрэзентаваны распаўсюджаны ў хрысціянстве матыў справядлівага Божага пакарання, што семантызуецца праз метафарычны выраз *“Усявышні злосць затаіў”*.

Найбольш яскрава на сінтэз дзвюх прыгаданых вышэй рэлігій указваюць народныя святы, якія спрадвеку адзначаліся беларусамі. Многія з іх маюць “паганскія” карані, аднак падчас хрысціянізацыі набылі новы статус. У мове Р. Барадуліна сустракаюцца шматлікія назвы свят і прысвяткаў беларускага народнага календара: Дзяды, Каляды, Масленіца, Сёмуха, Радаўніца і інш.

Як вядома, у структуру храналагічнага календара беларусаў уваходзяць такія святы, як Каляды, Грамніцы, Купалле, Жніво, Багач, Восеньскія Дзяды. Да прыходу хрысціянства да гэтага цыкла адносілася яшчэ некалькі найбольш значных свят веснавога перыяду: Масленка,

Репозиторий ВГУ

Саракі, Вялікдзень, Радаўніца, Сёмуха, або Русальны тыдзень. Шырокае выкарыстанне назваў гэтых свят яшчэ раз сцвярджае тое, што паэтычная творчасць Р. Барадуліна, цесна знітавана з народнай культурай, якая трансліруецца праз мову паэтычнага кантэксту: "*Дзякуй / **Пакравам,** / **Дзядам,** / **Калядам,** / Што чакалі з даўнасці мяне"* (Р. Барадулін. Рум) – кажа ў адным са сваіх вершаў паэт. Сямейныя святы беларусаў таксама знайшлі адлюстраванне ў яго паэзіі: заручыны 'абрад аб'яўлення жаніхом і нявестай', запоіны 'абрад выпівання чаркі як згоды сваякоў на заручыны': *Ані **заручын,** / Ані **запоін.** / Жывуць дагэтуль / Самі сабою* (Р. Барадулін. Вяселле); хрэсьбіны (хрышчэнне) 'адно з хрысціянскіх таінстваў, рэлігійны абрад прыняцця у лік вернікаў, далучэнне да царквы і наданне асабовага імя': *Там на **хрэсьбінах,** / На **запоінах** / Ці завеі, ці йскрыпкі пілікаюць* (Р. Барадулін. Евангелле ад мамы); агледзіны 'бытавы абрад знаёмства жаніха і яго сваякоў з нявестай': *Пасажыры аўтобуса / Глядзяць на поўню, / Як на **агледзінах*** (Р. Барадулін. Маладзік над стэпам).

У вершы "Вогнепаклонніца" паэт па-мастацку вызначыў "сінтэз" хрысціянства і паганства ў рэлігійнай свядомасці беларусаў, у тым ліку і сваёй маці: *Мама мая хрысціянкай зжыла, / З богабаязнай душой, іконніцай. / Ды вернападдадзеная святла, / Болей была яна / **Вогнепаклонніцай*** (Р. Барадулін. Вогнепаклонніца). Зазначым, што лексема *вогнепаклонніца* ў беларускай мове мае значэнне 'чалавек, які пакланяецца агню як бажаству' і ў моўнай свядомасці беларусаў абазначае язычнікаў.

Як вядома, маці Р. Барадуліна паўплывала на фарміраванне яго творчай асобы, на што паэт сам неаднаразова звяртаў ўвагу: *"Мама была жывой энцыклапедыяй крывіцкай мовы, крывіцкіх песняў і прыбабунек, карані якіх у сівой даўніне, у паганскім свеце*" [9, с. 575]. Амаль усе сямейныя абрады, апісаныя паэтам, выконвае менавіта яго маці Куліна Андрэеўна: *Мама ў паддзеўку бацькаву / зашывала святы лісток / з замовай ад кулі, ад пікі, / ды лісток засланіць партызана не змог* (Р. Барадулін. Блакада); *Торкае маці ў сцяну / Купалкі ў купальскі вечар. / ... Калі ... раскудлацяць галовы / Купалкі... – / значыць... усе, / На каго загадалі... – Здаровы...* (Р. Барадулін. Бацьку). У паэме "Куліна" аўтар узгадвае малітву маці, яе зварот да Бога: *Абнясі, Божа, тынам / Ад зямлі да неба, / Сахрані мяне, Божа, / Адныні давеку* (Р. Барадулін. Куліна), у якой вельмі моцна адчуваюцца прыкметы замовы як фальклорнага жанру.

У мове паэзіі Р. Барадуліна знаходзім пацвярджэнне традыцыйнага народнага светапогляду адносна таго, што ў беларускай сям'і менавіта жанчына спрадвеку была захавальніцай традыцый, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне: *А **нашы матулі** сціплыя / Думкі думаюць ціхія / Як і ў часы Скарыны, **Не забываюць за нас памаліцца, / Абнашчыцца ў пост скарынкай*** (Р. Барадулін. Матчына хата). Многія абрады і прыкметы, або "прымхі", "забабоны", беларусы выконваюць згодна з народнымі традыцыямі, часам да канца не асэнсоўваючы іх, не паглыбляючыся ў іх

Рэпозиторий ВГУ

сутнасць. І гэта не засталося па-за ўвагай паэта: *Выходзячы з хаты: Печ заслaніць, – / Каб людзі не разяваліся, / Пасядзець маўчком, – / Каб пашанцавала, / Першага сустрэць чалавека – На ўдачу, / Маладзіцу – / Непажадана* (Р. Барадулін. Рум). Прыгаданыя ў вышэйпрыведзеным кантэксце павер'і маюць у сабе глыбіннае значэнне, нясуць у сабе пэўную інфармацыю пра светапогляд беларускага народа.

Народныя прыкметы, якія сустракаюцца ў мове паэзіі Р. Барадуліна, сведчаць пра тое, што беларусы – гасцінны народ: *Зляцеў са стала на падлогу нож – / Спяшае мужчына, мне шэпча прыкмета / У цішыні са стала / Звалілася лыжка. / Мне шэпча на вуха / Прыкмета: / Спяшае кабета* (Р. Барадулін. Лінія перамены дат). Трэба адзначыць, што ў свядомасці беларусаў нож сімвалізуе мужчынскі пачатак, а відэлец і лыжка – жаночы. Або яшчэ прыклад: *Бяда не бяда, / Кот мыецца – **на гасцей*** (Р. Барадулін. Вяртанне ў першы снег). Паэт неаднойчы гаворыць, як важна наведваць родных і блізкіх людзей, неаднаразова падкрэслівае гасціннасць беларусаў у сваіх вершах ("Традыцыі", "А бяседа цячэ", "Наведвайце бацькоў", "Трэба дома бываць часцей"). Ужо сталі хрэстаматыйнымі для беларускай літаратуры радкі Р. Барадуліна, якія выяўляюць важную маральную норму беларусаў – *Помніць свой на іржышчы цень, / Не забыць, як завуць суседа, / Не забыць, як пяе пад дзень / За вясельным сталом бяседа* (Р. Барадулін. Трэба дома бываць часцей). Кожнае слова нясе ў гэтых радках глыбокі лінгвакультурны патэнцыял: выраз *на іржышчы* сімвалізуе глыбокую прывязанасць беларусаў да сваёй зямлі, працы, дзе іржышча – гэта зжатае поле, радок *не забыць, як завуць суседа* ўказвае на названую раней характэрную рысу беларусаў – ветлівасць, добразычлівасць. Пра традыцыю святкаваць вялікія шумныя вяселлі, на якіх абавязковым з'яўляліся песні, якія выконваліся гасцямі, паведамляюць нам радкі з верша ... *пяе пад дзень / За вясельным сталом бяседа.*

Рэпрэзентацыя асаблівасцей народнай культуры беларусаў у мове паэзіі Р. Барадуліна адбываецца таксама і праз прыметы, звязаныя з ашчаднасцю, беражлівым стаўленнем яго землякоў да гаспадаркі, паважлівымі адносінамі да хлеба. Назоўнікі *хлеб (бохан, луста)* семантызуюць павагу да працы і да хлеба як яе выніку: *Так, помню, вучылі мяне / **Хлеб** не кідаць пад ногі* (Р. Барадулін. Матчына хата); *Стол не змяталі ніколі на рог, / Каб не звесці на клін гаспадарку / Не сядаў у шапцы за стол маладзён, / Каб не была глухою цешча, / **Бохан не быў цемем уніз кладзён*** (Р. Барадулін. Аблачына-самабранка); *А я на лусту аржаную / Шапчу: – Кусціся, ярына! / Прыглухлай бояззю шаную / Маўчанне перуна* (Р. Барадулін. Самота паломніцтва). Назоўнік з памяншальна-ласкальным значэннем ***хлебнічак*** з'яўляецца назвай аднаго з вершаў аўтара, які вяртае нас у цяжкія пасляваенныя гады: *Рана будзіў сорак шосты год... / Няўродзіца... Картачная сістэма... Як скарб, / я дадому буханку нёс...* Маці паэта ласкава называла маленькага Рыгорку хлебнічкам: *Да сёння прыемна*

Репозиторий ВГУ

*мне адчуваць, / Што быў не нахлебнікам – / **хлебнічкам** дома* (Р. Барадулін. Хлебнічак). З кантэксту вынікае, што аўтарскі наватвор *хлебнічак* мае лексічнае значэнне ‘асоба, якая прыносіць хлеб’. Заўважым, што лексема *хлеб* у моўнай карціне свету беларусаў акружана станоўчым сэнсавым арэолам, пра што сведчаць барадулінскія радкі *“Як чорны хлеб, / Свой чорны дзень цані”* (Р. Барадулін. Псалмы Давідавы), г.зн. ‘вельмі цані, паважай’. У паэта знайшлося месца і для жартаў пра хлеб, своеасаблівую перыфразу радкоў з малітвы “Ойча наш” сустракаем у гумарыстычнай паэме “Смаргонская акадэмія”: *Хлеб наш насушаны, / Сам ссох і нас ссушыў...* (Р. Барадулін. Смаргонская акадэмія).

Можна вызначыць агульнапрынятыя нормы паводзін і ўзаемаадносін беларусаў, якіх прытрымліваецца сам паэт: *Хай жа ў **зміры** / Усе суседзі без нуды / Жывуць і **не сварацца** задзіры / Адзін у другога **просяць шчыра** / Няхай на свежыну заўжды* (Р. Барадулін. Традыцыі); *Не жыць як набяжыць, / Каб дзень за дзень – і годзе* (Р. Барадулін. Рум). Імкненне беларусаў да мірнага і спакойнага жыцця рэпрэзентуецца ў мове яго паэзіі праз лексемы *не сварацца, просяць шчыра* і інш. Некаторыя асаблівасці паводзін Р. Барадулін “пазычае” ва “ўшацкіх людзей”, якія выяўляюць асноўныя рысы карціны свету большасці беларусаў, у тым ліку – сарамлівасць, жаданне быць такім, як усе, асуджэнне залішняй ганарлівасці: *На тых, хто шарахаўся зайцом у хлудзе, / пазіралі з дакорам, / бо вышэй над усім **ушацкія людзі** / ставілі сорам; добра таго біць, каму баліць, / добра таго лаіць, хто сорам маіць. / Калі хто ў шляхту ціснуўся... / з яго кпілі ўсмак* (Р. Барадулін. Лінія перамены дат). Найбольш яскрава характарызуе паэт асноўныя рысы характару беларускай этнічнай супольнасці ў вершы “Мы – беларусы”, у якім згадваюцца такія якасці нашага народа, як ахвярнасць, сціпласць, гасціннасць. Станоўчую характарыстыку беларусам дае паэт у наступных выразах: *“Саміх сябе хваліць нам не з рукі”*, *“Надзейныя сябры і дружбакі”*, *“Гатовы ўсё аддаць – / І тым багаты”* (Р. Барадулін. Мы – беларусы), заўважаючы між тым і недахопы, у тым лікугістарычнае беспамяцтва: *Ахвотна забываем, што мы, / Хто мы. / Згадаюць / Нашай памяці вякі!* (Р. Барадулін. Мы – беларусы).

Заўважым, што Р. Барадулін у сваёй творчасці асобнае месца адводзіць вобразу *“ўшацкіх людзей”* – сваіх землякоў, якія характарызуюцца дасціпнасцю, кемлівасцю, працавітасцю, ветлівасцю і маральнасцю ў паводзінах. Але разам з тым паэт указвае і на недахопы сваіх землякоў, такія, як абыякавасць да мастацтва, п’янства: *“Наогул **паэзіі** тут **не чытаюць** – / Ані класічнай, ані навейшай”*; *“Па **выпітай гарэлцы** / Раён наш займае / першае месца ў вобласці. / Землякі мае выпіць могуць, / Але і не зломкі на працу”* (Р. Барадулін. Вяртанне ў першы снег). На нашу думку, стварэнне абагульненага вобраза жыхароў Ушаччыны як прадстаўнікоў беларускай этнічнай супольнасці – вельмі значны ўнёсак

Рэпозиторий ВГУ

пісьменніка ў беларускую літаратуру і культуру, важны для спасціжэння народнага светапогляду ўсёй беларускай нацыі праз мастацкі тэкст. Абагульнены вобраз землякоў Р. Барадуліна з Ушаччыны можна параўнаць з вобразам палешукоў, з замілаваннем апісаных І. Мележам у яго “Палескай хроніцы”.

Сёння ў памяці народа жывуць розныя язычніцкія міфалагічныя ўяўленні аб існаванні “таго свету”, святкуюцца Дзяды і Радаўніца, жывуць гісторыі пра русалак, лесавікоў, чарцей, ведзьмаў. Працягваецца традыцыя паважлівых адносін да агню, а ў фальклоры ўслаўляюцца сонца, месяц, зоркі, дрэвы, рэкі і інш. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў мове паэзіі Р. Барадуліна. Даследаваны матэрыял дазваляе сцвярджаць наступнае:

1. Выкарыстоўваючы традыцыі і матывы народнай творчасці, багатую палітру вобразна-выяўленчых сродкаў мовы, Р. Барадулін імкнецца глянуць на свет вачыма свайго далёкага продка, як бы ўзнаўляючы сваю кроўную сувязь з зямлёй-маці, вяртаючыся да вытокаў, сваіх продкаў, тых першакрыніц, якія выяўляюць духоўную існасць беларускага народа, нацыянальна-культурную адметнасць яго гісторыі, мовы, побыту.

2. Разнастайнасць і значная колькасць ужывання назваў розных народных свят і прысвяткаў беларусаў выяўляе рэлігійны светапогляд нашага народа, яго назапашаныя стагоддзямі мудрыя назіранні за прыродай.

3. Сістэма народных прыкмет беларусаў, семантызаваных у мове даследаваных намі зборнікаў паэзіі Р. Барадуліна, дае цікавую інфармацыю пра такія адметнасці характару беларусаў, як гасціннасць, ашчаднасць, гаспадарлівасць.

4. Агульнапрынятыя нормы паводзін беларусаў, рэпрэзентаваныя ў мове паэзіі Р. Барадуліна, выяўляюць наступныя рысы характару прадстаўнікоў нашага народа: справядлівасць, добразычлівасць ва ўзаемаадносінах, шчырасць, працавітасць, годнае стаўленне да людзей. Заганнымі лічацца фанабэрлівасць, баязлівасць, гультайства. Заўважаецца сінтэз аўтарскага і народнага разумення нормаў паводзін чалавека, што дасягаецца ўвядзеннем у моўную тканіну вершаў народных выслоўяў, прыказак, прымавак, фразеалагізмаў.

5. Створаны Р. Барадуліным вобраз сваіх землякоў – “ушацкіх людзей” – дапамагае спасцігнуць народны светапогляд беларусаў.

Рэпозиторий ВГУ

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Найважнейшым складнікам нацыянальнай культуры з'яўляецца мова. У ёй знаходзяць адлюстраванне здабыткі духоўнай і матэрыяльнай спадчыны народа, яго гісторыя, звычаі і абрады. Разам з працай, творчасцю і мысленнем яна адносіцца да ўзаемаабумоўленых атрыбутаў культуры. Чалавечае маўленне, вобразы, сімвалы і паняцці мовы фіксуюць усю жыццядзейнасць чалавечага грамадства, увасобленую ў яго культурных здабытках. Сувязі мовы выяўляюцца найперш з культурай духоўнай. Так, найбольш цесныя стасункі мова мае з літаратурай.

Сярод актуальных аспектаў сучасных лінгвістычных даследаванняў вылучаецца праблема ўзаемадачыненняў мовы і культуры, асаблівасці адлюстравання духоўнага свету моўнымі сродкамі. Як вядома, у кожнай мове выяўляецца нацыянальная спецыфіка светабачання, спосаб фіксацыі тых ці іншых фактаў рэчаіснасці. Антрапацэнтрычны накірунак, які актыўна развіваецца ў сучаснай лінгвістыцы, ставіць перад даследчыкамі новыя задачы – даследаваць ментальныя адзінкі – канцэпты, якія з'яўляюцца элементамі канцэптасферы і мадэлююць моўную свядомасць індывіда і нацыі ўвогуле.

Адной з найбольш важных праблем кагнітыўнай лінгвістыкі стала праблема выяўлення ў свядомасці чалавека цэласнай карціны свету, што фіксуецца мовай. Рэканструкцыя моўнай карціны свету нацыянальных пісьменнікаў дазваляе стварыць таксама і моўную карціну нацыі, бо да асаблівасцей аўтарскай мастацкай карціны свету адносіцца сумяшчэнне нацыянальнага і індывідуальнага кампанентаў. Аналіз тэкставага зместу ключавых канцэптаў у хрэстаматыйнай літаратуры дазволіў выявіць дадатковыя сэнсы да ўжо вызначаных на папярэдніх этапах (праца са слоўнікамі, фразеалагічным фондам, фальклорам) вывучаных канцэптаў. Яны таксама ўваходзяць у зместавую структуру дадзеных канцэптаў, бо мастацкая карціна свету – гэта частка нацыянальнай карціны свету, а пісьменнік – творца культурных каштоўнасцей.

Вывучэнне ключавых канцэптаў мастацкай літаратуры – спосаб пранікнення ў ментальнасць народа, разумення культурных асаблівасцей, нормаў і правіл паводзін у пэўным соцыуме. У ключавых канцэптах увасоблены найважнейшыя, базавыя каштоўнасці нацыянальна-культурных супольнасцей.

У аснове нашай працы ляжыць думка, што ў беларускай мастацкай літаратуры можна выдзеліць набор ключавых канцэптаў, якія суадносяцца з адпаведнымі канцэптамі беларускай лінгвакультуры. Намі выяўлена культурна маркіраванае ўспрыманне пісьменнікамі такіх ключавых агульнакультурных канцэптаў, як *Радзіма*, *народ*, *воля*, *мова*, *сям'я* і інш.

Репозиторий ВГУ

Гэта дазваляе гаварыць пра існаванне своеасаблівага светабачання беларусаў, якое выяўляецца ў мастацкіх тэкстах.

У хрэстаматыйнай беларускай літаратуры адбілася своеасаблівае ўспрыманне часу беларускай нацыяй (наяўнасць безэквівалентных адзінак для называння прамежкаў часу і прасторавых аб'ектаў, адлюстраванне старажытных міфалагізаваных персанажаў, звязаных з порамі года, падзел прасторы на "сваю" і "чужую", звязаныя з гэтым канатацыі).

Даследаваўшы змест канцэпту *Радзіма* ў мастацкіх тэкстах, прадстаўленых у школьных падручніках, мы пацвердзілі меркаванне аб тым, што дадзены канцэпт займае найважнейшае месца ў масавай свядомасці беларускага народа. Пра гэта сведчаць развітая структура канцэпту, наяўнасць у ёй некалькіх паняццевых складнікаў, якія актуалізуюць у свядомасці школьнікаў трывалыя маральна-патрыятычныя ідэалы. Канцэпт *Радзіма* з'яўляецца ключавым у беларускай нацыянальнай свядомасці і стаіць у адным шэрагу з такімі маральнымі каштоўнасцямі, як *народ*, *воля*, *мова*, *сям'я*, што трансліруецца мастацкімі тэкстамі.

Мадэляванне канцэпту *народ* дазволіла выявіць вобраз беларусаў у моўнай свядомасці пісьменнікаў-класікаў, апісаць дамінантныя рысы беларускай ментальнасці. Безумоўна, ва ўсіх падобных меркаваннях, стэрэатыпах ёсць пэўная доля ўмоўнасці, суб'ектыўнасці, аднак у цэлым яны адлюстроўваюць тыповыя рысы псіхалогіі беларускай этнічнай супольнасці.

Аналіз мовы хрэстаматыйнай беларускай мастацкай літаратуры паказаў, што канцэпты *мова* і *воля* – актуальныя як у мове хрэстаматыйнай літаратуры, так і ў моўнай карціне свету беларусаў. Мова і воля – важныя складнікі самастойнасці нацыі, умова для яе захавання.

Здаўна ў беларусаў *сям'я* лічылася маральнай і гаспадарчай асновай агульнапрынятага ладу жыцця. Народная свядомасць утрымлівае ў сабе разуменне велізарнай ролі бацькоў у выхаванні дзяцей, якія павінны ім перадаваць найлепшыя маральныя якасці. Роля маці ў гэтым самая галоўная, бо яна знаходзіцца эмацыянальна бліжэй да дзяцей, ад яе ў многім залежыць лад і спакой у сям'і, добрыя ўзаемаадносіны і згода.

Рэканструкцыя канцэптаў – *шчасце* і *каханне* – дазволіла больш поўна і глыбока прааналізаваць псіхічны склад нацыянальнага характару беларусаў. Айчыннымі майстрамі слова падкрэсліваюцца такія рысы беларускай ментальнасці, як стрыманасць, працавітасць, прыхільнасць да ўстаноўленай у грамадстве нормы паводзін (што адлюстроўвае каштоўнасны/ацэначны кампанент канцэптаў).

Дыяхранічны аспект даследавання канцэптаў рэпрэзентаваў эвалюцыю лінгваментальных адзінак у моўнай свядомасці беларускіх пісьменнікаў як яскравых прадстаўнікоў беларускага народа. У хрэстаматыйных творах засведчаны важныя падзеі айчыннай гісторыі, адлюстраваны шлях беларусаў да незалежнасці, гісторыя беларускай мовы.

Репозиторий ВГУ

Эвалюцыя сям'і і побыту рэпрэзентавана ў канцэптах *сям'я*, *каханне*, а таксама пры лінгвакультуралагічным аналізе паэзіі Р. Барадуліна.

Вывучэнне традыцыйнага светапогляду беларусаў у паэтычных творах Р. Барадуліна дапамагае не толькі вызначыць спектр асаблівасцей матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, але і прэзентуе духоўныя каштоўнасці і маральныя арыенціры нашых продкаў і сучаснікаў, адлюстроўвае традыцыйнае мысленне, якое абумоўлена этнакультурным светабачаннем і ментальнымі асаблівасцямі беларускага народа, паказвае асаблівасці іх светаўспрымання.

Такім чынам, вывучэнне моўных сродкаў рэпрэзентацыі мастацкага канцэпту з'яўляецца важным і неабходным для ўсведамлення ідэйнага сэнсу мастацкіх тэкстаў і для разумення вывучаемых творчых асоб, іх непаўторнай манеры. Духоўны светапогляд беларускага народа, яго разуменне жыцця, праяўленні ментальнасці знайшлі адлюстраванне на старонках літаратурных твораў беларускіх пісьменнікаў. Вербальнае выражэнне асноўных канцэптаў у мове беларускай літаратуры адлюстроўвае асаблівасці мастацкага мыслення і светапогляду пісьменнікаў, дае магчымасць атрымаць уяўленне пра іх унутранае духоўнае жыццё, сістэму каштоўнасцей, карціну свету як мастакоў слова, так і нацыі, да якой належаць пісьменнікі.

Репозиторий ВГУ

ЛІТАРАТУРА

1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Канчэўскі ; прадм. С. Дубаўца. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.
2. Антология концептов / под ред. В. И. Карасика, И. А. Стернина. – Волгоград : Парадигма, 2005. – Т. 1. – 352 с.
3. Антология концептов / под ред. В. И. Карасика, И. А. Стернина. – Волгоград : Парадигма, 2006. – Т. 3. – 381 с.
4. Антология концептов / под ред. В. И. Карасика, И. А. Стернина. – Волгоград : Парадигма, 2009. – Т. 7. – 334 с.
5. Антология концептов / под ред. В. И. Карасика, И. А. Стернина. – Волгоград : Парадигма, 2011. – Т. 8. – 328 с.
6. Апресян Ю. Д. Образ человека по данным языка / Ю. Д. Апресян // Избр. труды. – М. : Языки русской культуры, 1995. – Т. 2. – 767 с.
7. Арутюнова, Н. Д. Язык и мир человека / Н. Д. Арутюнова. – М. : Языки русской культуры, 1999. – 896 с.
8. Бабарыкова, Э. В. Ключевые концепты поэзии И. Анненского : автореф. дис. … канд. филол. наук / Э. В. Бабарыкова ; Яросл. гос. пед. ун-т им. К. Д. Ушинского. – Ярославль, 2007. – 22 с.
9. Барадулін, Р. Выбраныя творы / Р. Барадулін ; уклад., прадм., камент. М. Скоблы. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – 596 с.
10. Барадулін, Р. Збор твораў : у 5 т. / Р. Барадулін ; прадм. В. Сёмуха. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996–2002. – Т. 3.
11. Барадулін, Р. Ксты / Р. Барадулін. – 3-е дапоўн. выд. – Мінск : Рым.-катал. парафія Св. Сымона і Алены, 2009. – 528 с.
12. Барадулін, Р. І. Навошта : вершасказы / Р. І. Барадулін ; уклад. А. Камоцкі; фотамаст. Дж. Кунстэдэр. – Мінск : Медысонт, 2009. – 162 с.
13. Бартминьский, Е. Языковой образ мира: очерки по этнолингвистике / Е. Бартминьский. – М. : Индрик, 2005. – 528 с.
14. Бахтин, М. М. Автор и герой. К философским основам гуманитарных наук / М. М. Бахтин. – СПб. : Азбука, 2000. – 332 с.
15. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі ; уклад., прадм. і камент. М. Хаустовіча. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998. – 480 с.
16. Беларусазнаўства : навучальны дапаможнік / пад рэд. П. Брыгадзіна. – Мінск : Завігар, 1998. – 288 с.
17. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 9-га кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. П. Рагойша [і інш.] ; пад рэд. В. П. Рагойшы. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011. – 320 с.
18. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання /

Репозиторий ВГУ

З. П. Мельнікава [і інш.] ; пад рэд. З. П. Мельнікавай, Г. М. Ішчанкі. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009. – 304 с.

19. Беларуская літаратура : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання / уклад. М. А. Лазарук [і інш.]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. – 622 с.

20. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З. П. Мельнікава [і інш.] ; пад рэд. З. П. Мельнікавай, Г. М. Ішчанкі. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009. – 304 с.

21. Беларуская літаратурная спадчына : анталогія : у 2 кн. / уклад. П. М. Лапо [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – Кн. 1. – 944 с.

22. Беларуская літаратурная спадчына : анталогія : у 2 кн. / уклад. С. А. Курбанава [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – Кн. 2. – 1029 с.

23. Беларусь: лингвокультурологический комплекс : пособие для иностранных студентов / сост. : Л. Н. Чумак, В. Г. Будай, Т. О. Верховцова [и др.] ; под ред. Л. Н. Чумак. – Минск : БГУ, 2008. – 112 с.

24. Беларусы : у 8 т. / В. К. Бандарчык. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – Т. 3 : Гісторыя этналагічнага вывучэння ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, А. І. Лакотка. – 375 с.

25. Беларусы : Сучасныя этнакультурныя працэсы / Г. І. Каспяровіч [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 607 с.

26. Белорусы. – М. : Наука, 1998. – 503 с.

27. Бельскі, А. І. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі, Л. К. Цітова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 320 с.

28. Беспалова, О. Е. Концептосфера поэзии Н. С. Гумилева в ее лексическом представлении : автореф. дис. ... канд. филол. наук / О. Е. Беспалова. – СПб. : Рос. гос. пед. ун-т им. А. И. Герцена, 2002. – 24 с.

29. Бромлей, Ю. В. Человечество – это народы / Ю. В. Бромлей, Р. Г. Подольный. – М. : Мысль, 1990. – 391 с.

30. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў : у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск : БелЭН, 1999. – Т. 2. – 736 с.

31. Быкаў, В. Знак бяды : аповесць / В. Быкаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. – 254 с.

32. Быкаў, В. Поўны збор твораў : у 14 т. / В. Быкаў. – Мінск, Саюз беларускіх пісьменнікаў; М. : ТАА “Выдавецтва “Время”, 2005. – Т. 2 : Аповесці. – 624 с.

33. Вежбицкая, А. Язык. Культура. Познание / А. Вежбицкая. – М. : Русскае слово, 1997. – 411 с.

34. Вежбицкая, А. Понимание культур через посредство ключевых слов / А. Вежбицкая. – М. : Языки славянской культуры, 2001. – 287 с.

Репозиторий ВГУ

35. Виноградов, В. В. Избранные труды. О языке художественной прозы / В. В. Виноградов. – М. : Наука, 1980. – 360 с.

36. Виноградов, В. В. О языке художественной литературы / В. В. Виноградов. – М. : Художественная литература, 1959. – 655 с.

37. Винокур, Г. О. О языке художественной литературы / Г. О. Винокур. – М. : Высш. шк., 1991. – 447 с.

38. Вінакурава (Півавар), К. С. Нормы паводзін беларусаў у люстэрку фразеалогіі / К. С. Вінакурава // III Машеровские чтения : материалы регион. науч.-практ. конф. студ., магистрантов и аспирантов, Витебск, 24–25 марта 2009 г. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова. – С. 170–171.

39. Вінакурава (Півавар), К. Нацыянальна-культурны кампанент у мастацкім тэксце (на прыкладзе аповесці В. Быкава "Знак бяды" / К. Вінакурава // От идеи к инновации : материалы XVI Респ. студ. науч.-практ. конф., Мозырь, 23 апр. 2009 г.: в 2 ч. – Мозырь, УО "МГПУ им. И. П. Шамякина", 2009. – Ч. 1. – С. 159–160.

40. Вінакурава (Півавар), К. С. Этнакультурны кампанент мовы ў паэтычным радку Р. Барадуліна / К. С. Вінакурава // "Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя праблемы даследавання : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. маладых вучоных, Мінск, 26 сак. 2010 г. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. – С. 89–92.

41. Вінакурава (Півавар), К. Моўныя сродкі стварэння вобраза маці ў паэзіі Р. Барадуліна / К. Вінакурава // От идеи – к инновации : материалы XVII Респ. студ. науч.-практ. конф., Мозырь, 29 апр. 2010 г.: в 2 ч. – Мозырь, 2010. – Ч. 2. – С. 80–81.

42. Вінакурава (Півавар), К. С. Сімволіка птушкі ў паэтычным радку Р. Барадуліна / К. С. Вінакурава, А. С. Дзядова // Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння : навук. зб. да 60-годдзя П. А. Міхайлава / рэдкал.: А. В. Барысевіч, Д. В. Дзятко, Н. П. Лобань ; адк. рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Права і эканоміка, 2010. – С. 242–247.

43. Вінакурава (Півавар), К. Этнакультурны змест колерапісу ў паэзіі Р. Барадуліна / К. Вінакурава // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 21–22 кастр. 2010 г. – Віцебск : УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2010. – С. 20–22.

44. Вінакурава (Півавар), К. С. Параўнанне як аб'ект лінгвакультуралагічнага аналізу (на матэрыяле твораў Р. Барадуліна) / К. С. Вінакурава // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі : матэрыялы рэсп. навук. канф. – Брэст : УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна", 2011. – С. 74–77.

45. Вінакурава (Півавар), К. Міфалогія і фальклор у паэзіі Р. Барадуліна: этналінгвістычны аспект / К. Вінакурава // Фальклор і

Репозиторий ВГУ

сучасная культура : матэрыялы III Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 21–22 красав. 2011 г. – С. 102–104.

46. Вінакурава (Півавар), К. С. Моўны этыкет беларусаў праз прызму паэзіі Р. Барадуліна: лінгвакультуралагічны аспект / К. С. Вінакурава // От идеи – к инновации : материалы XVIII Респ. студ. науч.-практ. конф., г. Мозырь, 28 апр. 2011 г. / УО МГПУ им. И. П. Шамякина ; редкол.: И. Н. Каралевич. – Мозырь, 2011. – С. 178–179.

47. Вінакурава (Півавар), К. Рэлігійны светапогляд беларусаў у паэзіі Р. Барадуліна: лінгвакультуралагічны аспект / К. Вінакурава // Скарына і наш час : матэрыялы V Міжнар. навук. канф., Гомель, 14–15 кастр. 2011 г. / рэдкал.: А. А. Станкевіч (гал. рэд.) і інш.; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2011. – С. 253–255.

48. Вінакурава (Півавар), К. Лінгвакультуралагічны аналіз перакладаў паэзіі Р. Барадуліна І. Шклярэўскім / К. Вінакурава // Кросс-культурная коммуникация и современные технологии в исследовании и преподавании языков : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 25 окт. 2011 г. / М-во образования Респ. Беларусь, БГУ ; редкол.: О.И. Уланович (отв. ред.). – Минск : Изд. центр БГУ, 2012. – С. 95–98.

49. Вінакурава (Півавар), К. Нацыянальная культура ў мове мастацкага тэксту (на прыкладзе паэзіі Р. Барадуліна) / К. Вінакурава // II Міжнар. навук. канф. “Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння” : зб. навук. арт. / рэдкал.: В. Д. Старычонак, Д. В. Дзятко [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2011. – С. 52–55.

50. Вінакурава (Півавар), К. Канцэпт *лёс, доля* ў мове паэзіі Р. Барадуліна і У. Караткевіча / К. Вінакурава // Фальклор, гісторыя і літаратура беларусаў у кантэксце культурнай спадчыны славян : матэрыялы рэсп. студ. навук.-практ. канф., Брэст, 19 кастр. 2011 г. / рэдкал.: З. П. Мельнікава [і інш.]. – Брэст : Альтэрнатыва, 2012. – С. 21–23.

51. Вінакурава (Півавар), К. Функцыянаванне фразеалагізмаў у паэзіі Р. Барадуліна і У. Караткевіча / К. Вінакурава // Славянская фразеология в синхронии и диахронии : сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины / редкол.: В. И. Коваль (отв. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2011. – Вып. 1. – С. 170–173.

52. Вінакурава (Півавар), К. Феномен *душа* ў паэзіі Р. Барадуліна і У. Караткевіча / К. Вінакурава // Образование XXI века : материалы XII (57) Регион. науч.-практ. конф. студентов и магистрантов, Витебск, 29–30 марта 2012 г. / Вит. гос. ун-т ; редкол.: А. П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2012. – С. 142.

53. Винокурова (Пивовар), Е. С. Концепт и его роль в изучении языков / Е. С. Винокурова // Актуальные пробемы русского языка и методики его преподавания: традиции и инновации : сб. ст. XIV Всерос.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

науч.-практ. конф. молодых ученых с междунар. участием ; под ред. В. М. Шаклеина. – Москва, РУДН, 23 апр. 2012 г. – М., 2012. – С. 62–65.

54. Вінакурава (Півавар), К. С. Ключавыя быційныя канцэпты ў паэзіі Р. Барадуліна і У. Караткевіча / К. С. Вінакурава // Национально-культурный компонент в тексте и языке : материалы докл. V Междунар. юбилейн. науч. конф., Минск, 6–7 дек. 2012 г. : в 2 ч. / редкол. : О. А. Полетаева (отв. ред.) [и др.]. – Минск : МГЛУ, 2013. – Ч. 1. – С. 194–197.

55. Вінакурава (Півавар), К. С. Мастацкі канцэпт *Радзіма* і яго моўная рэпрэзентацыя: на матэрыяле паэзіі Р. Барадуліна і У. Караткевіча / К. С. Вінакурава // Весн. Магіл. ун-та. – 2013. – № 1(41). – С. 67–72

56. Вонсович, Л. В. Белорусоведение : учеб. пособие / Л. В. Вонсович. – Минск : ТетраСистемс, 2005. – 224 с.

57. Воркачев, С. Г. Лингвокультурология, языковая личность, концепт: становление антропоцентрической парадигмы в языкознании / С. Г. Воркачев // Филологические науки. – 2001. – № 1. – С. 64–72.

58. Воркачев, С. Г. Идея патриотизма в русской лингвокультуре : монография / С. Г. Воркачев. – Волгоград : Парадигма, 2008. – 199 с.

59. Воркачев, С. Г. Singularia tantum: идеологема «народ» в русской лингвокультуре : монография / С. Г. Воркачев. – Волгоград : Парадигма, 2013. – 254 с.

60. Гаўрош, Н. Вобразнае азначэнне ў мастацкіх тэкстах: слоўнік эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы : вучэб. дапаможнік / Н. Гаўрош. – Мінск : Ураджай,1986. – 98 с.

61. Гілевіч, Н. Родныя дзеці : раман у вершах / Н. Гілевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. – 192 с.

62. Гимаев, Я. А. Актуализация концепта *РОДИНА* в школьных учебниках по литературе и в массовом сознании учащихся : автореф. дис. … канд. филол. наук / Я. А. Гимаев. – М. : Моск. гос. обл. ун-т., 2010. – 26 с.

63. Грушко, Е. А. Словарь славянской мифологии / Е. А. Грушко, Ю. М. Медведев. – Н. Новгород : «Русский купец», 1995. – 368 с.

64. Гуліцкі, М. Беларуская мова як першааснова нацыянальнай культуры / М. Гуліцкі // Роднае слова. – 2009. – № 2. – С. 23–27.

65. Гумбольдт, В. фон. Избранные труды по языкознанию / Гумбольдт В. фон ; пер. с нем., под ред., с предисл. Г. В. Рамишвили. – М. : Прогресс, 1984. – 397 с.

66. Гусоўскі, М. Песня пра зубра / М. Гусоўскі ; пер. з лацін. мовы і прадм. Я. Семяжона ; маст. А. М. Кашкурэвіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. – 71 с.

67. Данич, О. В. Менталитет белорусов и русских. Отражение в мифологии, фольклоре, фразеологии : учеб.-метод. пособие / О. В. Данич. – Витебск : Изд-во УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2004. – 84 с.

Репозиторий ВГУ

68. Данцевич, Е. А. Концепт “белорусский народ” в языковом сознании старших подростков / Е. А. Данцевич // Весн. Гродз. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы. Сер. 3, Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2013. – № 1(149). – С. 145–151.

69. Дзядова, А. С. Чалавек у люстэрку беларускай фразеалогіі і парэміялогіі : манаграфія / А. С. Дзядова. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2013. – 161 с.

70. Дубашынскі, Р. Канцэпты прыпавесцей Васіля Быкава / Р. Дубашынскі // Полымя. – 2011. – № 6. – С. 90–99.

71. Дубовік, А. І. Асаблівасці нацыянальнага характару беларусаў / А. І. Дубовік // XXI век: актуальные проблемы исторической науки : материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ. Минск, 15–16 апр. 2004 г. / редкол.: В. Н. Сидорцов (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2004. – С. 203–205.

72. Дубоўка, У. Выбраныя творы / У. Дубоўка. – Мінск : “Беларусь”, 1970. – 192 с.

73. Дубянецкі, Э. С. Таямніцы народнай душы : кн. для вучняў : для сярэд. і ст. шк. узросту / Э. С. Дубянецкі. – Мінск : Народная асвета, 1995. – 47 с.

74. Дудараў, А. А. Князь Вітаўт : п’есы / А. А. Дудараў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – 318 с.

75. Дунін-Марцінкевіч, В. Збор твораў : у 2 т. / В. Дунін-Марцінкевіч; уклад. з тэкст. падрыхт., прадм., пераклі. і камент. Я. Янушкевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. – Т. 1. Драматычныя творы, вершаваныя аповесці і апавяданні. – 494 с.

76. Есмурзаева, Ж. Б. Концепт *Родина* в педагогическом дискурсе на рубеже XX–XXI вв. : дис. ... канд. филол. наук / Ж. Б. Есмурзаева. – Омск : Ом. гос. ун-т им. Ф. М. Достоевского, 2010. – 209 с.

77. Жаўняровіч, П. Канцэпт публічнага тэксту: на прыкладзе публіцыстыкі Уладзіміра Караткевіча / П. Жаўняровіч // Роднае слова. – 2010. – № 4. – С. 35–38.

78. Зализняк, А. Ключевые идеи русской языковой картины мира / А. Зализняк, И. Б. Левонтина, А. Д. Шмелев. – М. : Языки славянской культуры, 2005. – 525 с.

79. Звонак, Н. П. Концепт *Родина* в американской и белорусской культурных картинах мира / Н. П. Звонак, О. С. Суравнева // Межкультурная коммуникация и профессионально ориентированное обучение иностранным языкам : материалы III Междунар. конф., посвященной 88-летию образования Белорусского государственного университета, 30 окт. 2009 г. / редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. – Минск : Тесей, 2009. – С. 26–28.

80. Зарэцкі, М. Вязьмо : раман / М. Зарэцкі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. – 301 с.

Репозиторий ВГУ

81. Зарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Зарэцкі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – Т. 1. Апавяданні. – 526 с.

82. Іванова, С. Ф. Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў : лінгвакраіназнаўчы дапаможнік / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 187 с.

83. Игнатова, Е. М. Концепт *Родина* в идеологическом дискурсе: на материале немецкой политической пропаганды 20–40-х гг. XX в. : автореф. дис. … канд. филол. наук / Е. М. Игнатова. – М., 2008. – 36 с.

84. Казько, В. Выбраныя творы : у 2 т. / В. Казько. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – Т. 1. Неруш : раман. Апавяданні. – 479 с.

85. Канцэпцыя вучэбнага прадмета Беларуская літаратура / [Электронный ресурс] / Национальный институт образования. – Минск, 2013. – Режим доступа: http://www.adu.by. – Дата доступа: 10.12.2013.

86. Калеснікава, А. А. Ключавыя сацыяльныя паняцці “дом”, “сям’я”, “радзіма” ў канцэптасферы носьбітаў беларускай мовы (на матэрыяле парэміялагічных адзінак) / А. А. Калеснікава // Ученые записки УО “ВГУ им. П. М. Машерова”. – Витебск, 2011. – Т. 12. – С. 181–188.

87. Калеснікава, А. А. Канцэпт *Радзіма* ў свядомасці носьбітаў беларускай мовы / А.А. Калеснікава // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., 21–22 кастр. 2010 г. – Витебск, 2010. – С. 50–52.

88. Карасик, В. И. Языковая личность и категории языка / В. И. Карасик // Языковая личность: проблемы значения и смысла. – Волгоград : Перемена, 1994. – С. 4–12.

89. Карасик, В. И. Языковые ключи : монография / В. И. Карасик ; ВГПУ, науч.-исслед. лаборатория “Аксиологическая лингвистика”. – Волгоград : Парадигма, 2007. – 519 с.

90. Карасик, В. И. Лингвокультурная концептология : учеб. пособие / В. И. Карасик, Н. А. Красавский, Г. Г. Слышкин ; ВГПУ, Калмыцкий гос. ун-т, науч.-исследед. лаборатория “Аксиологическая лингвистика”. – Волгоград : Парадигма, 2009. –116 с.

91. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. – Т. 1 : Вершы, паэмы. – 431 с.

92. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1988. – Т. 3 : Раман. Аповесці. – 540 с.

93. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – Т. 4 : Каласы пад сярпом тваім : раман, кн. 1. – 399 с.

94. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – Т. 5 : Каласы пад сярпом тваім : раман, кн. 2 ; Зброя : Аповесць. – 527 с.

Репозиторий ВГУ

95. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – Т. 7 : Дзікае паляванне караля Стаха : аповесць ; Чорны замак Альшанскі : раман. – 527 с.

96. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – Т. 8 : Аповесці, апавяданні, казкі. – 399 с.

97. Караулов, Ю. Н. Русский язык и языковая личность / Ю. Н. Караулов. – М. : «Наука», 1987. – 264 с.

98. Кириенко, В. В. Белорусская ментальность: истоки, современность, перпективы / В. В. Кириенко. – Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2009. – 319 с.

99. Ковшова, М. Л. Лингвокультурологический метод во фразеологии. Коды культуры / М. Л. Ковшова. – М. : URSS, 2012. – 453 с.

100. Когнитивная лингвистика: новые парадигмы и новые решения : сб. ст. / отв. ред. М. В. Пименова. – М. : ИЯ РАН, 2011. – 896 с.

101. Кожанов, Д. А. Концепт “Homeland” в американской картине мира и способы его языковой репрезентации : автореф. дис. … канд. филол. наук / Д. А. Кожанов. – Барнаул : Барнаул. гос. пед. ун-т, 2006. – 16 с.

102. Колесов, В. В. Язык и ментальность / В. В. Колесов. – СПб. : Петербургское востоковедение, 2004. – 240 с.

103. Колесов, В. В. Языковые основы русской ментальности : учеб. пособие ; отв. ред. М. В. Пименова. – 3-е изд., доп. – СПБ. : С.-Петерб.ГУ, 2011. – 136 с.

104. Колшанский, Г. В. Соотношение субъективных и объективных факторов в языке / Г. В. Колшанский. – М. : URSS, 2005. – 230 с.

105. Конан, У. Архетыпы беларускага менталітэту: спроба рэканструкцыі паводле нацыянальнай міфалогіі і казачнага эпасу / У. Конан // Беларусіка. – Мінск, 1993. – Кн. 2. – С. 24.

106. Конюшкевич, М. И. Концептосфера школьного учебника / М. И. Конюшкевич // Тэорыя і практыка навучання мовам, літаратурам і рыторыцы ў сярэдняй і вышэйшай школе : матэрыялы міжнар. навук. тэарэт. канф. 15–17 снеж. 1997 г. : у 3 ч. – Мінск, 1998. – Ч. 1. – С. 5–8.

107. Красных, В. В. От концепта к тексту и обратно / В. В. Красных // Вестн. МГУ. Сер. 9, Филология. – 1998. – № 1. – С. 34–40.

108. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – 2-е выд. – Мінск : Ураджай, 2001. – 350 с.

109. Колас, Я. Новая зямля. Сымон-музыка : паэмы / Якуб Колас. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. – 448 с.

110. Колас, Я. На ростанях : трылогія / Я. Колас. – Мінск : “Народная асвета”, 1972. – 494 с.

111. Кубрякова, Е. С. Краткий словарь когнитивных терминов / Е. С. Кубрякова [и др.]. – М. : МГУ, 1996. – 245 с.

Репозиторий ВГУ

112. Кузнецов, А. М. Сепира – Уорфа гипотеза / А. М. Кузнецов // Лингвистический энциклопедический словарь. – М. : Наука. – 1990. – С. 443.

113. Культура и этнос : учеб. пособие для самостоятельной работы студентов / сост. : Л. В. Щеглова, Н. Б. Шипулина, Н. Р. Суродина [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Culture/KultEtn/15.php. – Дата доступа: 15.09.2014.

114. Купала, Я. П'есы, пераклады / Я. Купала. – Мінск : Юнацтва, 1992. – 303 с.

115. Лазарук, М. А. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агульн. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. А. Лазарук, В. І. Русілка, І. М. Слесарава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011. – 360 с.

116. Лазарук, М. А. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. устаноў для з беларус. і рус. мовамі навучання / М. А. Лазарук, Т. У. Логінава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 304 с.

117. Леонтьев, А. А. Словарь ассоциативных норм русского языка / А. А. Леонтьев. – М. : Изд-во Моск. гос. ун-та, 1977. – 191 с.

118. Лихачев, Д. С. Внутренний мир художественного произведения / Д. С. Лихачев // Вопросы литературы. – 1968. – № 8. – С. 74–87.

119. Лихачев, Д. С. Концептосфера русского языка / Д. С. Лихачев // Известия РАН. Серия литературы и языка. – 1993. – Т. 52. – № 1. – С. 3–9.

120. Лобач, У. А. Уяўленні аб прасторы і часе ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (па этнаграфічных і фальклорных матэрыялах XIX – пач. XX ст) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук / У. А. Лобач ; НАН Беларусі. – Мінск, 2003. – 19 с.

121. Логический анализ языка. Квантификативный аспект языка / Н. Д. Арутюнова [и др.] ; отв. ред. Н. Д. Арутюнова ; РАН, Ин-т языкознания. – М. : Индрик, 2005. – 671 с.

122. Лосев, А. Ф. Имя. Избранные работы, переводы, беседы, исследования, архивные материалы / А. Ф. Лосев. – СПб. : Алетейя, 1997. – 614 с.

123. Лотман, Ю. М. Анализ поэтического текста / Ю. М. Лотман. – Ленинград : Просвещение, 1972. – 271 с.

124. Лыч, Л. Беларуская нацыя і мова : літаратурна-гістарычныя нарысы / Л. Лыч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – 277 с.

125. Ляшчынская, В. А. Фразеалагічная эмацыянальная канцэптасфера беларусаў : манаграфія / В. А. Ляшчынская. – Мінск : РІВШ, 2012. – 246 с.

126. Ляшчынская, В. А. Ключавы канцэпт культурна-нацыянальнага светапогляду праз фразеалагізмы з твораў Янкі Купалы / В. А. Ляшчынская // Роднае слова. – 2012. – № 6. – С. 37–39.

Репозиторий ВГУ

127. Мажэйка, Н. С. Частотны слоўнік беларускай мовы. Мастацкая проза / Н. С. Мажэйка, А. Я. Супрун. – Мінск : Выдавецтва БДУ, 1976. – 232 с.

128. Мажэйка, Н. С. Частотны слоўнік беларускай мовы. Паэзія / Н. С. Мажэйка, А. Я. Супрун. – Мінск : Выдавецтва БДУ, 1992. – 198 с.

129. Макаёнак, А. Выбраныя творы : у 2 т. / А. Макаёнак. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – Т. 2 : П'есы ; Сцэны сельскага жыцця ; Аднаактоўкі ; Гумарэскі ; Фельетоны ; Артыкулы. – 376 с.

130. Максімовіч, В. "Каб не страціць святое штосьці" : Нацыянальны космас у творчасці Р. Барадуліна / В. Максімовіч // Роднае слова. – 1994. – № 7–8. – С. 23–25.

131. Манджиева С. В. Ключевые концепты в рассказах О. Генри : дис. … канд. филол. наук / С. В. Манджиева. – Волгоград, 2010. – 256 с.

132. Марзалюк, І. А. Людзі даўняй Беларусі: Этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII стст.) : манаграфія / І.А. Марзалюк. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2002. – 324 с.

133. Марчук, Г. Кветкі правінцыі : раман, навелы, афарызмы / Г. Марчук. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. – 416 с.

134. Маслова, В. А. Введение в лингвокультурологию : учеб. пособие / В. А. Маслова. – М. : Флинта, 1997. – 207 с.

135. Маслова, В. А. Лингвокультурология : учеб. пособие / В. А. Маслова. – М. : Academia, 2001. – 208 с.

136. Маслова, В. А. Когнитивня лингвистика : учеб. пособие / В. А. Маслова. – Минск : Тетра-Системс, 2004. – 256 с.

137. Маслова, В. А. Национальный характер сквозь призму языка : монография / В. А. Маслова. – Витебск : УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2011. – 76 с.

138. Маслова, В. А. Поэт и культура: концептосфера Марины Цветаевой / В. А. Маслова. – М. : Флинта, 2004. – 256 с.

139. Маслова, В. А. Преданья старины глубокой в зеркале языка / В. А. Маслова. – Минск : Пейто, 1997. – 128 с.

140. Маслова, В. А. Поэтический текст как феномен культуры / В. А. Маслова // Вестн. Полоцк. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2004. – № 10. – С. 12–16.

141. Медведева, Т. В. Ключевые концепты в лирике А. С. Пушкина: лингвостилист. анализ : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / Т. В. Медведева ; Самар. гос. пед. ун-т. – Самара, 2002. – 21 с.

142. Мележ, І. Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – Т. 5 : Людзі на балоце : раман з "Палескай хронікі". – 415 с.

143. Мельнікава, А. М. Мастацкі тэкст як фактар нацыянальнага / А. М. Мельнікава // Текст в лингвистической теории и методике преподавания филологических дисциплин : материалы 2-й Междунар. науч. конф., Мозырь, 26–27 марта 2003 г. – Мозырь, 2003. – Ч. 2. – С. 168–170.

Репозиторий ВГУ

144. Мельников, А. П. Национальный менталитет белорусов / А. П. Мельников. – 2-е изд. – Минск : Право и экономика, 2005. – 112 с.

145. Мечковская, Н. Б. Чем белорусы отличаются от русских? / Н. Б. Мечковская // Мовы і культуры Беларусі : нарысы. – Мінск : Права і эканоміка, 2008. – С. 67–82.

146. Мікуліч, Т. М. Мова і этнічная самасвядомасць / Т. М. Мікуліч ; навук. рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – 159 с.

147. Морозов, И. Основы культурологии. Архетипы культуры / И. Морозов. – Минск : «ТетраСистемс», 2001. – 608 с.

148. Мрый, А. Запіскі Самсона Самасуя : раман / А. Мрый. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2001. – 111 с.

149. Муратова Е. Н. Выражение концепта «народ» в английской лингвокультуре / Е. Н. Муратова, А. Э. Сенцов // Молодой ученый. – 2011. – № 10. – Т. 2. – С. 35–37.

150. Народная культура Беларусі : энцыклапедычны даведнік / пад агул. рэд. В. С. Цітова. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с.

151. Падучева, Е. В. Феномен Анны Вежбицкой // Язык. Культура. Познание / А. Вежбицкая ; отв. ред. М. А. Кронгауз ; вступ. ст. Е. В. Падучевой. – М. : Русские словари, 1997. – С. 21–41.

152. Петрашкевіч, А. Воля на крыжы : гіст. п’есы / А. Петрашкевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. – 271 с.

153. Півавар, К. С. Канцэпт *Радзіма* ў творчасці пісьменнікаў-ураджэнцаў Віцебшчыны / К. С. Півавар // Состояние и перспективы развития белорусско-российского приграничья как специфической социокультурной реальности : материалы междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 26 нояб. 2013 г. / Вит. гос. ун-т ; И.М. Прищепа [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2013. – С. 82–84.

154. Півавар, К. С. Вербалізацыя канцэпту “беларускі народ” у творчасці У. Караткевіча / К. С. Півавар // Славянские народы и их культуры : традиция и современность : сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь, Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины / редкол.: В. И. Коваль (отв. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2013. – С. 199–202.

155. Півавар, К. “Сын герояў і багоў”: канцэпт *народ* у мове беларускай літаратуры / К. Півавар // Роднае слова. – 2014. – № 8. – С. 34–38.

156. Пивовар, Е. С. Программная школьная художественная литература как материал для реконструкции концептосферы белорусов / Е. С. Пивовар // Лингвистика XXI века : сб. науч. ст. : к 65-летнему юбилею проф. В. А. Масловой / соред. В. В. Колесов, М. В. Пименова, В. И. Теркулов. – М. : Флинта : Наука, 2013. – С. 870–875 (Сер. Концептуальный и лингвальный миры. Вып. 3).

Репозиторий ВГУ

157. Пименова, М. В. Душа и дух: способы концептуализации : монография / М. В. Пименова. – Кемерово : Комплекс «Графика». – 386 с. (Сер. Концептуальные исследования. Вып. 3).

158. Полиниченко, Д. Ю. Концепт «язык» в английской паремиологии / Д. Ю. Полиниченко // Язык, сознание, коммуникация. – М. : МАКС Пресс, 2004. – Вып. 26. – С. 83–90.

159. Попова, З. Д. Когнитивная лингвистика / З. Д. Попова, И. А. Стернин. – М. : АСТ: Восток–Запад, 2010. – 314 с.

160. Поспелов, Г. Н. Теория литературы / Г. Н. Поспелов. – М. : Высш. шк., 1978. – 350 с.

161. Разанаў, А. Паляванне ў райскай даліне : Версэты. Паэмы. Пункціры. Вершасказы. З Вяліміра Хлебнікава. Зномы / А. Разанаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1995. – 287 с.

162. Родная літаратура : хрэстаматыя для 11 кл. агульнаадук. шк. / склад. У. А. Дзіско, М. І. Мішчанчук, Т. М. Саўчук. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 702 с.

163. Садоўская, А. Канцэпт птушка ў беларускай фразеалогіі і культуры / А. Садоўская // Роднае слова. – 2002. – № 12. – С. 68–70.

164. Садоўская, А. Нацыянальна-культурная спецыфіка фразеалагізмаў / А. Садоўская // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : РІВШ, 2005. – Вып. 4. – С. 90–103.

165. Садоўская, А. Л. Паняцце моўнай карціны свету ў сучаснай лінгвістыцы і яе роля ў плане вывучэння нацыянальна-культурнай спецыфікі моўных адзінак // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы. / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : БДУ, 2007. – Вып. 6. – С. 171–179.

166. Самусевіч, В. Канцэпт зямля ў лагасферы нацыянальнай культуры : семантычны каментар / В. Самусевіч // Роднае слова. – 2002. – № 12. – С. 65–68.

167. Серебренников, Б. А. Предисловие / Б. А. Серебренников // Роль человеческого фактора в языке. Язык и картина мира. – М. : Наука, 1988. – 216 с.

168. Сіпакоў, Я. Веча славянскіх балад : паэмы ў прозе / Я. Сіпакоў. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 303 с.

169. Славянская концептосфера в сопоставительном освещении: лексикон / под ред. Е. Е. Стефанского. – Самара : Самар. гуманит. акад., 2011. – 458 с.

170. Слышкин, Г. Г. От текста к символу: лингвокультурные концепты прецедентных текстов в сознании и дискурсе / Г. Г. Слышкин. – М. : Academia, 2000. – 125 с.

171. Смятаннікаў, В. С. Беларусазнаўства : вучэбна-метад. дапам. для выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных устаноў / В. С. Смятаннікаў. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 149 с.

Репозиторий ВГУ

172. Старасценка, Т. Канцэпт зіма ў паэзіі Сяргея Грахоўскага / Т. Старасценка // Роднае слова. – 2013. – № 9. – С. 33–35.

173. Степанов, Ю. С. Константы. Словарь русской культуры. Опыт исследования / Ю. С. Степанов. – М. : Языки русской культуры, 1997. – 824 с.

174. Стефаненко, Т. Г. Этнопсихология / Т. Г. Стефаненко. – 3-е изд. испр. и доп. – М. : АспектПресс, 2004. – 368 с.

175. Стральцоў, М. Выбранае : проза, паэзія, эсе / М. Стральцоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. – 607 с.

176. Сепир, Э. Избранные труды по языкознанию и культурологии / Э. Сепир. – М. : Прогресс, 1993. – 190 с.

177. Телия, В. Н. Метафоризация и ее роль в создании языковой картины мира / В. Н. Телия // Роль человеческого фактора в языке. Язык и картина мира. – М. : Школа «Языки русской культуры», 1988. – 256 с.

178. Телия, В. Н. Русская фразеология, семантический, прагматический и лингвокультурологический аспекты / В. Н. Телия. – М. : Школа «Языки русской культуры», 1996. – 284 с.

179. Телия, В. Н. Наименование *РОДИНА* как часть социального концепта «Patria» в русском языке / В. Н. Телия // Языковая категоризация : материалы круглого стола, посвященного юбилею Е. С. Кубряковой по тематике ее исследования. – М. : Наука, 1997. – С. 77–79.

180. Тер-Минасова, С. Г. Язык и национальный характер / С. Г. Тер-Минасова // Слово и текст в диалоге культур : юбил. сб. – М. : Международная ассоциация преподавателей русского языка и литературы, 2000. – 312 с.

181. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / рэд. тома М. Р. Суднік. – Мінск : БелСЭ, 1984. – Т. 5. Кн. 2. У–Я. – 608 с.

182. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : больш за 65 000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко; афармленне А. М. Хількевіча. – 4-е выд. – Мінск : БелЭН, 2005. – 784 с.

183. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка : в 4-х т. / М. Фасмер. – М. : Прогресс. – 1971. – Т. 3. – 827 с.

184. Фрумкина, Р. М. Концептуальный анализ с точки зрения лингвиста и психолога / Р. М. Фрумкина // Научно-техническая информация. – 1992. – Сер. 2. – № 3. – С. 3–29.

185. Хроленко, А. Т. Основы лингвокультурологии : учеб. пособие / А. Т. Хроленко ; под ред. В. Д. Бондалетова. – М. : Флинта: Наука, 2004. – 181 с.

186. Цітова, Л. К. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Л. К. Цітова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009. – Ч. 1. – 176 с.

Репозиторий ВГУ

187. Цітова, Л. К. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Л. К. Цітова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009. – Ч. 2. – 192 с.

188. Чорны, К. Пошукі будучыні : раман, аповесць, апавяданні / К. Чорны ; уклад. І. Дабрыян ; прадм. М. Тычыны. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2001. – 335 с.

189. Шамякін, І. Сэрца на далоні : раман; Гандлярка і паэт : аповесць / І. Шамякін. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. – 670 с.

190. Шкраба, І. Р. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі (у рускамоўным дачыненні) / І. Р. Шкраба. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2008. – 318 с.

191. Щербин, В. Белорусская концептология: на этапе самоопределения / В. Щербин // Etnolingwistika. Problemy yezyka i kultury. – № 21. – Lublin, 2009. – С. 171–187.

192. Щукина, Д. А. Пространство в художественном тексте и пространство художественного текста / Д. А. Щукина. – СПБ. : Филологический факультет С.-Петерб.ГУ, 2003. – 218 с.

193. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 3. – 527 с.

194. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / рэд. В. У. Мартынаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – Т. 2 : В. – 344 с.

195. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы : у 9 т. / рэд. В. У. Мартынаў / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – Т. 4 : К–Каята. – 327 с.

196. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы : у 9 т. / уклад. І. І. Лучыц-Федарэц, Г. А. Цыхун ; рэд. В. У. Мартынаў / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – Т. 7 : М–Н. – 315 с.

197. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. / уклад. М. Я. Абрагімовіч [і інш] ; гал. рэд. Г. А. Цыхун ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – Т. 13 : С–Т. – 352 с.

198. Яленскі, М. Г. Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка : вучэб. дапаможнік для студ. філал. спец. устаноў, якія забяспеч. атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 223 с.

199. Янішчыц, Я. І. Пачынаецца ўсё з любві… : вершы, паэмы / Я. І. Янішчыц. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. – 339 с.

Репозиторий ВГУ

ДАДАТАК

Мадэляванне канцэпту *Радзіма* (на аснове методыкі І.А. Сцерніна)

<table>
<tr><td>Намінатыўнае поле</td><td colspan="7">Радзіма; Беларусь; Белая Русь; край мой; родны край; Палессе; матчына зямля; айчына; зямля бацькоўская; родны кут; родныя куты; Бацькаўшчына; княства Літоўскае, наш край; Усяго Старонка Родная; Бацькаўшчына-маці; наша старонка; родныя межы; Літва, Бацькоўскі край; Літва і Русь наша (“Прамова Мялешкі”); Руская зямля; Забраны край (У. Караткевіч); Задзвіншчына, Занёманшчына, Бярэзінская зямля; Літва–Беларусь (У. Караткевіч); твая і мая радзіма; куточак родны; родныя мясціны; мілы кут маіх дзядоў</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Вобразны змест канцэпту</td><td colspan="4">Перцэптыўны вобраз</td><td colspan="3">Кагнітыўны вобраз</td></tr>
<tr><td>зрокавы:
узгорачкі, рэчкі, курганы, лясы; далі сасновыя; азёрны рабінавы край; сакавітыя пожні мурожныя; лясная ружа, зялёны ліст, чырвоны цвет; стужкі поля і дарогі; курганы-вежы; поясам блакіту над Нёманам лясныя ўзгоркі апавіты; бясконцыя імшары, пушчы, змрочны, лясны, тужлівы; светлая; рай бульбяна-жытні, зеленадолы, залаты; край, дзе горы паўсталі ўзнёсла; край сініх вод, пушчаў; на ўзвышшах Наваградскіх дрэмлюць суровыя вежы і вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро; вачамі азёраў глядзіш ты ў празрыстыя высі нябёс; поле бацькава, над хатай буслова жытло</td><td>слыхавы:
тут продкаў галасы; край мой ціхі; ціхі, грушны край; песня магутных дубоў; гоман спелае нівы; ціхая жальба палёў; лесу высокага шум-гуд шчаслівы; песні цягучыя, песні пявучыя; нівы гутаркі вядуць; дзе бары-лясы гудуць; як спеў матулі; як песня любай; дзе вечную песню пяе Белавежа; гамоняць пра гэта бары-байкары</td><td>тактыльны:
неаб’ятна, як мора</td><td>смакавы:
дзе мядамі пахнуць грэчкі</td><td>маральныя якасці:
Радзіма не падмане; край раскрытых душ</td><td>псіхічныя якасці:
поўныя смутку і жальбы нядолі</td><td>інтэлекту-альныя якасці:
тут мудрыя лясы</td></tr>
<tr><td>Інфармацыйны змест канцэпту</td><td colspan="7">‘Радзіма – зямля продкаў’ (Я. Лучына, Я. Колас, Я. Купала, Я. Янішчыц, Е. Лось, В. Быкаў, Я. Баршчэўскі, П. Броўка); ‘прыгажосць роднай прыроды’ (Я. Лучына, Я. Колас, Я. Купала, М. Гусоўскі, А. Бачыла, Н. Гілевіч); ‘прыгажосць, багацце Радзімы’ (Я. Колас, П. Панчанка, М. Гусоўскі, Н. Гілевіч, У. Караткевіч); ‘імкненне да Радзімы, сум па ёй’ (Я. Колас, Л. Якубовіч, М. Багдановіч, А. Міцкевіч, А. Петрашкевіч, К. Чорны, В. Быкаў, Я. Баршчэўскі, Г. Бураўкін); ‘Радзіма – месца вечнага спачыну’ (Я. Баршчэўскі, А. Куляшоў, Я. Купала, Н. Гілевіч, В. Быкаў) ‘неўміручасць, бессмяротнасць Радзімы’</td></tr>
</table>

Рэпозиторий ВГУ

	(П. Панчанка, І. Шамякін, У. Караткевіч); ‘сувязь маці–Радзіма’ (М. Багдановіч, В. Казько, П. Панчанка, З. Бядуля, Я. Баршчэўскі, Н. Гілевіч, Я. Сіпакоў); ‘пажаданне росквіту Радзіме’ (С. Полацкі, Я. Купала, В. Лукша, М. Багдановіч, А. Бачыла); ‘служэнне на карысць Айчыне’ (Ф. Скарына, П. Панчанка, І. Шамякін, І. Навуменка, А. Бачыла, Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас, У. Караткевіч, Л. Тарасюк); ‘заклік да адраджэння Радзімы’ (Я. Колас, Я. Купала, М. Багдановіч, Цётка); ‘Радзіма – гэта родны дом, сям’я’ (А. Міцкевіч, Р. Барадулін, Я. Крупенька)					
Інтэрпрэтацыйнае поле канцэпту	Ацэначная зона: ‘святая’ (П. Панчанка); ‘мець родную зямлю – шчасце’ (З. Бядуля, Я. Сіпакоў, А. Бачыла, А. Міцкевіч, В. Быкаў, Н. Гілевіч); ‘радасць вяртання на Радзіму’ (К. Чорны); ‘гора Радзімы – бяда для чалавека’ (І. Навуменка, Я. Колас, У. Караткевіч); ‘запавет шанаваць Радзіму’ (Я. Сіпакоў, Л. Тарасюк, Р. Барадулін); “той край, дзе пачатак пачаткаў / Сэнсу жыцця і пачуцця святога – радзімы” (М. Гусоўскі)	Міфалагічная зона: “усе яе «Бяларуссяй»” звалі, і недарма ж гэта! Не вялікая, не малая, не чырвоная, не чорная яна была, а белая, чыстая: нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася” (Ф. Багушэвіч); “Прызыўна трубілі лебедзі, кружлялі, падалі на ваду […] Кажуць, з таго часу Белая Русь і празываецца «белай». Ад лебядзінага апярэння стала белай вопратка ў людзей. А кажуць і другое: быццам таму яна «белая», што пад татарамі ніколі не пабыла” (У. Караткевіч)	Парэміялагічная зона: Родная зямелька – як зморанаму пасцелька; На чужыне і камар загіне; Чым за морам віно піць, лепш з Нёмана вадзіцу; Свая каліта дарагая; На Беларусі Бог жыве; Лепш грызці зямлю ў родным кутку, чым каб цябе ліхім ветрам кідала па чужым свеце; У сваім краі, як у раі; на чужой зямлі без каранёў і палын не расце	Энцыклапедычная зона: ‘падзел Беларусі на Заходнюю і Усходнюю’ (К. Чорны); ‘палярная зорка – зорка Радзімы’ (Д. Бічэль-Загнетава); ‘шматлікія абарончыя войны Беларусі’ (Я. Лучына, Цётка, Ф. Багушэвіч, А. Бачыла, П. Панчанка, У. Караткевіч, А. Дудараў); “да пэўнай ступені бусел – сімвал Беларусі” (У. Караткевіч); ‘дзяцінства і ўспаміны звязаны з Радзімай’ (М. Гусоўскі, В. Казько, П. Панчанка, А. Дудараў); ‘супярэчлівасць рэпрэзентацыі Радзімы’ (Я. Колас, У. Караткевіч)	Утылітарная зона: ‘Радзіма аб’ядноўвае людзей, пакаленні ў адзіны народ’ (І. Навуменка, Л. Тарасюк, У. Караткевіч, А. Грачанікаў, Я. Крупенька)	Сацыяльна-культурная зона: ‘Купала і Колас – твар Радзімы’ (В. Казько); багацце ‘духоўнае – злата дзяржавы’ (М. Гусоўскі); ‘Радзіма – наша самабытнасць’ (А. Грачанікаў)

Рэпазиторий ВГУ

Мадэляванне канцэпту *народ* (на аснове методыкі І.А. Сцерніна)

Намінатыўнае поле	народ, беларусы; дзеткі роднага краю; нашы людзі; паспаліты люд; беларускі сярмяжны народ; тутэйшы народ; народ Божы; просты люд; грамадзяне беларускія; жыхары гэтага краю; дзеці Беларусі; крывічане-беларусы; мазольных рук мільёны; браты; ліцвіны; тутэйшыя; твой Люд; унукі Скарыны; нашчадкі Каліноўскага; грамада; русін, свой народ рускі (В. Цяпінскі); браты; братцы; грамада						
Вобразны змест канцэпту	Перцэптыўны вобраз				Кагнітыўны вобраз		
	зрокавы: шэры, аднатонны (М. Гарэцкі); “рысы аблічча мяккія, склад здаецца, на першы позірк, крыху далікатным” (У. Караткевіч)	слыхавы: –	тактыльны: –	смакавы: –	маральныя якасці: дабрыня (Я. Купала, У. Караткевіч); гасціннасць (Я. Купала, Я. Колас, Р. Барадулін, Я. Баршчэўскі, У. Караткевіч); патрыятызм (А. Петрашкевіч); пачуццё ўласнай годнасці (А. Петрашкевіч); вольналюбівасць (К. Чорны, П. Панчанка, У. Караткевіч); працавітасць (Г. Бураўкін); “быў адданы спрадвеку славянскаму крэўнаму брацтву” (Ю. Свірка); гістарычнае беспамяцтва (Р. Барадулін, М. Багдановіч, У. Караткевіч); “надзейныя сябры і дружбакі” (Р. Барадулін); “цёмны, сляпы, быццам крот” (М. Багдановіч); любоў да сям’і (У. Караткевіч); верацярпімасць (А. Петрашкевіч);	псіхічныя якасці: ветлівасць (Я. Колас); цярплівасць (Я. Купала, Ю. Свірка, У. Караткевіч); паслухмянасць (В. Быкаў); мірны характар (Г. Бураўкін, А. Петрашкевіч, У. Караткевіч, Ю. Свірка, А. Бачыла); маўклівасць (Ю. Свірка, Я. Баршчэўскі, В. Казько); ахвярнасць (Р. Барадулін); сціпласць (Р. Барадулін, В. Казько); меланхалічны дух (Я. Баршчэўскі); вынослівасць, цягавітасць (У. Караткевіч); горды (У. Караткевіч); языкатасць (У. Караткевіч); асцярожнасць (Я. Колас)	інтэлектуальныя якасці: “светлы” розум (А. Гарун); багатая фантазія (Я. Баршчэўскі, У. Караткевіч); змрочная задумлівасць (Я. Баршчэўскі); адукаванасць (В. Цяпінскі, Г. Бураўкін, Н. Гілевіч); гумар і самаіронія (У. Караткевіч); таленавіты (У. Караткевіч, Я. Колас); дасціпнасць (В. Цяпінскі); мудрасць (В. Цяпінскі); “як і паўсюль, ёсць сярод беларусаў мяшчане і падзвіжнікі, лайдакі і працаўнікі,

Рэпозиторий ВГУ

					“беларусам прыродна ўласцівая павага да іншых народаў і памяркоўнасць да таго, хто думае іначай” (У. Караткевіч); памяркоўнасць (В. Казько); гаспадарлівасць (А. Гарун, Е. Лось, А. Бачыла)		«малюскі»” і героі… дурні і мудрацы” (У. Караткевіч); аптымізм (Я. Колас, У. Караткевіч)
Інфармацыйны змест канцэпту	‘абуджэнне самасвядомасці народа’ (Я. Колас, Я. Купала, М. Багдановіч, Н. Гілевіч, Цётка); ‘усведамленне самабытнасці беларускага народа’ (В. Цяпінскі, Я. Колас, Я. Купала, Н. Гілевіч, Ф. Багушэвіч, Н. Гілевіч); ‘войны – бяда для народа’ (М. Гусоўскі, А. Вярцінскі, А. Дудараў); ‘уціск іншых народаў’ (А. Гарун, Я. Колас, Я. Купала, М. Багдановіч, Цётка, А. Дудараў); ‘у народзе захоўваецца памяць пра мінулае’ (А. Макаёнак, Я. Купала, У. Караткевіч); ‘паэт звязаны з народам’ (Я. Купала, Я. Лучына, Ф. Багушэвіч, В. Коўтун, Р. Барадулін, М. Багдановіч, У. Караткевіч) ‘народ паўстае як калектыўная асоба’ (М. Багдановіч, Цётка, Н. Гілевіч)						
Інтэрпрэтацый-нае поле канцэпту	Ацэначная зона: “Што большага шчасця няма, як памерці / За вольную волю і вольны народ” (Я. Сіпакоў); “Ты памрэш. Але ў бязмежным свеце / Будуць працвітаць твой Люд і Край… / Вер, што ў гэтым, вер, што толькі ў гэтым / Шчасце пасмяротнае і рай” (У. Караткевіч)	Міфалагічная зона: “Бог дзяліў між народамі землі […] Бог падумаў, крэкнуў, але назад адбіраць не будзеш […] «Добра, – кажа, – зямля будзе – рай. А каб не занадта вы перад маім раем ганарыліся – дам я вам найгоршае ўва ўсім свеце начальства. Яно вам таго раю збавіць дый пыхі трохі саб’е. Гэта вам для раўнавагі»” (У. Караткевіч)	Парэміялагічная зона: “Хан, хіба ж ты забыў старую прыказку: «Дзіцёнак нараджаецца ад мацеры, а памірае за народ»” (У. Караткевіч)	Энцыклапедычная зона: –	Утылітар-ная зона: –	Сацыяльна-культурная зона: “кожны народ памятае заснавальнікаў княжацкіх і царскіх дынастый” (У. Бутрамееў); ‘народ захоўвае сваю духоўную спадчыну і прыроду’ (М. Гусоўскі, Ю. Свірка, У. Караткевіч)	

Репозиторий ВГУ

Мадэляванне канцэпту *мова* (на аснове методыкі І.А. Сцерніна)

<table>
<tr><td>Намінатыўнае поле</td><td colspan="7">беларуская мова; родная мова; роднае слова; мова; матчына мова; крэўнае слова; матчына слова, бацькава мова; мужыцкая мова; мужыцкая гаворка; маці-родна мова; беларускі язык; наша бацькава спрадвечная мова; наская мова; гаворка; зямлі маёй перлы; руская мова (Ф. Скарына, В. Цяпінскі)</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Вобразны змест канцэпту</td><td colspan="4">Перцэптыўны вобраз</td><td colspan="3">Кагнітыўны вобраз</td></tr>
<tr><td>зрокавы: агністае; празрыстае; свецішся словам кожным; як сонца; сіняя, як васілёк; незамутнёнае; праменнае; найвялікшае сонца</td><td>слыхавы: як песня; празвінела; жаўруковая музыка; звіняць яны сардэчнай струнаю; пявучая; шэпт дубровы і пчаліны звон; звон вялікі, звон магучы; звонкая (2)</td><td>тактыльны: цёплае; цёплая; мяккая; гнуткая і цвёрдая; гарачая, як прамень; булатны клінок</td><td>смакавы: пах хлеба жытняга</td><td>маральныя якасці: чыстае; жывая; не беларучка; “і сівая, і разам сучасная, як харошы, жывы чалавек” (М. Танк); працаўніца (Я. Сіпакоў)</td><td>псіхічныя якасці: пяшчотнае, шчырасці поўнае; ласкавае; раптоўнае; ад шчырага сэрца; трапяткая</td><td>інтэлектуальныя якасці: лаканічная</td></tr>
<tr><td>Інфармацыйны змест канцэпту</td><td colspan="7">‘беларуская мова – багатая і прыгожая’ (А. Міцкевіч, Ф. Багушэвіч, Цётка, У. Караткевіч, Я. Крупенька, К. Цвірка, А. Разанаў, М. Танк, П. Броўка, Г. Бураўкін, А. Пысін, Д. Бічэль-Загнетава, Я. Янішчыц, П. Макаль); ‘ахвяраванне жыццём дзеля мовы’ (Я. Янішчыц, Я. Крупенька); ‘перададзена ад продкаў для нашчадкаў’ (Я. Янішчыц, А. Пысін, Г. Бураўкін, К Цвірка); ‘неабходнае навучанне на роднай мове дзяцей’ (В. Цяпінскі, С. Будны, Я. Брыль, М. Танк, П. Панчанка, Я. Сіпакоў); ‘сувязь мовы і радзімы’ (Ф. Багушэвіч, Цётка, У. Караткевіч, Я. Крупенька); ‘беларуская мова – мова дзяржавы, прымета дзяржаўнасці’ (У. Караткевіч, А. Петрашкевіч); ‘мова закону’ (Л. Сапега); ‘беларуская мова вечная’ (М. Танк, У. Караткевіч, М. Лужанін); ‘родная мова знікае’ (П. Панчанка, С. Законнікаў); ‘родная мова ад маці’ (А. Гарун, С. Дзяргай, А. Пысін, Я. Крупенька); ‘захаванне мовы – умова захавання нацыі’ (Ф. Багушэвіч, У. Караткевіч, Р. Барадулін); ‘мова – ад маці’ (А. Гарун, А. Пысін, С. Дзяргай, Я. Крупенька)</td></tr>
</table>

Рэпазиторый ВГУ

Інтэрпрэтацыйнае поле канцэпту	Ацэначная зона: “наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная” (Ф. Багушэвіч; “нашу да цябе любоў вялікую” (Я. Янішчыц); “у любімай мове, роднай, наскай” (П. Броўка); “святыня народа, бяссмерце яго” (М. Танк); “наша невычэрпнае багацце, наша несмяротнае жыццё” (Г. Бураўкін); “што родная мова, хоць бедная мова, мілей найбагатшай чужой” (Я. Купала); “мой скарб дарагі, найсвятлейшая спадчына” (Я. Крупенька); адмаўленне, асмяянне роднай мовы некаторымі яе носьбітамі (В. Цяпінскі, Ф. Багушэвіч, Я. Купала, П. Панчанка, Н. Гілевіч)	Міфалагічная зона: “Ёсць паданне вякоў, што разбурыць калісь / Вавілонскую вежу Адам… / І няўмольна сальюцца мовы зямлі / У адну, народную нам” (У. Караткевіч).	Парэміялагічная зона: “не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі” (Ф. Багушэвіч)	Энцыклапедычная зона: “Узнікла даўно і выдатна распрацавана” (А. Міцкевіч); “мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая” (Ф. Багушэвіч)	Утылітарная зона: “на беларускай мове гавораць каля 10 мільёнаў чалавек” (А. Міцкевіч); “сродак сувязі паміж душамі людзей” (У. Караткевіч); мова старажытнай кніжнасці (Ф. Багушэвіч, У. Караткевіч, А. Петрашкевіч)	Сацыяльна-культурная зона: “аблічча маё адродзіць айчыннае слова” (П. Макаль); “святыня народа, бяссмерце яго” (М. Танк); “мова продкаў нашых і нашчадкаў” (Г. Бураўкін); “адзежа душы народа” (Ф. Багушэвіч; ‘мова аб’ядноўвае людзей у суцэльны народ’ (Цётка)

Рэпозиторий ВГУ

Мадэляванне канцэпту *воля* (на аснове методыкі І.А. Сцерніна)

<table>
<tr><td>Намінатыўнае поле</td><td colspan="7">воля; незалежнасць; свабода; дзе людзі ніколі не будуць рабамі; вольныя прасторы; вырвацца з пут; вольнасць; годнай волі дар; не знацца з прымусам</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Вобразны змест канцэпту</td><td colspan="4">Перцэптыўны вобраз</td><td colspan="3">Кагнітыўны вобраз</td></tr>
<tr><td>зрокавы:
сцяг волі;
вянок дзявочай волі;
светлая воля.</td><td>слыхавы:
“У гэтым раскаце чуецца воля, /
Чуецца радасць зямлі […] / Гром ты магутны”
(Я. Колас)</td><td>тактыльны:
вецер свабоды;
паветра свабоды</td><td>смакавы:
“ніяк не натраплю / вадзіцы хоць каплю, / ды такой вадзіцы, / ды з такой крыніцы, / што як хто нап’ецца, / Дык вольным стаецца”
(Ф. Багушэвіч);
“навучыла жыццё волю светлую піць”
(Л. Случанін)</td><td>маральныя якасці:
–</td><td>псіхічныя якасці:
–</td><td>інтэлектуальныя якасці:
–</td></tr>
<tr><td>Інфармацыйны змест канцэпту</td><td colspan="7">‘ваяваць за волю’ (У. Караткевіч, Я. Колас, А. Дудараў); ‘воля Радзімы, народа’ (Л. Сапега, Я. Колас, Я. Купала, У. Дубоўка, У. Караткевіч, Н. Мацяш, А. Петрашкевіч); ‘сувязь лірнік, паэт–воля’ (У. Караткевіч, Я. Колас, Я. Купала, М. Багдановіч); ‘воля даецца Богам’ (Я. Колас, “Гутарка Данілы са Сцяпанам”); ‘волю неабходна здабыць самому’ (Я. Купала, У. Караткевіч); ‘воля абмяжоўваецца законам’ (Л. Сапега, А. Макаёнак); ‘да свабоды неабходна “дарасці”, саспець’ (У. Караткевіч, А. Макаёнак, Я. Купала); ‘беларусы – свабодны, вольналюбівы народ’ (Я. Купала, У. Караткевіч, Л. Случанін); ‘сувязь мова–воля’ (В. Коўтун, У. Караткевіч)</td></tr>
<tr><td>Інтэрпрэтацыйнае поле канцэпту</td><td>Ацэначная зона:
‘воля – найвышэйшая маральная каштоўнасць’
(М. Гусоўскі, Ф. Багушэвіч, В. Быкаў, В. Шніп, У. Караткевіч, А. Дудараў, І. Мележ);
‘воля – гэта шчасце’
(Я. Колас, У. Караткевіч);</td><td>Міфалагічная зона:
“Асаблівым поспехам карыстаўся святы Юры, які забівае дракона, і святы Мікола за сваё сялянскае паходжанне і за тое, што (па беларускай легендзе) аднойчы ўратаваў адзіную</td><td>Парэміялагічная зона:
не чакай долю, а здабудзь волю</td><td>Энцыклапедычная зона:
‘воля–зямля’ (гістарычная сувязь) (Я. Колас, У. Караткевіч, “Дзядзька Антон…”);
‘воля – гэта адказнасць за свае ўчынкі’
(Л. Сапега,</td><td>Утылітарная зона:
‘воля – неабходная умова існаваня чалавека і нацыі’ (У. Караткевіч);
‘воля неабходная ўсяму жывому’
(У. Караткевіч, Г. Далідовіч, Я. Купала,</td><td>Сацыяльна-культурная зона:
“З кулінарных кніг выкрэслівалі словы аб смажаных парасятах, якіх трэба «не таміўшы, ставіць на вольны дух»”
(пра часы імператара</td></tr>
</table>

Репозиторий ВГУ

	‘няволя – страшнае выпрабаванне’ (М. Гусоўскі, Л. Сапега, У. Караткевіч, А. Макаёнак); “калі паміраць, то паміраць за сваю волю і веліч” (У. Караткевіч); “справа ішла больш чым пра хлеб. Справа ішла пра свабоду” (У. Караткевіч); “за свабоду жыццё б даў бы” (Ф. Багушэвіч); “на тым святым, што мы завём «Свабода»” (В. Коўтун); “у свабодзе зажывем шчасліва” (У. Сыракомля); “мудрацы розных часоў лічылі, што ў кожнай дзяржаве прыстойнаму чалавеку даражэй за ўсё на свеце яго свабода” (Л. Сапега)	кабылку беднага мужыка, якая заблукала ў лесе. Не даў раздзерці ваўкам і памог ажарабіцца, а пасля прывёў гаспадару. Згодна павер’ю, калі жарабятка падрасце, то на ім паедзе той, хто дасць волю народу” (У. Караткевіч)		У. Караткевіч)	Ф. Багушэвіч, А. Пысін)	Паўла) (У. Караткевіч); ‘воля звязана з постаццю К. Каліноўскага’ (Я. Сіпакоў, У. Караткевіч)

Репозиторий ВГУ

Мадэляванне канцэпту *сям'я* (на аснове методыкі І.А. Сцерніна)

<table>
<tr><td>Намінатыўнае поле</td><td colspan="7">сям'я; радзіна; гняздо; бацькі; продкі; маці; браты; сёстры; муж; жонка; дзеці; дачка, дочкі; сыны; унучка, унук; сірата</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Вобразны змест канцэпту</td><td colspan="4">Перцэптыўны вобраз</td><td colspan="3">Кагнітыўны вобраз</td></tr>
<tr><td>зрокавы:
гняздо;
бацькоўская буслянка; хата</td><td>слыхавы:
–</td><td>тактыльны:
–</td><td>смакавы:
–</td><td>маральныя якасці:
–</td><td>псіхічныя якасці:
–</td><td>інтэлектуальныя якасці:
–</td></tr>
<tr><td>Інфармацыйны змест канцэпту</td><td colspan="7">'бацькі і дзеці – самае дарагое ў жыцці чалавека' (У. Ліпскі, М. Зарэцкі, Ф. Багушэвіч, К. Чорны, Н. Гілевіч); 'звады ў сям'і – вялікае гора' (Я. Колас, "Вось цяпер які люд стаў"); 'цяжкае жыццё сіраты' (Я. Баршчэўскі, Я. Колас, М. Стральцоў, М. Багдановіч, Н. Гілевіч, В. Быкаў); 'распад сям'і, паступовае драбненне' (Я. Купала, В. Быкаў, У. Караткевіч); 'маці аберагае дзяцей' (Я. Купала, В. Быкаў, Ю. Свірка, В. Карамазаў, І. Мележ); 'маці – выхавальніца дзяцей' (А. Куляшоў, П. Панчанка, С. Грахоўскі); 'аснова сям'і – каханне, узаемаразуменне' (Я. Баршчэўскі, М. Зарэцкі); 'выхаваннем дзяцей займаюцца бацькі' (І. Шамякін, А. Макаёнак, Я. Баршчэўскі); 'фізічнае пакаранне дзяцей' (Я. Колас, М. Стральцоў); 'крыўдзіць бацькоў – вялікі грэх' (М. Сматрыцкі, "Вось цяпер які люд стаў", У. Караткевіч); 'адказнасць за продкаў і перад імі' (У. Караткевіч, У. Ліпскі, А. Пісьмянкоў); 'сувязь сям'я–Радзіма' (В. Казько, Ю.Свірка, Р. Барадулін, А. Міцкевіч, Я. Колас); 'дзеці падобныя да бацькоў' (А. Дудараў, М. Сматрыцкі, В. Казько); 'трагедыя вайны ў лёсе сям'і' (М. Лынькоў, Р. Барадулін, У. Караткевіч, В. Зуёнак, Н. Гілевіч, А. Куляшоў, І. Чыгрынаў); 'мужчына – абаронца сям'і' (І. Мележ, М. Стральцоў); 'бацькі жэняць дзяцей' (Я. Купала, В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Баршчэўскі, І. Мележ); 'рэвалюцыя карэнным чынам мяняе ўклад сям'і' (М. Зарэцкі, В. Быкаў); 'сувязь сям'я–хата' (В. Казько, Я. Чачот, Р. Барадулін, В. Быкаў)</td></tr>
<tr><td>Інтэрпрэтацыйнае поле канцэпту</td><td>Ацэначная зона:
"І заплакаў, аж заліўся, /
Так, як бацьку пахаваўшы"
(Ф. Багушэвіч);
'доўг перад грамадствам пераважае перад сямейным абавязкам'
(Л. Дайнека,</td><td>Міфалагічная зона:</td><td>Парэміялагічная зона:
"Сына за бацьку не адказвае [словы Сталіна – *К.П.*]" (І. Шамякін, В. Быкаў);
"Бо як добры плод сведчыць аб добрым дрэве, так і добрыя паводзіны дзяцей аб добрым жыцці бацькоў апавядаюць (М. Сматрыцкі); яблыка ад яблыні недалёка падае, а ты вун куды адкаціўся (В. Казько); "у багатага сам чорт дзяцей калыша, а беднаму…" (В. Казько);
"Пазнаў роўны роўнага – будзе добрая пара"</td><td>Энцыклапедычная зона:</td><td>Утылітарная зона:</td><td>Сацыяльна-культурная зона:
вясельная абраднасць: выкуп нявесты (В. Казько);
вясельны каравай (В. Дунін-Марцінкевіч, В. Казько);
хрэсьбінная абраднасць – хрэсьбінныя песні</td></tr>
</table>

Репозиторий ВГУ

	М. Зарэцкі, А. Куляшоў); ‘смерць члена сям’і – гора’ (Г. Далідовіч, Я. Колас, Я. Брыль, М. Лынькоў, І. Чыгрынаў); ‘маці – самае дарагое ў жыцці’ (Ю. Свірка, С. Грахоўскі, А. Куляшоў, Н. Гілевіч)		(Я. Баршчэўскі); “Брат супраць брата – страшны грэх прад богам!” (А. Дудараў); “Сіроцкія слёзы дарма не мінаюць. Падуць на белы камень – камень прабіваюць” (У. Караткевіч); Якое карэнне, такое і насенне; Які куст, такі і парастак; Які род, такі і плод; Якое дрэва, такі і клін, які бацька, такі і сын; Усякая птушка сваё гняздо бароніць (прыказкі, змешчаныя ў падручніку 5 кл.); “Ёсць прыказка: хто ажэніцца, той перамяніцца” (Я. Баршчэўскі)			(“Каля месяца, каля яснага”); пахавальная абраднасць: галашэнні па нябожчыку (Я. Баршчэўскі, У. Караткевіч); выхаванне: дзядзькаванне

Мадэляванне канцэпту *шчасце* (на аснове методыкі І.А. Сцерніна)

Намінатыўнае поле	шчасце; удача; радасць						
Вобразны змест канцэпту	Перцэптыўны вобраз				Кагнітыўны вобраз		
	зрокавы: шчаслівы буйны ўраджай; як прыемны сон	слыхавы: –	тактыльны: вялікае, неабсяжнае.	смакавы: простае шчасце людское […] пэўна, складаецца з солі, / З хлеба сабранага ў полі (М. Танк)	маральныя якасці: –	псіхічныя якасці: “Спакойнага шчасця не зычу нікому” (А. Куляшоў)	інтэлектуальныя якасці: –

Репозиторий ВГУ

<table>
<tr><td>Інфармацыйны змест канцэпту</td><td colspan="6">‘шчасце недасягальнае’ (Я. Баршчэўскі, Я. Купала, Я. Колас, І. Мележ); ‘шчасце жыве ў душы чалавека’ (Я. Колас, Я. Купала); ‘шчасце – у мірным існаванні’ (Я. Баршчэўскі, У. Караткевіч); “сумленнаму чужое шчасце «вачэй не мазоліць»” (П. Сіняўскі); ‘шчасце ў веданні/няведанні’ (У. Караткевіч, Я. Колас); ‘шчасце – у дзейнасці, працы на карысць іншым’ (Я. Баршчэўскі, Я. Купала, А. Дудараў); ‘шчаслівы той, хто ўсведамляе шчасце’ (А. Петрашкевіч); ‘шчасце – ўзаемнае каханне’ (Н. Гілевіч, У. Караткевіч, М. Зарэцкі, С. Грахоўскі); ‘шчасце заключаецца ў сям’і, у дзецях’ (В. Казько); ‘шчасце немагчыма пабудаваць несумленнымі ўчынкамі’ (Я. Баршчэўскі)</td></tr>
<tr><td>Інтэрпрэтацыйнае поле канцэпту</td><td>Ацэначная зона:
“Людзі, марачы пра шчасце на гэтай зямлі, малююць яго ў розных вобразах” (Я. Баршчэўскі)</td><td>Міфалагічная зона:
легенда пра папараць кветку (Я. Купала, У. Караткевіч); легенда пра пералёт-траву (Я. Баршчэўскі); “І казалі, што свечкі ў маладых [пры вянчанні. – К.П.] гарэлі так цьмяна, што […] не будзе тут шчасця. Жыццё іх зацьміцца смуткам” (Я. Баршчэўскі); “А чаркі ні адной / На шчасце не разбіта” (Я. Янішчыц)</td><td>Парэміялагічная зона:
“Як свет стаіць, то яшчэ не было вядома, каб на нянавісці выросла шчасце, а радасць на чужой бядзе” (К. Чорны); “Грэх квапіцца на чужое. На чужым і дармовым шчасця не будзе” (В. Быкаў); “Шчасце з чужых рук заўсёды кіслае” (А. Дудараў); “Не шукай ты шчасця, долі / На чужым далёкім полі” (Я. Купала); “Многа казак розных / Нам складалі продкі. / Шлях да шчасця доўгі, да бяды – кароткі” (У. Дубоўка); “Шчасце не ў золаце” (З. Бядуля)</td><td>Энцыклапедычная зона:
‘шчасце дае Бог’ (Я. Купала, У. Караткевіч); ‘шчасце здабывае сам чалавек’ (У. Дубоўка, Я. Купала, А. Дудараў, П. Сіняўскі); “Хто сам шчаслівы, таму здаецца, што і ўсе шчаслівы” (Я. Колас)</td><td>Утылітарная зона:
–</td><td>Сацыяльна-культурная зона:
–</td></tr>
</table>

Репозиторий ВГУ

Мадэляванне канцэпту *каханне* (на аснове методыкі І. А. Сцерніна)

<table>
<tr><td>Намінатыўнае поле</td><td colspan="8">каханне; любоў</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Вобразны змест канцэпту</td><td colspan="4">Перцэптыўны вобраз</td><td colspan="4">Кагнітыўны вобраз</td></tr>
<tr><td>зрокавы:
–</td><td>слыхавы:
–</td><td>тактыльны:
–</td><td>смакавы:
–</td><td>маральныя якасці:</td><td colspan="2">псіхічныя якасці:
летуценні, парыванні, кроў агнём бушуе, бурліць неспакойна (М. Зарэцкі); “ціхім каханне к табе разгарацца” (М. Багдановіч); “любоў – пяшчотная ласка маці да дзіцяці і […] адважная, шчырая адданасць барацьбіта сваёй справе і агнёвае, што кроў растапляе ў жылах, што грудзі віхурыць прагавітым жаданнем” (М. Зарэцкі)</td><td>інтэлектуальныя якасці:
–</td></tr>
<tr><td>Інфармацыйны змест канцэпту</td><td colspan="8">‘каханне – шматграннае пачуццё’ (М. Зарэцкі, І. Шамякін, Я. Янішчыц, А. Грачанікаў); ‘немагчымасць жыць без каханага чалавека’ (В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Колас, А. Грачанікаў); ‘каханне мацнее ў перашкодах’ (У. Караткевіч); ‘каханне не падуладнае багаццю, узросту’ (Я. Купала, М. Багдановіч, М. Зарэцкі, З. Бядуля, А. Міцкевіч);</td></tr>
<tr><td>Інтэрпрэтацыйнае поле канцэпту</td><td colspan="2">Ацэначная зона:
‘каханне – гэта шчасце для чалавека’
(У. Караткевіч,
М. Зарэцкі); ‘маральны абавязак галоўнейшы за каханне’
(Я. Баршчэўскі,
А. Дудараў);
“Бо, сапраўды, на свеце без кахання / Жыцця няма – ёсць толькі існаванне”
(А. Грачанікаў)</td><td>Міфалагічная зона:
–</td><td>Парэміялагічная зона:
–</td><td colspan="2">Энцыклапедычная зона:
‘каханне вечнае’
(Я. Купала,
В. Дунін-Марцінкевіч,
У. Караткевіч);
‘каханне можа знікнуць’
(У. Караткевіч)</td><td>Утылітарная зона:
–</td><td>Сацыяльна-культурная зона:
–</td></tr>
</table>

Рэпозиторий ВГУ

Навуковае выданне

ПІВАВАР Кацярына Сяргееўна

БЕЛАРУСКАЯ МЕНТАЛЬНАСЦЬ
У МОЎНАЙ ПРАСТОРЫ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ

Манаграфія

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*
Карэктар *Т.У. Образава*
Камп'ютарны дызайн *Л.Р. Жыгунова*

Падпісана ў друк . .2015. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 9,01. Ул.-выд. арк. 10,15. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 от 31.03.2014 г.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.

Репозиторий ВГУ